ЯДВІГІН Ш.

ЯДВІГІН Ш.

ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ

МІНСК

«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

1976

Бел1
Я35

Укладанне кнігі, прадмова і каментарыі
І. П. Чыгрына

Я $\frac{70303\text{-}158}{М302(05)\text{-}76}$ 100-76

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1976 г.

ЯДВІГІН Ш.

Яго сапраўднае прозвішча Антон Іванавіч Лявіцкі. Ён нарадзіўся 25 чэрвеня 1868 г. на Рагачоўшчыне, у маёнтку Добасня (зараз Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці), у сям'і ўпраўляючага. Закончыў Мінскую гімназію. Нейкі час вучыўся на медыцынскім факультэце Маскоўскага універсітэта, але за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях з універсітэта быў выключаны. Пасля вяртання ў Беларусь працаваў памочнікам аптэкара ў Радашковічах. Асноўную частку свайго сталага жыцця ён правёў у фальварку Карпілаўка (каля Радашковіч) — займаўся гаспадаркай, тут напісаў свае асноўныя творы.

Ядвігін Ш. — адзін з першых нашых празаікаў. Заслугі ў яго перад літаратурай немалыя.

Вельмі высока творчасць Ядвігіна Ш. ставіў Максім Багдановіч. Па характары таленту ён лічыў яго чыстым байкапісцам. «Няма спрэчкі, што ў асобе Ядвігіна Ш., — сцвярджаў М. Багдановіч у артыкуле «За тры гады», — мы маем аднаго з найлепшых баечнікаў нашых часоў...»[1].

---

[1] М. Багдановіч. Зб. тв., т. II, Мінск, 1968, стар. 131—132.

Пісаў Ядвігін Ш. пераважна пра людзей працы. І цяперашняга чытача не можа не ўсхваляваць да глыбіні душы лёс, напрыклад, Ганулькі і Адамкі, герояў апавядання «Зарабляюць». У гэтым творы праблема адчужанасці паміж людзьмі — асноўная праблема класавага грамадства — пастаўлена надзвычай востра. Сапраўды, хіба маглі яны, неспрактыкаваныя ў жыцці падлеткі, супрацьпаставіць сябе свету, дзе ўсё купляецца і прадаецца, і захаваць за сабой права аставацца людзьмі?

Тамашыха — галоўная гераіня апавядання «Гаротная» — такая ж самая ахвяра эксплуататарскага грамадства. Розніца хіба толькі ў тым, што гэта чалавек сталага веку і жыве яна ў вёсцы. Чаго толькі не вынесла гэтая кабета на сваіх плячах! Былі тут і сірочае маленства, і цяжкая праца на чужых людзей, і зганьбаванае — за шчырасць і давер — дзявоцтва, і вымушанае — за ўдаўца і п'яніцу — замужжа, былі тут і холад, і заўсёдныя нястачы, і смерць — аднаго за другім — дзяцей...

«Задумалася Тамашыха. І ажно сама дзівілася, скуль можа брацца столькі бяды, столькі няшчасця, сколькі ўсцяж валілася на яе галаву. І за што? Грэшная? Мо яе грэх найважнейшы, найбольшы за ўсіх? Мо дзеля таго і пакутвае яна за ўсіх? Мо іншым затое лягчэй жывецца? Ой, бо ці ўсё ж яе жыццё не адна пакута? Не адна бяда? Не адна нядоля?».

Прыгнятальнікаў і эксплуататараў пісьменнік называе павукамі і каршунамі. Яму ненавісны лад іх жыцця. Яго гнеў і трывога асабліва выразна выявіліся ў так званых байках у прозе («Вяселле», «Павук», «Рабы», «Падласенькі»). Тое, што падобныя людзі ёсць на белым свеце, не дае пісьменніку спакою.

Ядвігін Ш. — вялікі чалавекалюб. Аднак увага да чалавека працы ў яго творчасці ніколі не абмяжоўвалася пасіўным спачуваннем, бо пісьменнік добра разумеў прычыны несправядлівасці і жорсткасці існуючага ладу жыцця.

Творы Ядвігіна Ш. вызначаюцца высокімі мастацкімі якасцямі. Асабліва значных поспехаў пісьменнік дасягае ў байках у прозе. Творы гэтыя вылучаюцца сапраўднай глыбінёй вобразаў, цікавым сюжэтам, добрай, дакладнай моваю.

Мастацкі талент пісьменніка фарміраваўся пад непасрэдным уплывам фальклору. Напрыклад, такія апавяданні, як «Вучоны бык», «Баба», «Што сказаў певень», «Хлеб» і некаторыя іншыя, з'яўляюцца апрацоўкамі народных сюжэтаў.

Ядвігін Ш. у большай ступені філосаф, мысліцель, чым жывапісец. Таму нават па самой прыродзе яго талент мог з найбольшай сілай праявіцца ў байках у прозе — творах, якія па спосабу абагульнення з'яў рэчаіснасці стаяць блізка да народных казак і анекдотаў.

Нельга не прызнаць, аднак, пэўных заслуг гэтага пісьменніка і

ў развіцці жанру нашага рэалістычнага апавядання. Возьмем хоць бы апавяданне «З бальнічнага жыцця». Твор гэты невялікі памерам, але даволі густа населены людзьмі, і людзей гэтых мы, чытачы, выразна ўяўляем.

Паводзіны і ўчынкі герояў апавядання псіхалагічна апраўданы не толькі той сітуацыяй, у якую яны трапляюць, але і нечым больш значным, важным — іх грамадскім становішчам. Нават малаіндывідуалізаваная, у асноўным лірыка-публіцыстычная характарыстыка цяжкахворага не здаецца вялікім недахопам твора. Усё ў апавяданні — і напружана-драматычная пейзажная замалёўка, і моцнае, знешне стрыманае, але вельмі эмацыянальнае лірычнае адступленне, і нескладаны сюжэт — дапамагае паказаць канкрэтнага чалавека, прадстаўніка канкрэтнага сацыяльнага асяроддзя.

У лепшых рэалістычных апавяданнях Ядвігіна Ш. характары напісаны праўдзіва і пераканаўча. З часам усё больш увагі пісьменнік аддае абгрунтаванню ўнутранага жыцця герояў, апісанню абставін, партрэтным характарыстыкам, малюнкам пейзажу. У пазнейшых апавяданнях пра сюжэт ужо можна гаварыць як пра сродак асэнсавання ўзаемаадносін герояў у працэсе сацыяльнай практыкі.

У байках у прозе Ядвігін Ш. праявіўся як сталы майстар, у рэалістычна-бытавым апавяданні як мастак ён сябе толькі шукаў. Думаецца, аднак, што і гэтыя апошнія былі вельмі цікавай з'явай у беларускай прозе.

Тое самае трэба сказаць і пра раман «Золата». Сёння ў рамане, бадай, не цяжка знайсці тыя ці іншыя пралікі, тым больш што твор дайшоў да нас не цалкам. Не трэба, аднак, забываць, што «Золата» — адна з першых спроб у беларускай літаратуры вялікай эпічнай формы. Калі ў адносінах да жанру апавядання ўсё-такі можна сказаць, што ў Ядвігіна Ш. былі папярэднікі, то ў жанры рамана пісьменнік гэты папярэднікаў такіх, бясспрэчна, не меў.

Шлях творчага станаўлення і развіцця Ядвігіна Ш. быў нялёгкі. Дастаткова сказаць, што часта нават лепшыя рэчы пісьменніка псуе суб'ектывізм («Шчаслівая»). Для некаторых жа наогул уласціва невыразнасць задумы, расплывістасць асноўнай думкі («Сіло»).

Першыя творы пісьменніка — апавяданні «Важная фіга», «Заморскі звер», «Пазыка», «З маленькім білецікам» і некаторыя іншыя — не вызначаюцца навізной тэматыкі. Затое яны жанрава ўзбагачалі літаратуру, давалі ёй сродкі сатырычнага выкрыцця адмоўных з'яў у жыцці.

У Ядвігіна Ш. селянін адчувае сябе самастойнай творчай сілай — ён ужо смяецца з самога сябе. І аб'ектыўна гэта быў вельмі важны, сапраўды новы паварот у мастацкім раскрыцці сялянскай тэмы. Творы свае Ядвігін Ш. адрасуе непасрэдна селяніну, каб разварушыць яго, абудзіць у ім чалавечае, падтрымаць веру ў сябе.

Пачатак літаратурнай творчасці Ядвігіна Ш. звязваецца з яго перакладам на беларускую мову апавядання У. Гаршына «Сігнал»

(асобнай кніжкай выйшла ў Маскве ў 1891 г.). Гэта быў час, калі на фарміраванне грамадска-палітычных ідэалаў моладзі асноўны ўплыў усе яшчэ аказвала народніцтва, бо ў Расіі сацыял-дэмакратыя тады перажывала зародкавы, пачатковы перыяд развіцця. І як пісьменнік, і як грамадзянін Ядвігін Ш. складваўся пад самым непасрэдным уздзеяннем ідэй народніцтва. Паводле яго ўласнага сведчання, народніцтва зрабіла яго, маскоўскага студэнта-медыка, адным з актыўных удзельнікаў студэнцкіх хваляванняў. Гэта яно, народніцтва, дапамагло юнаку з Мінскага зямляцтва ўпершыню прычасціцца роднай песняй, адчуць сваю нацыянальную прыналежнасць. Гэта яно, тое самае народніцтва, выкрасаючы ў душы першыя іскры нацыянальнага самаўсведамлення, павяло яго ў родную вёску пазнаваць сапраўдны воблік свайго краю, вывучаць жыццё свайго народа ў самых розных праявах.

Пад уплывам народніцтва Ядвігін Ш. у сваіх творах прымушаў мужыка высмейваць свае недахопы — някемнасць, п янства і г. д.

Народніцкая тэорыя малых спраў, асабліва ва ўмовах Беларусі, многімі ўспрымалася тады як справа патрэбная, нават надзённая. І ўсё ж не гэта, як паказаў час, вызначала тады агульную тэндэнцыю руху беларускай вёскі ў будучыню.

Упершыню данашаніўскія творы Ядвігіна Ш. былі апублікаваны толькі пасля легалізацыі беларускага друкаванага слова і ў пэўным сэнсе яшчэ да сустрэчы з чытачом устарэлі. Не дзіва, што нават дакастрычніцкая крытыка сустрэла іх насцярожана — як рэчы, у якіх нібы беспадстаўна высмейваецца мужык.

Ядвігін Ш. не прызнаваў рэвалюцыйнага шляху вырашэння грамадскіх супярэчнасцей, у тым ліку і нацыянальных. «Тыя, хто рассейвае не яднанне, а раз'яднанне, не дружбу, а варожасць, не любоў, а нянавісць, тыя не ўсведамляюць ніякай адказнасці не толькі перад кім-небудзь, але, я ўпэўнены, і самі перад сабой»,— зусім шчыра пісаў ён у артыкуле «Erare humanum» у неспакойны 1905 год. На яго думку, адзіна прымальны спосаб вырашэння грамадскіх супярэчнасцей — маральна-этычнае самаўдасканаленне. Ён верыць у творчыя сілы чалавека. Розум — вось што робіць людзей людзьмі, і ўсе свае супярэчнасці чалавек павінен вырашаць толькі на грунце разумнай гуманнасці. Сцягам людскога агульнажыцця павінны быць любоў і дабрата да бліжняга. Каб быць добрым — неабходна ўдасканальвацца. Шлях жа да ўдасканалення ляжыць праз асвету.

Супярэчнасці ў творчасці Ядвігіна Ш. вынікаюць перш за ўсё з супярэчнасцей яго светапогляду.

Пасля выдання асобнай кнігай перакладу гаршынаўскага «Сігналу» Ядвігін Ш. доўгі час на роднай мове, па зразумелых прычынах, друкавацца не мог, але ад літаратуры цалкам не адышоў — супрацоўнічаў, асабліва актыўна ў 1905 г., у мясцовай рускай, часткова польскай прэсе (апав. «Мілка», «Мустафа», шэраг артыку-

лаў, фельетонаў). З першым уласным творам на беларускай мове ён змог выступіць толькі ў 1906 г. (апав. «Суд», «Наша доля», № 3). З гэтага часу і пачаўся яго самы актыўны ўдзел у развіцці беларускай літаратуры. Пісьменнік устанавіў сувязі з многімі беларускімі грамадскімі і палітычнымі дзеячамі, актыўна выступаў на старонках беларускага перыядычнага друку. Некаторы час быў загадчыкам літаратурнага аддзела «Нашай Нівы». Усё гэта хоць нейкім чынам не магло не аказаць уплыву на светаўспрыманне Ядвігіна Ш., на яго творчасць. Сапраўды, калі ў апавяданні «Суд» пісьменнік прапаведуе салідарызм на чыста чалавечай аснове, г. зн. выступае са сваіх старых ідэйна-творчых пазіцый, то ў «Жывым нябожчыку», напісаным вельмі тонка, з глыбокім унутраным болем і горыччу, ён, калі і не адыходзіць ад сваёй ранейшай філасофіі жыцця, то, ва ўсякім разе, ужо глыбока адчувае, што маладое пакаленне гэтай філасофіі не прымае. Адсюль і назва твора (і героя) — «Жывы нябожчык».

Пісьменнік жыў патрабаваннямі і клопатамі эпохі, у першую чаргу праблемамі беларускага нацыянальнага адраджэння, але разумеў гэтыя патрабаванні і клопаты па-свойму. Ён імкнуўся быць максімальна патрэбным краю. І ў тых выпадках, калі яго найбольш «раздзіраюць» унутраныя сумненні, стараўся акунуцца ў мора народнага жыцця. Так, напрыклад, здарылася ў 1910 годзе, калі ён, ужо не вельмі моцны здароўем і параўнальна не малады гадамі, адбывае пехатою з Вільні ў родную Карпілаўку, з адзінай мэтай «заглянуць пад саламяныя стрэхі ў тыя куткі-куточкі, аб каторых столькі-то пішуць, сядзячы ў горадзе».

Памёр Ядвігін Ш. у Вільні ад сухотаў у 1922 годзе.

Пісьменнік не змог арганічна прыняць хаду часу, асабліва ў свае апошнія гады, і ў тым яго трагедыя — не толькі як чалавека, але ў значнай ступені і як мастака.

Нягледзячы на ўсе перашкоды і цяжкасці, Ядвігін Ш. працаваў у літаратуры даволі доўга і зрабіў нямала. Яшчэ пры жыцці выйшла ў свет шэсць кніжак яго твораў: «Дзед Завала» (1910), «Бярозка», (1912), «Васількі» (1914), «Успаміны» (1921) і два выданні перакладу апавядання У. Гаршына «Сігнал». Па сутнасці, Ядвігін Ш.— аўтар першага беларускага рамана («Золата», друкаваўся ў 1920 г.), адзін з першых нарысістаў («Лісты з дарогі»). Добра заявіў ён пра сябе і як паэт (паэма «Дзед Завала»). Нярэдка выступаў з артыкуламі, фельетонамі, допісамі. Характэрная асаблівасць творчасці пісьменніка — незвычайная вера ў чалавека, у чалавечы розум. З аднаго боку, Ядвігін Ш. непрымірымы да несправядлівасці і фальшу, і ў яго творчасці вялікае месца адведзена сатыры і гумару; з другога боку, мастака неадступна трывожаць праблемы чалавечага быцця, і для многіх яго твораў характэрна глыбокая філасафічнасць.

Літаратурная спадчына Ядвігіна Ш. — з'ява ў беларускай літаратуры даволі арыгінальная і цікавая, але не ў меншай ступені і

складаная. І, бадай, сёння было б няправільна, каб мы цалкам пагадзіліся з тою высокай ацэнкай, якую пісьменніку давалі яго малодшыя сучаснікі, у тым ліку і М. Багдановіч.

Ацэнка тая шмат у чым была выклікана тагачаснымі патрэбамі развіцця нашай літаратуры. Але, канешне, вялікім грэхам было б таксама закрэсліваць творчасць мастака, як гэта часам рабілася ў крытыцы, ці хоць бы абыходзіць маўчаннем. Творчасць Ядвігіна Ш. яшчэ патрабуе свайго ўсебаковага вывучэння. Зразумела адно: як пісьменнік ён мае ўсе падставы, каб у гісторыі беларускай літаратуры, у першую чаргу ў гісторыі станаўлення беларускай прозы, яму было адведзена належнае месца.

Лепшае са спадчыны Ядвігіна Ш., безумоўна, мае права на ўвагу шырокага чытача.

•

Творы Ядвігіна Ш. друкуюцца тут у асноўным з захаваннем асаблівасцей мовы таго часу. Папраўкі датычацца галоўным чынам фанетычных і сінтаксічных адхіленняў.

Ядвігін Ш. вельмі чулы да слова. Нягледзячы на шырокі жанравы дыяпазон творчасці, на тое, што наша літаратурная мова тады толькі складвалася, мова яго твораў вельмі багатая, дакладная, гнуткая — амаль без дыялектызмаў, без іншамоўных слоў. У тых жа выпадках, калі словы такія ўсё-такі сустракаюцца (з запазычаных часцей за ўсё з польскай мовы), тлумачэнне іх даецца ў каментарыях. Гэтыя словы і выразы ў тэксце пазначаны зорачкай.

І. П. Чыгрын

АПАВЯДАННІ

БЯРОЗКА

Даждаўся Лявон, што яго пацеха Марыська выцягнулася ўгару, як тая маладая, гладкая бярозка. Ад хлапцоў адбою не было, і хоць сэрца кроўю аблівалася, а пара падышла замуж аддаваць.

Справіў Лявон вяселле як мае быць: каб у сэрцы дзіцячым на доўгія годы добрая памятка асталася і каб перад людзьмі сораму не было; але, як прыйшлося расставацца з дачушкай, сплакаўся, бедны, як бобр: быццам чуяла сэрца нешта нядобрае. Ён і кажа ёй на апошнім адвітанні:

— Слухай, пацеха мая, адну цябе толькі я маю і адну табе толькі даю раду: калі цябе прыцісне горкая доля, калі табе будзе вельмі цяжка жыць, што і змогі не будзе вытрываць, не жалься нікому-нікому, хіба знойдзеш

такую спрыяючую верную душу, як спрыяла і верная была для цябе душа твайго бацькі; не знойдзеш — ідзі лепш у лес, выберы, каторае табе спадабаецца, дрэва і яму, толькі яму аднаму, маё ты дзіцятка, душу сваю адкрывай, жаль свой вылівай...

. . . . . .

Прайшло нямала часу. Паехаў Лявон дачкі даведацца. Вылецела Марыська з хаты, кінулася бацьку да кален; прыпала пасля галоўкай да грудзей бацькавых, але ўскорасці, як бы засаромеўшыся, адскочыла, спусціла вочкі і стаіць, уся збялеўшая, толькі губкі дрыжаць...

Доўга Лявон моўчкі ўглядаўся на сваю пацеху, а пасля памалу падышоў да яе і глухім, быццам не сваім голасам стаў дапытваць:

— Цяжка?

— Ой, цяжка, татачка! — уздыхнуўшы, адказала дачка.

— Жалілася?

— Жалілася, — вышаптала Марыська.

— Каму?

— Бярозцы.

— А больш?

— Не знайшла каму.

— Нясі сякеру, пакажы мне гэтае дрэва, — сказаў Лявон.

. . . . . .

Хістаючыся, як маладая ад буры бярозка, ішла наперадзе Марыся, а за ёй, як хмара, сумны ішоў з сякерай Лявон...

— Вось тая, на ўзгорку, — здалёк паказвала рукой Марыся. — Ой, татачка, — жалілася яна, — якая гэта была пекная бярозка, якая гладкая! Якія пекныя былі

на ёй галінкі, а на галінках паўнюсенька зялёненькіх бліскучых лісточкаў!..

Лявон маўчаў.

— ... Татачка! што ёй зрабілася? Гэта ж цяпер лета... Чаму яна ўчарнела? Чаму здрабнелі, пакорчыліся яе лісточкі? Татка?

Лявон маўчаў.

— ...Чаму жаўцеюць гэтыя лісточкі? Бачыш, татка, лісточкі з яе ападаюць?.. Чаму галінкі свае яна ўніз апусціла, быццам яны плачуць?.. Я так любіла, я так кахала гэту бярозку, а яна ўмір...

Не паспела слова скончыць Марыся, як цяжка грукнуў па дрэве абух... Як падстрэленая птушка, скокнула яна і схапіла за руку старога:

— Татачка, не чапай!! Не чапай, родненькі мой! — прасіла Марыся. — Баліць... баліць...

Але Лявон, нічога не кажучы, ізноў стукнуў абухом па дрэве; рэха не адазвалася — стук быў глухі, як бы гэта не па дрэве, а па зямлі стукаў... Марыська стаяла воддаль, заламаўшы рукі, і глядзела быццам на нешта вельмі страшнае, толькі з вачэй яе сыпаліся адна за адной слязінкі, як сыпаліся пажоўклыя лісточкі з здрыгануўшайся пад абухом бярэзіны... Лявон нагнуўся, абчасаў каля пня кару і, адагнуўшыся, са ўсяго маху запусціў сякеру ў бярозу і, павярнуўшы тапарышча набок, адшчапіў вялікую трэску. Дрэва заскрыпела, запішчала, быццам стала жаліцца, як тое дзіця... а з-пад Лявонавай сякеры шчэпкі ляцелі і ляцелі...

Але нядоўга яму прыйшлося працаваць: нагнуўся Лявон, глянуў на падсечанае месца, ткнуў туды тапарышчам і, адагнуўшыся, глыбока-глыбока ўздыхнуў...

— Марыська, дзіцятка маё, — дрыжачым голасам пачаў Лявон, — бачыш? Гэта ж тут усяго на палец абалоні! А там — там парахня, адна парахня!.. А ведаеш чаму, гаротніца ты мая? Ведаеш? Гэта ж твой боль, гэта ж твой жаль спарахнілі гэту бярозку,— бо ты доляй сва-

ёй жалілася ёй. Дрэва і то спужалася такой долі... Умірае гэта бярозка, умірае без пары, бо кожны раз, як ты прыходзіла жаліцца, ёй было штораз цяжэй, а ты, маё гаротнае дзіця, успомні, ты тады мела хвіліны, падобныя да шчасця...

І Лявон, узяўшы рукамі галоўку сваёй пацехі, моцна прыціснуў да сябе, а Марыська, тулячыся да бацькавых грудзей, прашаптала:

— Татачка, а чаму паміж людзей я не знайшла, каму пажаліцца?

Лявон маўчаў.

БАБА

Даўно гэта было. Пад той час хадзіў яшчэ па свеце пан Езус са святым Пятром глядзець, які парадак на зямлі. Ідуць гэта яны дарогай, гутараць, а пан Езус і пытае: «А як бы ты, Пётра, хацеў: ці кабета, ці мужчына каб быў важнейшым у хаце?» Св. Пётра давай прасіць за кабету.

— Добра, — кажа пан Езус, — зайдзем жа ў гэту хатку нанач.

Зайшлі ды просяцца ў гаспадара, каб пазволіў пераначаваць. «З ахвотай пусціў бы я вас,— адказвае гаспадар, не спазнаўшы, да каго гаворыць, — але жонкі баюся, ліхая баба! Як вернецца з карчмы ўночы, то і мне, і вам, як паднясці, надасць». — «Нябойсь, — кажа св. Пётра, — не будзе чапаць».

Гаспадар згадзіўся, прынёс саломы, паслаў як мае быць, і ўсе, паклаўшыся, паснулі. Ажно чуе гаспадар, як у дзверы — грак! грак! Ён гэта пакуль расчухаўся дый трапіў на закрутку, жонка, ляскаючы зубамі на марозе, аж пену са злосці пусціла і, як толькі ўляцела ў хату, так зара за качаргу дый да старога; той ходу, яна за ім дый, зачапіўшыся за Пятровы ногі, грымсь, як доўгая, сярод хаты. «А гэта яшчэ што?!» — усхапіўшыся, накінулася баба на мужыка. «Падарожныя нанач папрасіліся», — адказвае той, спусціўшы вочы. «Падарожныя? — зараўла баба, — дык ты тут без мяне нейкіх валацугаў наводзіш? Пачакай жа: спраўлю я табе лазню, спраўлю і тваім падарожным!» — дый, скочыўшы да св. Пётры, давай яго пражыць. Корчыўся, корчыўся св. Пётра, але замаўчаў. Сагнаўшы ахвоту, баба, засопшыся, кажа: «З гэтага годзе, трэба таго — з другога боку пачаставаць», — дый заходзіць ад сцяны, дзе ляжаў пан Езус. Спанатрыў св. Пётра, што справа кепская, дый кульгіць борздзенька праз пана Езуса на другі бок і ляжыць

ціханька; а баба, не ўгледзеўшы гэтай штукі, давай ізноў ківацца над св. Пётрам: усё як гоп дык гоп. «Ну, гэтаму, — кажа, — мо ўжо і перадала; той першы гатоў загневацца, што яго скрыўдзіла — мала дасталося, трэ надкінуць!» — дый ізноў заходзіць на другі бок да пана Езуса. Бачыць св. Пётра: з бабай жартаў няма; ізноў дрэнна выходзіць. Вось ён — шлык! дый смарганyў праз пана Езуса на сваё старое месца, а баба ўжо тут, і давай яму прыклады зноў рабіць: як па ім так па ім, ажно пакуль не змарылася і не пайшла спаць. А пан Езус праз увесь час ляжыць сабе спакойна, быццам спіць.

Назаўтра яшчэ і сонца не ўзнялося, будзіць пана Езуса св. Пётра дый давай прасіць, каб скарэй ісці ў дарогу («Хаця б, думае, баба не прачхнулася»). Выйшлі. Пан Езус, як бы і нічога, пытае: «Ну, як жа табе, Пётра, спалася? Як бабіны парадкі спадабаліся?» — «Як спалася, то спалася, а што да парадкаў, хай бы ўжо, пане мой, лепш мо мужчына іх вёў...»

ЗАМОРСКІ ЗВЕР

«...Даўно-то даўно гэта было, але яшчэ помню, бо, між намі кажучы, далі-такі добра нам на памяць. Было так: Рыгор, Гаўрыла і я выбраліся ў горад з дравамі; дровы прадалі, зайшлі да Янкеля выпіць чарку, сядзім, калякаем; чуем — каля другога стала гамоняць аб усялякіх зверах заморскіх, якіх панавозілі цяпер у гэты горад. Гаўрыла і кажа да нас: «Браткі, лепш меней чарак вып'ем, а пойдземо паглядзець заморскую налпу». Добра, пайшлі; чаўпёмся па вуліцах, дапытваючыся, як і куды трапіць да гэтай заморскай звярыны, аж тут нарываецца нейкі і кажа: «Хадзіце за мной, я вам пакажу налпу, і кошту ніякага не будзе». Усцешыліся мы; коцім за ім. «Слухайце, дзядзькі,— кажа да нас правадыр наш,— паказаць налпу-то я вам пакажу, але сам з вамі не пайду, бо яна вельмі сярдзітая і не любіць, каб хто другі раз прыходзіў глядзець на яе, а я ўжо раз быў». Праўда, спярша і па нашым целе забегалі мурашкі, але — было не было. «Вядзі», — кажам. Завёў ён нас на нейкую вуліцу, збочыў у нейкі садок ды і паказвае пальцам. «Бачыце, — кажа, — вунь гэны жоўты дом і велізарны ганак пры ім? Падыдзіце бліжэй і прыгледзьцеся — вось на крэсле і сядзіць тая заморская налпа». Сунуліся мы бліжэй, углядаемся — праўда: страшная, гарбатая, твар неяк сплюснуўшыся, дый амаль не ўся ў валасах, але да чалавека надта падобна — і нават апрануўшыся зусім як пан які: апратка пекная, багатая; але і ўвагі на нас ніякай не робіць, сядзіць і нават газету чытае... «Ну, — думаем сабе, — хоць налпа, але як заморская, дык, можа, і ўмее чытаць?» Асмеліўшыся, сталі мы бліжэй падходзіць, — нічога — сядзіць. Гаўрыла кажа: «Братцы, свісну я». — «Свішчы»,— адказваем. Свіснуў ён раз — нічога, свіснуў другі і трэці раз, ажно праўда — падняло гэтае звяр'ё галаву дый лыпае на нас

маленькімі вочкамі, але так неяк смешна, што мы ўсе ў рогат. Ажно, людцы вы мае, як запішчыць гэта яна на нас, і хоць усяго не зразумелі, але лаянка зусім да нашай падобна, толькі яшчэ крапчэйшая! «Іш ты, — кажа Рыгорка,— хоць заморская падла, а лаянкі тутэйшай скора навучылася». Дый яшчэ горш сталі рагатаць; а я, доўга не чакаючы, тыц ёй пад нос пугаўём. Браткі вы мае! Калі ўскочыць гэта яна, выхапіла нейкую дудачку ды як засвішча, — ужо на што Гаўрыла быў здатны да гэтага, а так бы не патрапіў! Але нядоўга мы дзівавалі-ся, бо, як бач, наляцела паліцыя — і за карак ды ў паліцыю. Там мы толькі даведаліся, што жулік нас падвёў, бо гэта не заморская налпа, а амаль не першы чалавек у горадзе, але, як людзі нам казалі, надта падобны да налпы. Даведаліся мы ў паліцыі яшчэ нечага, але ўжо не заморскага, а тутэйшага — лазовага куста; а мне за тое, што ткнуў пугаўём гэну звярыну, зрабілі гонар — лішніх пятнаццаць усыпалі...»

ПАЗЫКА

Што пазыка не кожнаму ідзе на карысць, усякі хіба добра ведае на сваім уласным карку. Пазнаў гэта і мой карк, а нават не карк, а ногі.

Было так: выбраўся я ў Вільню, а што неяк, не тут кажучы, саромеўся паказацца ў горадзе ў лапцях, дык пазычыў боты ў суседа. Прыйшоў у Вільню; цягнуўся ў Кальварыю. Аж тут на мосце, што зроблены цераз раку Вілію, — бачу: нейкія два падросткі цягаюцца за чубы.

— Што вам, — кажу, — за ліха, абібокі вы гэткія, чаго вам не хватае, — гэта ж смех і грэх!

— Дзядзенька, — кажуць яны, — дзярэмся — праўда, але дзярэмся з тваёй прычыны.

«Вось, — думаю, — ліха надало: з-за мяне — Янкі з Гаротнікаў — у Вільні чубы трашчаць?!.» Аж дзіва: скуль яны могуць знаць мяне? Але на сэрцы зрабілася неяк добра: як бы ні было, а ўсё ж гонар.

— Пакіньце, — кажу, — хлопчыкі, шкада мне вас, ды скажыце, у чым дзела?

— Як жа ж, дзядзенька, во гэты гіцаль * кажа, што ў цябе шэсць пальцаў на назе, а я кажу, што пяць; ну, і ўзяліся за чупрыны.

— А дзетачкі ж мае вы родныя, пакіньце цягацца,— кажу, — бо ў мяне і папраўдзе тыкеля * па пяць пальцаў на назе!

— Не,— кажа старэйшы хлапец, — так табе, дзядзька, веры не дамо: скінь боты і пакажы.

— Добра, — кажу, — хлопчыкі, супакойцеся — я вас пераканаю.

Зышлі мы на бок; сцягнуў я бот, адкруціў анучыну, пералічылі яны мае пальцы — пяць!

— Ага, — кажа той самы забіяка, — чаму ж ты, дзядзька, паказаў нам тыкеля правую нагу? А на левай то пэўне шэсць пальцаў!

Хоць вас паляруш! Разуўся я і з левай нагі, пачаў анучу адкручваць,— калі глянь — ажно ўжо няма маіх чупрыннікаў; няма каму пальцаў лічыць! Але, дасцё веры, і на пальцы няма чаго нацягнуць, бо разам з імі паехалі і новыя пазычаныя боты!..

З МАЛЕНЬКІМ БІЛЕЦІКАМ

Ці здарылася вам, браткі мае, ехаць на чыгунцы? Не? Ну і дзякуйце богу! Мне бо давялося раз,— няхай яна згарыць: чуць-чуць даехаў! А ехаць мусіў: у гарадской бальніцы ляжаў хворы ўнук — трэба было да яго дабрацца. Жонка адвезла на вакзал, добрыя людзі параілі, як і дзе купіць білет, нават улезці мне памаглі на гэту шалёную кабылу, згінь яна, прападзі!..

Людцы мае! Колькі ж там народу, народу! І ўсе разам: і жыды, і мужыкі, і паны, і бабы разам паміж усіх сядзяць... Толькі гэта я зірк у адзін, у другі бок, аж тут калі зазвоняць, засвісцяць, загудзяць, ды гурурурy — вагоны, значыцца, крануліся; калі схіснуўся я, то, каб нейкі добры пан мяне не паддзяржаў, мусіць, і костачак я не сабраў бы сваіх.

— Садзіся, — кажа да мяне, — старычок, — і сам пасунуўся крыху на зэдліку гэным. Сеў я, глянуў на яго — бачу — крапчэй ён за пана паказвае: па шапцы пазнаў я, што чыноўнік нейкі, а каля яго дзве паненкі сядзяць, ну, але сказаў сесці, то і сяджу.

Толькі гэта шалёная кабыла так неяк не то што трасе, але калыша, каб на яе звод, што мне пачало млосна рабіцца. Дастаў я люльку, махоркай добра напхаў дый затуманіў — чую, палягчэла, адлягло; я тады другую і трэцюю. Бачу: нешта паненкі круціць носам пачалі і давай шаптацца з чыноўнікам. А той зараз да мяне:

— Білет жа ты, старычок, маеш?

— А як жа; грошы, — кажу, — заплаціў, вось і білет, — выймаючы з капшука, паказваю яму.

— Ах, стары, стары, куды ж ты — кажа — забраўся з гэткім маленькім білецікам? Гэта ж ты штраф заплаціш! Глянь, які мой!

Калі глянуў я на яго білет — праўда: у разоў 20 большы за мой ды і зусім не падобны! Я гэта, доўга не

чакаўшы, цмок у адну руку, цмок у другую. «Паночку, — кажу, — ваша выскароддзе, пакажыце ж, дзе мне сесці?!» — «Хадзі, — кажа, — пакажу».

Павёў ён мяне, адчыніў нейкія дзверцы. «Во, — кажа, — у цябе маленькі білецік, дык табе па закону і маленькае месца палагаецца».

Падзякаваў я яму за раду і ўвагу на маю старасць. Праўда, крыху цеснавата, але для аднаго годзе; і зэдлік да сцяны прыбіты, толькі з велізарнай круглай дзіркай, але сядзець нішто — выгодна. Прычыніўшы крыху дзверы, затуманіў я люльку, пачаў думаць, як там унук мой маецца, што жонка дома парабляе, аж тут тыц да мяне нейкі барадаты жыд, але, праўда, зара назад папёр; толькі я гэта стаў напіхаць другую люльку, аж тут шась да мяне нейкая паня, але то не абы-якая паня — так чыста адзеўшыся, што я ўжо маніўся хоць у куточку пры ёй пастаяць, хай бы садзілася на зэдлік — неяк бы змясціліся, але і яна стук дзвярамі і пайшла. Божухна-бацюхна, думаю сабе, пыхкаючы люльку, гэткая то, відаць, багатая паня, а мусі таксама, як і я, бедны, з маленькім білецікам едзе. Не скончыў я яшчэ і другой люлькі, аж тут калі стаў да мяне сыпаць народ, — не раўнуючы, як на хрэсьбіны: усё скрыг ды скрыг дзвярамі, усялякага стану, і малых, і старых; а я сяджу сабе, як пан, — ведама, заплаціўшы грошы,— ды падміргваю ім, ды ўсміхаюся з іх зайздрасці. Аж ізноў лезе той самы барадаты жыд ды як наваліцца на мяне: «Што ты,— кажа,— адзін рассеўся? Іншым не трэба, ці што? Злазь!»

— Дурны ты, кажу, дурны. Я ж за свае крывава запрацаваныя грошы білет купіў, праўда — маленькі, але пан, дай божа яму здароўя, паказаў мне, дзе і з гэткім білецікам можна да ўнука даехаць...

— От я табе пакажу ўнука! — крыкнуў жыд і пабег некуды.

Аж зара навёў ён на мяне нейкіх чыноўнікаў, ці ліха іх там ведае каго, і сталі яны мяне адтуль цягнуць.

Але не такі я ўжо дурань, хоць першы раз на гэтай паганай кабыле еду, — не даўся.

Прыехалі на нейкую станцыю, навялі на мяне нейкіх вайсковых з аружжам людзей; тыя, дык, прызнаюся, адразу далі рады мне, старому, і нават на вакзал зацягнулі, хацелі нешта пісаць ды і мяне пакінуць тут... чуць-чуць выпрасіўся і ледзь дабраўся, дзякаваць богу, да месца.

ВУЧОНЫ БЫК

Павёў Язэп бычка-трацячка на рынак прадаваць; на дарозе спатыкае салдатаў; тыя і пытаюцца Язэпа:

— Куды, старча, бычка вядзеш?

— На торг прадаваць вяду, — кажа Язэп, — такі нейкі няўдалы, наравісты ўдаўся, што рады даць не магу.

— Эх, дурны ты, землячок, — кажуць салдаты, — што ж ты возьмеш за гэткую злыбіну? Аддай лепш нам яго на навуку ў горад на які год, дык прынамсі апасля жмені са тры грошы згорнеш.

Падумаў, пачухаў патыліцу Язэп, — падумаў — згадзіўся і аддаў бычка на навуку салдатам, а сам вярнуўся дадому.

Мінуў год; пайшоў Язэп у горад па свайго быка. Дапытаўся салдатаў, каторым аддаў сваю жывёлу на навуку, прыходзе да іх і пытае:

— Ну, землячкі, як мой падласы? Чы добра навучыўся?

— Ах, каб ты ведаў, — кажуць яны, — якой бяды набраліся мы з ім! Спярша — як спярша: брыкаўся, тузаўся, бадаўся, — але неяк далі рады — угаманіўся; толькі, як прыйшло ўжо да самай навукі, то так стаў скора браць усё ў свой бычачы розум, што аж рогі паадпадалі, шэрсць выпаўзла, стаў хадзіць на дзвюх нагах, словам, зусім падабнюсенькі стаўся да чалавека, а які разумны, аж дзіва!

— Ну, я яму скора выганю гэты розум з галавы, — кажа Язэп,— толькі вядзіце мяне ў хлеў, дзе ён стаіць!

— Звар'яцеў ты, чалавеча, чы што? — кажуць салдаты,— праўда, чакаў ён цябе, але жыць болей з намі не захацеў: дагадзіць яму не маглі патрапіць, перабраўся ён цяпер на сваю кватэру і, чутно, папаў у вялікія чыноўнікі.

— Пакажыце тыкеля, — просіць Язэп, — дзе ён жыве, а я ўжо сам дам рады — нябось, пастронкі моцныя ўзяў.

Салдаты завялі Язэпа, паказалі дом, куды ісці, а самі ўцяклі. Язэп, убачыўшы на дварэ нейкага чалавека, пытае, дзе тут жыве бык?

— Не бык,— адказвае той,—а Быкаў; вунь у тыя дзверы ідзі.

Раскруціўшы пастронак і прыгатаваўшы пугу, смела Язэп адчыняе адны, другія дзверы і апынуўся ў вялікім пакоі, дзе ўбачыў абедаўшага за сталом пана.

— Табе чаго? — пытае той.

Язэп, падміргваючы адным вокам, зарагатаў і кажа:

— Іш ты, Падласы, які ласун! Нябось, не спазнаў гаспадара?

— Вон пайшоў! — крыкнуў пан, выскачыўшы з-за стала.

— Быську-быську, — стаў усцішваць Язэп разгневанага пана, але той рынуўся на яго з кулакамі.

Язэп, доўга не чакаючы, закінуў на пана пастронак, зацягнуў яго ды давай акладаць пугай...

Немаведама, чым бы гэта скончылася, каб не збеглі-ся на крык людзі і не абаранілі пана.

ПАДЛАСЕНЬКІ

Прыждаў Падласы сынка падласенькага, а з практыкі жыццёвай ведаў добра стары Падласы, што цяперашнім часам з бычачым розумам далёка не зайдзеш. Вось, параіўшыся са сваёй жонкай — Красуляй, надумаўся ён аддаць свайго сына ў навуку. Аддаць-то аддаць, ано чым заплаціць? Раіліся, раіліся — нічога. Падласы, як рупны бацька, і кажа: «Прадам хоць сваю скуру, абы толькі вучыўся сынок».

Выбраўся Падласы ў глаўны горад, да важнейшага разніка, дый кажа: «Купляй ты, скуралуп, маю скуру— за сабачыя грошы аддам, абы з сына свайго, бычаняці, зрабіць чалавека».

Стаў шчупаць скуралуп Падласаву скуру і пачаў яе, як і прыстала на добрага купца, ганіць: і лінялая яна, і вуграватая, і абмуляна шмат, усёй цаны — рубель. Артачыўся спачатку Падласы, бо ведаў добра, што разнік лжэць, і хоць, праўда, скура вельмі абмулена, але нашто тое — на юхтовыя боты хоць куды; аднак жа мусіў і на рубля прыстаць, бо скуралуп заверыў, што цяперашнім часам з бычаняці і за дзесятку зробіш чалавека, каторы пасля будзе браць вялікія грошы, і за іх, быкоў, заступіць, каб не так намулівалі ім скуру.

Старгаваўшы ледзь не задарма валовую скуру, разнік скамандаваў яму стаць задам да сцяны і, падрэзаўшы каля рагоў і ног скуру, залупіў яе на два бакі, прывязаў да прымацаваных у сцены гужоў дый кажа: «Ну, братка, панатужся дый вылазь». Напрогся Падласы і — хоць боль узяў — вылез аблуплены. Глянуўшы на апаўшую скуру, жаль ахапіў Падласага: успомніў ён, як гэтую рыжую на левым баку лапіну не раз лізала яго Красуля; успомніў, як на курчавую каля рагоў яго шарсціну ласа спаглядалі ялаўкі, але чаго не зробіш дзеля дзіцяці: абы чалавекам стаўся. Вярнуўся ў хлеў аблуплены да

чырвана Падласы. Гледзячы на яго, Красуля неяк не так мыкнула, але Падласы прынадзеяў яе — другая, кажа, нарасце скура — не бядуй; а тым часам сынка падласенькага аддалі ў добрыя навукі.

Мінуў год, другі, і шле ліст за лістом бычачы сын, каб прыслаў бацька больш падмогі, бо за дзесятку быком, піша, не будзеш, але і чалавекам не станеш. Замаркоціўся Падласы, бо, пашчупаўшы свае бакі, пераканаўся, што новая скура не расце. Рупны бацька давай нагаварваць жонку — Красульку: «Прадай, — кажа, — скуру, — сына чалавекам прычакаеш». — «Так-то так, — кажа Красуля, — для роднага сына і скуры не пашкадую, але хай прыедзе да нас, — глянем на яго, як ён на чалавека рыхтуецца». Добра. Паслалі ліст. Чакаюць дый чакаюць. Ажно адной начы, калі хлеў быў добра зачынены, нехта раз-другі стукнуў і, рохкаючы, пачаў ламаць вароты. Усхапіўся Падласы, расштурхаў Красулю, і адчынілі вароты... Глянулі і абамлелі: сын-то сын — і падласенькі, толькі морда свінячая, і не мычыць, а рохкаць стаў. Зараўлі з жалю Красуля і Падласы, але сынок скора іх усцешыў: «Гэта я, — кажа, — толькі так — да часу, а калі хочаце, каб саўсім стаўся чалавекам, то на навуку не адну, а тры скуры спусціце...»

РАБЫ

(Перароблена з каляды)

Нават і радзіўся не зусім так, як найбольш родзяцца, — прымерам у якім-колечы брудным кутку дый цэлай кучай; не, радзіўся, як і прыналежыць іхняму роду, у велізарных, аздобных мурах, на чыстай, як пярына, мяккай саломе і то адзін-адным.

Велізарная, тоўстая, сытая, паважная матка яшчэ і не адсаплася добра, калі ўжо першы піск дзіцяці ўстрывожыў увесь свінарнік.

Па ўсіх загародках, каторыя пароблены былі абапал доўгага калідора і дзе жылі то далейшая, то бліжэйшая радня або хоць і зусім чужыя, але таксама з важнейшага роду, — пайшоў вялікі неспакой.

Рохкнуў першым, высунуўшы з саломы лыч, стары рабы кнур; за ім адазваліся ў суседніх загародках кармнякі; адтуль рохканне перадавалася і шырылася далей і далей, — яшчэ момант — і ўзняўся такі гармідар, што, хоць гэта была самая поўнач, ачнуўся нават вартаўнік, каторы смачна хроп на бруднай тухлай саломе ў цеснай баковачцы, прыбудаванай да свінарніка. Падняўся Марцін, працёр кулакамі вочы, пацягнуўся і, нашчупаўшы на ляжанцы сернікі, запаліў ліхтарню, адчыніў дзверы на калідор і стаў абходзіць па чародзі ўсе загарадкі, падымаючы агонь уверх. Натрапіўшы нарэшце на прычыну трывогі — радзіны, затрымаўся Марцін, абвёў ліхтарняй усю загарадку, зважна прыглядаючыся дый мармочучы нешта сабе пад нос, сплюнуў, завярнуўся і пайшоў будзіць **аканома.**

Не рад, відаць, быў пан аканом а гэткай пары вылазіць з цёплай пасцелі; доўгі час круціў ён сваімі нашупыранымі, як у таракана, жоўтымі вусамі, але што ж ты зробіш: на тое служба! — устаў, апрануўся і пацягнуўся будзіць ахмістрыню *.

Падышоўшы пад акно, стаў спярша далікатна барабаніць па ім костачкай зложанага ў кручок пальца, пасля — ляпаць усёй пяцярнёй, урэшце, як пачаў пражыць кулаком у аконную раму, дык праз нейкія паўгадзінкі выпаўзла-такі з пярыны тоўстая, прысадзістая ахмістрыня і, даведаўшыся, у чым справа, валюхаючыся, як качка, пайшла ў пякарню, дзе сваімі пухлымі, чырвонымі кулакамі, як бач, падняла на ногі дзвёх дзевак — спадручніц сваіх, і гэтак грамадой сунуліся на месца важнага здарэння.

Віднець ужо пачынала, калі яшчэ агонь, мігочучы, пералятаў то з свінарніка ў пякарню, то з пякарні ў свінарнік; толькі днём, калі камісар * па дакладу аканома і ахмістрыні ўпісаў у кнігі, што гэткага то чысла, месяца і года ад такіх то бацькоў радзіўся рабы парсючок, ды занумараваў яго, — усе супакоіліся. Толькі дзеўкам праз нейкі яшчэ час трэба было насіць маладой матцы асобную, лепшую яду, ахмістрыні — выдаваць на гэты корм іншую прымешку, а Марціну — часцей змяняць падсцілку. Але ўскорасці ўсё наладзілася, і жыццё заплыло сваім звычаем.

Гадаваўся Рабы наўздзіў: і ў рост яго гнала і сыць брала непамерна; але бо, праўду кажучы, і яды яму было не набрацца: сваю мерку спітлюе дый пачынае сквірчэць — усё яму падбаўляй ды падбаўляй, а чаго ўжо сам не ўбярэ, дык хоць выверне з пасудзіны, абы другі не пажывіўся. Калі ж, бывала, выпушчалі свінскую моладзь на волю — крыху пабрыкаць, ніводзін, як Рабы, не вышукае так скора слабейшага месца ў паркане і, хоць сам таўстават, а такі праз невялічкую шчыліну і то выціснецца з выгану ды першы ўб'ецца ў шкоду; але, калі прыйдзе які страх, першы і драпане адтуль, — дык ані калок, ані пуга ні разу не дакрануліся да яго далікатнага цела! Забяруцца, бывала, свінні ў сажалку пакупацца, — усе павылазяць адтуль мурзатыя, укачаўшыся ў балота, а наш Рабы — хоць разам валяўся — выйдзе,

страханецца, дзе паскрабецца і зноў чысты, гладкі, быццам і не быў там.

Час у выгодзе скора ляціць. Мінуў год, зляцеў другі, і не агледзеўся наш Рабы, як разбухаўся ўжо так, што і з хлева вылазіць не хоча; сядзіць на адным месцы і дзень і ноч, сапе, храпе, лыпае заплыўшымі салам маленькімі сваімі вочкамі дый цяжка ўздыхае, гледзячы на яду: змёў бы, здаецца, усё, а як прыйдзецца — лізне раз, другі, і хоць ты што — не лезе!

Гневаўся цяпер Рабы і на падрастаючую моладзь — падсвінкаў: лётаюць, пішчаць, крычаць, дурэюць ліха ведае чаго! От, сядзелі б, як сядзіць ён — спакойна, важна, і не перашкаджалі б іншым драмаць. Злаваў Рабы і на непарадкі, якія час ад часу бывалі ў свінарніку: находзяць нейкія людзі — і то хоць бы свае, а то чужыя; цягаюцца па загарадках, турбуюць такіх, як ён — Рабы, важных свінней; падымаецца, разумеецца, на ўсю будыніну такі страшэнны гармідар, што ажно жутка слухаць. Але ўскорасці ўсё супакойвалася — супакойваўся і Рабы і толькі дзівіўся, нашто і каму патрэбны гэтыя здзекі.

Ажно прыйшлі ўрэшце гэтыя самыя людзі і да яго— Рабога; прыйшлі зараня — яшчэ прыцемна, з ліхтарняй, святло каторай так і рэзала заспаныя вочы парсюка.

Стаў рохкаць нездаволены Рабы і ўжо думаў падняцца з гнязда, каб ткі добра напудзіць няпрошаных гасцей, калі пачуў, як нейкі велізарны цяжар прываліў яго, а заднія абедзве нагі быццам ушчаміліся. Гэткай знявагі не мог сцярпець Рабы і толькі што хацеў разінуцца ды крыкнуць так, каб ажно ўсе браты пачулі яго крыўду, як тут жа нейкая пятля моцна сцягнула і заціснула яму лыч. Цяпер ён мог толькі ўжо сквірчэць; а тым часам цяжары валіліся на яго з усіх старон, прыдушвалі яго, выкручвалі яму ногі, цягнулі за вушы... і раптам пачуў Рабы, як нешта халоднае, слізкае ўпіваецца яму ў грудзі... Задрыжэў Рабы са страху, а пасля і ад страшэннага болю, бо тое, што спярша выдалася яму халодным, цяпер пякло ў

грудзях жывым агнём, ды разам бухнуў гэты агонь у галаву і разляцеўся па ўсім целе...

Што прыйдзецца расставацца калі-колечы з жыццём нават і свінскаму роду, аб гэтым Рабы чуў і ведаў, але аб смерці ніколі не думаў. «На гэта будзе часу, — пацяшаў сябе Рабы, — калі смерць стане падхадзіць». І вось цяпер зразумеў ён, што гэта смерць і не думала надыходзіць, а наляцела — наляцела так неўспадзеўкі, як толькі можа налятаць яна адна. І не аб гэтай смерці думаў ужо Рабы, бо ведаў добра, што яе ўсё роўна не міне: праз агнём праёжаны мозг віхрам пралятала ўсё мінулае яго жыццё. Стараўся Рабы ўспомніць, што зрабіў ён праз час гэтага жыцця добрага і благога. Благога? Ці ж ён каму зрабіў што благое? Не — гэтага не мог Рабы аб сабе сказаць. А добрага — што ж? — спяшаўся, слабеючы ўжо, успомніць бядак. Ага: праз усё сваё жыццё нікому благога нічога не зрабіў, ну і... смачна еў, смачна піў, смачна спаў. Ці ж мала яшчэ гэтага? І, з успакоіўшымся ўжо сумленнем, апошні раз захроп Рабенькі і... даўся.

ДАЧЭСНЫЯ

З добрым сваім старым знаёмым, каторы акуратна год у год з ласкі сваёй дзярэ з майго статка па адным старым баране і па двое маладых ягнятак падатку, сустрэціўся я нядаўна ў яловым гушчарку. Ён не быў галодны, а я — без стрэльбы — прычыны, як бачыце, важныя, дзеля чаго маглі мы разгутарыцца паміж сабой пасуседску.

Слова за словам, дабраліся і да жыцця суседа — воўчага. Праўду ці не казаў мне сусед — самі разбірайце.

Бадай, усе ўжо чулі (таксама — праўду ці не), што даўней воўк быў найлепшым хатнім прыяцелем і вартаўніком і ў ніякія зладзействы і здзірствы не ўдаваўся, ажно пакуль не трапіў да нейкай паганай скупой гаспадынькі на службу. Дакучыла, відаць, ёй карміць хлебам звера, і вось аднаго разу, калі воўк, пасучы цэлую раніцу гаспадарскую стадніну, прыбег на снеданне дахаты, ведзьма тая, мест хлеба цёплага, кінула яму горача напалены камень. З голаду, не разнюхаўшы добра, схапіў бедны ваўчок гарачы камень і так моцна апёкся, што і па сягонняшні дзень ляпа асталася чорнай. Вось з таго часу воўк з жалю і злосці кінуў сваю службу ў людзей.

Гэта старая гутарка, а цяпер паслухайце, што мой сусед баяў далей новага.

Адрокшыся службы, воўк пажаліўся сваім сябрукам. Папрабавалі тыя заступіцца за яго, але нічога не дабіліся. Пайшлі тады ваўкі грамадой з жальбай да цара свайго — ільва.

Леў, выслухаўшы справу, асудзіў так: «Лепш жывіце ў лесе, чым у такой хаце, дзе вам могуць здрадзіць, а як усё жывое без яды не можа абысціся, так і вы, не перабіраючы, што і чыё, хапайце і ешце; на прыпадак жа голаду дам вам даўгавечную карову, карміце і даглядайце яе толькі добра, а малака — яды хваце».

З таго часу сталі ваўкі жыць у лесе, займацца рабункам, а да таго — даіць сваю карову і дзяліцца малаком.

Але час ад часу паміж згоднай даўней воўчай сям'і пачаліся звадкі, завялося шальмоўства; харчаваць карову ўсім разам прыходзілася, а як падойдзе дзяліцьба малака, дык адзін так набухаецца яго, што чуць адпаўзе, а іншы зусім з пустым жыватом пасунецца.

Каб як зарадзіць процію гэткага ашуканства, склікалі ваўкі сход, на каторым прызналі: на кожны дзень назначыць чароднага ваўка, каторы б даглядаў карову і ўдой увесь ад яе забіраў сабе.

Цешыліся ваўкі з такога мудрахітрага свайго пастанаўлення, але не доўга. Кожны воўк, як толькі падойдзе яго чародны дзень, разважае сам сабе: на якое ліха мне карміць гэту карову, калі з гэтага харчу прыбудзе малака не столькі мне, колькі заўтрашняму чароднаму, хай жа сабе той і важдаецца з ёй, а я што выдаю — то і маё.

Як сталі гэтак даглядаць сваю кароўку дачэсныя гаспадары, дык, калі не пажывяцца дзе на старане баранчыкам ці так чым-колечы, зубамі ляскаць прыходзіцца.

Вось з таго часу і налажылі ваўкі падатак на людзей: з каго авечку, з каго цялё, парасё, гусака і г. д. Апрача таго, карову сваю ўсё ж такі даяць! Не толькі малако дачыста сцягнуць, але ціснуць, ажно пакуль да крыві не дабяруцца, дый апрача таго кожны гэткі дачэсны гаспадар няўзнак — ціхачом, а хоць кавалачак і лыткі з беднай жывёлы ўрве.

Гэткім парадкам з даўнейшага спакойнага звера стаўся цяпер несуградны * гад прагавіты — воўк.

ВАСІЛЬКІ

Васількі закрасавалі... Не, не закрасавалі!

Дзе ж ім цяпер красаваць? Холад. Зіма. Снег. Не закрасавалі васількі; гэта толькі перад вачамі маімі міганулі яны. Нават не перад вачамі, а так недзе: не то ў думках, не то ў душы ці сэрцы? Не ведаю дзе. Міганулі васількі: васількі ў жыце... неба, як васількі... як васількі, вочкі... міганулі васількі і... счэзлі!..

. . . . . .

У красе нашага жыцця мы любім, як красуюць васількі...

А калі паблекнуць васількі, паблекне неба, паблекне на душы, а на сэрцы ляжа холад; калі зямлю пакрые снег, а на тваю галаву быццам сыпне шоран *; калі маеш штодзённы цёмны, горкі хлеб, — тады толькі ўспомніш, што гэта — ад васількоў, ад іх красы, бо... адкрасавалі васількі...

РАНЫ

Памяці С. Палуяна

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — гояцца, і па іх знаку няма. Большыя — гояцца, але па іх астаюцца рубцы.

Гэтак на целе.

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — гояцца; па іх астаюцца рубцы. Большыя — заўсёды крывавяцца.

Гэтак на сэрцы.

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — заўсёды крывавяцца. Большыя — залечвае толькі... смерць.

Гэтак на душы.

ЖЫВЫ НЯБОЖЧЫК

Колькі гадоў мінула з таго часу — не ўспомню. І цяпер, і тады валасы мае былі белыя... толькі цяпер яны белыя, як той на згон зімы брудны, прырыжэўшы снег, а тады яны былі белыя, як добра вытрапаны лён. Вочы мае цяпер, як тая вада вапенная; тады былі, як васількі ў жыце. Так мне і прозвішча далі — Васілёк. (Хрышчонае імя маё — Максім.) Паненка мяне так празвала — Васільком... Добрая была паненка. Бывала, як толькі ўгледзе, што нябожчык татка мой, адкінуўшы полы бравэркі, хопіцца за паясніцу, каб адперазаць дзягу, дык зараз яна — паненка — цап мяне за руку ды набок, да сябе прыцягне. «Не бі, — кажа, — Мацей (бацьку майго Мацеем звалі), не бі! Малы ён, хударлявы—каго тут біць?!» І бацька слухаў яе. Паненка, не ведаю за што, любіла мяне. «Вучыся, — бывала, кажа, — Васілёк, вучыся — пад старасць, як знойдзеш». Вучыла яна мяне чытаць і пісаць; страху да яе ніякага не меў, а не раз і з бядой сваёй дзяліўся — бо маткі маёй ужо не было на гэтым свеце.

Гэтак ішлі гады за гадамі. З смаркача выцягнуўся я ўжо на ладнага дзецюка; чытаў — як рэпу грыз; як напішу — хоць хто прачытае, і шмат ужо пацехі з мяне меў мой бацька: памагу ў гаспадарцы (бацька мой вёў усю панскую гаспадарку), і дагледжу, і запішу.

Але... зрабілася нешта такое, чаго ніхто з нас не мог зразумець. Адной цёмнай ночкі разбудзіў мяне татка і кажа: «Расчухайся, Максім, і добра слухай, што я табе буду казаць: ты ўжо, дзякаваць богу, не маленькі, да гаспадаркі прылажыўся, парадкі тутэйшыя добра ведаеш, дык от што запамятай сабе добра: пан, паніч, Змітрок і я зараз едзем... куды — не пытайся і сам языка не распушчай! Глядзі, пакуль хаця адзін з нас каторы не вернецца сюды, — пільнуй і слухай паненкі, пільнуй двара

і гаспадаркі, пільнуй і глядзі панскага ўсяго дабра; чаго сам ведаць не будзеш — райся старога Тадора, — ён не здрадзе; глядзі на ўсё і пільнуй, як стары сабака будкі! Не паслухаеш бацькаўскага слова — вярнуся, — не пагляджу на твой мох пад носам, — дзве скуры спушчу... не вярнуся — з таго свету пракляну!..»

Бацька, сказаўшы гэта, глыбока ўздыхнуў, быццам пасля цяжкай работы; слёзы заблішчалі ў яго вачах; ён адвярнуўся ад мяне.

— Будзь здароў, сынку, — шапнуў ужо на парозе. — Няхай пан Езус мае над табой апеку. — Сказаў і выйшаў з хаты.

Я так спужаўся, што забыўся і языка: стаю, трасуся, нейкі жаль сціснуў сэрца. А слёзы так і падплываюць да вачэй...

З таго часу не відзеў болей я бацькі свайго: прыйшлі весці, што недзе галаву злажыў сваю разам з панам і маладым панічом. Змітрок таксама прапаў без весці.

Я і Тодар так і асталіся жыць у двары пры паненцы.

Шлі гады за гадамі... Ужо і ў паненчыных валасах заблішчала серабро. Дзеля мяне — жыццё было добрае: уся гаспадарка была на маіх руках і добра ручыла; пенсію браў добрую; яды — па вушы і пашанаванне меў. Не раз, бывала, паненка на гарбату, на вячэру клікне да сябе: сядзем, гаворым, раімся, а на астатак пад час доўгіх зімовых вечароў і ў карты — у дурня паіграем. Любіла паненка гэтага дурня, і не раз смеху мелі з яго — аж бакі ўрывалі.

Былі дзве дзяўчыны пры пакоях: Параска і Тэкля. Сядзем мы ў дурня гуляць з паненкай, а яна кліча гэтых дзяўчат і кажа: «Ну, Васілёк, калі ты прайграеш — то будзе дурань Тэклі, калі я — Параскі». Пачынаем гуляць, а дзяўчаты, вылупіўшы вочы, пільнуюць, каторая дурня возьме. Прайграю я — ну, кажу, Тэкля, узяла ты вялікага дурня! Прайграе паненка — ну, кажа, Парасачка, ты дурань!.. Перш ціха, пасля лічаць, каторая больш

набрала дурняў; а пасля ўжо і сварка ў іх (а мы аж кіснем са смеху), потым бачым і слёзы, і давай яны нас прасіць, каб іграць кінулі, бо надта шмат дурняў набраліся!

Вось гэтак жылі мы... Меж працы і клопатаў мелі часам і смеху і жартаў трохі. Толькі гэта аднаго дня пад вечар прылятае, як шалёная, да мяне Тэкля ды як загалосе: «Па дохтара! Па дохтара! Паненка памірае!!»

Як я даставіў гэтага доктара — не помню... Шмат я іх пасля гэтага перацягаў, але, дай божа ім доўгі век, з таго свету вярнулі паненку... Але якую? — і не пазнаць! Ані яна складна што скажа, ані ў яе памяці, ані якой рупнасці да гаспадаркі... адна толькі ахвота асталася да дурня ў карты, і то без усялякіх даўнейшых жартаў... от толькі мы ўдваёх. І то—ігра, каб ігра, а то жалься божа! Нічога не помніць, толькі кідае картамі! Іншы раз у рабочы час пасылае па мяне ісці гуляць у карты. Як тут не паслухаць? Але бачу я, што ад гэтых гульняў гаспадарка пачынае кульгаць... Я і так, і сяк прабаваў выкручвацца — нічога не памагае! Так мне гэта надаела, што і сказаць не патраплю!

Добра не скажу, на каторым гаду паненчынай хваробы, у самую пятроўку, калі грукала і бліскала на небе, а на пожні сена, як шафран пахучае, раніцай разбілі, — прысылае паненка па мяне, каб зараз ішоў у дурня гуляць.

Не сцярпеў — грэшны я чалавек — узлаваўся. «Досыць,— кажу,— мяне дурнем рабіць! Не мая гаспадарка, а чужая! Здаць мне яе трэба — каб людзі не смяяліся,— не пайду! Скажы, што мяне не знайшоў».

— Паненка ўсю дворню пагоне шукаць,— кажа зафрасаваны * пасланец.

— Калі так, то скажы, што я памёр! — са злосці крыкнуў я.

Спацелы, зморaны, сярдзіты — бо шмат сена не ўхапілі і разбітае замокла — вярнуўся дадому і толькі стаў

запісваць у кнігу работнікаў, як прыбягае Параска з крыкам: «Паненка ідзе тваё цела наведаць!» — «Што брэшаш?» — вылупіўшы вочы, пытаю. «Даліпан ідзе! Гэты дурны Апанас сказаў ёй, што ты памёр, і што мы ні наўгаварвалі — нікога не слухае: усіх гоне ад сябе...»

Што тут рабіць, думаю... злосць яшчэ горшая схапіла мяне: раз з гэтым скончыць! Выправіў Параску, высунуў сярод хаты тапчан, заслаў яго гунькай *, палажыў падушку і лёг, выцягнуўшыся, а сам з-пад вока паглядаю, што будзе.

Праўда: уходзе паненка сама адна; глянула на мяне, уздыхнула цяжка, на калены стала, перажагналася і давай пацеры гаварыць:

— За душачку змарлую... За душачку змарлую... — Забылася, відаць, як завуся, бо ўсё прамеж сябе шэпча: «Як жа яго? Як жа яго?»

А я з тапчана падказваю: «Васілёк...» — «Не... не... не Васілёк... — забыўшыся, што з нябожчыкам спор вядзе, кажа паненка. — Гэта дзеля мяне ён Васілёк, а дзеля бога іначай... не ўспомню... але не Васілёк...»

— Максім, — ізноў падказваю з тапчана.

— Ага, ага, Максім, Максім, — узрадавалася паненка ды ізноў:—За душачку змарлую Максіма анёл панскі...— ды давай усе гэтыя пацеры адпраўляць...

І стыдна, і жутка мне неяк зрабілася, але і прыдумаць не магу, як з бяды вылезці! Устаць? — горш будзе: спужаць магу... Жутка, але то так жутка стала, што здалося, і напраўду ўжо я нябожчык, і першай прыйшла наведаць мяне тая, з каторай век свой пражыў і ад каторай век свой крыўды не зазнаў... Не то што жутка, але чую ўжо, як рукі і ногі халадзеюць, як бы паміраю... Тым часам паненка ўстала, перажагналася, падышла яшчэ бліжэй да мяне, пацалавала ў мой мокры ад поту, халодны лоб... «Хутка спаткаемся, Васілёчак»,—шапнула і... ціханька— на цыпачках — выйшла...

. . . . . .

Не злез, а зваліўся я з тапчана... толькі гэта і помню.

. . . . . .

Сонца высока ўжо ўзнялося, калі я прачнуўся і аж спужаўся, успомніўшы, што сена разбітае на пожні засталося; хацеў усхапіцца — куды там! Ані павярнуся... На шчасце, Тодар увайшоў... Я да яго: «Братка, родненькі, скажы, што са мной — устаць не магу — памажы... там сена разбітае счарнее...»—«Добра, добра,—кажа,—от з'еш перш, што я прынёс, ды выпі, тады аб сене пагамонім...»

. . . . . .

Ледзь на пяты дзень, калі ўжо я мог сядзець на ложку, даведаўся аб сене: звезлі яго... тры тыдні таму назад, а я праляжаў чатыры тыдні без памяці ў гарачцы...

Паненка? Паненку ў дзесяць дзён, як прыходзіла па мне — нябожчыку — пацеры гаварыць, адвезлі... на могілкі!..

Бедная, бедная мая ты панначка! Можа, там табе няма з кім і ў карты паіграць?..

Вечны табе пакой!

А я — нябожчык — жыву ды жыву...

З таго часу ўжо не Васільком сталі мяне клікаць, а жывым нябожчыкам...

ЧОРТАВА ЛАСКА

На ўсю нашу вёску (а вёска — хат 60) не было набажнейшага чалавека за Пранука Агорчыка. Ніводнага свята, бывала, не прапусце, каб не схадзіў богу памаліцца; да споведзі не то што раз — а разы два-тры ў год дападзе; кут хатні — увесь абразамі залеплен; а што лаянкі, дык хоць бы як там яму дапякло,— ніколі ніякай ад яго не пачуеш! Аж дзіва, бо вядома: у нашай прастаце без чорта, паралюша ці яшчэ там як — абысціся трудна. Шапталі людзі, што наш Пранук не заўсягды гэтакі быў: слова, бывала, не скажа, каб брыдка не вылаяцца; але як і што там гэтак яго перарабіла—ніхто добра не ведаў. Маўчаў і я, бо абяцаўся да пары маўчаць,— але цяпер, калі ўжо пад зямлёй ляжыць Агорчык,— раскажу.

У цёплую, відную летнюю ночку паехалі мы аднаго разу з Прануком на начлег. Ніхто больш не прыехаў да нас,— спаць не было як класціся, дык сталі то аб тым, то аб сім гутарыць.

— Дзядзенька,— пытаю, што гэта пра цябе людзі выдумляюць?

— На тоє людзі,— махнуўшы рукой, кажа Пранук.

— Раскажы, дзядзенька! — стаў я прыставаць.— Родненькі, я нікому не скажу!— ды ў адну руку цмок, у другую...

— Ну, добра ўжо, добра, раздабрухаўшыся, кажа стары.— Ідзі толькі коні перавяжы.

Скокнуў я, агнём справіўся, прыбег, прысеў каля Пранука і аж трасуся з цікавасці. А ён пачаў баяць.

— Быў я тады, як гэта зрабілася, за лесніка і жыў на адзіноце каля Чорнай Лужы. Жанаты ўжо быў і двое дзетак меў. Любіў сваю Агату так, як вы цяпер і не патрапіце; а дзетак? — прападаў за імі! Жылося нішто. Дабытак меў: і свінку, і авечкі, і каня, тры каровы...

Надумалі мы з жонкай каня прагандляваць: ціхават быў і дыхавіца прычапілася. Даў я такога-сякога зелля, каб не было знаку дыхавіцы, і павёў на кірмаш; там каню ўліў яшчэ кручкі са два гарэлкі, каб развейшы быў, і паставіў на рынак. Як слова сказаць, падбягае да майго каня нейкі чорны, хударлявы, малады яшчэ хлопец, чыста ў крамнае адзеты. Паглядзеў на каня, на мяне і пытае: «Колькі хочаш?» — «Пяцьдзесят», — кажу (а яму ўсёй цаны 30!) — «А шустры?» — ізноў пытаецца. «Як вецер!» — кажу. Ускочыў ён на каня, праехаўся (а конь, ведама, ап'янеўшы — ірвецца на ўсе бакі), пад'ехаў да мяне ды ізноў: «Браку ніякага няма?» — «Які брак? — кажу. — Няма!» — «Можа, уступіш хоць на барыш?» — пытае. «Не хачу, — кажу, — ні барыша і ўступаць не думаю». Так ён, не злазячы з каня, зараз шасць у кішэнь, дастаў грошы, адлічыў 50 рублёў, даў мне, зарагатаў, па кані сцебануў і прапаў...

Стаю, як дурны, і сам сабе не веру: за гэтакую падлу 50 рублёў! Вар'ят, думаю, нейкі — і пайшоў шукаць сабе каня. Прайшоў раз, другі рынак, бачу: стаіць чорны жарэбчык; падышоў, абгледзеў — аж вока рве: сыт, складзен, малады... «Можна папрабаваць?» — пытаю. «Чаму не,— кажа прадавец,— толькі чы ўседзіш?» «Э-э, дам рады», — думаю і, ускочыўшы на каня, пакаціў. Ну, хлопча, і конь жа быў: агонь, а не конь! Вярнуўся; торг у торг — перабіваю руку на 75 рублёў. Дастаю грошы плаціць... «Пачакай,— кажа прадавец,— конь не мой; гаспадар прыйдзе — яму і заплаціш, а то гатоў не паверыць». Аж якраз падбягае той самы чорны... Ну, думаю, можа, агледзеўся — будзе бяда! Тут ён да мяне: «Купіў майго коніка?» — «Купіў», — кажу. — «Маладзец! Але я не такі скупы, — кажа, — як ты: ідзём у карчму на барыш, там і заплаціш».—«Пайшлі». Чаго мы там не пілі?! І гарэлку, і піва, і віно,— і за ўсё ён сам плаце. «Ну,— кажа нарэшце, узяўшы за каня грошы,— годзе піць! Дзякую табе за кампанію і дзякую за коніка: заслугу,

вялікую заслугу будзеш мець...» — «Перад кім?» — здзівіўшыся, пытаю. «Перад чортам! — кажа. — Прадаў ты каня за здаровага, а ён і дыхавічны, і выпіць кручок, другі можа, — такіх мне і трэба! Удружыў ты мне! Так слухай жа: ласку за ласку: чаго толькі зажадаеш да дзевяці разоў, — помні — не больш дзевяці, — скажы: зараз тое споўніцца...» — «Згінь ты, прападзі, нячыстая сіла!— крыкнуў я,— чаго ты да мяне прычапіўся?!.» Зарагатала нешта... «Гэта раз!» — толькі пачуў я; гляджу — нікога няма!

Кепска, думаю я; скарэй на воз; як па кані, так па кані, і не агледзеўся, калі да хаты прыляцеў, ды скарэй да жонкі: так і так, кажу, прыгода якая выйшла. «Дурань ты, — кажа Агата, — выпіў цераз меру; але маладзец, што каня добрага выгандляваў; кладзіся спаць!» Злосць нейкая мяне ўзяла, а і барыш разабраў: давай я крычаць: спаць?! выпіў многа?! Лжэш!! Капейкі на гарэлку не страціў — па грошах глянь! Нашто плаціць за гарэлку? Крыкну толькі: давай, чорт, гарэлкі! — і будзе гарэлка зараз!.. Але гарэлка на стале не паказвалася, і жонка стала кпіць з мяне. Аж тут убягае ў хату старшы сынок і пытае мяне: «Тата, тата, чы гарэлку сюды несці?» — «Якую гарэлку?» — пытаю, вылупіўшы вочы. «Я ў драбінцы шукаў абаранкаў, — адказвае, — а знайшоў чатыры пляшкі гарэлкі». Здзівіўся я, бо помню, што не купляў. Збялела і жонка: «Можа, хто памыліўшыся ўлажыў пляшкі не ў свой воз? — кажа, гледзячы на мяне.— А можа, і праўда тут што нячыстае — цераз лад ужо з коньмі пашэнціла!.. Засні, Пранук, крыху; як схаладае, каровы выпусці, а я з'езджу з дзяцьмі да таткі: ён стары — хітры, — можа, што параіць». — «Едзь», — кажу.

Астаўшыся адзін, стаў я думаць: а ну ж і праўда, што ўсякае жаданне маё споўніцца? Дзевяць жаданняў! Праўда, два ўжо прапалі: чорта гэнага з карчмы выгнаў і гарэлкі набраў: але яшчэ сем! Чаго ж, думаю, зажадаць? Зямелькі бы? Бо хоць у вёсцы і ёсць траціна, дык

што ж гэта значыць? Валоку, дзве, а то і ўсе пяць! Будынкі мураваныя... Немаведама толькі, раздумляю, чы на кожны будынак пойдзе па аднаму жаданню, чы адно — на ўсе? А коні, коні! Якіх і ў пана няма — буду мець!.. Скаціну, свінней, зярна, — а грошы, грошы!.. Гэтую самую пустош, чуў, прадае пан; от адкупіць бы!.. Дай, думаю, прайдуся, пагляджу, як граніцу правясці, дзе запусціць, дзе ўздзерці, бо ўжо калі карыстаць з чортавай ласкі, дык карыстаць!..

Толькі гэта выйшаў я, гляджу: куры ў пшаніцы, свіння ў бульбе, авечкі найлепшы мурог дратуюць! От, думаю, бабскі дагляд! Узлаваўся, забыўся ўжо аб сваіх думках, хапіў нейкі сук ды, ціханька ззаду падкраўшыся, хлясь свінню па спіне (а свіння вялізная — пудоў 12, ды на апарасенні). Тая са страху не па сухапуцці, а цераз трасучую балоціну сморг—уцякаць! Але куды там— гэтакая туша! Як віш і асела, храпе, сапе ды ваду ўсё цямкае... Я і за вушы, я і за хвост, а яна ўсё глыбей едзе... Бачу: адзін не дам рады; можа, думаю, як дам ёй спакой, сама як выберацца. «Чорт цябе бяры, тапіся!»— крыкнуў я і бягу да авечак; па дарозе закруціў сукам над галавой ды пусціў ім у пшаніцу па курах. «Каб вас ястраб гэтак дзёр, як вы маю пшанічку дзерыцё!»—кажу і бягу далей. Авечкі, згледзеўшы мяне, ходу пад лес на дзірван! «Ну, і воўк вас зарэж! — закрычаў я. — Там шкоды не зробіце!..» Гляджу: як добрыя падцёлкі, выскачылі два ваўкі, занялі авечкі і гоняць іх перад сабой у гушчар! «Ага — цю! Ага — цю!» — нарабіў я гвалту, а яны і не зважаюць: гоняць! Я назад — ляту, як мага, да хаты па стрэльбу. Ажно бачу: на мяжы каля пшаніцы дзярэ ястраб кур, толькі пер'я ўгару ляцяць, а на балоціне свіння ўжо і сапці перастала, — толькі спіна відаць... Уляцеў я ў хату, схапіў з калка стрэльбу ды ў ногі, а тут калі трэснуся аб вушак лбом! — толькі ў вушах зазвінела. «Няхай цябе агонь!» — застагнаў я і паляцеў авечак бараніць. Дабягаю да лесу — чую: тра-

нчыць нешта. Аглянуўся: гвалт! Хата гарыць! Кідаю стрэльбу аб зямлю, дзяру ва ўсе лапаткі кароў выганяць, бо хлеў пры самай хаце! Але куды там! Раве скаціна, аж на сцену лезе, а з хлева ані руш! Тузаўся я, тузаўся — хоць вас няхай павыцягваюць! — зароў я сам нема ды кінуўся цягаць з хаты, што папала... Каб хоць жонка ды дзеці дома былі: памаглі б... А тут і бэлькі трашчаць сталі... «Згіньце, прападзіце вы ўсе разам!» — як шалёны, крыкнуў я, выскачыў з хаты ды ізноў у хлеў. Аж тут пасярод яго ляжаць мае кароўкі: вочы вылупіла, языкі павыпірала!.. Як непрытомны выскачыў на двор ды давай у адзін голас выць: «Гвалт! Ратуйце! Гвалт! Ратуйце! Гвалт!..» — аж пакуль не ахрып, не асунуўся, не абамлеў...

Як праз сон стаў я разбіраць, што тут парабілася, ды як успомніў,— аж валасы дыбам сталі!! Гэта ж я сам усяму вінават! Сам! Гэта ж мае жаданні споўніліся!.. Гэта тая чортава ласка! Ласка чортава!! «Дзевяць жаданняў, казаў — дзевяць!»

А колькі споўнілася? Стаў лічыць спачатку: чорта прагнаў, гарэлкі ўзяў, перавёў куры, свінню, авечак, кароў, хату спаліў і жонку з дзецьмі запрапасціў, — значыць, восем! Добрыя жаданні — няма чаго казаць! Скарыстаў! От дурань, от дурань! — стаў я сам сябе лаяць... Ну, але яшчэ адно — дзевятае жаданне асталося! Каб тут не прамахнуцца... Чаго жадаць? Грошы! Што найбольш грошы! Усё адаб'ю!.. Але тут успомніў жонку з дзеткамі... Як жа з імі будзе? Іх за грошы не выкупіш!.. Такая схапіла мяне жаласць, што і сказаць не магу... Давай прасіцца: «Чарточак, міленькі, даражэнькі! Аддай жонку, дзетак, скаціну!..» Не, думаю, так нічога: жаданне адно мусіць было, а тут іх шмат набярэцца... Круціў я мазгамі, круціў, аж злосць забрала, ды як крыкну:

— Чорт лазаты! Аддай усё, што забраў у мяне! Аддай, рагаты, не то і рогі табе павыкручваю! Усё, што забраў,— гэта дзевятае і апошняе маё жаданне!..

«...Пранук, Пранук! Расчухайся — устань, жарабца няма!..» Усхапіўся я, разглядаюся, як непрытомны, — бачу: жонка нада мной стаіць; хата цэлая; дзеткі, увесь дабытак на месцы — усё, як было, толькі, значыцца, жарабца не хватае. І ведаеш, хлопча: што нашукаліся, — як у ваду ўпаў!

Чорт чортам! Праўда, слова здзяржаў: дзевяць жаданняў маіх споўнілася, але аб жарабцу гутаркі не было, і чы я, чы чорт у гэтым дзеле вінават — сам добра не разбяру. Вось з чаго лаянку кінуў.

ДУБ-ДЗЯДУЛЯ

Амаль не ўся вёска зайздросціла мне майго надзелу. Шнур быў, праўду кажучы, ані большы, ані выгаднейшы, ані зямліца на ім не лепшая, — можа, нават горшая, — бо пры канцы шнура была страшэнная гара, дзе апроч грэчкі ды ярыцы нічога не радзіла, але на самым версе гэтай гары рос такі дуб, што аж дзівіўся народ: веліч, таўсціня, а сукі так разрасліся, што, здавалася, свет бы пад сябе хацеў падгарнуць.

З давён-даўна ўсе звалі яго: Дуб-Дзядуля.

Дык вот паслухайце, што мне пад гэтым дубам здарылася.

Раз улетку, ад цёмнага напрацаваўшыся, што аж пот з мяне цурком каціў, губы пасмяглі, босыя ногі да крыві патрэскаліся, — зацягнуўся я неяк на гару да свайго дзядулі аддыхнуць у яго цяні. Толькі прылажыўся гэта я, уздыхнуў раз, другі і пачынаю драмаць... Ажно чую: не то над галавой, не то пад галавой нехта таксама два разы ўздыхнуў... Стаў я прыслухвацца: яшчэ і яшчэ ўздыхае, але так цяжка ўздыхае, што аж за сэрца бярэ, немаль * стогне... Перажагнацца хачу — рукі падняць не магу!.. Струхлеў я — ляжу, чакаю, што будзе. Аж тут нехта ў вуха маё шэпча:

— Не бойся, не пужайся, дзіцятка ты маё, не пужайся: я гэтак дышу, я гэтак уздыхаю, я — твой дубочак старэнькі...

— Божа моцны! Што ты, дзядулька, як жа гэта можа быць, каб дрэва ўздыхала ды гаварыла? — пытаю ўжо смялей.

— Эх, дзіцятка, дзіцятка, — ізноў шэпча мне на вуха, — шмат чаго ты яшчэ не ведаеш, шмат чаго не разумееш, але люблю я цябе, шчыра люблю, як любіў тваіх бацькоў, дзядоў ды прадзедаў, бо не зазнаў ніколі крыўды ад вас, а толькі векі пашанасць меў... Пара прыхо-

дзіць, дзіцятка ты маё, пара прыходзіць сказаць, адкрыць табе такое, чаго нікому яшчэ не гаварыў... Але пакляніся, што споўніш маё апошняе жаданне!

— Клянуся, дзядулька, клянуся, родненькі, споўню, усё споўню, — ізноў, дрыжучы ўвесь, адказваю.

— Слухай жа! — кажа Дуб-Дзядуля. — Адкуль я тут узяўся і калі радзіўся, — ніхто, дый я сам добра не ведаю. Помню толькі — з малалецтва жылося нішто, суседства шмат меў: сваёй радні — цэлыя ваколіцы, — хлапцы адзін у адзін — дужыя, здаровыя; а тут да кампаніі зграбныя елачкі, хоць сварлівыя, але сэрца добрага — сасонкі. Міргнеш ім, бывала, жалудком, а яны табе шышкай у бок... А асінкі-пашаптушкі? Кіўні толькі ёй галінай (бо дубу не след кланяцца асіне!), а яна, як тая сарамлівая панначка, затрасецца ўся і лісточкамі цябе абсыпе... От, ведама, забаўляліся, як умелі... Але што гэта ўспамінаць? Ляцелі годы, як вашы ляцяць дні,— змяняліся вякі, як вашы годы, — а я стаяў і рос, рос і стаяў — крапчэў... Зрываліся не раз буры,— як пад тапаром, шмат нашых клалася, але тыя, што аставаліся,— яшчэ вышэй падымаліся; находзілі навальніцы — гінулі тыя, што ў неба глядзелі, а знізу падымалася маладзёж; наляталі ветры, наганялі свежага насення, і ўзрасталі суседзі невядомыя, незнаёмыя... Так вякі ішлі, аж мінула ўсё, — аж прыйшло і на тое, што з тутэйшых — даўнейшых астаўся, як відзіш, адзін я. Праўда, ось глянь на захад: бачыш цёмную паласу? Але што гэта за лес? Хударлявы, крывы, увесь у суках — гніль нейкая, дый толькі. Глянь на ўсход — прыслухайся да шуму гэнага лесу... Чуў ты калі шум здаровага, крэпкага дрэва? Не, не! Не гэтак шуміць здаровы лес! А чаму ён так шуміць? Бо змарыўся, ніколі перадышкі не мае, гэтак і згінуць мусіць... Паглядзі на поўнач: чы бачыў ты калі такое дзіва? Такі гонкі, такі крэпкі здалёку выдае лес, а ўважай, як яго гайдае ва ўсе бакі: то да зямлі прыгне, то крыху адпусце, — здаецца, і вецер невялікі, а пень выпрастац-

ца не можа... Цяпер глянь на мяне: пастухі бок асмалілі, людзі кару аскраблі, колькі-то сукоў павыразалі? Лісты, жалуды — і тыя штогод падбіраюць; усё, каб толькі сабе карысць мець; а чы падумалі, што стары ўжо я, пакалечаны, веку дажываю, а ніводзін жалудок мой не ўзрос... Сохну ўжо я. Каб хоць два, каб хоць год далі вы мне засілку — вадзіцы чыстай, здаровай, — можа б, вам памятку пакінуў: новае пакаленне... Прысягнуў ты, дзіцятка, — дык дабудзь жа ты мне цяпер гэтакай вадзіцы, пашукай, прынясі, карэньчыкі мае бедныя падлі...

— Добра, — кажу,— дзядулька, добра — будзь спакоен: дастану, прынясу — хіба згіну!..

Бег я, замарыўся — ужо і самаму піць зажадалася. Цямнець стала, а — вады як не відаць, так не відаць. Бачу: нейкая кабеціна — старэнькая, худзенькая — прыгаршчамі зямлю носіць.

— Чы не ведаеш, бабулька, дзе тут блізка вады дастаць? — пытаю.

— Хадзі за мной, сыночак, пакажу табе цэлае возера.

Уцешыўся я. Пайшлі; па дарозе пытаю:

— Адкуль ты, бабулька, і як завешся?

— Тутэйшая, — кажа, — а завуся Праца, сынок, Праца.

Дзіўнае, думаю, прозвішча. Прыйшлі да возера — вялікае, што вокам не сцягнеш, і хоць вада мутная, брудная, — кінуўся я піць. Хлебануў раз — што гэта? Вада— не вада, хоць смак і знаны. Ага, успомніў я, як напрацуешся ды пот цякучы па брудным твары пападзе ў рот,— от, якраз гэтакі смак! Пытаю бабульку.

— Праўда, сынку, праўда: пот. Паўнюсенькае возера людскога поту...

— А нашто ж ты зямлю прыгаршчамі носіш ды кідаеш у гэтае возера? — пытаю.

— Глыбокае яно бясконца, а трэба, каб заўсёды было поўнае; дык вось, як засыплю яго зямліцай, тады і поту мала трэба будзе людзям ліць.

Здзівіўся я, але не было калі распытвацца, і пабег далей. Бег я, бег — бачу ізноў возера — больш за першае, але вадзіца ў ім такая чыстая, што аж свеціцца. Прыпаў я. хлебануў — горкая, але то такая горкая, што піць нельга! Прыйшло мне на памяць, як аднаго году апошнюю скацінку з хлева вывелі... Скацілася тады слязінка і ў рот мне папала... от, якраз гэтакі смак! Бачу, старушка нада мной стаіць.

— Хто ты? — пытаю.

— Бяда, сынку, Бяда. Не пі, сыночку, гэтай вадзіцы, не пі: досі ты яе ўжо напіўся...

— А што ж ты тут робіш? — пытаю.

— Глянь, унь, на катлы вялікія, пад імі заўсягды агонь гарыць. Дзень і ноч наліваю я ў іх з гэтага возера поўна слёз людскіх і грэю, каб высахлі, аж пакуль усё гэта возера не высушу, аж пакуль пара ад іх не падымецца аж да неба!..

Здзівіўся я, але памчаў далей. Спатыкаю ізноў старэнькую кабеціну, — палівае яна зямлю з конаўкі.

— Дай, бабулька, напіцца, — прашу яе.

— Ідзі, — кажа, — да возера.

Падбягаю — бачу: поўнае яно не вады, але віна чырвонага... Прыпаў, хлебануў...

— Божа! — крыкнуў я са страху. — Помню, помню гэтае віно: у губах яго было поўна, — вочы ім заліты... помню яго! Але ж гэта не віно, але кроў! Людская кроў!

— Праўда, — кажа старушка, стоячы нада мной, — праўда, сыночку, людская гэта кроў, і вось мушу ўсё гэта возера конаўкай вынесці і ўсю зямліцу паліць!..

— Хто ж ты? — пытаю.

— Цярпенне, — ціхенька адказала бабулька.

Без аглядкі кінуўся я ад гэтага страшэннага месца. Чую: у старане недзе бурчыць, пераліваецца, бяжыць, нібы, скажаш, ручаёчак жывенькай вадзіцы. Я туды шукаць, аж тут калі блісне, трэсне, заляскае, — здалося, увесь свет задрыжаў!..

. . . . . .

Усхапіўся я, вочы праціраю, не магу да сябе прыйсці... Не чуў я, як бура найшла, як перуны сталі біць, пакуль не дабраліся да майго дзядулі, пад каторым я так моцна спаў... Працёр вочы, сон свой страшны ўспомніў, закалаціўся ўвесь, зуб на зуб не пападае... Гляджу: дзядулька мой бедненькі ляжыць ціхенька на баку...

З таго часу прайшло некалькі год. Ляжыць дзядуля на сваім месцы (сукі толькі паабразалі), а з-пад яго вылезлі тры, хоць яшчэ цененькія, але гладкія, роўныя дубочкі...

4. Зак. 182

ЧАЛАВЕК

І прыйшоў чалавек да Бога свайго і кажа:

— Божа! Забяры ад мяне Бяду, Слязу і Хваробу, а дай мне Волю, Шчасце і Здароўе.

Бог і кажа:

— Добра, чалавеча, будзе так, як ты жадаеш.

І стаў жыць чалавек без Бяды, без Слязы, без Хваробы, а — вольны, шчаслівы і здаровы. Ажно прыходзе Смерць і кажа:

— Чалавеча, паміраць пара.

Чалавек, калі жыў з Бядой, Слязой і Хваробай, не раз сам жадаў і рад быў са Смерці, але цяпер жаль яму стала жыцця.

І пайшоў чалавек да Бога свайго і кажа:

— Нашто ты, Божа, хочаш адбіраць у мяне тое, што сам дараваў? Забяры ад мяне Смерць.

Бог і кажа:

— Добра, чалавеча, будзе так, як ты жадаеш.

Ішлі вякі, ляцеў час.

І прыходзе чалавек да Бога свайго і кажа:

— Божа, усё я зведаў, усяго зазнаў, адна толькі рэч нязнаная мне асталася.

Бог і кажа:

— Чаго ж ты, чалавеча, хочаш?

— Смерці, — адказвае чалавек.

І Бог даў чалавеку Смерць.

З БАЛЬНІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

Змяркалася. Візглівы вецер, як бы з вялікае злосці, ірваў апошнія з дрэў кляновых крывава-жоўтыя лісты, круціў іх у паветры, кідаў аб мокрую брудную зямлю, ганяў з месца на месца, як адкрасаваўшае, нікому не патрэбнае, ні на што нягоднае смяццё, і, закруціўшы, як круціць вір на глыбіні, біў імі аб тоўстыя, жоўтыя сцены, аб вялікія памуцеўшыя шыбы высокіх акон гарадской бальніцы...

І ліплі крывава-жоўтыя лісты да тоўстых сцен бальніцы, як бы падслухаць хацелі, што чутно за імі, і ліплі крывава-жоўтыя лісты да памуцеўшых шыб, як бы заглянуць хацелі...

. . . . . .

Праз адчыненыя дзверы бальнічнай палаты № 2 высунуўся бледны твар, адна старана каторага была пакалечана, распухлая і бліскучая, і, распусціўшы доўгія полы вырудзеўшага бальнічнага балахона, ціха — быццам нейкая мара — сунуўся, раз за разам шэпчучы сіплым голасам: «№ 17 канае... дзе служачы? № 17 канае...»

Разаспаны паночны служачы лыпнуў вачыма, працёр іх кулакамі, пацягнуўся і падняўся з свайго месца.

— № 17? — спытаў знехаця.

— Але!

— Вось выбраўся! Супакою чалавеку не даюць!— І, мармочучы нейкую лаянку, падышоў да акна, дзе стаяў крыж, абапал каторага былі непачатыя яшчэ дзве васковыя грамніцы *, выкруціўшы адну з іх, запаліў і паплёўся да канаючага. Хворыя, карыстаючы з агню, прыкурвалі папяроскі, перакідваліся слоўцамі, іншыя — на выздараўленні — паджартовывалі: «Проціў начы выбраўся, нябось, якраз трапіць да Абрагама на піва!»

— Не бойся, яшчэ не выбраўся, — адказаў другі, —

як пачне збірацца, дык гатоў і прыпазніцца: па поўначы і Абрагам не прымае — чакай да заўтра! Вось чуеш, як хліпае?..

І праўда: здалёку — амаль не праз усю палатку — чутно было, быццам пасля доўгага плачу, не саўсім супакоіўшаеся дзіця раз за разам хліпала і хліпала, толькі да гэтага хліпання час ад часу прылучаўся нейкі скрыгат як бы сапсаванай, стрыманай машыны...

Так канаў чалавек...

Біты з малалецтва сірата, гаротны праз увесь век свой працаўнік, і вось ужо калі жыццё выціснула з яго апошнія сілы, высмактала кроў, высушыла апошнія мазгі, жылы выцягнула, цяпер гэта жыццё, бачачы, што з гэтага чалавека няма больш чаго выдушыць, — кінула яго на бальнічнае ложка, мучыла яго доўгія ночы, цэлыя месяцы і на астатак, угледзеўшы, што гэты кусок надгніўшага мяса гатоў ужо разваліцца, накінулася на апошнія мінуты канаючага і здзекавалася... Так жагнала жыццё замучанае ім цела і за пражыты супольны век, жагнаючы, давала награду па-свойму...

Так канаў чалавек...

. . . . . .

Служачы, падышоўшы да ложка, над каторым вісела чорная бляха з надпісам № 17, нагнуўся, узяў за руку, разагнуў касцянеючыя пальцы і ўткнуў грамніцу; але для гэтай рукі, што столькі цяжараў перацягала за свой век, цяпер поцяжка было ўтрымаць цяжар свечкі; схіснулася грамніца на голыя высахшыя грудзі і апошні раз прыгрэла тое месца, пад каторым чуць білася ўжо, даўней гарачае, сэрца.

Служачы падняў грамніцу, паправіў і адной сваёй рукой падтрымліваў і грамніцу і руку ўміраючага чалавека, падцягнуў адной нагой зэдлік і, прысеўшы, пачаў расказваць блізкім хворым, якія былі заўчора хрэсьбіны ў свайго швагра.

Хліпанне і скрыгат не сціхалі... Служачы, скончыўшы апавяданне, глянуў на ўміраючага, пашчупаў яго рукі і галаву і, махнуўшы рукой, загасіў грамніцу.

— Не скора яшчэ дасца: саўсім яшчэ цёплы і свечка ўся згарыць, пайду па надзірацеля.

Ускорасці вярнуўся з надзірацелем і кніжкай пад пахай. Надзірацель, падсеўшы да століка каля акна, дзе міргатала лямпа, разлажыў кніжку і пачаў запісваць, мармочучы пад нос: «1909 года... 23 дня, чарнарабочы 49 лет воласці... Сымон сканчаўся ў... часоў...», затрымаўся, але тут выцягнуў гадзіннік з кішэні, глянуў на яго і дакончыў пісаць: «часоў 9 вечара...» — «Ну,— абярнуўшыся да служачага, сказаў надзірацель,— цяпер палавіна дзевятай, даю, значыцца, яму паўгадзіны часу — хіба годзе — паспее; падасі яму грамніцу, а я пайду; у адзінаццаць прышлю за ім насільшчыкаў па закону,— значыцца,— у дзве гадзіны». ...Ізноў замігацела грамніца, ізноў чутно было і хліпанне, і скрыгат, але штораз радзей, штораз цішэй.

Як увесь свой нядоўгі век быў паслухмяны Сымон, так і ў гадзіну свайго канання астаўся паслухмяным... начальству: у дзевяць сканаў.

Служачы зняў з яго ўсю бялізну і, варочаючы з бока на бок цёплае яшчэ голае цела, палажыў тварам дагары, сцягнуў рукі на грудзі і, прыкрыўшы ўсяго посцілкай, занёс на месца грамніцу і пайшоў ізноў у свой кут драмаць...

. . . . . .

Вецер гудзеў. Ліплі крывава-жоўтыя лісты кляніны да памуцеўшых шыб бальніцы, як бы падгледзець хацелі, што там робіцца...

На акне, дзе быў крыж, стаялі абапал дзве васковыя свечкі, адна з іх непачынаная, другая крыху падгарэўшы, — увесь знак, уся нядоўгая памятка, што на свеце не стала аднаго чалавека.

ЗАРАБЛЯЮЦЬ

Мамку — дык закапалі на могілках — пры горадзе; не на самых, праўда, могілках, але так — крышку збоку — за плотам, бо казалі, што яна неяк не зусім так, як трэба для могілак, паміра́ла.

Татку не давялось убачыць. Ганулька — сястрычка, значыцца, мая, — казала, што як была маленькая, а мяне яшчэ на свеце зусім не было, — дык разы са два бачыла. Нішто, казала, хоць старэнькі, але добры быў: грошы, а то і цукеркаў, бывала, прыносіў і надта пекную пахучую адзежыну меў на сабе. Але я так і не бачыў яго: на пахавунак мамкі ён не прыйшоў. Чаму? Не ведаю.

Як мамку хавалі, мне было гадоў восем; Ганулька бралася пад чатырнаццаць.

Пры мамцы жылі мы ў пекным мураваным доме; дом быў вельмі высокі, але мы жылі зусім нізенька — быццам у зямлі. Так, бывала, смешна глядзець праз аконца; толькі ногі міг-міг, а то іншыя шлэп-шлэп, але толькі і відаць ногі, як бы людзям галоў і не трэба было...

Жыць было добра, спакойна, і гульні свае з Ганулькай мелі. Зімой, напрыклад, у вялікі мароз на акне (адно яно было ў нас) такія бывалі пекныя кветкі, што так і глядзеў бы цэлы дзень на іх, а Ганулька возьме вугольчык дый ім на сцяне такія самыя кветкі навядзе, — якраз такія самыя, толькі тыя былі белыя, а гэтыя чорныя... Або — іншым разам — з акна вада стане капаць,— вось якраз, як часта, бывала, з вачэй мамчыных: такая перш маленькая капелька, а пасля яна неяк пухне, пухне і зробіцца велізарная, бліскучая і... кап; а потым другая, трэцяя, але таксама памаленьку: кап... кап... кап... Толькі, помню я, раз мамчына капелька ўпала мне на твар, дык такая цёплая была, ажно гарачая, а тыя, што з акна капалі, дык іншым разам замярзалі ў

доўгія-доўгія сасулькі, тады мы з Ганулькай аддзіралі іх і гулялі ў крамніка, што цукеркі прадае.

Здаралася не раз, што есці надта хацелася, а мамка не прыносіла (мусіць, часу не мела), дык затое яна як пачне нам гаварыць, як пачне, а так умела пекна гаварыць: як птушачкі божыя — такія маленькія, бедненькія, а страхі над сабой не маюць, а мы маем; як іх вецер праймае, а да нас не дабіраецца; як яны галодныя спаць садзяцца;— і ўсё гэта так пекна, так жаласліва нагаворыць, што аж нам захочацца быць падобнымі да гэтых птушачак божых, каб і нам холадна было, каб і нам, як гэтыя божыя птушачкі, галоднымі класціся спаць у халодны кут. І кладзёмся. А мамка доўга яшчэ сядзіць і шые, шые, шые...

. . . . . .

. . . . . .

Спярша, як асталіся мы толькі ўдваёчку, — вельмі маркотна было... Стуліўшыся, — як каткі ў клубочкі, дрэмем, не раздзяваючыся ўсю ноч, хліпаючы ад часу да часу, на мамчыным ложку... Галоднымі не былі: хлеб яшчэ цягнуўся; два злоты ў мамчынай апратцы знайшлі, а як праелі іх, — Ганулька і кажа да мяне: «Ты, Адамка, не дурэй, сядзі ў хаце ды лемантар, як мамка паказывала, грызі, а я пайду грошы зарабляць і на сябе і на цябе». І праўда: заработкі яна дастала ўскорасці: то на пабягушкі, то падлогі мыць, то вады прынесці ці так што якое, — але зарабляла, і год за годам ішлі роўна, спакойна... Ганулька вырасла на сталую ўжо дзяўчыну, а і я, хоць тонкі і худы, але таксама ўверх выцягнуўся, і мы не раз ужо памеж сябе раіліся, каб убіцца мне да якога майстэрства, але... але зрабілася нешта такое, чаго мы самі не маглі зразумець: заработкі Ганульчыны неяк зразу ўрваліся...

Чаму? — не зразумеў я. Чуў толькі ад дворнічыхі, што такіх ганарыстых, як мая Ганулька, — паны не

любяць... Жыць стала цяжка: мала таго, што ціснуў голад, але і апрануць не было чаго, — сядзім цэлы дзень у хаце, як тыя мышы ў нары, і толькі, як добра сцямнее, Ганулька ў сваіх лахманах выпаўзала да адной старэнькай пані, каторая адна і асталася, што яшчэ мела літасць над намі, і то тое, то сёе перападала ад яе нам з яды. Але цягнуцца гэтак доўга не магло. Ганулька кідалася ўсюды, шукаючы працы, і змораная прыбягала позна вечарам дахаты, ламала свае ручкі і плакала, плакала... Гледзячы на яе, скавытаў і я з жалю, як тое шчанё...

. . . . . .

— Адамка, — вярнуўшыся знекуль, кажа да мяне Ганулька,— няма рады; каб адна я была — ведала б, што зрабіць, але цябе шкода! Ідзём разам на службу; нам дадуць апраткі, кватэру і есці, колькі захочам.

Я цешыўся, аж скакаў, і дзівіўся, што Ганулька была вельмі маркотная: амаль не ўсю ноч пракленчыла яна пры мамчыным ложку — малілася і плакала, плакала і малілася...

Назаўтра пайшлі мы на службу: гэта быў вялікі, пекны, чысты рэстаран. Далі мне чыстую цэлую адзежыну і паставілі за лёкая; Ганульку адзелі, як кралю якую, але работы не назначылі ніякай...

І служым мы. Штодня, а найбольш вечарам, находзяць дзесяткі і сотні чыста і багата адзетых паноў, бяруць смачную, дарагую яду, купляюць заморскія водкі і віны, кідаюць грашыма, як трэскамі; п'юць, ядуць, крычаць на лекаёў — бо такіх, як я, ёсць тут яшчэ з пяток і такіх, як Ганулька, ёсць апроч яе тры. І ўсе яны нічога не робяць: ходзяць ад стала да стала, госці іх адны перад другімі просяць да сябе, кормяць, пояць ды яшчэ гасцінцы даюць...

Мая служба вельмі цяжкая, — найгорш, калі Ганулька — мая родная, каханая сястрычка, седзячы пры адным стале з панамі, — крыкне: «Адам! Яшчэ бутэльку

віна!» Ляту, нясу, адпячатываю, неяк ногі і рукі мае трасуцца, і мест у шклянкі лію віно на белы, чысты абрус, бо не на віно гляджу; гляджу, як зачараваны, у сінія-сінія вочкі сваёй Ганулькі, і хочацца мне крыкнуць на ўвесь гэты рэстаран, не — не рэстаран, а крыкнуць так, каб увесь свет пачуў: «Кідай, сястра, безработную службу! Кідай, дарагая мая!»

ЗАРАБІЎ

Хоць меў Сцёпка Тацюк траціну зямлі, і то зямлі добрай, меў жонку — Тацяну, да ўсяго дасужую, меў трох сынкоў, з-паміж каторых старшыя два былі ўжо ладнымі падросткамі і зараблялі не толькі на сябе, але і на хату, а ўсё ж ткі ў хаце жылося несамавіта: штодзённы недастатак! Нажывуць круп, затаўкі няма; згарусцяць затаўку,— якраз крупы скончыліся; і так усцяж!

Праўду кажучы, найбольш вінават быў гэтай бядзе сам Сцёпка: хоць любіў, каб яды было, як на Дзяды *, але хацеў, каб работы было, як у нядзелю. Людзі ўжо напрацуюцца, па колькі-то пракосаў пройдуць, а Сцёпка ўсё яшчэ соўгаецца ад хаты да хаты па вёсцы: то з адным пастаіць, пагутарыць; то з другім за глупства завядзецца — пасварыцца, — глядзі — ужо і поўдня блізка, і, хоць як не кідалася Сцёпкава Тацяна, нічога не памагала: жылося, як той казаў, дрэнна.

А Сцёпка не ад таго, каб жылося лепей, — чаму не? Але каб гэта лепей само як-небудзь скуль-небудзь звалілася, знайшлося. І хада Сцёпкі была такая, быццам усё шукаў гэтага лепей. Апусціў галаву, як той конь убоісты, уніз дый цягаецца, быццам чагось углядаючыся.

Многа ці мала гэтак шукаў Сцёпка сваёй долі, але вось адной неяк раніцы, пралайдачыўшы ўсю ночку ў падгарадскім шынку і варочаючыся з пустой кішанёй і цяжкай галавой дахаты, здалося яму, што ткі знайшоў сваю долю. Стрымаўся раптам сярод дарогі і стаў з-пад лоба аглядацца, як бы баяўся, каб яго думак хто не падгледзеў ці не падслухаў... Потым, крута завярнуўшыся, скорым крокам памахаў у горад. Прайшоўшы на адну з вуліц, дзе стаяў знаёмы гарадавы (не раз чарку перакулівалі разам — усёй знаёмасці), стаў з ім шаптацца. Доўга, надставіўшы вуха і ківаючы галавой, слухаў па-

шаптушак Сцёпкавых гарадавы, пасля, кіўнуўшы пальцам, павёў яго ў паліцыю.

Там зара гэты самы гарадавы завёў Сцёпку ў камору, дзе сядзеў за сталом нейкі чыноўнік ці начальнік, а сам чмыхнуў адтуль. Жутка зразу зрабілася Сцёпку, мо ўжо і жалеў цяпер, што ажно сюды кінуўся шукаць сваёй долі, але неяк слова за слова (начальнік паказаўся Сцёпку вельмі прыступным чалавекам) і ўсё, што было ў думках Сцёпкі, вылажыў як мае быць.

...Выйшаў Сцёпка. Выйшаў, як бы пасля вялікай, цяжкай працы: спацелы, чырвоны як рак. У моцна заціснутым кулаку трымаў сярэбраны рубель... Але што цяпер знача Сцёпку гэты рубель? Ого! Сцёпка бо ведаў цяпер, як зарабляць рублі. Калі захоча — не аднаго будзе мець. Вось захацеў і будзе мець... як вам здаецца: што? Каня! Як мае быць каня — гаспадарскага каня. Трэба будзе толькі падысці на торг, выбраць любога, а пасля сеў і паехаў; аб цане і не пытай! Ёсць каму за яго плаціць!

Варочаючыся дадому, разважаў Сцёпка: сказаць жонцы ці не сказаць? Але ткі надумаў не гаварыць: нашто бабе ведаць? Яшчэ гатова разбрахаць па вёсцы, а гэтага нельга, бо і заработак можа ляснуць.

Па дарозе зноў зайшоў Сцёпка ў шыночак, знайшлася там знаёмая кампанія, а да таго быў рубель — было за што і пры чым пасядзець, дык ледзь уночы дацягнуўся дадому. І, увайшоўшы ў хату, намацаў палок і, рынуўшыся на яго, заснуў моцным, п'яным сном.

Сонейка ўжо высока паднялося, калі Сцёпка расчухаўся, злез з палка, моўчкі насунуў шапку і высунуўся за дзверы. Тацяна таксама быццам і не бачыла мужа — ніводным словам не зачапіла яго. Яна добра ведала, што ніякае прычытванне не толькі не памагала, але яшчэ горш шкодзіла: Сцёпка, на злосць жонцы, кідаў тады ўсю работу і сцягваўся з дому на колькі дзён. Хліпаючы і ўціраючы нос хвартухом, Тацяна ямчэй толькі перастаўляла гаршкі; мацней ляскала вілкамі і чапялой у кача-

рэжніку і часцей куксала свайго малога Сымонку, каторы круціўся каля спадніцы маткі.

Тым часам Сцёпка, выйшаўшы на двор, як сеў на прызбе, дык і не скрануўся, ажно пакуль жонка не клікнула палуднаваць. Па палудні пайшоў кратацца каля гаспадаркі і гэтак дацягнуў да вечара.

Ноч выдалася Сцёпку бесканечна доўгая. Доўгай і страшнай паказалася яна і Тацяне. Чаго ніколі даўней не бывала, кідаўся Сцёпка, як у гарачцы: то крычаў, каб каня яму запрагалі, то клікаў Юрку і Кастуся, то будзіў жонку, дапытваючыся, ці не чула, як сабакі брахалі і званочкі звінелі, і ледзь над раніцай крыху супакоіўся. Назаўтра праз увесь дзень не выйшаў, як даўней бывала, на вуліцу, словам да нікога не адазваўся, толькі яшчэ больш згорбіўся, яшчэ ніжэй апусціў галаву ўніз, як бы баяўся, каб не заглянуў яму хто ў вочы.

Так прайшло трое сутак. На чацвёртыя — звечара, калі жонка з сынам ляглі ўжо спаць, Сцёпка, запаліўшы лучыну, толькі стаў лапці падшываць, як пачуў, адазваўся на вёсцы спярша адзін сабака, пасля другі, трэці... Твар Сцёпкі збялеў, рукі і ногі так сталі калаціцца, што ледзь падняўся, ледзь дайшоў да лучыны, вырваў яе з лучніка, кінуў вобземлю, затаптаў і, асунуўшыся на лаву, цяжка дыхаючы, стаў прыслухацца. Колькі гэтак сядзеў Сцёпка — сам не ведаў, і толькі, калі пачуў, як на вуліцы вёскі нешта затаркатала, затопалі конскія капыты, Сцёпка як бы ачнуўся. Праз сваё акно бачыў Тацюк, як замігацелі агні па хатах, потым стаў высыпаць народ на вуліцу і, як тыя пчолы ў вуллі, загудзеў. Пад акно Тацюковай хаты падбегла суседка — Мар'яна, забарабаніла па ім і, крыкнуўшы: «Юрку і Кастуся забралі... кніжкі нейкія знайшлі», — пабегла далей. Сцёпка ані скрануўся...

Мінуў тыдзень, другі, і выбраўся Сцёпка ў тарговы дзень у горад. Спярша падышоў да знаёмага гарадавога, але з ім аніяк не мог дайсці да ладу: буркне нешта пад

нос ды адвернецца. Махнуў Сцёпка рукой і пайшоў да таго чыноўніка, у каторага спярша быў. Той, распытаўшыся, ці няма яшчэ якіх навін, сказаў Сцёпку прыйсці па каня на другі торг. Прыйшоў ён на другі торг — якраз начальніка дома не застаў. За трэцім разам — часу таму не было. І гэтак як стаў хадзіць, дык ходзіць, а ўсё нічога не выходзе; ажно пакуль аднаго торгу не спаткаўся ён нос у нос з гэтым сваім начальнікам на рынку. Круціўся, праўда, спярша той, як уюн, але ўрэшце згадзіўся ісці каня купляць Сцёпку. Абышлі адзін, другі табун, пры трэцім начальнік, гутарачы з гаспадаром-цыганом, нешта доўга замарудзіў, а пасля і кажа Сцёпку: «Выбірай каня, садзіся і едзь»,— а сам завярнуўся і пайшоў.

Сцёпка абышоў гнядога — добры; паглядзеў у зубы буланаму — яшчэ лепшы, але найбольш спадабалася яму лысая кабыла: складная, сытая, ростам невялічка,— якраз на яго гаспадарку. Пакруціў яе ў адзін бок, пакруціў у другі. «Гэту можна?» — пытае цыгана. «Прабуй, якога хочаш», — адказвае той. Але што там Сцёпку было прабаваць? Абы скарэй дадому — пахваліцца! Ускочыў на кабылу, залопаў нагамі па баках лысай і, трушком з'ехаўшы з рынку, мінуў прыгараддзе і выехаў на сваю дарогу. Тут затуманіў люльку і толькі стаў надумвацца, што б тут сказаць у вёсцы: адкуль, за што нажыў гэткую жывёлу, ажно ззаду нехта калі храпне па карку Сцёпку, дык і не агледзеўся бядак, калі на зямлі апынуўся. Падняў галаву, глядзіць: цыган — гаспадар кабылы — стаіць над ім, крычыць, лае дый зноў складаецца пражыць. Усхапіўся Сцёпка, хацеў ужо даць цыгану здачы, але той давай нема раўці: «Злодзей! Злодзей!» Падбеглі людзі, і як ні растлумачваў ім Сцёпка, як ні кляўся, як ні прасіўся, нічога не памагло: кожны тоўк яго, як сабаку на чужым двары, — гэтак збітага звязалі і павялі назад у горад. Там здалі Сцёпку ў участак. Прабаваў і тут Сцёпка выкладаць сваю справу, як ён і не краў кабы-

лы, як за яго маніўся заплаціць нейкі важны чыноўнік, але ніхто і слухаць не хацеў, а толькі кпілі і смяяліся з яго.

На другі дзень выпрасіў-ткі Сцёпка, каб завялі яго да таго чыноўніка. Завясці завялі, але той і не дапусціў яго нават да сябе, і як ні артачыўся Сцёпка, а адтуль павялі яго ўжо проста ў турму і ўпхнулі паміж арыштантаў «да разбору дзела».

Ліха яшчэ надало Сцёпку прызнацца перад сваімі новымі таварышамі, за што і як папаў сюды. Думаў Сцёпка іх разжаліць сваёй доляй, і тым часам — дзіва: злодзеі, разбойнікі і тыя адтрахнуліся ад яго. «Здраднік! Юда! Гад!» — інaчай і не адзываліся да Сцёпкі...

Пакуль назначылі суд, Сцёпка адседзеў у турме месяцы з чатыры; але, ці то яму той начальнік — зжаліўся — памог, ці як там было, выкруціўся-ткі неяк, небарака, з большай бяды і вярнуўся дадому.

З таго часу перастаў цягацца па вёсцы, бо абы толькі паказаўся — сталыя і малыя, мужчыны і бабы прыставалі да яго: «Сцёпка, Сцёпка, калі пойдзеш у заработкі?»

САБАЧЧА СЛУЖБА

Чуў я (а мо і вы чулі) не раз, як іншыя кажуць: «Паганая тая служба — сабачча служба». Чуў — і думаў сабе: што за такая служба? Сабацы — пэўне, што і сабачча служба, а і то не паганая, бо і сабака найлепшы прыяцель чалавека і найвярнейшы з яго служака гаспадара. Але каб службу чалавека назваць паганай, сабачай — ніколі неяк не мог я даць веры. Можа быць служба цяжкая, вельмі цяжкая, але не паганая, бо ніякая праца не ганьбіць чалавека.

Але неяк давялося мне раз быць у горадзе. Заначаваў у кума. Раніцай выйшлі на вуліцу, стаім каля брамы, гамонім... Ажно ляціць колькі падросткаў, адзін і сталы лынды распусціў, за імі дзеці — і ўсе цюкаюць, свішчуць! Дзе каторы спанатрыць якога беднага сабаку, то так уляжа за ім, што толькі пяты міргацяць... Гляджу, вочы вылупіўшы, дый нічога не разумею! Ажно бачу, сунецца воз — не воз, катух — не катух, быццам велізарная жалезная клетка; на клетцы гэтай сядзіць дзяцюк — коніка паганяе, двух абапал падросткаў таксама прычапілася на гэтай клетцы з вялікімі, як вуды, пугамі, а ў клетцы гэтай сабакі сядзяць — мусіць, з дзесятак які — і малых, і вялікіх — усялякай масці, дый ззаду клеткі бяжыць яшчэ адзін невялікі кудлаты сабака.

— Што гэта, братка? — пытаю кума.

— Гіцлі,— кажа,— што ловяць валацугаў — сабак, а гэта грамада, што паперадзе з крыкам ляцела — от, людзі як людзі—заўсягды нешта добрае ў сэрцы сядзіць, дык і разганяюць сабак, каб не папаліся ў гіцлевы лапы.

— А гэты ж — задні, — пытаю, — чаму на свабодзе?

— Эгэ, — кажа кум, — ён самы важнейшы ў гіцляў: гэта правакатар. Бяжыць ён, значыцца, па вуліцы дый знаёмства заводзіць з сваім братам: угледзіць каторага, зараз да яго — з аднаго боку зайдзе — нюх, з другога —

нюх, хвосцікам на ўсе бакі віль-віль, а той ужо і рад новаму сваяку — і язык высалупіць. Тут і тыц і гіцлі на новага сябра з гэтымі пугамі дый у жалезную клетачку!.. А той кудлаты юда — як бы і нічога: хвост толькі зноў крапчэй падцісне, морду ўніз апусціць дый ізноў бяжыць далей, насцеражыўшы вушы, лыпаючы з-пад лоба вачмі, шукаць новай ахвяры...

. . . . . .

Ну, браткі, вось гэта служба дык служба: праўда, што паганая, мусіць, мала і сабак знойдзецца на такую службу!

ЦЫРК

Здаўна ўжо Андрэй Зорка выбіраўся ў губернскі горад да свайго сябрука — Міхалкі Гурчыка. Змалку яшчэ, памятаў добра Андрэй, як з Міхалкам у зрэбных кашулінках на вуліцы вёскі босымі ножкамі разам снег убівалі, бабы ляпілі; падкасаўшыся, разам скацінку ў поле ганялі, цэўкі і стрэлкі з вяршынак маладых сасонак выразалі, з вугальчыкаў па каменнях стралялі, дзецюкамі — за баронамі праз адзін шнур цягаліся, на ігрышчах у качарэжніку разам адстайвалі, ласа паглядаючы на гулякаў, а падцягнуліся яшчэ (аднагодкамі былі), ужо складна і да сахі браліся; толькі ў сілу сталі брацца, ажно і не агледзеліся, як скончылася іх сяброўства: Міхалку здалі ў салдаты, Андрэй-ільготнік астаўся дома гаспадарыць.

Шмат з таго часу вады ўплыло, а сябрукі тыкеля разы са два спаткаліся. Першы раз — Міхалка прыязджаў на вяселле старшага брата (ох, і пагулялі ж тады!), а другі раз — ужо стражнікам. Стражнікам, бо Міхалка, скончыўшы службу ў войску, варочацца дадому не захацеў і астаўся па сваёй ахвоце стражнікам у горадзе.

Не раз Міхалка слаў пісулькі да свайго сябрука Андрэя, просячы яго, каб ткі выбраўся даведацца сваяка, бо мучыла, прызнаваўся гарадскі служака, яго нуда па сваіх.

Вось урэшце і выбраўся Андрэй. Восень была; дарога дрэнная; ехаў Зорка дзень, ехаў ноч, а над раніцай ледзь дабраўся да мэты.

Спаткаўшыся, сябрукі не маглі адзін з другога нацешыцца, успамінаючы даўно мінулае, пражытае. Праз увесь дзень цягаліся разам па горадзе, а Андрэй не мог надзівіцца тым усялякім навінам, аб якіх, седзячы ў вёсцы, і не снілася чалавеку. Але Міхалка надумаў пака-

заць Андрэю яшчэ большыя дзівы і вечарам завёў яго ў цырк. І праўда: гэткае, што там давялося ўбачыць Зорку, у яго цеснай галаве і памясціцца не магло.

Аграмадная будыніна. Агні гараць, быццам сонцы свецяць.

Музыка рэжа ў велізарныя дуды. Народу — гібель. Пасярод будыніны — круг, высыпаны чыстым пяском. І вось на гэты круг выйшаў увесь у чорным нейкі чалавек, сам чорны, як смоўж, з бізунамі пад пахай; за ім высыпала грамада яго прыслужнікаў у бліскучых адзежынах, і зараз жа на гэты самы круг віхром уляцеў табун, як малако, белых коней. Ляснуў бізуном той чарнамазы (мусіць-то, камандзер?) адзін раз, і ўсе коні сталі дыбка, ляснуў другі раз — коні апусціліся на каленцы, і зноў засвісцеў бізун — і рынуліся ўсе коні берагам круга ў такую скочку, што, здавалася, жыватамі зямлю даставалі!

Намуштраваўшы ўсяляк, што ажно пара з беднай жывёлы пайшла, камандзер махануў бізуном, прыслужнікі расступіліся, і ўвесь табун з такім самым імпэтам, як быў прыляцеў тады, счэзнуў быццам у нейкай браме, прыкрытай чырвоным сукном.

А той смоўж зноў стаў ляскаць бізуном, і, як бач, вылецеў на круг сівы ў яблыкі жарабец, быццам з табурэтам мест сядла на спіне, на каторым стаяў маладзенькі хлопец.

Музыка гудзела; бізун ляскаў, а падростак, стаючы на расшалелым кані, то прысядаў, то ўскакваў, то куляўся, кідаўся на ўсе бакі, ажно пакуль і ён, зморaны, цяжка дыхаючы, пад свіст бізуна не счэз у той самай чырвонай браме.

Ізноў музыка гудзела, ізноў ляскаў бізун, а на круг выляталі ўсё новыя і новыя то мужчыны, то дзяўчаты,— скакалі, круціліся, куляліся і гінулі за чырвоным сукном.

Урэшце нагналі цэлую грамаду звяроў: і сланоў, і

медзвядзёў, і сабак, і налпаў, і казлоў, і ваўкоў, і якіх там толькі не было! Усё гэта скакала, вешалася, качалася... А бізун свісцеў і ляскаў, ляскаў і свісцеў...

Колькі гэтага было, — Андрэй і ўспомніць не мог. Выйшаў з цырка, як здурнеўшы. Міхалка, будучы пэўны, што надта дагадзіў сябруку, стаў расхваліваць цырк і дапытваць Зорку, як яму спадабаліся гэтыя штукі, але Зорка ішоў злосны, хмурны, адно толькі слова і адказваў: «Здзек! Здзек! Здзек!»

Вярнуўшыся на кватэру, Міхалка стаў частаваць сябрука вячэрай, але той і не дакрануўся да яе. Лёг, скорчыўся, кажух на галаву нацягнуў і стараўся скарэй забыцца, заснуць...

. . . . . .

Перад вачамі Андрэя Зоркі гараць агні.... У вушах грыміць музыка, б'юць у бубны... У галаве ўсё круціцца, шуміць... На вялікі, пасыпаны чыстым белым пяском круг выступае, як смоўж, чорны велізарны чалавек з грамадой у бліскучых адзежынах прыслужнікаў сваіх, і ўсе яны, як адзін, круцяць і ляскаюць доўгімі-доўгімі бізунамі...

З-пад брамы, завешанай, як кроў, чырвоным сукном, стаў сыпаць народ: дзеці і сталыя, падросткі і старцы, а за імі сунецца цэлая чарада рознага звяр'я. Уся гэта жывая грамада лётае, круціцца, куляецца, падае, устае, ізноў падае, урэшце ўсе змораныя, спацелыя прыпадаюць на каленцы... А бізуны свісцяць і ляскаюць... «Здзек!» — крычыць Андрэй з вышак, дзе ён сядзіць у цырку... «Здзек...» — як адзін голас, адзываецца, ускакваючы з кален, жывая грамада... Бізуны хутка падымаюцца ўгару, але дзіва: не свіснулі, не ляснулі яны, а быццам завесіліся ўгары, а пасля схіснуліся і... счэзлі. Белы чысты пясок на кругу стаў жаўцець, штораз болей жаўцець, урэшце чырванець, усё больш чырванець, ажно пакуль не зрабіўся так чырвоны, як тая засланка на ва-

ротах... «Здзек...» — раўнула яшчэ раз жывая грамада такім страшэнным голасам, што сцены велізарнай будыніны задрыжалі. А народ і звяр'ё з гмаху пачалі сыпаць на вуліцу; ажно тут Міхалка стаіць, растапырыўшы рукі, пасярод вуліцы і стрымлівае гэту грамаду... Андрэй, замахнуўшыся, кінуўся да яго з крыкам: «Міхалка, ты?!»

— Я, — адазваўся Міхалка, стоячы над самым Андрэем. — Прачніся, братка, папраўся, — надта нечага стогнеш, — мо баліць што?

Андрэй падняўся, працёр кулаком вочы, паглядзеў кругом, глянуў на Міхалку. «А праўда, — адказвае, — мусіць-то, я дрэнна ляжаў, страхі нейкія мучылі мяне»,— і, перавярнуўшыся на другі бок, ціха і смачна заснуў...

ГАРОТНАЯ

У канцы вёскі каля старэнькай хаткі ўдавы Тамашыхі сабралася кучка баб. Кожная з іх штось гаварыла, кожная штось раіла, але Тамашыха не чула і не разумела — ані іхніх гутарак, ані іхніх рад. З ахапкам брудных ануч пад пахай, шэпчучы штосьці пасінеўшымі ад холаду вуснамі, хадзіла яна ад акна да акна, ад вуглоў хаты да дзвярэй і ўглядалася, ці не пакажацца дзе дымок. І праўда: праціскаўся ён паміж лучынак, месцамі пазацягваных замест шыб у аконныя рамы; працягваў і праз надгніўшыя вуглы хаты,— і праз пашчапаўшыеся ў дзвярах дошкі. Дзе толькі дагледзела Тамашыха гэты дымок, хутка падбягала туды, выцягвала з-пад пахі анучыну, адрывала шматочак і з усёй сілы затыкала ім шчэліну.

Вецер раз за разам узрываўся, гудзеў паміж гнілых жардзей азяродаў, паміж дзе-нідзе цэлага яшчэ частакола; са свістам прарываўся праз голыя галіны вялікай крывой вярбы і гінуў недзе ўдалі. З пахмурнага неба сыпалася імжака. Нездаволеныя, што Тамашыха не зважала на іх, бабы, пазалеўшы, парасцягваліся па вёсцы. Скончыла і Тамашыха сваю занятку, глянула на пустую балоцістую вуліцу і, асунуўшыся на прызбу, шаптала далей.

Што шаптала — сама добра не разумела. Ведала толькі, што так трэба. Трэба, бо, — бо знахарка Караліха, да каторай Тамашыха сягоння яшчэ додня замчала курыцу, так і раіла: «Зачыні, — казала яна, — юшку, распалі агонь на прыпечку, насып гэтага, што табе даю, зелля, — хай курыць, а сама выйдзі з хаты дый пільнуй, каб дым праз шчэліны не ўцякаў». А калі Тамашыха спыталася, як доўга трэба курыць, знахарка строіла так: «Столькі часу куры, колькі займае сказаць шэсць па шэсць пацераў; тады, — кажа, — і варочайся ў хату — усё будзе добра».

Шэсць па шэсць? Не менш — то пэўна, а мо ўжо і болей, як шэсць па шэсць нашаптала пацераў Тамашыха; мо гэта і не добра? Усхапілася з прызбы, кінулася да дзвярэй і расчыніла іх. Шугануў дым, цёмны, едкі дым, грыз вочы, душыў у горле, але Тамашыха не зважала на гэта: вобмацкам мінула печ, дабралася да палка і нагнулася.

Там — з нацягнутай на галоўку грубой посцілкай ляжаў Сцяпанка — пацеха і ўся надзея Тамашыхі. Ляжаў ціханька, і толькі худзенькая маленькая ручка звесілася з палка. Тамашыха асцярожна падняла і палажыла гэту малую ручку на грудзі сына, а сама ціханька, каб не разбудзіць хворага, адышла, села на лаву і задумалася. І, ці то ад дыму, ці то ад гэтых думак, слязіна за слязінай капалі і капалі з вачэй беднай кабеціны...

Задумалася Тамашыха. І ажно сама дзівілася, скуль можа брацца столькі бяды, столькі няшчасця, сколькі ўсцяж валілася на яе галаву. І за што? Грэшная? Мо яе грэх найважнейшы, найбольшы за ўсіх? Мо дзеля таго і пакутвае яна за ўсіх? Мо іншым затое лягчэй жывецца? Ой, бо ці ўсё ж яе жыццё не адна пакута? Не адна бяда? Не адна нядоля?

Змалку, помніць Тамашыха, калі была яшчэ ў Язэпавай хаце — там ужо началася яе нядоля — там першая. Бо ці ж гэта не нядоля? — з-паміж усіх дзяцей, якія гадаваліся тады ў Язэпа,— адна яна не мела маткі. У кожнай хаце былі дзеці, былі і маткі, а от жа ў яе не было. І калі, бывала, бачыла яна, як іншыя дзеці песцяцца, прытуляюцца да матчыных грудзей, бегла і яна — маленькая, худзенькая — да той высокай белавалосай Тэклі, клала сваю галоўку на яе калені і шаптала: «Мама, мама, мама». Але пяшчотаў, а яшчэ горш гэткіх слоў Тэкля не любіла. «Не лезь, — кажа, — да мяне з гэткім — абуза, а не дачка ты мне». Плачучы, бегла тады малая Ганулька (Ганулька? Гэта ж яе калісь звалі Ганулькай, ледзь цяпер успомніла Тамашыха), бегла ў

які-колечы цёмны куточак або ўціскалася ў запечак і, закрыўшыся, ціханька шаптала сама да сябе: «Мама, мама, мама...»

Потым... што ж было потым?.. Ага: зімой крыху меншых ад сябе дзяцей калыхала, насіла, хату замятала, бульбу скрэбла, а ўлетку — у поле ўжо стала ганяць. Прыгнаўшы на дзяніну *, змораная, бяжыць травы каровам, свінням... Гэтак доўга было, бо неяк да сярпа не магла налажыцца, але пасля і гэтага наўчылася. Стала хадзіць тады на заработкі і, як тая пчолка, зносіць двузлоткі ў хату. Але каб з гэтых двузлотак сабе што справіць — адзежыну якую, нікому, дый самой Ганульцы, ніколі і ў галаву не прыходзіла. Адзявалі яе хатнія: справяць што сабе, падносяць, пацягаюць дый аддаюць ёй. «Палатай, — кажуць, — добрая яшчэ для цябе адзежына будзе». Цешылася Тамашыха з падарунку, латала і насіла. Інакшых радасцей Ганулька не мела; і толькі, калі ўжо вырасла на сталую дзеўку, Васіль — хлопец з суседняй вёскі, спатыкаючы яе, зажартуе, бывала, загаворыць. «Дурная ты, — кажа, — Гануля: цябе крыўдзяць дома, і ты падаешся. Слухай лепш мяне, усё добра будзе!» І Ганулька, хоць баялася Васіля, але верыла яму і слухала. Слухала, ажно пакуль не пагналі Васіля ў салдаты, а яна зноў адна асталася. Адна? Каб жа хоць на век адной можна было астацца! Але ўскорасці падышла найгоршая бяда: радзіўся сынок... Выгналі Ганульку з хаты... Прыйшлося сесці кутам * на дворнай пляцоўцы. Ой, трудненька прыходзілася Ганульцы, трудненька! І не думалася ёй, што на свеце бяда не мае канца, што можа быць яшчэ цяжэй... Памерла Тамаша Канцавога матка; патрэбна была ў хату гаспадыня, а што за п'яніцу ніхто не хацеў ісці, абы-якое колечы прыстанішча мець, — пайшла Гануля.

І вось яна ўжо Тамашыхай стала, Тамашыхай-гаспадыняй! Бяда толькі, што не было надта над чым гаспадарыць: адна ўсяго кароўка ды дзве авечкі, каня нават

не было. Шнурок свой у запашку аддавалі, дык пражыць было цяжка. Але што там пражыць? Нейкі ж лахман быў нацягнуць на сябе, а есці? Улетку — шчаўя, грыбоў — гібель; а зімой — які там дзень? Зусім кароткі. Прыставіць саганок бульбы — на ўвесь дзень хапае! Вось толькі абы Васільку... дык каб жа яму аднаму? А то і не агледзелася Тамашыха, як прыбыў Яначка, Пятрусь і вось гэты — Сцяпанка. Сабе — як сабе, а дзецям трэба ж даць хоць раз у тыдзень нейкі праснак ці блін, — ды малачка калі ўліць. Ну і давала Тамашыха колькі мела; а на каляды, на вялікдзень нават скаромнае траплялася. А хоць і ў буднія дні, — каму — на што тое — грэх наракаць: у пячурцы заўсёды ў запасе бульба валяецца, і ядуць яны яе, бывала, не раўнуючы, як тыя парасяткі — праз увесь дзень, дык голад каму-каму, а дзецям не дакучаў. Толькі вось, разважала далей Тамашыха, неяк сыць іх не брала: жывоцікі, праўда, параспірала, але ручкі, ножкі, шыйкі — ажно жаль было глядзець — як тыя цэвачкі. А і сама яна, Тамашыха, неяк сохнуць стала дый моц зусім страціла. Даўней, бывала, асміну бульбы закіне на плечы і прымчыць з поля, а цяпер і кошык цяжка прыцягнуць. Не дзеля таго саслабела яна, што галодная была або што Тамаш праз колькі-то год духі выймаў — біў, не — гэта што — глупства; вось другі год ужо як не б'е: зваліўся п'яны з рыштавання, захварэў і памёр, а ўсё ж ткі сілы не варочаюцца, — сну зусім няма з таго часу, як увалілася хвароба ў хату.

Гэткі-то хлапчук быў Васілька, успамінала сабе Тамашыха, гадкоў з дзесяць пэўна меў; аддалі на службу за падпаска; усё ж ткі карміць дома не трэба, ды чатыры рублі пенсіі браў за лета. От і зарабіў! — вярнуўся са службы, стаў кашляць, хірлець і каляд не прыждаў — як тая свечка — згас. Згас Васілька, за ім той самай сцяжынкай пайшоў Яначка, а пасля і Пятрусь. А цяпер вось гэты — Сцяпанка — мала-то страху нагнаў. Згоджаны быў да ўсіх святых: на ўсім гаспадарскім, пуд

жыта і тры рублі; ведама, першая яшчэ служба; ды і тая не ўдалася: скаціны хоць мала, але дуроная; знямогся, лётаючы за ёй, так, бедны, што без пары сарваць са службы прыйшлося; мо і грошы прападуць, але дома Тамашысе спакайней. Малачка яму напарыць, сама паложыць, накрые, уночы да яго ўстане; толькі нешта ніяк ачуняць не можа, а вось з тыдзень ужо будзе, то такі страшэнны кашаль прычапіўся, што і духу не даваў яму перавесці. Чаго, чаго ні рабіла, якога толькі ні парыла, ні давала зелля, — нічым супакоіць не магла, ажно пакуль, вось, не збегала да Караліхі, і хоць курыцу прыйшлося аддаць, але такога нейкага моцнага-то курава дала, што зразу кідаць перастала, супакоіўся і гэтак-то ціханька ляжыць, ані скранецца; нават ручку, што звесіўшыся з палка была, як паправіла, так і цяпер на тым самым месцы ляжыць...

Цяпер толькі ўспомніла Тамашыха, чаму гэта, як папраўляла тую руку, то яна была нейкая не то потная, не то ліпкая і быццам цяжкавата?.. І раптам, як пярун агністы, страшэннае падазрэнне мігнула праз галаву Тамашыхі. Зразу ўнутры зрабілася холадна, пуста; ногі быццам волавам наліліся... Але неяк жа скранулася Тамашыха і, апіраючыся то аб стол, то аб зэдлік, з страшэннымі, выкаціўшымісяі наверх вачамі, ляскаючы зубамі, дасунулася да палка і смарганула за посцілку. З-пад яе паказаўся пасінеўшы твар нежывога Сцяпанкі.

ШЧАСЛІВАЯ

Не першына: калі шанцуе, то і Халімон танцуе, а іншаму: куды ні кінь, усюды клін. Вось гэткія кліны скрозь спатыкаў на сваім жыцці Юрка Сухавей. Вёска вялікая, зямля ўдалася, усе жывуць дастатна, багата, адзін Юрка канец з канцом чуць-чуць звяжа. І каб-то сям'ёй праз лад ужо абсыпаўся, ці там гультаём такім ужо ўдаўся, або, не тут кажучы, да чортава зелля ласым быў, — ані думаць! А тым часам, як ні завіхаўся, як ні кідаўся Сухавей, — усюды спудлуе. Нажыве парсюка карміць — не есць; купіць карову — прычэпіцца нейкае ліха — капыты задзярэ; конь — на роўнай дарозе ўлегцы — нагу зломе... але гэта што! Мо Юрка купляць не ўмее, мо даглядаць, абхадзіцца з жывёлай не складзен — хай і так. Чаму ж, калі ваўкарэзіна барана з поля сцягне — то пэўна Юркі; каршун курыцу дзярэ — толькі Юркі; сабака ашалеў — ну, значыцца, Юркі; жарабё ў студні ўтапілася — і не пытай — Юркі! Усё Юрку не ўдавалася, а найгорш не ўдалася яму, паміж намі кажучы, жонка — Тадора. Апісваць яе вам не буду: хто такую жонку мае — той сам ведае, а хто не мае — хай жыве (Тадор хапае на свеце) — вось і будзе ведаць... Мусіць-то, не дарма казалі суседзі аб Сухавею, што дзве пілы ў хаце: адной — сам дровы рэжа, а другая — яго самога пілуе... А найгорш пілавала свайго мужыка Тадора за беднасць у хаце. А як тут было разбагацець Сухавею пры гэткім яго шчасці? Добра і то, што галоднымі не сядзелі. Добра каму, але не для Тадоры. Хай бы лепш прыгаладаць, абы грошы ў запасе былі, багатырамі звацца.

Тым часам гады мінаюць, а багацця як няма, так няма. Што тут рабіць? Вось і надумалася Тадора выправіць свайго да знахара па раду: мо з вачэй ім гэтак вядзецца. Доўга скроб патыліцу Юрка, але такі паехаў. На трэці дзень ледзь вярнуўся Сухавей, і то ўночы, Та-

дора і не чула (нашто богу грашыць: паспаць любіла смачна), як увайшоў ён у хату, як доўга капашыўся, пакуль не ўзлез на палок і таксама смачна і моцна не захроп.

Назаўтра, як толькі накінулася з пытаннямі на мужыка Тадора, ён і прызнаўся, што ўся віна ў няшчасці з дабыткам яго — Юркі (так знахар яму і сказаў).

А віна вось у чым. Нябожчык бацька пакінуў замазаны гаршчочак з грашыма, а ён крыўся з ім дагэтуль перад жонкай, дык бог за тое, відаць, і кару насылаў на яго дабро. І, збедзіўшыся, нясмела аддаў Юрка той гаршчочак жонцы.

Тадора, першы раз трэснуўшы кулаком мужа з радасці (тыя кулакі, што бывалі — заўсёды ў злосці) і схапіўшы ў дрыжачыя свае рукі скарб, стала трэсці ім каля вуха: там і звінела, і шуршэла; былі, відаць, і пабразгачы, былі, мусіць-то, і паперкі.

Як кот з салам, лётала Юрчыха з гаршчком, каб дзе лепш яго захаваць; урэшце ўпхнула яго сабе пад сяннік.

З гэтага часу, хоць, праўду кажучы, гаспадарка таксама не ладзілася, але жыць стала спакайней. Тадора моўчкі соўгалася па хаце, не лезла больш у вочы мужыку, Юрка ажно павесялеў.

Не раз, бывала, дагаварваўся, усміхаючыся, Юрка да таго гаршчочка, каб як пажывіцца падмогі на гаспадарку, але Тадора слухаць не хацела; не хацела нават адпячатаць і палічыць сваё багацце. Выме гаршчок, патрасе яго, прыслухаючыся, каля свайго вуха, патрасе ім каля вуха Юркі дый зноў, запхнуўшы пад сяннік, радасная, шчаслівая клалася на пасцель, цешучыся, як гэты скарб муляў яе бакі.

Але, ці то гаршчок гэты такі цвёрды быў, ці то думкі неспакойныя а цэласць скарбу дакучалі Тадоры, а мо адно і другое, толькі сон зусім прапаў у яе. Прапаў спярша сон, а пасля прапала і ахвота да яды. Стала Тадора ў вачах бялець, сохнуць. Раілі суседкі Тадоры ўдацца да

знахара, але яна і слухаць не хацела. Не жалела Юрчыха апошняй двузлоткі на знахара, каб разбагацець, але цяпер хоць бы і сабе — ні за што не згадзілася б надпачаць скарбу.

Дый нашто ёй лячыцца, калі ёй нічога не баліць. Галава толькі круціцца, іншым разам млосна крыху робіцца , — дык не дзіва: не спіць, зусім не спіць. Вось каб хоць разок заснула, як даўней спала: моцна, смачна, і ўсё б было добра...

І Тадора заснула, моцна заснула: навекі, а па яе высахшым, забялеўшым твары відаць было, што ўмірала радасная, шчаслівая — умірала багатая.

А Юрка, дастаўшы яшчэ з-пад цёплага цела жонкі гаршчок, выйшаў на двор і бразнуў ім аб камень. Адтуль пасыпаліся брудныя паперкі газецін і бляшаныя гузікі...

ВЯСЕЛЛЕ

Давялося ўдаве каршунісе (мужа нядаўна Паўлюк забіў суком на сметніку: надта ўжо з курыцай завёўся!) дачку замуж аддаваць. А паміж каршуноў (гэтак ужо вядзецца), каб гонару сям'і сваёй не зняважыць, толькі паміж сабой і бяруцца. Вось і каршуніха, як прыстала на ганорную матку, нагледзеўшы лоўкага, маладога каршунка, стала рыхтавацца да вяселля.

Дачка і кажа: «Замуж, мамка, пайду, — спірацца няма чаго: такая ўжо доля наша дзявочая, але вяселле спраў як мае быць».

Добра: вяселле — дык вяселле. Хай пацешыцца дачушка паміж сваіх елак! Дый сама каршуніха не ад таго; дарма, што мужавы костачкі яшчэ не пагнілі.

Каго ж прасіць на вяселле? Старая каршуніха і стала вылічаць.

— Перш-наперш, — кажа яна, — салавейку: ён, калі завядзе, ажно за сэрца хапае, — так яно і трэба на вяселлі! Пару галубкоў: для прыкладу, як маюць жыць маладыя. Сароку — канешне трэба: па ўсёй ваколіцы разнясе, якое важнае было вяселле. Удота...

— Мамка, — перапыніла маладая, — я памятаю, як ты яшчэ малую мяне накарміла раз удотамі, — надта смярдзючыя яны...

— Маўчы, дурная! — прыкрыкнула на дачку каршуніха.— Маладая ты — не ведаеш яшчэ, як на свеце жыць! Смярдзючы ўдот — то праўда; але, калі прыбярэцца дый нашупырыцца, дык іншаму здаецца, што і трэба яму смярдзець: ад важнасці, значыцца. Прасіць і цецерука: у яго такая гутарка, што ніхто яе не разбярэ; вось і будуць думаць, што надта нешта разумнае! У музыкі клікнем дзятла з жаўной: хай у барабаны таўкуць. Дразда — падсвіставаць, бач, майстар. Бухайлу, хоць аддае балотам, але да дуды складзен. На цымбалах добра рэжа

бусел, але з ім нам не варта займацца: праз лад ужо насаты. З нас і так будзе; хай малады з сваёй стараны прымчыць.

Слухаючы гэтых праектаў, маладая з радасці ажно з сука на сук стала скакаць.

Толькі, як прыйшлося выбраць пасланца па госці, аніяк не маглі прыдумаць, каго б тут назначыць? Урэшце згадзіліся на сініцу: надта ўжо дасужая — ці трэба ці не трэба — усюды дападзе, усюды загляне дый набрахаць хоць што можа!

І праўда: зрання наказалі, ды йшчэ поўдня не мінула, а яна ўжо назад з дакладам прыпёрла.

— Так і так, — кажа, — усюды была, усіх абляцела, з усімі гаварыла, усе іх гутаркі падслухала, усе іх думкі выведала. Надта ўжо ўсцешыліся і шлюць падзяку за такі вялікі гонар і неспадзяваную ласку вашай міласці, толькі баяцца...

— Чаго? — насупіўшыся, пытае каршуніха. — Казала ім, як я табе прыказывала?

— А як жа, казала, ваша міласць, усё казала! — для пакоры падняўшы хвост уверх, адказвае сініца. — Казала, што ваша міласць і ўсе вашай міласці сваякі з вялікай сваёй ласкі да нас, дробязі, у дзень вяселля панадзяюць мяккія рукавіцы на свае капцюры, дык, калі і выйдзе якая звадка (ведама, на вяселлі), ніякай крыўды быць не можа. Але ведама — дурныя! Чаго яны не выдумаюць?! Хочуць...

— Чаго хочуць? — перапыніла каршуніха.

— І казаць не адважуся... — зноў падняўшы хвосцік, адказвае сініца.

— Ну! — налягала старая.

— Хочуць, каб ваша міласць і ўсе, каторыя будуць на вяселлі, з роду вашай міласці, на той час панадзявалі мяшэчкі на свае шаноўныя глюгі, ды і то баяцца...

— І так баяцца? Якая ж яшчэ трасца ім патрэбна?— злосна спытала каршуніха.

— Я ж і кажу: дурныя! Хоць на ўсялякія шальмоўствы, нябось, розуму хапае. Кожны з іх не такі, то сякі, а ткі мае на сваёй душы грашок. Я вашай міласці ўсю праўду выкажу. Вось хоць бы цецярук? Ці ж гэта выпадае на ўвесь бор — гэткі-то бор, гэтак балабаніць?! Ведама, бор — борам, каго толькі там не бывае, а ён балабане, балабане дый яшчэ падшыкне! Або сарока? Вядомая брахуха! Брэша, абы брахаць, а іншаму можа здавацца і вунь што... Салавейка, дрозд нават панавучваліся такія рэчы свістаць, што не асмелюся і сказаць вашай міласці... Дый усе яны, бабры — дабры, а хоць пашпарты і маюць, усё ж ткі баяцца, што як з дому скрануцца, пакуль дападуць пад апеку вашай міласці, каб часам у дарозе...

— Годзе! — крыкнула каршуніха. — Можаш адпраўляцца.

. . . . . .

А ткі каршуніха справіла вяселле сваёй дачцэ як мае быць! І ці дасцё веры: былі там цецярук, дрозд, усе другія, толькі не ў гасцях, а... на скаварадзе!

СІЛО

Ціснуў мароз; круціла мяцеліца. Паміж гумна і адрыны, дзе на гурбе стаяла сіло, абсыпанае ўвакол мякінай з канаплямі, было крыху зацішней. Забраліся сюды снягір, верабейчык і сініца.

Снягір, важна насупырыўшы чырвоны свой валяк дый пасвіствaючы, як і ўвесь свой век рабіў, стаў падбірацца да канапель.

Дзюбануў раз, другі асцярожна, але, разласаваўшыся, апанавала яго такая прагавітасць, што ўзлез на самую сярэдзіну сіла ды давай малаціць, ажно пакуль пятля не зацінула яму шыі.

— Чык-чы-рык! — усцешыўшыся, пачала здзеквацца над ім сініца, бо за снегіром сама баялася даступіцца да канапель.

— Чык-чы-рык! — крычала яна, увіхаючыся каля зярнят, дый не агледзелася, як сама абедзве нагі ўплутала ў валасянку.

— Жыў-жыў-жыў! — адазваўся верабейчык, скачучы здалёку сіла і набіваючы мякінай свой валяк. «Жыў-жыў-жыў!»

ПАВУК

У сетку з дзіўна хітрасплеценых нітак папалася муха.

Сетку зрабіў і наставіў павук. Зрабіў і наставіў, — як рабілі і настаўлялі такія ж самыя сеткі павуковы дзяды і прадзеды.

Папалася ў сетку муха, як пападаліся ў такія ж сеткі яе бабкі і прабабкі. Як там было ў гэткіх сетках бабкам і прабабкам, муха чула і ведала, але цяпер, трапіўшы сама туды, як толькі наляцеў на яе павук з сваімі клюшнямі дый пачаў накідаць кандалы, сцягваючы і звязваючы імі крыллі з ножкамі, — яна заартачылася.

— Слухай ты, — кажа, — крывапіўца: натуру тваю дасканальна знаю і ведаю, што дабра ад цябе не спадзявацца; дай жа хоць слова сказаць...

— Э-э, — адказвае павук, — ведаю я гэтыя гутаркі вашыя — старая песня! Кожная з вас, як толькі пападзецца да мяне, усялякімі тонамі галосіць: «Павук крывапіўца!» А ці ж я адзін такі? Ці мала такіх жа крывапіўцаў паміж вашага брата? Глянь на аваднёў, камароў: іх цэлыя хмары! Ды і з твайго роду ёсць такія, што калі ўрэжа ў лытку...

— Не, павук, — перапыніла муха, — тое — дый не тое: праўда, ссуць і яны кроў, але жыцця не адбіраюць, а і то, праўду кажучы, хоць іншым разам і ім не даеш ты спуску, усё ж такі лічым мы іх больш тваімі спадручнікамі, чым нашымі. Такія, як я, нічога супольнага з імі не маюць: мы жывём божым дарам...

— Чым бы вы там ні жылі, — ужо злосна пераняў мову мухі павук,— гэта мне ўсё роўна; мне толькі абы была кроў, а пакуль ваш род не звядзецца, то і павукам крыві хваціць.

— А ці ведаеш жа ты, пракляты вісельнік, — пачала муха, — што хоць згіну я, згіне мо яшчэ не адна такая, як я, але як зразу наляціць цэлы рой мух, ударыць у

тваю сетку, тады не толькі яна паляціць у ласкуткі, а, бадай, і ты жывым не выйдзеш? Здзекаваўся ты, пакуль па адной нас перабіў, але зыкну я толькі, і цэлая хмара...

— Ха-ха-ха! — зарагатаў павук і наляцеў ужо на галаву мухі. — Зыкнеш? Ты зыкнеш? Недачаканне! Недачаканне тваё!!

І павук, запеніўшыся са злосці, як бач прабіў галаву мусе і пачаў смактаць з яе кроў.

Ніколі, здавалася павуку, не смакавала так яму кроў, як гэтай мухі. Ніколі такой прагавітасці ў яго не было, як вось цяпер. Вісеў ён над мухай, ажно пакуль што да капелькі крыві не выссаў з яе, і тады толькі адбегся і глыбока заціснуўся ў сваю шчыліну.

Хоць сыт быў — не спаў гэтай ночы павук. Неспакойныя думкі наляталі на крывёй заліты павуковы мозг. А што, калі і праўда наляціць зразу цэлы рой мух? Ці ўтрымаецца сетка? Ці здолее ён даць усім адразу рады? І як гэта адважылася гэткая паганая муха такое слова яму, яму — павуку сказаць? Не адна муха мо не раз ужо і думала так, але каб сказаць?

Не спаў гэтай ночы павук, а назаўтра, надумаўшыся, зрабіў і наставіў новых яшчэ дзесяць сетак...

ГАДУНЕЦ

Каля крыжавых дарог пад узгоркам разрасліся кусцікі: пад'яловец, сухадрэўка і лаза. Кусцікі былі дробныя. Гулялі ветры лютыя і абрывалі лісточкі з іх; праляталі навальніцы страшэнныя і крышылі галінкі іх; каціліся паводкі глыбокія і падмывалі карэньчыкі ім. Дрэнна, зусім дрэнна стала жыць кусцікам...

Вось у цёмныя ночкі сталі шаптацца паміж сабой кусцікі, каб як долю сваю паправіць. Раіліся, раіліся і ўрэшце прыдумалі ўзгадаваць паміж сябе такое велізарнае дрэва, каторае бы густымі лістамі сваімі ад ліхіх ветраў закрывала іх, вялікімі галінамі сваімі ад страшэнных навальніц сцерагло, тоўстымі карэннямі сваімі ад глыбокіх паводак бараніла.

Траплялася не раз — памяталі кусцікі, — як паміж іх заляталі зярняты з вялікіх дрэў, але яны і ўвагі на іх не звярталі: паляжыць гэтакае насенне, паваляецца, і то вецер далей яго гоне, то яно засохне і згіне. Але цяпер — пасля нарады — на першае зерне, якое да іх трапіла, сыпнулі кусцікі сваімі лісточкамі і іголачкамі і, гэтак прыкрыўшы, сталі шанаваць і сцерагчы яго. З пестуна на другі год — на вясну — паказаўся расток, і пагнала яго ўгару. Цешыліся кусцікі і, каб даць выгоду свайму гадунцу, не жалеючы, падсыпалі і падсыпалі яму то лісточкаў сваіх, то іголачак.

Шмат год прайшло з таго часу, але ўсё ж ткі прыждалі кусцікі, калі іх гадунец — дрэва разраслося на здзіў высокае, на здзіў шырокае, на здзіў густое. Надзея кусцікаў, што вось-вось цяпер настане для іх новае, спакойнае, лепшае жыццё, цешыла іх бязмерна.

І праўда. Таўстое карэнне, вялікія галіны, густыя лісты бараніли іх ад ворагаў: паводак, навальніц, ветраў, — але гадунец гэты закрыў ім і... сонца.

І — пагінулі кусцікі!

СУД

Эх, браточкі, кепска стала жыць на свеце, калі ўжо за курыцу сусед суседу анэгдысь * калом галаву пашчапаў, ды пасля за гэтую самую курыцу (ведама, спусціўшы адзін другому юху) будуць цягацца па следавацелях ды па судах. А што за шкоду зрабіла курыца? От, вырвала на гародзе бурачкоў на пядзі тры. А ім, гэтым задзіракам, колькі гэта курыца будзе каштаваць? Цэлага падцёлка, калі не больш! Няма цяпер памеж маладых дабра.

А вось паслухайце вы, якія ў нас даўней былі суды. Нябожчык Янка (вечны пакой яго душы), «махляром» што звалі, забраў са свайго аўса двох быкоў Рыгора Канцавога; праўда, аўса з'есці — мала з'елі, але шмат стратавалі; дома пагадзіцца — не пагадзіліся, напісаў пахтар * прашэнне, і пайшло ў суд.

Цешыўся і я з гэтага, бо ўжо колькі часу, як і на маіх шнурах пасля ночы атава была стратавана — не інакшай — як гэта работа Рыгоравых Лысага і Падласага! Але, не злавіўшы за руку, не кажы, што злодзей. Шмат было гутаркі аб гэтых быках у вёсцы, толькі мне Сталючонак падшапнуў, што, як уночы хадзіў на рунь пільнаваць зайца, бачыў на маёй атаве кабылу ўдавы Габрэлі хі. Эге, думаю сабе, недачаканне: злаўлю і я.

Павячэраўшы, зараз абуў лапці, насунуў кажух дый ціхенька шусць праз сенцы на гумнішча, гоцнуў праз плот ды борздзенька на мяжу і бух!.. Ляжу... чакаю...

Толькі першыя пеўні прапяялі, як чую: едзе нехта на маю атаўку. Мусіць, і адной малітвы не паспеў бы чалавек прагаварыць, ходзіць ужо Габрэліхі кабылка па маёй атаве і хрумшчыць, аж пена ідзе, а за аброць трымае ды водзіць сама Габрэліха. Здуру пагарачыўся я і, не пачакаўшы, каб бліжэй мяжы падышлі яны, крыкнуў, скокнуў да кабылы. Але і Габрэліха, каб яе паралюш, спрыт-

на была кабеціна: як бач, на кабылу ды ўскочку наўцёкі. Гнаўся я, гнаўся, але па ночы куды там!.. Назаўтра, чуць свет, узяў я старасту, двох панятых, і следам якраз давялі. Прызналася і Габрэліха, але заплаціць за шкоду не хацела. Падаў я на суд.

Праз якіх два тыдні прыходзяць нам павесткі: і Рыгору з Янкам, і мне з Габрэліхай — усім на адзін дзень. Паехалі. Міравы суддзя быў у нашым участку немец, і надта цяжка было з ім разгаварыцца, мала нашай гутаркі ён разумеў, а мы яго яшчэ менш.

Выклікае на сам перад Янку з Рыгорам і пытае:

— Ну, как біль?

— Не, — кажуць, — ваша скародзе, далібог, мы не біліся...

— Балван, — закрычаў суддзя, — я спрашываю, какой патрава?

— Не, — кажа Янка, — не па траве, а па аўсе, ваша скародзе, хадзілі Рыгоравы быкі.

— Какой бік?

— Лысы і Падласы, ваша скародзе.

— Болван, мошэннік! — яшчэ горш закрычаў суддзя. — В прошэні кафаріт воль, а теперь — бік! Сам не знаеш, хто імел потрава! Ідіте дамой! Мне время нет! Дело кончено!

Выйшлі Рыгор з Янкам, а я стаю і дрыжу: не іначай як пахтар наплутаў у прашэнні і замест быкоў упісаў валоў. Ах, каб яго ліха! А калі і ў маім прашэнні змяніў ды замест кабылы напісаў каня? Стаю, дрыжу і языка ў губе забыўся. Стаю, шапчу, каб не збіцца з панталыку: «Кабыла, кабыла, кабы...» А тут якраз кліча мяне з Габрэліхай! Выйшаў я... стаю... дрыжаць калены (першы раз на суд папаў), бачу — і Габрэліха збялеўшы стаіць. «Кабыла, кабыла, кабы...» — шапчу я, аж тут трах! Міравы і пытае:

— Ну, как?

— Кабыла, — кажу, — ваша скародзе.

— Как кабыла, кто?

— Габрэліха — ваша скародзе.

Але ўжо ані вочы мае не бачаць, ані вушы не чуюць... стаю... дрыжу... як праз туман бачу — суддзя смяецца дый зноў пытае:

— Кто кабыла? Кто?

— Удава, Габрэліха, Ваша скародзе! — Але ў вачах неяк весялей мне робіцца; мусіць, справу выйграю, бо суддзя замест гневу смяецца ды ізноў да нас:

— Ну вот і карашо, ты, — кажа, хоць і мужчына, но маленькі, а она хоць і баба, но, правда, большая кабыла. Так вы лучше так... без суда. Зачем суд? Помертесь!

Глянуў я на Габрэліху, зірнула яна на мяне. Стаім, чакаем, што будзе.

— Но, ідіте, — кажа, — в корідор — помертесь! На то соседі — зачем суд?

Выйшлі мы ў калідор. Глянуў я на Габрэліху дый думаю сабе:

«Кепска будзе. Хоць віна і яе, але як прыйдзецца да меры, дык рады не дам — баба рослая!»

Сталі мы гэтак бокам. Узняўся я на цыпачкі, і так на корх не хапае. Габрэліха, каб ёй дна не было, дагледзела гэтую штуку дый кажа:

— Не, суседзе, гэта не мера. Калі суддзя сказалі памерыцца, дык трэба памерыцца як мае быць. Суддзя лепш ведае, што і як трэба да справы. Давай плячыма станем.

Як сталі плячыма, а баба яшчэ ўчапілася за маю бравэрку ды ціснє ўніз, каб на цыпачкі не ўзняўся, — дык куды там! Бадай, не на ўсю галаву ніжэй я росту. Уздыхнуў я, але што ж зробіш — воля божа! Вярнуліся ў камеру, а тут суддзя і пытае:

— Ну, как?

— Памерыліся, — кажам, — ваша скародзе!

— Вот і хорошо! Ідіте, — кажа,— з богам домой, дело кончено, я ошень рад!

Выйшлі мы. Толькі... але што там валаводзіць? Хочаце ведаць, які канец? Думаеце, што зараз, як цяпер вы, маладыя, зараз у з'езд, у палату, у Пецярбург? Ані думаць! Да Бэркі трапілі і Рыгор з Янкам, і я з Габрэліхай. Што і як там было?.. Ат, было як было, але з таго часу не ездзілі на суд.

ВАЖНАЯ ФІГА

(Ахвярую добрым свякроўкам)

— А што, каб цябе паляруш, мая ты кветачка, каб табе дух заняло, мая ты ягадка, — усціхла, нябось, — спакарнела! Не шкодзе, не шкодзе!! Але што я бяды набралася, пакуль гэтага, мае вы кветачкі, дабілася; што я стыду, злосці і слёз глынула?! Матачцы боскай, мае вы ягадкі, іх ахвяровываю.

Бо як жа ж! Падумайце самі: гэтакае, шануючы бога і людзей, шчанё, што яшчэ і малако на губах не абсохла, — будзе пад мой нос — свякровін нос, — мае вы кветачкі, фігу падтыкаць?! Няма што казаць: усцешыў мяне сынок, усцешыў — чаго на старасць прычакалася! А ўсё, бывала, прыставаў да мяне: «Мамка, мамка, вазьму я Агатку, хоць маладая, але не бедная, цялушку, дзве авечкі, парасё і 30 рублёў пасагу дадуць, і дзяўчына гладкая, як качалачка, і гаспадарная, і рупная...» — «Бяры, — кажу, — сынок, мая ягадка, хоць і Агатку — па мне што? Не я, а ты, Сымонка-дзіцятка, будзеш з ёй жыць; я ўжо старая, нядужая і вады вам не замучу». Рупная? Праўда, што рупная: парупілася матчын нос, мае вы кветачкі, фігай падціраць! А спытайцеся, за што? Вось паслухайце, мае вы ягадкі.

Спачатку, — як толькі Агатка ўзяла ўсю хатнюю гаспадарку ў свае лапы, — ішло і ціха, і складна — от ведама як спачатку. Раніцай, бывала, прыставіўшы абед, пабяжыць каровы падаіць, свінням замяшаць, ну і падойдзеш да прыпечка па-даўнейшаму, мае вы кветачкі, гаршкі паправіць, пераставіць, у каторы солі падсыпеш, у каторы вадзіцы падліеш... Прыбяжыць Агата, угледзіць і зараз, мае вы ягадкі, на мяне накінецца: «Нашто, мамка, чапаеш? Нашто груцу перасаліла? Нашто квас, як памыі, вадой развяла?» І пойдзе, і пойдзе сыпаць! А то, часам, сынок як выйдзе з сахой ды замарудзіць на

палудзень, так зараз яна, Агата, значыцца, мае вы ягадкі, тыц у печ — скварку выцягне, стравы чабохне ў міску. «На, — кажа, — мамка, з'еш крыху, старая ты, можа млосна зрабіцца... а я паляту з спарышамі к Сымону на поле». — «Што ж ты, — кажу, — нявестачка, каб цябе трасца, мая ты ягадка, такая ўважная на маю старасць, а там Сымонка спрацаваны, галодны, як воўк, чакае — абыдуся без тваёй ласкі»,— ды бразь ёй міску пад нос!.. Праўда, першыя дні, бывала, нічога не адкажа і пабяжыць; але іншым разам здарылася ізноў прыпазніцца Сымону на полі... Наліўшы спарышы і не гледзячы, не чакаючы ўжо на мяне, паляціць... Чакаю я, чакаю, мае вы ягадкі, аж злосць ужо мяне добра забірае, і як толькі на парозе пакажацца нявестка, ну і дам ёй тады дыхту! Бо як жа, мае вы ягадкі, кінуць галодную старую матку, а самой ляцець з ядой перш да мужа; мо там і стравы сама нацурболіцца, а ты хоць зубы на паліцу кладзі. Ну і тыцнула я ёй раз фігу пад нос адну-аднюсенькую, а яна, мае вы ягадкі, мах па фізе; і то жалься божа, якая гам была фіга. Я ёй тады другую, трэцюю, аж і яна мне тыц пад нос фігу, ды якую?! Махнула я па фізе дый не папала, а што махне яна, то якраз урэжа. Як пайшлі гэта мы частавацца, мае вы ягадкі, фігамі, дык аж пакуль не вярнуўся Сымонка і не расцягнуў нас. З таго часу, мае вы ягадкі, амаль не кожны дзень пайшлі фігі, аж рукі сабе паадбівалі: то за яду, то за печ, то за промешку, — дый мала за што — ведама — жыўшы ў адной хаце.

Не змагла сцярпець я гэтай паняверкі, дай, думаю, схаджу да земскага — пажалюся... Праўда, ісці прыйшлося далёка — вёрст 18, але неяк зацягнулася і ўсё як мае быць расказала яму.

«Ну, — кажа, выслухаўшы мяне, земскі, — во што я табе скажу: па судах цягацца табе няма чаго, дый грошы трэба, а я і так раду дам: не лезь да печы, а лепш на печ, сядзі ды прадзі і не перашкаджай працаваць

маладым; з гутаркі тваёй бачу, што яны табе, старой, хлеба не пашкадуюць». — «Добра, — кажу, — паночку, мая ягадка, хай і так будзе, але толькі як жа будзе з гэтымі фігамі, я па яе не пападу: баба вёрткая, — а яна мае фігі таўчэ ды таўчэ?» — «Добра,— падумаўшы, кажа земскі, — і на гэта дам раду: давай руку!»

Узяў гэта ён маю правую руку, мае вы кветачкі, круціў, круціў мае кастлявыя пальцы, думала, што ўжо хіба паломе іх, але сагнуў неяк такі ў кулак і пытае: «Што гэта?»

Калі гляну: ягадкі мае, фіга! Ды і то не адна, а дзве велізарныя фігі з аднаго кулака злажыў, даліпан, фігі. Я і кажу: «Фігі, панок, мая ты кветачка».

«Ну от і добра, — кажа. — Нясі ж ты гэтыя фігі дадому і падаткні нявестцы пад нос: скажы, што земскі прыслаў. Няхай пасмее ўдарыць па фігах земскага? Але помні сабе, што толькі па гэтых фігах калі ўдара, то падавай у суд, а як раскруціш пальцы ды сама зложыш, то няхай сабе ізноў таўчэ табе пальцы, — я бараніць не буду».

Пайшла я. Іду, паглядаю ўсё на рукі; як гляну на фігі земскага, гэткага-то пана, аж уцеха, мае вы ягадкі, бярэ. Праўда, спачатку балелі пальцы гэтак пакручанымі нясці і нявыгода вялікая, але апасля скрэплі яны, і кулак неяк такі данесла дахаты. Уходжу — бачу: нявестка каля печы круціцца, Сымонка хамут абшывае, дзве кумы сядзяць — гукаюць. Я барзджэй да нявесткі: Так і так,— кажу, — земскі табе, мая ты ягадка, гасцінец прыслаў — фічкі са дзве! Папрабуй жа ўдарыць па земскага фізе?!. Дый тыц ёй кулак пад нос... Праўда, збялела яна як палатно, аж губы задрыжалі, але ўдарыць — не ўдарыла. Я і давай ёй тыкаць раз-пораз. Падбег Сымонка бараніць, — я і яму тыц, умяшаліся кумы — наце і вам! Папрабуйце, кажу, зняважыць земскага фігу! Кумы драпанулі, разбрахалі па вёсцы, — пачаў збірацца народ і з пашанасцю аглядаць важныя фігі, я і іх пачаставала.

Іншы зарагатаў, іншы абідзіўся, але крануць не пасмелі!

Толькі, мае вы кветачкі, нядоўга я цешылася, частуючы як мага суседзяў, зачапілася, каб яго агонь, за тапчан — грымнула, і фігі раскруціліся!

З таго часу не лезу я ў вочы маладым, але і нявестка баіцца мяне, як агня, — каб ізноў не пайшла да земскага, мае вы ягадкі, па фігі.

САКАТУШКА

Складна жылі перапялёсценькая Сакатушка з сваім, як агонь, чырвоным пеўнем — Дзярыгорлам. Складна жылі, а з гэткага складнага жыцця — так ужо вядзецца — адзін крок да клопату.

Вось адной неяк імглістай раніцы падгледзеў Дзярыгорла, што ў шыпшынніку каля каменя яго перапялёсценькая прызапасіла кучачку яечак. Колькі там было гэтых яечак — хто іх ведае, але кучка ладная, і ўсё адно ў адно: жаўтаваценькія, з тупаватымі пяткамі. Дзярыгорла і кажа Сакатушцы: «Пара было б заняцца імі: сесці дый пагрэць, мо што выйдзе...» — «Сесці — села б, — адказвае перапялёсценькая, — але часу шкада (надта ўжо дасужая была!): маладая яшчэ я, сіл хапае, яшчэ з адну такую кучку нанесла б. Пад восень прыдаліся б. Хоць то праўда, ночы доўгія, халаднаватыя, моладзь выходзіць нягеглая, але выкачала б неяк; усё ж ткі з сваімі лепш зімаваць, як з чужымі; а тут за матэрыялам на лушпіны трэба далёка лётаць: за ток — на жвіровую гару; за млын — да вапеннай печы. Папрасіла б зязюлястую сесці — нянька хоць куды,— але тая сваімі занялася, а на іншых здацца — маладыя яшчэ, няздары, вецер у галаве, гатовы недаседзець, — боязна...

— Дык як бу-у-дзе? — на ўвесь садок, дзе рос побач з іншымі кветкамі шыпшыннік, закрычаў Дзярыгорла.

— Ціха! — перапыніла яго Сакатушка, — не крычы: пачуе гаспадыня — увесь скарб наш забярэ; прагавітая, нябось: за кавалак медзі гатова ўсю нашу надзею зніштожыць! Паслухай лепш маёй рады, Дзярыгорлачка,— ласючыся, стала ўмаўляць Сакатушка, — што маеш цягацца за бараду з гэным суседнім чорным Кукарэкам — было б яшчэ за каго, а то самыя смяцюшкі, недаросткі, — сядзь сам, а я займуся сваёй работай. Толькі глядзі: пакуль не вярнуся падмяніць, з гнязда не злазь,

бо прыкрыць не патрапіш і ўвесь наш заход прападзе марна. Яды мо неяк прымчу, дый седзячы не многа яе і трэба.

Няўсмак прыйшоўся гэты праект Дзярыгорлу, але чаго не зробіш для радні. Працінуўся, бядак, праз калючае галлё шыпшынніку і, насупіўшыся, з павагай рассеўся на гняздзе. Сакатушка, увокал агледзеўшы, папраўіла сухія лісточкі каля гнязда, абаткнула яго сіўчыкам і, пакруціўшы галоўкай, памчалася на суседнія гароды.

Першы дзень скора праляцеў Дзярыгорлу; на другі — з самай раніцы млосна рабілася, але неяк дацягнуў да канца; надышоў і трэці дзень, Дзярыгорла маніўся ўжо злазіць, пашукаць яды, але нешта аслабеў зусім — ногі памлелі і не выпрастаць, дый, праўду кажучы, баяўся папсаваць справу і, хоць грэбень абвіс, барада пабялела, — астаўся-ткі сядзець...

Пад канец другога тыдня, дзеці, збіраючы кветкі ў садочку, дагледзелі ў шыпшынніку Дзярыгорлу і выцягнулі адубеўшага за ногі.

А Сакатушкі як няма, так няма. Што з ёй стала? Мо ястраб задзёр? Мо дзе заблудзіла? Мо... э-э, ды хто там згадае гэтых Сакатушак?!.

ШТО СКАЗАЎ ПЕВЕНЬ

(Казка)

Жыў-быў на свеце такі чалавек, каторы разумеў усю гутарку ці то скаціны — звяр'я, ці птушак божых; ці як лес шуміць, ці трава шапаціць. Толькі нельга яму было прызнацца да гэтага: скажа каму — самому паміраць трэба. Меў гэты чалавек жонку, і жылі яны паміж сабой складна. Гаспадарку мелі невялікую: асла і быка. Асёл стаяў у хлеве і авёс жраў, на быку гаспадар вазіў дровы і карміў яго саломай.

Вось аднаго разу прывёз гаспадар галля з лесу, адпрог вала і пусціў у хлеў; не паспеў яшчэ і варот прычыніць — чуе, стаў вол жаліцца аслу: «Паганае маё жыццё, братка асёл, пашанасці і ўвагі ніякай не маю ад свайго гаспадара: араць—ты, Рабы, ідзі; вады прыцягнуць—запрагай Рабога; дроў прывезці — зноў Рабы ў адвеце. Усё як Рабы, дык Рабы: каму пугай па баку? — Рабому; каму яда — салома? — Рабому. А вось ты, асёл, стаіш, нічога не робіш, а сена ды авёс толькі глуміш!» Разжаліўся асёл над доляй Рабога; стаў ківаць ён сваёй вялікай галавой, каб прыдумаць якую раду для вала. З вялікай натугі свайго аслячага розуму застрыг доўгімі вушамі дый, апусціўшы ісподнюю лупу, зашаптаў: «Ты, вол, захварэй, дык гаспадар і да работы цябе не возьме і карміць лепш пачне».

Пачуўшы гэта, гаспадар вярнуўся ў хату ды смяецца сам сабе. «Чаго смяешся?» — пытае жонка. «От, так сабе смяюся», — адказаў мужык.

Назаўтрае, даў бог дзень, пайшоў гаспадар у хлеў. Глядзіць: вол, адкінуўшы хвост і галаву, ляжыць на баку дый паглядае з-пад вока на гаспадара, што будзе? Гаспадар, быццам нічога не ведаючы аб хітрыках Рабога, закінуў яму сена, усыпаў аўса і, прыйшоўшы ў хату, смяецца. Жонка ізноў давай прыставаць да яго: «Чаго

шчырышся? Мо з мяне чаго? Кажы праўду!» Мужык і кажа: «Не магу я табе праўды сказаць, чаго смяюся, бо тагды смерць мая прыйшла б па мяне». На другі дзень ідуць гаспадар з гаспадыняй быка даведацца; ляжыць Рабы, хоць сена і авёс дачыста спытляваў, толькі на другі бок перавярнуўся. Гаспадар і кажа да жонкі: «Няма рады: зарэжам быка, бо страта будзе вялікая, а так то хоць што колечы выручым». — «Пачакай да заўтрага,— кажа жонка, — калі не паправіцца — рэж». Выйшлі яны з хлева, жонка пайшла ў хату, а мужык стаў пад варотамі слухаць, якая будзе нарада паміж яго жывёлай. Ажно бык і кажа аслу: «Дрэнную ты, асёл, раду мне прыдумаў; што ж мне без пары пад нажом гінуць? Цяпер парадзь, братка, як з бяды выкруціцца?» Думаў, думаў асёл — нічога. «Няма, — кажа ён, — іншае рады, папраўляйся, бык! Глядзі, каб заўтра ты быў ужо здароў, бо гэтыя жарты дрэнна могуць скончыцца: з цябе скуру злупяць, а мяне ў хамут на тваё месца ўшчэмяць!»

Чуўшы гэта, прыйшоў мужык у хату дый смяецца: «Заўтра наш Рабы здароў ужо будзе!» — «А ты скуль ведаеш? Чаго вышчырыўся? Кажы! — крычыць, тупаючы нагамі, жонка. — Зара мне кажы! Ты хіба нешта пра мяне ведаеш, што абы ў хату, дык смяешся! Ну!?» — «Смерці маёй ты, кабета, хочаш, ці што? — адказвае мужык. — Гаварыў я табе, што калі прызнаюся перад табой, чаго я смяюся, дык у той час паміраць мне прыйдзецца».

На другі дзень прыходзіць гаспадар у хлеў, ажно бык ужо стаіць ды скоса ўсё паглядае на яго рукі, ці не прынёс нажа з сабой; але гаспадар — нічога; адчыніўшы хлеў, выпусціў вала да вады і сам за ім ідзе. Рабы, каб паказацца перад гаспадаром, што ён саўсім ужо здароў, паставіўшы хвост дагары, як дуду, давай выбрыкваць, як мага, заднімі нагамі, а сам збоку паглядае, ці добра бачыць гэтыя штукі яго гаспадар. Але мужык, напаіўшы вала, загнаў яго ў хлеў, вярнуўся ў хату дый смяецца

сабе. Як угледзела ізноў яго смех гаспадыня, калі ўз'елася яна, калі не пачне яго лаяць. «Здохні ты, — кажа, — лепей, а скажы прычыну твайго смеху! Вытрываць больш не магу!» Зазлаваў і мужык. «Ну, — кажа, — калі табе не шкада мяне, хай ты пропадам прападзі! Даставай з кубла смяротную адзежыну, — скажу ўжо табе ўсю праўду, хоць сам памру!» Кінулася з радасці жонка да кубла, выцягнула смяротную адзежыну, а сама ажно ўстаяць на месцы з цікаўнасці не можа. Гаспадар, уздыхнуўшы, стаў памалу рыхтавацца на смерць. Скінуўшы апратку, памыўся, надзеў смяротную кашулю... толькі чуе гэта ён, як сабака, што ляжаў пад сталом, пачаў плакаць і кажа да пеўня, каторы хадыром хадзіў па хаце каля перапялёсценькіх курыц: «Ах, певень, певень! Як табе не сорам? Гаспадар уміраць рыхтуецца, а табе вунь што ў галаве!» А певень, пад'ехаўшы на адным крыле, калі зараве: «Дурны гаспада-а-ар! Я маю дзевяць жонак, дый ліха мяне не бярэ, а ён праз адну памірае!» Пачуўшы гэту гутарку пеўня, сціснулася спярша з жалю сэрца гаспадара, а пасля падпала такая злосць на жонку, што, доўга не чакаўшы, схапіў ён пугу ды калі стаў сцябаць сваю гаспадыню пугаўём, што тая з болю ажно занямела...

І спужаўся, і шкада зрабілася мужыку жонкі сваёй, усцягнуў ён яе на ложка, накрыў, а сам пабег па зелле да баб. Назаўтра, каб барзджэй жонка моцы набралася, зарэзаў і спёк для яе пеўня. Ачуняла ўскорасці гаспадыня, але больш ужо не лезла ў вочы свайму мужыку, і зноў сталі яны жыць паміж сабой складна.

ХЛЕБ

(З народнага апавядання)

Стаў ганяць стараста Пранука ажно ў павятовы горад адбываць там нейкія павіннасці. «Ах, каб з вас духі павыганяла!» — замармытаў пад нос Пранук, але ткі, хоцькі-няхоцькі, закінуўшы на плечы торбу з хлебам, пацягнуўся.

Раніцай — халадком — ісці было нішто, але пад паўдня стала прыпякаць, ногі пачалі млець, а тут яшчэ вяровачка ад торбы з хлебам муляе плечы Пранука. А ў дарозе, вядомая рэч, зразу зусім не чутно цяжару, а прайдзі толькі далей, дык і хунт пудам здаецца!

Перакідваў Пранук торбачку з аднаго пляча на другое, перакідваў, дый так нічога: рэжа!

— Вось каб цябе ліха! — стаў наракаць Пранук. — Сам чуць цягнуся, а тут яшчэ і хлеб нясі...

— Не ты мяне нясеш, а я цябе нясу, — адзываецца хлеб з торбы.

Забыўся Пранук і на дзіва, што хлеб загаварыў, толькі яшчэ горш узлаваўся:

— Дык ты гэтак?! Мала таго, што на плячах маіх ляжыш, — яшчэ агрызацца ўздумаў? Вось жа паглядзім, хто каго нясе! — дый бразь торбу з хлебам аб зямлю, а сам ажно ходу са злосці падбавіў.

Ішоў Пранук, ішоў доўга; але штораз часцей садзіўся спачываць, штораз часцей уздыхаў, штораз часцей сплёвываў і, не прыждаўшы яшчэ вечара, вельмі ўсцешыўся, угледзеўшы здалёку на дарозе карчму.

Зайшоў, дастаў капшук, вытрас з яго апошнюю залатоўку, што з дому ўзяў, каб было чым хлеб свой падкрасіць у дарозе, ды аддаў яе цяпер на хлеб і, ласа сухі яго грызучы, дагадаўся ўрэшце, хто каго нёс: ці ён — хлеб, ці хлеб — яго.

НАГРАДА

Прыгнаныя з усіх старон гасударства дактары і шаптуны ўжо лічылі, што толькі некалькі гадзін аставалася жыць іхняму цару цароў — Султану. Ніякай надзеі на ратунак не было: надышла апошняя ноч жыцця яго.

Ажно пад поўнач да канаючага Султана прыляцеў, як шалёны, з пляшкай нейкага зелля першы яго міністар і, прыпаўшы на адно калена перад хворым, крыкнуў:

— Выпі, пане наш, гэтае зелле і будзеш здароў!

Султан выпіў і назаўтрае ўстаў здаровым.

Цешыўся, але не дзівіўся народ, што першы міністар вылечыў Султана, бо каму ж і быць найразумнейшым, калі не першаму міністру?

Султан, клікнуўшы да сябе збаўцу свайго ад смерці, міласціва кіўнуў яму галавой і кажа:

— За тое, што выратаваў ты мяне ад смерці, даю табе маёнтак на паўмільёна рублёў.

— О, цар цароў! Ласка твая вялікая, — адказаў першы міністар, — але не я заслужыў яе, бо лякарства гэтае даў мне мой памошнік!

— Памошнік? — здзівіўшыся, пытае Султан. — Клікні ж яго да мяне. Але як ты падаў мне лякарства, так і назначаная награда няхай будзе пры табе.

Прыйшоў міністраў памошнік і, сагнуўшы калені, кажа:

— О, пане мой! Заслуга не мая: зелле даў мне мой сакратар.

—Калі даў гэткага добрага зелля твой сакратар, то твая вялікая заслуга, што ўмееш падбіраць сабе такіх разумных людзей, і за гэта даю табе сто тысяч рублёў, а сакратару выдай 50 тысяч наградных.

За колькі гадзін убягае шчаслівы сакратар да Султана і, пакаціўшыся яму ў ногі, кажа:

— О, сонца маіх вачэй! За такую вялікую ласку жыц-

цё я сваё гатоў аддаць, але не я заслужыў яе, бо лякарства даў мне старшы мой лёкай.

— Добра, — адказаў Султан, — свае грошы вазьмі і карыстай з маёй ласкі, а касіру майму прыкажы даць лёкаю твайму 10 тысяч рублёў.

Ускорасці ізноў убягае сакратар да Султана і кажа:

— Лёкай мой прызнаўся, што зелле гэнае даў яму кухар.

— Даць і кухару, — кажа Султан, — наградных тысячу рублёў.

Кухар, атрымаўшы грошы, пабег да міністра, кінуўся яму ў ногі і, як на споведзі, прызнаўся, што лякарства не ён зрабіў, а даў яму крамнік, дзе ён усё купляе.

Пачуўшы гэта ад міністра, Султан пераслаў крамніку сто рублёў.

Да слёз разжалены ад такой ласкі, крамнік пабег у Султанавы палац і шчыра выказаў, што лякарства гэнае даў яму знаёмы шавец, каторы прыходзіць да яго крамкі купляць цыбулю і хлеб. Зрабілі даклад Султану, а той па сваёй міласці вялікай даў прыказ паслаць шаўцу гасцінца: адзежы і боты.

Бясконца цешыўся шавец з адзежыны, але боты былі старыя, і латаць ён іх не хацеў; апроч таго, яго грызла сумленне за незаслужаную награду, бо лякарства тое даў яму знаёмы негр-жабрак, каторы ніякае апраткі не меў; і вось гэты шавец аддаў жабраку старыя боты...

І ходзіць цяпер збаўца Султанава жыцця хоць голы, але ў ботах...

ПРАТЭСТ

(Адкрыты ліст у рэдакцыю «Н. Н.»)

«Мы, ніжэйпадпісаўшыеся, аддыхаючы ці то грэючыся пасля цяжкай і сумленнай працы пад лавай або сталом у хаце, не раз чуем, як нашы гаспадары чытаюць пісаную ў іх мове газету «Нашу Ніву», у каторай часта ўспамінаецца слова «брахня». Брахнёй, як мы заўважылі, называець «Наша Ніва» выдумкі і лгарствы, якія прыдумваюць нейкія там нанятыя за грошы людзі. Проціў гэтага мы пратэстуем.

А пратэстуем вось чаму. Што іншага — выдумка і лгарства, што іншага — брахня. Брэшам толькі мы, сабакі. Дык ведайце, што брахня — не выдумка і не лгарства, бо ніводзін сумленны сабака ані за грошы, ані без дай прычыны брахаць не будзе; гэта могуць пасведчыць нашы гаспадары. Дык не маеце права нас зневажаць, раўнуючы да гэных паноў, аб каторых пішаце.

Бываюць, праўда, і паміж нас (але зусім мала!) гіцлі, каторыя, каб убіцца ў хату, дзе чуюць яду, і пажывіцца, пачынаюць быццам шчыра брахаць. Гаспадар, разумеецца, выгляне праз дзверы: што за неспакой? А той лодыр шусь яму пад ногі і ўжо каля стала хвастом круце! Гэткі прайдоха шмат шальмоўства робіць, бо пакуль суседнія сабакі добра яго не распазнаюць, дык не раз і іх падвядзе, пачаўшы брахню, і другія падымаюць напрасную трывогу. Гэткі гад у нас, так, як і ў вас, завецца правакатарам. Розніца толькі ў тым, што ў вас гэткаму пану кланяюцца, вітаюцца з ім і грошы плацяць, а наш брат, калі свайго гэткага спаткае, дык і хвастом не кране, а ўсёй заплаты ім, калі гаспадар палкай перацягне...

Бываюць яшчэ паміж нас так званыя ляпайлы (але не брахуны!). Ляпайлай завуць у нас прыдуркаватага або падслепаватага сабаку, каторы прывык таптацца толькі па адных і тых самых, змалку знаных яму сцеж-

ках; дык калі такі бядак наткнецца на сваёй дарожцы на які-колечы ражончык ці што якое (мала хто можа кінуць што туды?), вось ён, спалохаўшыся, і адскоча ўзад дый, не разнюхаўшы добра, у чым справа, пачынае ляпаць ды ляпаць — дзень і ноч.

Але з ляпайламі, а яшчэ менш з правакатарамі мы, сабакі-брахуны, нічога супольнага не маем.

Лыска — Міхалкі Канцавога, з вёскі Граек;

Разбой — Тадора Серадняка, з вёскі Булькаў;

Жук — Сцяпана Крывога, з вёскі Засілля, і другія.

Па іх просьбе ліст напісаў і за неграматных распісаўся

Ядвігін Ш.»

ВАРОНА

На шырокім і даўгім пазадворку было весела і крыкліва.

Найважнейшым па чыне лічыў сябе, разумееца, індык. Зважна, хоць і не без страху азіраючыся ва ўсе бакі, пад'язджаў ён, нашупырыўшыся, час ад часу на скрыдлах, а з вялікай натугі бледнаватыя гузакі на галаве яго то чырванелі, то ажно рабіліся сінімі, урэшце, белымі, але затое, калі, бывала, гукане — вылае, як і прыстала на важны чын, на той момант ціхлі, прыслухаліся і дзівіліся ўсе; але толькі на момант.

Гусі — страшэнныя пляткаркі — доўга вытрываць моўчкі не маглі і адзываліся, спяшаючыся адна перад другой як мага больш нагагатаць, першымі.

Чырвоны з велізарнымі косамі пявун, маючы пад сваім загадам не мала хоць і слабейшага роду падданых, таксама не надта быў падатны ўступаць хоць бы і самому індыку: ляпаў сябе па баках скрыдламі, дзёрся на ўсё горла ды, скрывіўшы набок галаву, доўга потым прыслухаўся да рэхвы свайго, як яму здавалася, вельмі пекнага голасу, а на астатак — для форсу — хоць на адным скрыдле — пад'язджаў і ён.

Качкі, не могучы ўтрымаць на сваіх кароткіх ножках раскормленае цела сваё, пераміналіся з нагі на нагу і, як больш спакойныя, бо здаволеныя з свайго жыцця, нізка ўсім кланяючыся, паддаківалі ўсім.

Толькі галубы ды павы ні на што не звярталі ўвагі, нічога быццам не бачылі, не чулі; не да таго ім было: адны былі заняты толькі любоўю, другія — толькі сваімі зікратымі хвастамі.

Рэшта, усялякая дробязь, якая круцілася і на пазадворку і па бліжэйшых, сумежных кустах і дрэвах, пішчала, крычала, свістала, і трудна было разабрацца, ці

каторыя з-паміж іх адзываліся да старшых з пашанай, ці з лаянкай, ці мо зусім з кпінамі.

Але гоман быў страшэнны. Страшэнны тым больш, што час быў веснавы, кожная з асобку грамада выбірала сабе лепшае, выгаднейшае месца; ішлі звадкі, бывалі бойкі; мелі свае клопаты, мелі і радасці; рыхтаваліся да новага жыцця, спадзеючыся прыбытку сям'і...

Рупнейшыя — ужо прыждалі гэтай сабе пацехі; іншыя — з дня на дзень чакалі, і, як на гэтых, так асабліва на першых спаглядалі ўсе з зайздрасцю і пашанай.

З зайздрасцю, але без пашаны спаглядала на гэта ўсё адна толькі варона.

Скуль гэта варона тут убілася, якім парадкам трапіла ажно сюды — ніхто добра не ведаў, а яшчэ менш ведала аб гэтым яна сама.

Хадзілі толькі чуткі, што — як гэта варона сядзела яшчэ ў гняздзе разам з сваімі братамі і сёстрамі—наляцеў каршун. На кліч бацькоў зляцеліся цэлыя хмары варання; завязалася бітва з ворагам страшэнная, але раз'юшаны каршун да гнязда такі дабраўся, некаторых там пакалечыў, адну штуку выцягнуў, а наша варона, хоць добра лётаць яшчэ не ўмела, але ткі першая выскачыла з гнязда. Сасна была высокая, дык, шлёпнуўшыся вобземлю, пабілася моцна. Хоць боль браў вялікі, але страх быў яшчэ большы, і вось яна то бокам, то скокам уцякала ад гэтага страшнага месца наўгад—абы-што найдалей, ажно пакуль не прыбілася да таго месца, дзе быў птушнік.

Тут, забіўшыся ў куст, сядзела бедная варона, пакуль голад не прымусіў яе вылезці. Праціснуўшыся праз дзірачку ў плоце, яна са зламаным скрыдлам, з выкручанай нагой скокнула колькі разоў наперад, прысела, уцягнула шыю, задзерла крыху галаву і моўчкі разінулася.

Пазадворкавае птаства, занятае кожнае сваімі асабістымі справамі, толькі цяпер агледзелася і спанатрыла * чужынца.

Аб вароннім родзе чулі ўсе, некаторыя, як, напрыклад,

куры, качкі — не адну справу ўжо мелі з варонамі, але каб гэта варона сама адна-аднюсенька адважылася залезці сярод усёй гэткай грамады свойскага птаства — проста дзіва!

Тым часам гусі ўспелі столькі ўжо ўсяго наплясці, што ўсіх агарнуў страх.

— Тут нешта будзе, будзе, будзе! — адазваўся індык і нават на скрыдлах пад'ехаць не адважыўся.

— Клопат, клопат, — прарочыла квактуха.

— Пад-вох! Пад-вох! — дзёрся певень.

— Так, так, так! — кланяючыся на ўсе бакі, з усімі згаджваліся качкі.

— Ся, ся! — усцішваў асцярожны качар.

Усе круціліся ўвокал вароны, каторая, быццам уросшы ў зямлю, ані краталася з месца, а толькі галаву паварочвала ў той бок, дзе большы паднімаўся крык, і, час ад часу зачыняючы дзюбу, каб перамачыць слінай засохшае горла, зноў яе шырока разяўляла, углядаючыся на ўсіх не то са страху, не то з хітрасцю сваімі бліскучымі чорнымі вочкамі.

Грамада птаства пільна прыглядалася да крывой, адстаўленай убок нагі, да апушчанага зламанага левага скрыдла, цікаўна заглядала ў раскрытае чырвонае, шырокае горла і судзіла на ўсе лады, а што гэта была яшчэ раніца — час не зусім прыдатны на даўгую палітыку — трэ было заняцца важнейшымі справамі: напхаць пустыя валякі, дык, нічым не скончыўшы, памаленьку ўсе разышліся.

Застаўшыся адной, устрапянулася спярша варона, паправіла пёркі, а пасля, агледзеўшыся ўвокал, падскакала да карыта, каля каторага, як яна ўжо ўспела прыкмеціць, найбольш завіхалася рознага птаства, заглянула туды і ажно ўсцешылася: яды, хоць мала знанай, было паўнюсенька. Дзёўбалі ўсе; працінуўшыся нязначна, дзеўбанула і варона раз і другі — нішто: есці можна. Накаўтаўшыся як мае быць, паскакала варона зноў у кусты і забі-

лася там, каб не мазоліць дарэмна вочаў другім, і адтуль квапна прыглядалася да ўсяго, як бы хацела спазнаць тутэйшыя парадкі і жыццё...

І спазнала. З таго часу дзень ада дня вароне жылося штораз лепей: набралася пэўнасці, смеласці. Разумеецца, не без таго, каб ёй часам не пападала, асабліва спачатку: не той, то другі — а таўкане, скубяне, але да ўсяго можна прывыкнуць — прывыкла і варона, а часам нават сама не раз слабейшага, бывала, дзеўбане, ушчыкне; ды яшчэ закруце, а пасля і з роўнымі цягацца стала.

Вось гэтак-то і плыло вароне жыццё; плыло год, другі. Прыждала варона і трэцяй вясны, калі-то прыйшла ёй у галаву новая і смелая думка: а што, каб-то завесці сваю сямейку? а? Завесці-то завесці, справа добрая — ані слова, але як? Доўга думала над гэтым варона, але, відаць, такі нешта надумалася, бо, забіўшыся ў найгусцейшыя кусты, звіла сабе гняздо. І вось з таго часу стала яна пільнаваць, калі сядухі злётвалі з гнязда есці, тады асцярожненька, ціханька падкрадвалася, выкрадала адтуль яйкі і закачвала іх да свайго гнязда. Гэтак рабіла варона з сільнейшымі ад сябе птушкамі; з слабейшымі — справа была саўсім лёгкая: прыйдзе да сядухі, гаўзане, калі тая спіраецца, у галаву і бярэ, што трэба.

Гэткім парадкам, праз нейкі час, сабраўшы больш дзесяці розных колераў і велічы яек, варона села.

Прайшло некалькі часу. Выгаладаўшаяся, высахшая, як шчэпка, вылезла ўрэшце варона з кустоў, а за ёй сыпалася пісклівая на ўсялякія таны грамадка рознай дробязі.

Дзівіліся і цікавіліся ўсе, як гэта варона ўхітрылася завесціся гэткай сям'ёй?

А і ганарыстай жа стала варона: курам, качкам — ані прыступіся; пеўню бараду і грэбень акрывавіла; самому індыку чуць вочы не выдзерла!

— За сваіх родных дзетак жыццё аддам, а не папушчуся! — крычала варона.

Але і дзяцей сваіх варона трымала востра — у послуху: абы каторае не тым голасам запішчыць, як падабаецца вароне — куксу, ды такую куксу, што малое толькі нагамі задрыгае ў паветры, і гатова. Хоць, праўду кажучы, і любіць — любіла іх варона: кураняткаў са двое з вялікай любоўю нават глынула — такія прыгожанькія былі!

Заляталі і заглядваліся на ўсё гэта дзіва сваяшніцы вароны, перад каторымі наша варона пахвалялася сваімі дзяцьмі; але тыя, доўга моўчкі ўглядаючыся, адляталі з крыкам: кра-кра-кра!

Гусі, добра, відаць, не дачуўшы, зараз жа ўсім разнеслі, што нават вароны пазналіся на моладзі сваяшніцы і кажуць, што яна іх крала. Як толькі разышлася гэта вестка, варона зразу страціла ўсю тую прыхільнасць, якую зазвычай маюць маткі.

— Прыблуда, прыблуда, прыблуда! — артачыўся індык.

— Гнаць вон! Гнаць вон! — крычаў у адзін дух певень.

— Так, так, так! — кланяючыся, паддаківалі качкі.

Пасля гэтага вароне жыцця не было: адусюль гналі, усе таўклі. А тым часам і моладзь падкачалася, і як ні старалася ўтрымаць яе ў послуху варона, як ні муштравала, ні біла ўсіх сваіх дзяцей — нічога не памагала: мест гарнуцца да маткі — сталі распаўзацца куды каторае: кураняты прылучыліся да кур, качаняты — да качак і г. д., словам, пакуль падышла восень — пры вароне ўжо нікога не асталося.

Цяпер толькі агледзелася, спазнала ўсю сваю абмылку варона; зразумела яна ўрэшце, што нават слабейшымі за сябе птушкамі, як напрыклад галубкамі, — камандаваць яна ніколі не здолее. А што ж гаварыць аб роўных па сіле?

І хоць жаль было выгоднага месца, жаль гатовага,

дармовага корму, але хоцькі-няхоцькі выбралася-ткі варона ў свой лес.

Час мінаў нязначна. Скрыдла ў вароны саўсім зраслося, толькі нага так і засталася крывой.

Пралятаючы неяк адной восені з цэлай хмарай сваіх сваяшніц над добра сабе знаным пазадворкам, дзе круцілася і завіхалася каля яды цэлая грамада рознага птаства, наша варона, паказваючы на птушнік, адазвалася:

— А ведаеце, сястрычкі, што? Гэта ж усё мае родныя дзеткі.

«ПРИ ИСПОЛНЕНИИ СЛУЖЕБНЫХ ОБЯЗАННОСТЕЙ»

А казаў я, колькі раз казаў Сымону Лябёдку — свату, значыцца, свайму — не лезь ты, гад, з языком сваім, куды не трэба, не патыкайся, а то, брат, нарвешся! Дык не: не паслухаў, не вытрываў! Ну і добра — не шкодзіць. Не на маё выйшла? Не нарваўся? Сядзі цяпер, сядзі і кукуй!

Язык — языком: трэба ведаць і статкавацца *, куды, калі і нашто ён патрэбны.

Нашаму брату — селяніну — язык патрэбны бывае разы са два ў год канечна: на каляды і вялікдзень. У гэтыя дні мясная яда — ну дык трэба ж і аблізацца, а чым жа абліжашся, калі не языком.

Патрэбны яшчэ язык і маладому, як жэніцца: бяз прысягі не выкруцішся, а пасля... пасля ўжо маўчы: і за сябе і за цябе жонка насакоча.

Ну, але справа не ў тым. Лепш раскажу ўсё толкам, па парадку, што і як было, а там... самі ўжо разбірайцеся,— чы ж не праўду я казаў, што Сымон — гад?

Перш-наперш трэба вам ведаць, што Сымон вялікі манюка: выдумае такое іншым разам, што табе і ў жыцці не снілася, а як раскажа, распіша, — здаецца, і сапраўды так было і так ёсць. Але і гэта яшчэ не бяда. Горшая бяда ў тым, што гэты самы Лябёдка страшэнны задзірака: старшыне — ніколі чаркі не паднясе; сустрэўшыся з ураднікам, а хоць бы нат з самім прыставам — да шапкі ані дакранецца; а такіх, як стараста чы там які выбарны — дык і саўсім не шманае.

Дык не дзіва, што кожны гэткі чын рад бы насаліць Сымону, а тут якраз здарылася прычына.

У двары нашым зрабілася пакража, і то, мусіць, пакража не абы-якая, калі, як толькі агледзеліся — ноччу яшчэ зараз жа паляцелі на станцыю і далі знаць у горад тэлеграмкай, каб адтуль прыслалі сабаку-сышчыка.

Хіба вы ўжо чулі, што цяпер і гэткія сабакі завяліся? Досыць гэткаму цюцьку абнюхаць хатнія рэчы, паміж каторымі здарылася пакража, і тыя месцы, да каторых дакратваўся злодзей рукамі чы нагамі, як ужо сышчык-сабака следам давядзе да праступніка і носам яго спазнае.

Праўда, не заўсёды бывае ўдача хоць бы і такому нюхайлу, бо іншым разам пройдзе снег чы дождж, пакуль прыедзе на следства «яго міласць», і гэтак залье след, што і сам сабачы нос нічога не паможа. Тады кідаюцца часамі на іншы спосаб: паказваюць западазроных людзей сабаку, а той, абнюхваючы іх, знаходзіць паміж іх вінавайцу.

У тую ноч, як сталася пакража ў двары нашым, шмат было там чужых людзей: удзень былі яны на рабоце дапазна дый заначавалі. Паміж іншымі быў Сымон, быў і я. А што, як на ліха, перад тым, пакуль прыехаў гэты важны сабака, прайшоў дождж і заліў след, дык прыйшлося хапіцца таго другога спосабу, аб якім я гаварыў: запрэзантаваць * сышчыку западазроных людзей.

Добра. Сагналі ўсіх: і падзённых рабочых і ўсю дворную службу, каб крыўды, значыцца, нікому не было.

Перад дворным ганкам, дзе збор быў назначаны, чалавек сорак набралася. Паразбіваліся на кучкі паводлуг знаёмства, кумаўства, сваяцтва. Пайшлі гутаркі, жарцікі, смешкі. У цяні, пад старой ліпай, стаяў ураднік і ляскаў нагайкай па сваіх бліскучых халявах; побач — стараста, казюрачы вочы на мядаль, які целяпаўся на грудзях яго світкі; а ззаду іх — выбарны нашай вёскі. Ліха надало неўздалёк гэтай кампаніі выбраць сабе месца і Сымону Лябёдку: рассеўся ён каля нейкага чырвонага куста загранічнага, як на сваёй дзядзіне *, з кумой Агатай Тамашыхай і швагрусём сваім Андрэем Дударом; прыкуцнаў і я тут каля іх, не столькі дзеля сяброўства, колькі, праўду кажучы, дзеля цікаўнасці, бо ведаю добра, дзе ўжо ўблытаецца наш Сымон, то там гладка не пойдзе,—

грэх гаварыць, любіў наварыць кашы, а і затаўкі не жалеў. Моладзь, якая знала і любіла язычок Сымона, абступіла ўвакол нашу кампанію.

— Ну, і дажыліся,—першым пачаў жаліцца Андрэй,— гэткі-то здзек над хрышчоным народам: наводзіць на чалавека нейкага сабаку, каб ён абнюхваў яго, як звяр'ё якое.

— Мужчын-то ён не абнюхвае: абы глянуў толькі на яго, то ўжо ведае, што за чалавек, а ось з бабамі — праўда—не дасць рады, не абнюхаўшы,—растлумачыў Сымон.

— Божухна-бацюхна, — пачала лямантаваць кума Агата. — Што я чую? Што выдумаў — нюхаць?! А каб яго воўк вантробы нюхаў, каб з яго дух выперла. Такі там, мусіць, і сабака, калі пушчаецца на гэткія штукі: няйнакш як пранцуз або немец, пераадзеўшыся за сабаку.

— Э, гэта што! — пачаў зноў Сымон. — Я вам лепшую штуку раскажу. Не чулі? У прыстава чацвёртага стану выкралі з лядоўні масла, сыры і кумпяк бараніны. Прыстаў, разумеецца, зараз жа паслаў па сабаку. Праз колькі гадзін прыкаціў гэны сабака, само сабой, з правадыром сваім. Абследаваў ён — сабака гэны самы — зараз усю лядоўню, выскачыў адтуль, нюх-нюх у адзін бок, нюх-нюх у другі дый прэ на дзядзінец да станавога пісара. А там стаяла сама пісарыха. Угледзеўшы сабаку ды ведаючы, у чым справа, сцяміла баба, што можа быць дрэнна (быў, відаць, нейкі грашок), — яна тады на сабаку вокам мірг-мірг...

Хлопцы — у рогат, а Тамашыха стала дзівіцца і дапытвацца:

— А-а-а-а? А што ж сабака?

— А што ж сабака? — цягнуў памалу Сымон, — сцяміў і ён, гад, адразу, бо — чы дасцё веры, чы не — адміргнуў! А пасля пакруціўся яшчэ праз нейкі час, мабыць, для фасону, па тым самым дзядзінцы ды як упёрся носам да паркану — хоць ты што. Прымчалі драбніну,

прыставілі да плота; сабака спрытна, як той нячысцік, на драбніну ды праз паркан на другі бок сморг, і пайшоў круціцца, водзячы носам па зямлі, па местачковых агародах.

— Ну, і знайшлі? — пытаемся ўсе, зацікавіўшыся гэтай справай.

— Але, знайшлі, — адказвае Сымон, — знайшлі, як у лесе рэха. Дзе ж вы бачылі, каб знайсці, калі яны ўспелі пераміргнуцца. Казалі толькі, што ўсю ноч пасля гэтага ў пісара балявалі: пісар, правадыр, пісарыха і гэны сабака; да раніцы так усе напіліся, што хоць ты іх выкручвай.

— Як-то ўсе? — здзівіліся мы. — І сабака напіўся?

— Не, — зважна кажа Сымон, — правадыр толькі піў, а сабака закусваў, а як гэта ў іх выйшла, што п'яныя былі ўсе — кадук іх ведае; стораж станавога, як ішоў раніцай па ваду, бачыў і пісара з пісарыхай, і правадыра з сабакам, як каля паркана ўсёй кампаніяй, шануючы вас, казлы дзёрлі *.

— От пайшла распуста на божым свеце!— пачала зноў лямантаваць кума Тамашыха,— сабака і той даўся на падкуп.

— Што ж вы хочаце, — кажа Сымон, — пападзі толькі ў паліцыю, там, як бач, навучаць, а ён жа сабака паліцэйскі.

— От я табе пакажу і навучу: будзеш ты помніць і станавога, і пісара, і паліцэйскага сабаку,— гакнуў неспадзеўкі ўраднік з-пад ліпы, а нос яго з сіняга колеру, як у індыка, ажно забялеўся.

А Сымон — хоць бы што! Спакойна так адказвае:

— Дарэмна работа ваша будзе. Я сам знаю: вы, прымерам, называецеся — паліцэйскі ўраднік, а ён — паліцэйскі сабака. Нічога не зробіш: кожнаму свой чын. Чуў нават я, што той сабака мае мядаль за свае заслугі; толькі як і дзе яго носе — не давялося бачыць. Пэўна ж, не на грудзях, як наш, не раўнуючы, стараста...

Усе нявольна глянулі на старасту. Той, пачырванеўшы

як рак, лупаў вачыма, як бы плакаць збіраўся. Ураднікава нагайка пачала шыбчэй яшчэ ляскаць па халявах, і немаведама, чым бы гэта ўсё скончылася, каб у гэты момант не ўехала брычка на дзядзінец, у каторай сядзелі прыстаў і правадыр з сабакам. Пад'ехаўшы пад ганак, яны саскочылі і пайшлі ў пакоі.

Жарцікі і смяшкі сціхлі. Нат Сымон замоўк. Неяк зрабілася непрыемна. Бадай-што, кожнаму на думцы было тое, што і ў мяне: а што, калі гэты самы сабака прычэпіцца да цябе, нявіннага чалавека? Гэта ж згубіць можа на векі вечныя.

Чакаць прыйшлося нядоўга. Ускорасці выйшаў станавы, за ім правадыр з сабакам. Людзі паўставалі. Вочы ўсіх былі звернуты толькі на сабаку. Сярэдняга росту, от як наш Лыска чы Разбой, толькі масці паджарай — падхадзя на ганчака, морда даўгаватая, невялікая, як у ваўка вушкі, саўсім кароткі (мусіць-то адсечаны) хвост.

Абход пачаўся з другога ад нас канца, але чы нам здалося, чы й сапраўды гэта цырымонія так хутка йшла, што і не агледзеліся, як гэты сабака, тыркаючы носам то туды, то сюды, мінуў ужо ўсю шарэнгу людзей, мінуў і мяне і Сымона, нюхнуў лапаць кумы Агаты і тыц пад той чырвоны куст, каля каторага мы перш сядзелі, а тут, як з неба, пад самы нос сабачы кот — гойц! — і стаў.

Скуль гэты кот узяўся, вансак яго ведае *; мо ў кусце сядзеў і птушак пільнаваў, а мо, як ураднік цвярдзіў, штуку гэту падстроіў Сымон, каб закпіць з начальства. Праўду кажучы, шмат хто і з-паміж нас гэтаксама думаў, хоць я гатоў быў прысягнуць, што сам Сымон гэтага не зрабіў, бо я тут жа каля яго стаяў і бачыў добра; хіба ён раней падмовіў каторага з дзецюкоў, і той трымаў за пазухай да часу тую мышыную смерць — гэта стацца можа, але праўды такі і не дабіліся.

Кот, апынуўшыся перад самай мордай сабакі, уцякаць зразу не адважыўся, бо—чы то бок, чы яшчэ горш— зад з хвастом апынуўся б у небяспецы. Трэ было пушчац-

ца на хітрыкі і адвагу. Выгінаючы спіну ў дугу і саставіўшы лапы ў кучу, стаў ён падымацца на іх, а калі яшчэ паставіў хвост дугой і ўсю шэрсць нашупырыў, то ўжо пэўны быў, што такога высокага і страшнага звера і сам сабака не надта адважыцца зачапіць, а каб яшчэ большага пуду задаць, кот разінуўся, як мог, найшырэй і стаў фыркаць і сыкаць, а пасля раптам — пэц! па мордзе свайму ворагу і сам ходу. Сабака ажно якнуў з болю.

— Ось так яго, каток, так! Курту гэтага! Воўчае мяса! Сышчык паліцэйскі! С-сук...

Але Сымон так і не скончыў свайго павіншавання: ураднік, як каршун, наляцеў і пацягнуў яго да прыстава. Які там даклад зрабіў ураднік начальству свайму — гэтага не скажу: не чуў. А толькі пагналі Сымона ў пакоі, там ураднік напісаў пратакол, а ад'язджаючы, пасадзіў яго побач сябе.

Я падышоў да брычкі і пытаю:

— За што цябе, Сымонка?

— «За оскорбление при исполнении служебных обязанностей», — сярдзіта адрэзаў ураднік.

— Каго ж ты, сваток, абразіў? — дапытваю.

— Паліцэйскага; але чы паліцэйскага сабаку, чы паліцэйскага...

Сымон і на гэты раз не скончыў: брычка пакаціла.

8. Зак. 182

ЧАМУ?

Як рыбка — прытная; як зорка — ясная; як раса — чыстая; як котачка — дурэла; як галубка — варкавала; як матылёк — пырхала.

Так было вясной.

Як мурашка — рупная; як пчолка — дасужая; як красачка — зацвіўшая; як сонца ў ясны дзень — усюды яе поўна.

Так было ўлетку.

Надышла восень. Спахмурнела. І чы то ад гэтых хмар, чы ад летняй яшчэ спякоты — пацямнела яна, спаважнела.

Насунулася зіма. Мароз. Сцюжа. Прытуляючыся да грудзей маіх: «Адагрэй мяне, ажыві мяне!» — шаптала яна. Аж у грудзях маіх цяпла не было. «Прыйдзе вясна— яна адагрэе і ажывіць цябе»,— пацяшаў я яе.

І вясна прыйшла. Зноў заблішчала сонца; зноў загудзела вада; зноў зазелянеў лес; зноў закрасавала поле; зноў зашчабяталі птушкі.

Вясна адагрэла, вясна ажывіла ўсё. Вясна не адагрэла, вясна не ажывіла... толькі яе.

Чаму??

ЗАВЕДЗЕНАЯ НАДЗЕЯ

«Не тудой дарога».

Гудзеў народ на сходзе. Бо ткі кепска, зусім кепска стала жыць. З лясоў-пушч вырываўся звер і глуміў дабытак, і з лугоў-стэпаў выплывалі прагавітыя свежай крыві ястрабы і зніштожывалі дробязь; з-за гор-граніц навалай наступаў крапчэйшы сілай вораг і няволіў слабейшых братоў сваіх.

Гудзеў народ: кожны выкладаў свой жаль, сваю крыўду, за каторыя некаму было заступіцца. Рада ў раду, і надумаліся ўзгадаваць с-паміж сябе такога, каторага веліч і сіла змаглі б усіх ворагаў беднага люду. Каб крыўды і спрэчак абмінуць, выбралі нікому не знанае дзіця і сталі яго карміць — даглядаць, паіць — дагаджаць.

Хто што лепшага меў, зносіў — аддаваў выбранаму гадунцу. Дзіця наўздзіў прыбывала — расло, але народу яшчэ цяжэй стала.

Год за годам ляцелі — мігалі; год ад году прыбывалі вымаганні гадунца. Каб здаволіць іх, нехват было складчыны добрай воляй, прыйшлося падаткі накладаць.

І раслі падаткі штораз большыя, але вырас і гадунец — надзея крыўджонага люду: лясы гонкія — па калена яму і на высокія горы — рукамі апіраўся...

. . . . . .

Гудзеў народ на сходзе. Аддаў ён ужо ўсё, што мог аддаць, і вось цяпер узгадаванаму з астатка гадунцу свайму пачаў выкладаць свой жаль, сваю крыўду, каб заступіўся за іх. Але, як гром з яснага неба, неспадзяванае няшчасце зніштожыла ўсю надзею абяднеўшага народа: яго стон каціўся па зямлі, але не шыбаў у гару, дзе бы пачуў народны выбранец, а той, спаглядаючы з гэтай вышы ўніз, не мог дагледзець потам і крывёй злітай зямлі, па каторай варушыліся яго маленькія кармільцы.

РАМАН

ЗОЛАТА

I

Па вузенькай, мала пратаптанай сцежцы, праз агарод сталяра Пётры Курачонка, уніз, дзе стаяла лазня каля рэчкі, плыў, гутарачы паміж сябе, местачковы народ. Ішлі мужчыны, ішлі кабеты, ціснуліся дзеці-падросткі. Усякаму хацелася глянуць, як гэта заўсёды бывае ў невялікіх мястэчках, на нябожчыцу. Кожны — ад старога да малога — знаў яе жывую, як жа было не паглядзець на мёртвую. Цікаўнасць яшчэ больш узрастала, што там была ўжо паліцыя: станавы і ўраднік. Смерць неяк неспадзеўкі захапіла Прузыну, дый мала хто ведаў, скуль узялася тут гэта кабеціна, дзе яе радня і што пасля яе засталося: ці не было якога спадку.

Прыцягнулася ў гэта мястэчка Прузына ўжо блізка году. Прыцягнулася — от, як цягаюцца па свеце дурныя,

звар'яцелыя; іх ніхто не пытае, скуль і чаго, а сталяр з ласкі, абы мела які прытулак, пусціў яе ў сваю пустую лазню. Месца, праўда, і ў лазні Прузына шмат не займала. Апрача скрынкі з-пад цвікоў, з прымацаваным, ззаду раменьчыкамі, а спераду — прабойчыкамі і клямкай, верхам, нічога больш нябожчыца не мела. Але гэты схоў, відаць, важны быў для Прузыны, бо заўсёды зачыняла яго на замочак і пры людзях ніколі туды не заглядала. Жыла нябожчыца з жабраніны; цягалася з мястэчка ў вёскі, з вёсак у мястэчка, а свой «скарб», як яна называла тую скрынку з-пад цвікоў, аддавала тады пад апеку Курачонку. Відаць, верыла яму.

З дароў ад людзей Прузына не ўсё прымала. Яды ў запас з сабой ніколі не брала — от, толькі што на месцы з'есць, а калі хто, бывала, вынесе якую капейку, то адракалася яды і ўцякала, як ад заразы, і праз доўгі час пасля гэтага такую хату абмінала. Затое на адзежыну нябожчыца вельмі ласа была. Не зважала яна, ці адзежыну давалі лепшую, ці горшую, абы-толькі напасці на свежую і змяніцца. Але на лахманы Прузыне шанцавала. Адны — з міласэрнага сэрца, іншыя, зноў, каб пасмяяцца над звар'яцелай кабецінай — дарылі чым папала. Цешылася тады старая, скакала, пяяла, ляскала ў далоні і, не зважаючы, ці то было лета, ці зіма, у хаце ці на дварэ, зрывала з сябе сваю адзежыну — хоць да кашулі, а нацягвала новападароную. Гэтак прыбраўшыся, скручвала ў камок старыя скінутыя лахманы і бегла ў першы лепшы шынок, каб там, як яна казала, выгандляваць людскую кроў на чартоўскую. І сядзела Прузына ў карчме, ажно пакуль не прапівала ўсяго да астатку. Цягнецца тады ў старую лазню Курачонка і там, не паказваючыся на свет божы, сядзіць праз 2—3 дні, каб пасля зноў бегчы ў другую старану выменяць адзежыну, бо гэту, як яна ўсім угаварвала, што была на ёй, надта ўжо людскою кроўю ад яе нацягнула, і так цяжка стала, што ні спаць, ні есці не дае.

Калі ж праз доўгі час не ўдавалася Прузыне змяніць адзежыну, бегала тады яна ад хаты да хаты і выпрашвала кавалачак мыла. Дастаўшы гэты скарб, зімой — варочалася ў лазню, прыносіла вады, скідала ўсё з сябе і мыла, паласкала, пакуль хватала мыла; улетку — бегла да рэчкі і там, раздзеўшыся, праз увесь дзень плёхалася ў вадзе.

Страшэнна яшчэ баялася Прузына цёмных плям на адзежыне; калі не ўдавалася ёй гэткі лахман прагандляваць, а плямы ніяк не адмываліся, выразала або жыўцом вырывала іх і гэтак — з велізарнымі, у розныя фігуры дзіркамі — цягалася старая, свецячы голым целам, у найбольшыя марозы.

І цяпер ляжала Прузына на палку ў лазні ў ірваных і рэзаных лахманах. Ляжала выпраставаная, з закінутай на галаву левай рукой, пальцы каторай моцна ўпляліся ў спутаныя, пакудлачаныя сівыя валасы; правая рука вісела, утыкаючыся пальцамі ў брудную зямлю. Твар нябожчыцы быў шэры, тонкі, доўгі нос завастрыўся, выцягнуўся і ажно загнуўся ўніз, быццам глюга гругана; ражкі заціснутых тонкіх вуснаў, як бы ў злосці вялікай, таксама спушчаліся ўніз, а правае, не зусім заплюснутае вока быццам украдкам спаглядала з-пад павекі, як бы дагледзець хацела, што тут сабраўшыйся народ будзе каля яе — нябожчыцы — рабіць. На адкрытых, яшчэ больш чым самы твар, грудзях, на чорным выпалавеўшым шнурочку гібелі медалікі, крыжыкі і маленькі ключык.

— Гэта ад ейнага скарбу, — паказваючы на ключык і скрынку з-пад цвікоў, каторая стаяла пад галавой нябожчыцы, далажыў прыставу ўраднік.

Прыстаў, нічога не адказаўшы, выняў з кішэні маленькі бліскуча-белы ножык, адчыніў яго і, падняўшы двума пальцамі шнурок з медалікамі і крыжыкамі з грудзей нябожчыцы, адрэзаў ключык. Сабраўшыйся ў цеснай лазні народ з цікаўнасці стаў напіраць бліжэй, але ўраднік, насупіўшы бровы, моўчкі патрос за плячамі

свайго начальніка вялікім касматым кулаком сваім, і — зразу паслабанела. Ураднік выцягнуў з-пад галавы нябожчыцы скрынку і паставіў водаль на лаве пад акном; прыстаў падышоў да яе і, доўга круцячы заржавелы замочак, урэшце адчыніў яго і, падняўшы верх скрынкі, глянуў усярэдзіну: на йсподзе ляжала пажоўклая старая газеціна. Падняўшы яе, станавы выцягнуў адтуль маленькую едвабную белую хустачку і, каб лепш разгледзець, страхануў яе. Нешта міганула, упала і, пакаціўшыся, зазвінела. Бліжэйшыя людзі затопалі, расступаючыся, нагамі і падаліся яшчэ больш узад. Ураднік прыкуцнуў і, чыркаючы адзін за адным серчыкамі, стаў пільна шукаць згубы. Урэшце з-пад палка, на каторым ляжала нябожчыца, падняў пярсцёнак і падаў яго прыставу. Пярсцёнак быў залаты з пекным бліскучым чырвоным камнем. У скрынцы, апрача нейкіх старых пацераў, больш нічога не знайшлося.

«Скарб» быў, значыцца, у цэласці, сведкі паказалі, што больш ніякіх рэчаў у нябожчыцы тут не было; на целе яе знакаў гвалтоўнай смерці не знайшлося; справы не было з чаго заводзіць, і на другі дзень Прузыну пахавалі.

Мінула колькі гадоў. Праязджаючы аднаго разу праз мястэчка С..., захапіла мяне мяцеліца. Прыйшлося падначаваць. У цеснай халоднай хаце неяк не браў мяне сон. Седзячы напроць печы, дзе ў грубцы жарам яшчэ зіхацелі вугальчыкі, а па іх — то там, то сям ускаквалі і перабягалі сівенькія аганькі, разгутарыўся я з падслепаватым дзедам-гаспадаром. Хатнім, відаць, дакучыла ўжо слухаць старадаўнія, адны і тыя самыя яго апавяданні, дык, як галодны на хлеб, так накінуўся дзед на мяне — свежага чалавека. Прагутарылі мы з ім ажно да белага дня, калі і мяцеліца ўжо крыху сціхла і можна было ехаць дальш — у дарогу. З-паміж розных яго апавяданняў адно ўрэзалася мне ў памяць.

Вось яно.

Шмат гадоў таму назад, недалёка мястэчка Д...—пры самым тракце — жыў удавец Мікола Строчык з дачкой сваёй Зосяй. Жылі яны на адзіноце на маленькім — маргоў пяць — але ўласным кавалку зямлі. Сама гаспадарка мала чаго давала Міколу: каня свайго не меў — не ў пару загарана, не ў пару засеяна — дык збіраць не было чаго. Займаўся Строчык бандарствам, але і бондар з яго быў такі самы, як і гаспадар. От, калі надта прыходзілася цесна і жывая капейка да зарэзу была патрэбна — выдзеўбе начоўкі, згарушчыць які цабэрак, прадасць у мястэчку, палавіну грошаў сядзе ў Лейбы-шынкара, а палавіну прынясе дахаты і аддасць дачцэ.

— З такімі даходамі далёка не заедзеш, — выгаварвала іншым разам Зося, надзьмуўшы тоненькія, але чырвоныя губкі.

— Нас двое—дык і грошы надвая—па палавінцы,— коратка паясняў Мікола.

— Каб жа татка ўсе свае даходы папалам дзяліў заўсёды — дык чаму ж? А то калі-нікалі ахлапіну якую кіне — і жыві, і хадзі, як жабрачка якая. Сама зарабіць не пайду — хаты не кінеш, — жалілася дачка.

— Добра, добра, падзелімся некалі. Не такая ты ўжо бедная ды пакрыўджаная, як наракаеш,— супакойваў бацька сваю дачку.

Справа ў тым, што час ад часу наязджалі да Строчыка нейкія людзі. Зоську пасылаў бацька па гарэлку, і баляванне ішло тады ўсю ноч, а досвету выязджалі. З імі разам выязджаў і Мікола, а Зоська аставалася праз колькі дзён, а то тыдзень адна ў хаце.

Варочаўся Строчык заўсёды не з пустымі рукамі: у хаце з'яўляліся крупы, мука, скаромніна; бываў гасцінец і дачцэ: чы пацеркі, чы істужка, а то што-небудзь з крамнага, але грошаў мала калі даваў, хоць Зося справядліва дагадвалася, што ў бацькаўскай кішэні пабразгачы былі, бо Мікола цэлымі днямі прападаў у мястэчку. Але пра-

ходзіў тыдзень, другі, рэдка калі месяц, — а Строчыку зноў прыходзілася брацца за начоўкі і цабэркі...

З такім няраўнаважным жыццём мог мірыцца Строчык, але маладой, прыгожай, поўнай жыцця, дзяўчыны — яно, разумеецца, здаволіць не магло.

Хадзіла яна, праўда, і да местачковых дзяўчат, бывала і на вечарынках, але моладзь — не толькі равесніцы, а нат і хлопцы, хоць украдкам ахвотна ўглядаліся — быццам цураліся яе. Гэткія адносіны, само сабой, ранілі сэрца маладой дзяўчыны. Прычыны такіх адносін Зося даўно дагадвалася, але ўпэўнілася яна толькі сёлета — на ігрышчы, якое спраўлялі на Пятра ў рымара, Міхалкі Гуронка.

Найстаршы сын Гуронка — Алёкса — ціхі, спакойны, добры, а што яшчэ важней — гладкі хлопец, ужо з год, як уздыхаў да Зосі. Дзівілася толькі дзяўчына, чаго ён адцягвае, чакае, калі яна прыльнула да яго ўсёй душой, усім сэрцам сваім маладым? Ажно на ігрышчы гэтым даведалася прычыны. Зося сама, сваімі вушамі чула, як Міхалка Гуронак, клікнуўшы ў каморку сына, адчытваў яго:

— Ты мне шуры-муры не заводзь з гэтай дзеўкай; я ў сваёй хаце заводзіць зладзейскага семені не дам. Мо хіба думаеш у прымы да гэтай паненкі прыладзіцца? Не спадзявайся: дарма, што ў цябе перад носам паказваецца — і табе і ёй такую лазню спраўлю, што ажно ў небе чутно будзе, а бацьку ў астрог засаджу! Як жывога мяне бачыш — засаджу! Мы яго тут церпім да пары, да часу: усё помсты той варожымся — абакрасці, спаліць могуць шаечнікі гэныя, але калі імя маё ўблытаеш з іхнім, — на ўсё пайду, не папушчу.

Зосі цяпер усё ясна стала. З вечарынкі без пары ўцякла яна, як у гарачцы; што рабіць?

Пакуль Зоська была малой — матка пакінула яе сямігодкай — яна верыла словам бацькі, што едзе ў заработкі — «бандарыць», як ён казаў, але цяпер, калі дзяў-

чыне мінула семнаццаць летак, яна на словы бацькі круціла сваёй зграбнай галоўкай:

— Добра, добра ўжо, хай сабе бандарыць, абы татка набандарыў мне пацерак і на спаднічку што новенькага.

Гадавалася Зося, як тое ваўчанё. Маткі яна мала памятала. Чула толькі ад людзей, што чамусь-то матку звалі цыганкай; што дома яна мала спатыкалася, больш па свеце цягалася, але дакладна — як і што — Зося ў чужых людзей дапытваць саромелася, а калі, бывала, запытае бацькі, той збываў абы-чым.

— Якая была — такая была. Няма чаго мёртвых трывожыць, — бурчэў Мікола.

Пасля — пры сіраце, апрача бацькі, нікога не было. Строчык, для яму толькі знаных прычын, нікога чужога ў сваю хату браць не хацеў. Калі ж здаралася якая вялікая патрэба, браў з мястэчка падзённіцу — глуханямую Стэфку. А так — сам быў гаспадаром, сам — і гаспадыняй, сам — і нянькай. Так і вырасла Зося. Знала яна толькі бацьку. Для дачкі быў ён добры: не біў, не муштраваў, да работ не цісну — спраўляў, што канешна патрэбна, а што іншым разам Зося наракала — дык усё тая прагавітасць, каб больш мець, чым сапраўды была патрэба. Усе іншыя людзі для Зосі былі чужыя; нат з-паміж дзяўчат-адналетак ніводнай не было, з якой бы Зося магла падзяліцца сваімі думкамі, сваёй душой. От, адзін толькі Алёкса быў для яе добрым: баранкамі, цукеркамі частаваў; салодкімі слоўцамі дарыў — з ім яна магла больш гаварыць аб усім, чымся з бацькам, да яго аднаго прывязалася шчыра, моцна. І вось цяпер і яго хочуць адарваць ад яе. Гэта ўсё роўна, як бы кавалак жывога цела адарвалі ў яе самой. Да бацькі мела жаль, да людзей — злосць.

Пасля ігрышча — пятроўкай — людзі, як тыя мурашкі, заварушыліся пры сенакосах. Зося спатыкалася са знаёмымі, і ад іх яна дачулася яшчэ горшай, больш балючай для сябе весткі: Міхалка Гуронак жэніць свайго

старшага сына — Алёксу з Прузынай Сальнічышкай. Вяселле адкладаюць на восень, як з поля збяруцца.

Прузыну Зося спатыкала на ігрышчах і знала яе: багачка, непрыступна, абы з кім не прывітаецца, не загаворыць. Прузыну ніхто не любіў. Цяпер, калі Зося даведалася, што гэта яна, Прузына, адбірае ў яе Алёксу, злосць, якую мела да ўсіх людзей, быццам зраслася ў адну злосць — нянавісць да Прузыны. З якой бы ахвотай паздзірала з яе ўсе пацеркі, істужкі, якімі заўсёды абчэплівалася гэтая Сальнічышка; вочы тыя жабіныя, здаецца, павыдзірала, як котка, задушыла б, каб магла. І днём, і ноччу ў Зосі цяпер была адна думка, адно жаданне: не дапусціць да гэтага вяселля, але як і што рабіць — сама яшчэ не ведала.

II

Сонца ўжо садзілася, а Мікола з дачкой яшчэ завіхаліся каля сена на сваём лужочку: раса не паказвалася, назаўтра можна было спадзявацца дажджу, дык трэ было і зграбіць і ў невялічкія копачкі паскладаць дый, не маючы каня свайго, пазносіць на насілках пад страху. Занятыя работай, не заўважылі, як нейкі чалавек звярнуў з гасцінца і, падышоўшы да іх саўсім блізка, адазваўся:

— Памажы божа! Добры вечар!

Зося і Мікола аглянуліся. Перад імі стаяў незнаёмы малады — гадоў дваццаць — хлопец, нізкі, худы, але чыста ў крамнае адзеты.

— Дзякуем і вам, добры вечар, — адказаў Мікола, аглядаючы прыбыша ад новай шапкі да бліскучых, хоць запыленых ботаў. — Скуль бог нясе?

— Яшчэ сягоння з гораду; адмахаў вёрст пяцьдзесят, дык падбіўся крыху, мо б пазволілі сапачыць крыху, пераначаваць, — кажа падарожны.

— Чаму не: і сапачыць можна, і падначаваць дзе і на чым будзе — на тое лета. А ты, Зося, — звярнуўся да

дачкі Мікола, — ідзі ўжо дахаты вячэру якую там нарыхтуй, і мы зара прыйдзем падмацавацца, а копкі і па месячку знясём — незабава.

Зося, азіраючыся на свежага чалавека, шпаркім лёгкім крокам пайшла дахаты, а Мікола, канчаючы аграбаць каля копак, не то сам сабе, не то незнаёмаму жаліўся:

— Колькі таго сена, і то няма каму сабраць: дзярэш, дзярэш гэты сівец, а пасля ўсю ноч качаешся з жыватом ды сярэдзінай. Здароўя няма, нядуж саўсім, а тут адна дачка ў хаце; працаваць няма каму — усё ты, бацька, а той бацька не туды ўжо глядзіць; па гадах — яно яшчэ нічога, але нутро ўсё быццам спарахнеўшы — уніз цягне.

— А вы, дзядзька, не паддавайцеся: яно ўніз цягне, а вы яго — угару, — параіў падарожны.

— Э, добра вам, маладым, гаварыць, а як прыйдзе пара — у тую самую дудку зайграеш, што і я цяпер. Але хадзем лепш вячэраць; пасля гэткага шпацару пара з'есці і сапачыць, — сказаў Мікола.

— Сапачыць не адкажуся, а што да яды — не галодны я: разы са два папасываўся і яшчэ засталося, — нядбала адказаў падарожны.

На стале чакала іх ужо поўная міса кваснага млека, але хлопец зняў з плеч катомку, дастаў адтуль кавалак каўбасы, лусту пытляванага хлеба і надпачаты паўбутэляк гарэлкі ды, паставіўшы на стол, коратка адазваўся:

— Калі ласка.

— Бач: малады, а розум — як у старога: з такім запасам і ў дарозе не прыстанеш. Нясі, Зося, чарку, — весела ўжо адазваўся Мікола.

Мужчыны выпілі раз і другі. Зося саўсім не дакранулася, а што падарожны — піць болей адмовіўся, Мікола сам перакуліў яшчэ пару чарак, а тады ўсе трое ўзяліся да млека.

Мікола забыўся і аб паясніцы сваёй, і аб спарахнеўшым нутры, праз увесь час гаварыў, кпінкаваў, а што і

хлопец гутарлівы быў, — вячэра для іх ішла шпарка і вясёла. Адна Зося маўчала і толькі прыслухоўвалася, калі падарожны стаў гаварыць аб сваім жыцці і праектах на будучыню.

Было іх — Дубінскіх — чатырох братоў; бацькі — беззямельная шляхта — жылі на выгадных арэндах, добра і багата, але па смерці бацькоў — хоць сыны былі ўжо дарослыя — гаспадаркі ўтрымаць не патрапілі і пераязджалі на штораз меншыя і меншыя фальваркі, і жыць было штораз трудней; калі ж яшчэ два старшыя браты пажаніліся, у хаце пачалося такое безгалоўе, што і вытрываць нельга было. Прыйшлося дзяліцца. Старшыя браты — кожны паасобку — пабралі ў арэнду невялікія сялібы; самы малодшы прадаў сваю частку і выехаў у Амерыку, а вось ён — Васіль — таксама прадаў сваю долю і больш года прабаваў шчасця на фабрыках у горадзе. Аднаму пражыць неяк жа можна, але каб што сабраць, адлажыць — аніяк не ўдаецца; усё тая гарадская зараза — пацягнешся з кампаніяй то туды, то сюды — грош той і ляціць услед. Добра, што хоць тую сваю долю не растранжырыў; ды і сама работа не па душы: да зямлі цягне. Цяпер выправіўся да старшых братоў даведацца амерыканскага адраса брата і напіша, каб той яму месца нарыхтаваў. Калі працаваць, дык каб было за што, каб было з чым у край вярнуцца ды зямлі хоць маленькі кавалак купіць, абы не цягацца ўвесь век па чужых сметніках.

Мікола, слухаючы Васіля, штораз часцей і ніжэй ківаў галавой: і дзеля таго, што ён згаджаўся з думкамі хлопца, і дзеля таго, што яго саўсім разабраў сон.

— А ведаеце вы што, — неўспадзеўкі голасна адазваўся Мікола, — заўтра хіба дажджу не будзе, дармо што расы няма — гэта бывае: на ўсходзе разабралася. Пойдзем мы спаць, а сена заўтра знясём. Дай, Зося, нам пасцілкі — мы з госцем на сена пойдзем, а ты сабе тут распраўляйся.

Зосю яшчэ менш абходзіла сена, чым бацьку, — яна ахвотна выправіла іх спаць, і сама, крыху спарадкаваўшы са стала, улеглася.

На сене хлопец прабаваў яшчэ завесці гутарку са старым, але ўскорасці пачуў, як Мікола моцна захроп; закруціўся тады і сам пасцілкай і хутка заснуў. Сон, відаць, быў і смашны, і моцны, бо раніцай Зося чуць раскратала бацьку.

— Татка, а татка, дождж пачынае пырскаць — сена замокне, — шаптала яна, каб не разбудзіць падарожнага.

— Дождж? Гэткі-то ўсход чысты быў — скуль жа ён узяўся?— дзівіўся, праціраючы вочы, Мікола, але з сена, відаць, не меў ахвоты вылазіць — чухаўся і крактаў дальш: — Ось, ліха надало; гэткае-то сухое сена — дарэмна праца наша прападае, цягайся пасля з ім...

Тым часам прачнуўся і Васіль, страпянуўся, хутка саскочыў з тарпы і выбег на двор.

— Дождж толькі-толькі пачынае, як імжака нейкая,— адазваўся, варочаючыся, хлопец.— Давайце борздзенька насілкі — мы з паненкай як віш яго ўпратаем, а дзядзька толькі заграбайце за намі ўслед — нічога яму не станецца: усярэдзіне сухутанька.

Ахвочасць хлопца прынадзеіла і Зосю зараз скончыць гэту работу — збыць яе з рук. Хапіла насілкі, і бяжком кінуліся з Васілём да копак. Работа ішла спраўна, жвава; ажно пот выступіў у маладых работнікаў, але неўзабаўкі, перакідваючыся паміж сабой жарцікамі, сухое сена апынулася пад страхой, і толькі пагрэбкі, якія сабраў, мармочучы нешта сабе пад нос, стары Мікола, былі як бы прыпаўшы расой. Гэта злажылі асобна. Здаволеныя, усе пайшлі ў хату. Зося кінулася цяпер толькі да печы варыць абед, але Васіль, не чакаючы на яго, дастаў з катомкі рэшткі сваіх падарожных харчоў, паўбутэлек з астаўшайся на дне гарэлкай, і селі з Міколам паснедаць. Тым часам дождж на добра расслініўся; у далёкую дарогу пехатой не было як і думаць. Васіль

застаўся чакаць поўдня — мо разбярэцца. Паабедаўшы, Строчык, не столькі з рупнасці, як разласаваны крошкай гарэлкі, каб было з чым паказацца ў мястэчку, узяўся сваім звычаем за бандарства. Госць і тут прыдаўся: ён хутка і лоўка прырыхтоўваў абручы і, ужо гатовыя да работы, падаваў іх старому.

Так, гутарачы то аб тым, то аб сім, працавалі разам да поўдня. Дождж не сціхаў, Васіль нібыта стаў збірацца ў дарогу, але лёгка даўся Міколу ўгаварыць застацца да заўтрашняй раніцы. Папалуднаваўшы, Строчык падмовіў госця схадзіць разам у мястэчка. Хоць дождж імжыць, але то ж недалёка — не размокнуць. Звязаўшы дробны пасудак вяроўкай і закінуўшы на плечы, выправіліся нацянькі і неўзабаве апынуліся перш-наперш, разумеецца, у Лейбы.

Выпіўшы пару бутэлек піва, якое Мікола паставіў, выправіўся ён разнесці заказчыкам пасудзіну, а госця папрасіў зачакаць на яго, і тады разам пойдуць дахаты.

Як толькі Васіль застаўся адзін, стары Лейба, разумеецца, зараз жа падсеў да яго і стаў распытваць: а скуль? а хто? а чаго? а куды? і г. д. Паказалася, што Лейба знаў бацькоў Васіля — Дубінскіх. Калісь-то — як малады яшчэ быў — на вёрст сто ўвакол усіх знаў, — лёнам гандляваў; купляў лён і ў Дубінскіх,— важныя былі людзі. Дзеці — браты Васілёвы, падзяліўшыся, зглумілі гаспадарку — збяднелі. Добра, што хоць адзін з-паміж іх паехаў у Амерыку — там чалавекам будзе жыць. Справядліва, што і Васіль выбіраецца туды, але калі думае пасля зноў варочацца, каб працаваць на зямлі — лезці ў хамут, то — паводлуг Лейбы, няварта і ехаць. Такі хамут і цяпер без Амерыкі можна лёгка нажыць, абы была крыха грошаў на пачатак — за што рукі зачапіць, а сяліб колькі хочаш — цягні лямку.

Але Васіль не гадзіўся з думкамі і радамі Лейбы. Лямкі не баіцца — цягнуць гатоў, але не ў чужым, а ў сваім уласным хамуце. Мае крыху і запасу ў кішэні, але

не столькі, каб і зямлю купіць і гаспадарку завесці — на што-колечы адно толькі хопе.

— І на гэта лякарства нойдзецца, — перапыніў Васіля стары Лейба, — і то тут — пад рукой: жаніся, васпан, з Зосяй.

— З якой Зосяй? — спытаўся здзіўлены Васіль.

— А з дачкою таго гаспадара, у чыёй хаце сягоння начавалі. Яна адна; бацька стары — нядуж; зямлі хоць невялікі кавалак, але добры, пры мястэчку — толькі што запушчаны — каня свайго не маюць, але і доўгу няма. Чысты, як золата, на пачатак і досыць, абы паручыла,— зямлі можна прыкупіць, побач пусташ кавалкамі прадаецца. Не трэба толькі зважаць, што людзі чаўпуць...

Але ў гэты момант увайшоў Мікола і перашкодзіў разважанню старога карчмара. Васіль глянуў на Строчыка, як бы цяпер толькі першы раз з ім спаткаўся.

Стары Мікола, пачуўшы грошы ў кішэні, зразу павесялеў, стаў строіць жарты з Лейбам і ўрэшце, разышоўшыся, заказаў селядца з перцам і паўбутэлек, дый заселі з Васілём у баковачцы. Пры чарцы гутарка пачала круціцца сваім звычаем — аб цяжкім жыцці, і ўрэшце з'ехалі зноў на гаспадарку. Але цяпер Васіль уважней выслухваў жалі Міколы, цікавіўся, колькі чаго засяецца, што лепш родзе, які бывае ўмалот, колькі сена збіраецца, чы можна каня прахарчаваць і г. д. Строчык на ўсё дэтальна адказваў. Няўдачу у сваёй гаспадарцы тлумачыў адным: трэ было б каня, упражку, плуг купіць — на гэта ўсё патрэбна гатоўка — зразу яе не вылажыць, а тут капейка капейку дагнаць не можа. Ды і ахвоты няма брацца за работу на старасць. Для каго? Адна дачка; хто яе возьме — зямлю возьме, — чы ж гэтага мала? Варштат гатовы, хай жа сам справе начэнне і працуе. А ён — Мікола — і вады не замуце маладым; яму толькі абы цёплы кут, лыжку стравы, а на свае выдаткі яшчэ сам запрацуе — ось, хоць бы гэтым самым бандарствам.

Так калякаючы, скончылі пачастунак Строчыка.

Васіль паставіў пару бутэлек піва, Мікола зноў хацеў браць паўбутэлек, але хлопец адмовіўся і старога адгаварыў, але, выходзячы, сам узяў і гарэлкі, і дзве бутэлькі чорнага салодкага піва і схаваў за пазуху.

Па дарозе Стрончык паказаў свой участак зямлі, лужок, які трэба яшчэ было скасіць, кудравінку бярэзніку, каторая расла на яго ўласным полі, і ўжо змяркаючы прыйшлі ў хату. Зося глянула на іх зукоса і ўцешылася, што вярнуліся не п'яныя, як гэта найчасцей бывала з бацькам, калі адзін хадзіў у мястэчка збываць свой тавар.

Дзяўчына закраталася каля вячэры. Мікола, падышоўшы да печкі, заглянуў у гаршчок, які паставіла Зося на прымурку, і зморшчыўся.

— А ведаеш, дачушка, што? — загаварыў, як бы ласячыся, стары, — хацелі мы з гасцём пападвячоркаваць у Лейбы, дык ён выправіў нас дахаты: спяшайцеся, кажа, там Зося яешню пячэ.

— Няўжо ж так Лейба нічым вас і не пачаставаў? — спытала, засмяяўшыся, дзяўчына.

— Хай ён на кучкі свае тое з'есць, — нібы ў злосці адказаў Мікола, — даў рыбу з перцам і вады — рыба выпіла ваду, а нам толькі перац застаўся. От, каб ты сапраўды, падкінуўшы трэсачак, колькі яек пасадзіла на скавараду — даліпан не пашкодзіла б; куры, кажуць, надта нясуцца, калі на захадзе яйкі на скаварадзе сквірчаць.

— Як, татка, хочаце, па мне незабава,— адказала, зноў усміхаючыся, дзяўчына і жвава ўзялася да работы.

Не столькі Стрончык хацеў той яешні, колькі знайсці прычыну дабрацца да таго запасу Васілёвага, аб якім ведаў і баяўся, каб тое дабро не ўцякло заўтра разам з хлопцам у дарогу.

Як толькі яешня была гатова і мужчыны заселі на лавак, Васіль дастаў паўбутэлек, піва і, усё гэта паставіўшы на стол, адазваўся:

— Каб куры нясліся, трэба, каб гаспадыня разам з намі і яещню ела, і таго, што людзі добрыя да яешні ўжываюць, — скаштавала.

— Праўда, праўда, — патакнуў стары і, клікнуўшы да стала дачку, падаў ёй першую чарку. Зося спачатку аднеківалася, але ўрэшце, узяўшы ў руку чарку, адвярнулася на старану, сербанула крыху і, зморшчыўшыся, сплюнула.

— Козамі сена травіць — толькі глум, — заўважыў бацька, — лепш садзіся ды еш.

Зося, прысеўшы збоку, стала пакрышачцы моўчкі есці. Выпіваючы і закусваючы, Строчык расказваў местачковыя навіны, якія чуў сягоння, разносячы свой тавар па хатах, а Васіль, нібы слухаючы, ківаў галавой, але ўсю ўвагу сваю звярнуў на дзяўчыну, пільна на яе ўглядаючыся.

І здзівіўся хлопец.

Васіль не быў распуснікам. Бацькі трымалі хлапцоў у руках; пасля смерці бацькоў старшыя браты-гаспадары так ціснулі малодшых да работы, што не ў галаве былі гулі, і толькі за гэты кароткі час, што пабыў у горадзе сам сабой, спазнаў крыху свету. Крыкліва маляваныя твары і крыкліва цудацкія строі гарадскіх дзяўчат вабілі неасвойчанае вока маладога хлопца, дык не дзіва, што пасля іх вясковая дзяўчына, як Зося, у цёмнай брудна-ватай спадніцы, у такім жа самым каптаніку — для Васіля выдалася нейкай шэрай толькі плямай, да якой і ўглядацца не было чаго. Але цяпер — за сталом, калі вочы яго затрымаліся толькі на твары дзяўчыны, сам сабе не верыў, як ён дагэтуль не прыкмеціў і гэтых валасоў чорных — не, нат не чорных, а быццам сініх, якія гвалтам хвалямі выбіваліся з-пад хустачкі, — і гэтага тоненькага зграбнага носіка, які завострываўся ўверх чутачку-чутачку — от, так толькі, каб даць свабоднейшы доступ да тонкіх, але пухлых чырвоненькіх вуснаў, за каторымі хаваліся, як часнок, густыя дробненькія і

беленькія зубкі. А гэтыя вочы? Як дзве цёмныя хмары, па каторых час ад часу быццам мігане маланка! Гэтыя вочы так іншым разам глянуць умелі, што Васілю ажно жутка рабілася так блізка для іх сядзець. Чула яго душа, што чаго б ні зажадалі такія вочы — ён, як малое дзіця, быў бы паслухмяны ім.

Не памятаў ужо добра хлопец, як тая вячэра скончылася, але калі апынуўся разам з Міколам на сене і ўкладаліся да сну, Васіль адазваўся:

— А ведаеш, дзядзька, што: наракаеш ось, што няма каму памагчы; хочаш — магу застацца на колькі дзён дакончыць касьбу; спяшацца мне няма куды — ніхто мяне не чакае; раней — пазней колькі дзён — для мяне ўсё роўна: я чалавек слабодны.

— А мой ты каток, мой каласок! — усцешыўся Мікола, — хіба з неба ты сюды зваліўся! Век бога за цябе буду прасіць, што злітаваўся ты над маёй старасцю.

— Добра ўжо, добра, толькі дзе ваша, дзядзька, каса, — дапытваўся Васіль, — бо трэба брацца самай раніцай — з расой лягчэй пойдзе.

— Каса, сынку, пры хаце, пад страхой на бэльцы вісіць, а малаток і бабка — у Зосі спытаеш; але яна выклепана і наладжана як след — толькі махай, — заахвочваў стары.

— Маханём, маханём — успомнім даўнейшыя часы,— радасна адазваўся хлопец, — а цяпер будзем спаць, каб сілы набраць.

Але сон не браў Васіля: як не плюшчыў ён вочы, а Зося, як жывая, здаецца, тут жа над ім стаяла. Доўга яшчэ з боку на бок варочаўся хлопец, шмат усялякіх думак пралятала праз малады мозг, урэшце, успомніўшы словы Лейбы аб Строчыку, «мала што людзі гавораць», рашыў заўтра ж як-колечы вырвацца нязначна ў мястэчка і даведацца акуратна аб усім.

Назаўтра, яшчэ сонца не ўзыходзіла, а на Строчы-

кавым лужку ў густа навісшым тумане чутно было, як раз за разам свісцела каса. Зося, выводзячы навязываць на пашу ядынае сваё багацце — рабую кароўку, здзівілася, пачуўшы гэты свіст, бо ніколі бацька такім рупным не быў, але, падышоўшы бліжэй, яна разгледзела і спазнала ў тумане фігуру Васіля. «От прычапіўся татка да незнаёмага хлопца, рад, што найшоў сабе добрага кумпана да чаркі — ужо і асядлаў яго», — падумала дзяўчына і пайшла рыхтаваць абед.

Тым часам прачнуўся і Строчык і, намацаўшы пустое месца, дзе звечара лёг Васіль, усміхнуўся і стаў сам з сабой разважаць: «Рупны і да работы, відаць, складзен; хваліўся — праўда чы не — што і грошы прызапасіў. Што ж? З тутэйшымі сяброўства ідзе туга — усё толькі языкамі чэшуць, а такі — наводны — прыдаўся б. Толькі як Зося? Але што там круціць носам: відаць, дарэчны і не зломак. Трэ толькі прытрымаць і выпытаць яго добра».

Але, устаўшы, Мікола, каб не перашкаджаць гутаркай у рабоце, не пайшоў на луг, а ў хату.

— Што ж гэта, татка, парабка наняў ужо сабе? — спытала яго Зося.

— Парабка — не парабка, а калі трапляецца добры чалавек, то трэба ўмець яго шанаваць, — важна адказаў Мікола.

— Добрая пашана: гаспадар у хаце, а госць — на рабоце, — адказала Зося.

Не ўсмак, відаць, прыйшліся гэтыя словы Міколу, ляпнуў дзвярмі і, выйшаўшы ў сенцы, узяў вілкі, падраўняў гной, дзе стаяла карова, пасля палез на стрых, паскідаў адтуль дрэва, якое меў у запасе для сваёй бандарскай работы, і ўзяўся наводзіць парадкі.

Сонца ўжо добра паднялося, выпагадзілася, калі Зося, адчыніўшы дзверы, клікнула абедаць.

Строчык моўчкі пайшоў па госця. Але на лузе знайшоў толькі касу, падложаную пад свежы пракос, а само-

га касца не было. Гукануў Мікола раз і другі — ніхто не адклікаўся.

«Што за ліха? — аглядаючыся на ўсе бакі, думаў Строчык, — чы не абразіўся і ўцёк, але ж у хаце катомка ляжыць»,— і стаў сачыць, дзе яшчэ трымалася раса, па слядах. Сляды як бы і ішлі ў старану мястэчка. Няўжо ж ён ізноў папёр па гарэлку? Нешта праз лад часта да яе дападае. Праўда: гарадскія ласы да яе, але гэта не саўсім добра — малады яшчэ — змарнавацца можа. Строчык неспакойны, не варочаючыся ўжо дахаты, пацягнуўся і сам у мястэчка ў той надзеі, што па дарозе мо напаткае хлопца.

А Васіль і сапраўды быў ужо ў мястэчку. Адмахаўшы ладны кавалак сенажаці, успомніў ён учарашнюю сваю пастанову і надумаў, не адкладаючы, даведацца да Лейбы, а што гэтак неспадзеўкі драпануў — спадзяваўся як-колечы перад Строчыкам выкруціцца.

Лейбу сказаў, што, выбіраючыся дальш у дарогу — да братоў, хацеў бы якога гасцінца купіць для дзяцей, а тым часам няўзнак навёў гутарку зноў на Міколу. Стары Лейба зразу сцяміў, аб што ідзе хлопцу, і на запытанне яго, што такое людзі гавораць аб Строчыках, нядбала стаў тлумачыць:

— Васпан, ведаеш: людзі як людзі — ім ніколі не дагодзіш. Хоць уся тутэйшая ваколіца ніякай крыўды ад Міколы ніколі не мела, а што там дальш — на старане — то хто яго ведае.

— Што ж ён — злодзей? — неспакойна перапыніў Васіль.

— Ці ж я сказаў — злодзей? Я такога слова ніколі не казаў, — супакойваў Васіля Лейба, — ці ж яго хто злавіў за руку, каб казаць — злодзей? От, заязджаюць да яго — ведама, пры дарозе жыве — іншым разам нейкія людзі, папасваючыся, пагуляюць крыху, а што ён з імі калі паедзе — на тое знаёмства, а мо да сваякоў нябожчыцы жонкі даведваецца — тая, кажуць, здалёку

была родам — прывязе што-колечы адтуль дахаты, а тут даведаюцца і пайшлі малоць языкамі — ведама: зайздрасць.

Як ні ўспакойваў і ні разважаў Лейба, Васіль дагадваўся, што тут нешта ды ёсць цёмнага, нячыстага, але, жывучы ў горадзе, спатыкаўся там з рознымі людзьмі, ды не такія штукі прыходзілася і чуць і бачыць, дзеля таго да ўсёй гэтай справы аднёсся з паблажкай, да чаго хіба нямала памаглі і думкі аб Зосі.

— Абы-толькі добры чалавек трапіўся ў хату, — далей угаварваў Лейба, — дык усё гэта зменіцца: свае парадкі павядзе. Старому што? Абы кут ды лыжку цёплай стравы. Любіць ён, праўда, крыху выпіць, але як гаспадаркі і дачкі пазбудзецца з галавы, дык будзе сядзець ціха і на свае патрэбы яшчэ выстругае начовачкі.

— Так-то, можа, і так, — згадзіўся Васіль. — Ну, а якава сама дачка? Яна не ўблытваецца ў гэтыя справы?— дапытваўся хлапец.

— Хавай божа! — завяраў Лейба. — Ведама, праз бацьку і ёй дастаецца: цураюцца крыху яе, але так нічога няможна закінуць Зосі, — хай таму язык адсохне, дзяўчына, адным словам, — ядраная, — і ажно цмокнуў стары Лейба.

Васіль яшчэ больш маніўся распытваць карчмара аб Строчыках, калі ў гэты момант паказаўся ў дзвярах сам Мікола. Угледзеўшы Васіля, расставіў рукі, быццам лавіць яго збіраўся, і закрычаў:

— Во-оо! бачыце — згубу найшоў! А каб табе добра было, напужаў дык напужаў! Што ж гэта? Загневаўся за што чы якое ліха? — уцёк ад абеду.

Васіль рассмяяўся і маніўся ўжо пушчацца на выкрутасы перад Строчыкам, калі тут жа ўмяшаўся Лейба.

— Дубінскі па старому знаёмству зайшоў даведацца мяне, старога. Бацькоў яго знаў, гандляваў калісь-то з імі; важныя былі людзі; а яго — Васіля — малым бэрбацям яшчэ бачыў.

— Як-то? — здзівіўся і ўсцешыўся разам Мікола.— Лейба, знаеш яго — Дубінскага? І бацькоў яго? От добра, унь калі шанцуе; трэба ж — дзе спаткаліся! Як той кажа — гара з гарой...

— Ну, калі так усё добра складаецца, — адазваўся Васіль, — дык ведаеш, дзядзька, што: паснедаем ужо тут на скорую руку, пакуль раса добра не абсохне, а тады адразу на лужок — разаб'ём пракосы: трава там сіўцаватая — да вечара будзе і гатова.

Строчык, разумеецца, ахвотна прыстаў на ўсё. Апаражнілі паўбутэлек, закусілі і, выйшаўшы з мястэчка, налажылі крыху кругу, бо Васіль хацеў пабачыць той пусташы, аб якой чуў, што прадаецца. Стары Строчык абвадзіў маладога хлопца і расказаў яму цэлую гісторыю аб гэтай пусташы.

Зямля прыналежала да двара. Сядзеў калісь-то тут ляснік-удавец і меў аднаго сына; стары багат быў без меры, але скупы страшэнна і сыну нічагусенькі не даваў. Маладому хлопцу даела чакаць спадку: засек ён бацьку сякерай і, завалокшы ў лес, закапаў глыбока, а сам пусціў пагалоску, што стары, пайшоўшы ў абход лесу, недзе запрапасціўся. Шукалі, дапытвалі, але нічога не знайшлі і нічога не даведаліся. Дагадваліся, што стары мо папаўся ў лапы зверу, бо даўней шмат тут было мядзведзяў, а можа, хто з вясковых, варажылі іншыя, прыціснулі па злосці, як праз лад рупнага лесніка, а праўды так ніхто і не даведаўся. Тым часам малады хлапец зажыў па-свойму: п'янствараў, лайдачыў па цэлых днях і начах у мястэчку, але баляванне цягнулася нядоўга. На другім неяк месяцы, вярнуўшыся з кампаніяй над раніцай з мястэчка, дзе была хата — застаў толькі попел: згарэў і дабытак і грошы. З жалю, ды прытом нявытразвіўшыся, прызнаўся хлапец перад сваімі таварышамі да забойства бацькі, а калі тыя са страху паўцякалі, ён тут жа на варотах павесіўся. Будынкі, двор паставіў новыя, і сеў новы ляснік, але не мінула і паўгода, як пажар зноў

усё зніштожыў. З таго часу ніхто не хацеў тут жыць, і для лесніка пабудавалі хату ў другім месцы, а гэту пусташ пастанавілі прадаць, але і дагэтуль не могуць знайсці ахвотніка на яе.

— Ось, я першы не пабаяўся б купіць гэту зямлю, абы-толькі было куды яе прылучыць, а то на зямлю, будову і гаспадарку — пораху не хопе, — сказаў Васіль.

— Як-то прылучыць? — спытаўся Мікола.

— А от, хоць бы да вашай, — адказаў хлапец, паглядаючы збоку на старога, — было б на чым развярнуцца, можна было б жыць.

— Чаму не? Чаму не? Мяжа з мяжой, — задумаўшыся, адказаў Строчык.

— А ведаеш, дзядзька, што? — адважыўшыся, пачаў Васіль, — хоць гэта, можа, і не выпадае так з бухту-барахту, крыху не па-людску, ды і вы мяне, а я вас мала знаем, а так мне здаецца, каб прынялі вы мяне да дачкі сваёй — Зосі, — зжыліся б неяк і гаспадарку паставілі як след.

— Што ж? Я нічога проці цябе не маю, — падумаўшы, адказаў Мікола, — толькі не ведаю — як Зося? Яна ў мяне дуроная, свае фанабэрыі мае.

— Разумеецца, так зразу мо яна і не прыстане, але каб я крыху тут пажыў, пазнаёміўся, каня купіў бы, наймаць не трэба было б, папар пара даўно паднімаць, а і нашчот той пусташы пранюхаў бы, — праектаваў Васіль.

— Хіба добры запас маеш? — асцярожна спытаў Мікола.

— З падзелу бацькаўшчыны восемсот прыйшлося — гэтыя ў мяне ў цэласці, — прызнаўся Васіль, — а на дробныя расходы крыху з фабрычных заработкаў абрэзаў.

— Ого, ладны грош, — пахваліў Строчык. — Што ж — заставайся; бяры тым часам, братка, ад папару на запашку — я ўсё роўна сам не дам ужо рады, а там пабачыш — Зосю трэба ўламаць.

Так гутарачы, абышлі пусташ, зайшліся і разбілі пракосы, урэшце завярнуліся дахаты. На парозе спаткала іх Зося і моўчкі, пытаючым поглядам уставілася на бацьку. Мікола паспешна загаварыў да дачкі:

— Бачу ўжо, бачу, што казюрышся, але бо такая справа выйшла, што і смех казаць: гэты наш госць, аблажыўшы ладны кавалак лугу, сам прапаў некуды; я — шукаць, я — гукаць — як у ваду ўваліўся; ледзь следам, як той гончы, вынюхаў яго і прывёў назад.

— Даганяючы — не нацалуешся, — коратка сказала Зося.

— Каб жа мяне хто цалаваў — не ўцякаў бы, — адазваўся Васіль.

— Ды і так ён не толькі не збіраецца ўцякаць, а нат маніцца ў суседства да нас прыстаць: пусташ аглядаў, зямлю думае купляць, дык пакуль усё гэта правядзе — не мае куды дзецца — хоча да нас тымчасова хоць у падсуседзі.

— Хата таты — як захочаце, так і зробіце, — зноў коратка адказала Зося.

Стары, знаючы характар свае дачкі, не хацеў зразу адкрываць карты. На ўсё свой час прыйдзе, думаў ён.

Папалуднаваўшы, мужчыны пайшлі да работы: стары — парадкаваць сена, а Васіль — да касы. Цяпер уся гутарка круцілася толькі аб будучай гаспадарцы. Першнаперш трэба было купіць каня, упражку, калёсы, плужок — гэта грунт. Парашылі, не адкладаючы, у першае таржышча, якое адбываецца кожны аўторак у мястэчку — усё гэта набыць. Васіль разважыў, што так зразу — у два-тры дні прыступаць са сваімі праектамі да жанчыны — няма што і патыкацца — усю справу можна сапсаваць. Трэ было перш паказацца, чаго ён сам варт, а калі б ужо так нічога і не выйшла (хоць ён гэтага не спадзяваўся) — ну, што ж? Запражэ каня, з'ездзе ў горад, забярэ свае там рэчы, якія цяпер не мог на плячах валачы, па дарозе ў Строчыка захопіць свае манаг-

кі на воз і гайда да братоў — там будзе відаць, што рабіць, пакуль спішацца з малодшым братам. Прападзе крыху часу, крыху працы — не бяда; малады, вольны — ён гэта мала цаніў, а мо і гаспадаром стацца — на тое рызыка!

За работай пры сене два-тры дні прайшлі няўзнак; надышоў аўторак; мужчыны, нічога не кажучы дзяўчыне — чаго, — выбраліся ў мястэчка. Сонца ўжо садзілася, калі Зося, здзіўлёная, угледзела, як бацька з Васілём, пад'ехаўшы да хаты на чорным коніку, злезлі з воза, знялі плуг і сталі вымаць нейкія клумкі (гэта былі крупы, мука, акраса і інш., якія купіў Васіль, як харч, на сваю долю). Пасля, выпрагшы каня, завялі яго на свежаскошаны луг і навязалі. Праз увесь вечар толькі было і гутаркі — колькі прасілі, колькі давалі то за таго, то за другога каня і як урэшце дабілі торгу зразу і з канём, і з упражкай, і з калёсамі, а плуг купілі ўжываны ў каваля.

Назаўтра чуць свет — яшчэ Зося ляжала на палку,— калі праз акно пачула ўжо голас Васіля, як той нокаў на каня. Хлопец араў папар, а Мікола стаяў збоку і прыглядаўся.

Рад быў стары. От так: каб хто араў, сеяў, збіраў, а яму і дачцэ хоць бы частку даваў — абы пражыць — адкараскаўся б ад даўнейшай цёмнай кампаніі — не тая ўжо пара — спакойна б дажываў веку, а на расходы ў Лейбы і лыжак настругаў бы — хапіла б з яго.

Зося, углядаючыся на работу Васіля, задумалася. Келішковаму сяброўству, усім тым гутаркам, якія за гэтыя дні вяліся паміж бацькам і Васілём — яна значэння не прыдавала: прычапіўся стары да хлапца, бо той быў яму на руку, разумеецца, ніякага толку з гэтага выйсці не можа: у бацькі сем пятніц на адным тыдні. Але цяпер бачыла, што тут ужо не жарты, не пустая гутарка, а нешта ды ёсць, і яе дзявочае сэрца чула, што тут справа не толькі ў гаспадарцы, не толькі ў зямлі, а справа і

ў ёй самой — Зосі. Але ўсё гэта яе мала палохала: знала бацьку добра і была пэўна, што ён проціў яе волі нічога не зробіць дый не захоча рабіць, а што гаспадарка будзе ісці, як у людзей — гэта нат яе цешыла, тым больш што сам Васіль дакучлівым не быў і ў хаце ні ў чым не замінаў, а што будзе пасля — тады тое будзе. Тым часам яна была занята сваімі, важнейшымі для сябе, думкамі: уступіць так лёгка Алёксу Прузыне, гэтай Сальнічышцы — яна не ўступіць. Што Гуронак так збэсціў сына за яе бацьку — дарма. Зося была пераконана, што Гуронку не столькі аб гонар сваёй сям'і ішло, колькі аб тыя зялёныя куфры, якія стаялі ў каморцы Прузыны, а яшчэ больш аб тыя трубкі палатна ў куфрах, у каторых былі закручаны, як хадзілі чуткі, бліскучыя пабразгачы. Але Зося не будзе Зосяй, калі з гэтага што выйдзе.

III

На сялібе Міколы Строчыка работа закіпела. Людзі не маглі надзівіцца, як усё хутка змянялася: дзе ляжала, як гара, крушня каменняў — следу яе не засталося; лазовыя кусты, якія з даўніх гадоў распаношыліся па сенажаці — счэзлі дазвання; там зноў дзірван заблішчаў роўнымі, як пад шнур, свежа паднятымі скібамі. Васілю Дубінскаму ўходу не было: як той галодны, дарваўшыся да хлеба, так ён пасля гарадскога жыцця рваўся да зямлі. Гледзячы на яго, нат стары Мікола раскратаўся і шчыра яму памагаў у працы. Зосю ад гэтых усіх перамен ажно страх нейкі агортваў, але разам з тым захоплівала яе і радасць ад таго ладу, які запанаваў на полі і ў хаце. А яшчэ больш усцешылася яна, калі бацька сваіх даўнейшых сяброў адправіў з нічым: прыехалі яны сваім звычаем адвячоркам, шаптаўся Мікола з імі гадзіны са дзве, пасля чаго тыя выехалі той жа ночы без ніякага балявання, а назаўтра стары, хоць быў крыху як бы не

свой, але ўзяўся зноў за работу — ладзіць барану, якая патрэбна была ўскорасці да скарадзьбы.

Кожны будні дзень работа ішла аднолькава і жыццё плыло роўна, тым больш выдзяляліся нядзелі і святы. Пасля абеду мужчыны ішлі ў мястэчка; там у Лейбы — у гэтым местачковым клубе — збіраўся розны народ: было з кім пагутарыць, было з кім і выпіць. Васіль, прывыкшы ў горадзе да таварыства, ахвотна праседжваў тут і заводзіў знаёмствы. Местачковыя хлопцы спярша крыху чураліся «прыблуды», як яны спачатку называлі Васіля, але атэстацыя Лейбы, што ён знаў яго бацькоў, што гэта былі гаспадары і «важныя» людзі, перамагла і супакоіла местачковых алегантаў; не малое значэнне мела яшчэ і тое, што Васіль не толькі не галіўся на чужую чарку, але нярэдка падстаўляў і сваю ўласную; калі ж выпівалі кампаніяй, Васіль заўсёды без торгу і спрэчак акуратна плаціў не толькі сваю, але і Строчыкаву долю. Ужо з гэтага аднаго ўсе варажылі, што ў хуткім, бадай, часе на сялібе Міколы не абойдзецца без вяселля. Такія чуткі яшчэ больш сталі расці, калі на ігрышчах пачалі разам паказвацца Васіль і Зося.

А тым часам паміж Васілём і Зосяй справа не так гладка ішла, як гэтага жадаў хлапец, а за апошнія часы нават дзіўна неяк стала заблытвацца.

Праўда, спачатку Васіль не толькі не налягаў, але і гутаркі не наводзіў аб сваіх сардэчных інтарэсах. Гэта супакоіла крыху дзяўчыну, і ўскорасці яна, можна сказаць, здружылася з Васілём. Жартавалі, смяяліся, нат у рабоце кпінкуючы, памагалі адно другому, гаварылі аб усім і ўсіх — толькі не аб сабе. Гэткія адносіны саўсім здаволілі Зосю, але не Васіля. З кожным днём ён штораз больш і больш прывыкаў бачыць яе каля сябе; не на дні, а ўжо на гадзіны лічыў час спаткання з Зосяй. Найлепш аб гэтым пераканаўся Васіль, калі ездзіў па свае рэчы ў горад.

Седзячы ў Лейбы з кампаніяй, яму здавалася, што

гэта гарадскі навык цягне яго да людзей, але цяпер зразумеў, што гэта саўсім не тое. Ад Лейбы — калі хаця — за паўгадзіны ён мог быць зноў пры Зосі, і гэта свядомасць блізкасці яе — супакойвала хлопца. Але калі ён ад'ехаў на пяцьдзесят вёрст ад той хаты, дзе жыла Зося, розныя думкі ажно пражылі яго мозг: не спаў усю ноч, а назад гнаў каня да Строчыкавай сялібы, як на пажар.

Угледзеўшы ўрэшце Міколу і Зосю, ён так з імі вітаўся, так аб усём распытваўся, — як бы немаведама колькі часу не бачыліся. Аніяк не мог даць веры, што праз гэты час нічога не змянілася, і заглядаў у вочы то старому, то дзяўчыне з недаверствам: ці не крыюцца яны перад ім з чым-колечы, аб чым не хочуць прызнацца.

Агледзеўшы ўсю гаспадарку, нагаварыўшыся даволі, вечарам Васіль крыху супакоіўся, але калі кінуўся, змучаны дарогай, на сена спаць, замест сну — трывожныя думкі зноў захапілі хлопца: куды дзеўся той спакой, які панаваў даўней у душы, пытаў ён сябе. І калі стаў удумвацца, разбірацца ў цяперашнім сваім палажэнні, то пераканаўся, што прычыны неспакою не ў грошах, частку каторых успеў расшорыць *, не час, патрачаны на чужую гаспадарку, не зямля, не тая пусташ, якую марыў набыць — не, — усё гэта толькі тыя нітачкі, якія накручваюцца на адзін і той самы клубок, а клубок адзін: Зося. Яго трэба разблытаць. Калі будзе пэўнасць якая з Зосяй, тады будзе пэўнасць і цэль усёй працы, а тады — само сабой — вернецца і спакой. Выхад, значыцца, застаецца адзін: разгаварыцца з Зосяй як найхутчэй, не адкладаючы — заўтра раніцай. Але раніца як бы ахаладзіла той імпэт, які быў агарнуў яго ўчора звечара. Няпэўнасць — чым і як скончыцца найважнейшая для яго цяпер справа — адбірала адвагу: ось, у нядзелю пойдуць на вечарынку ў мястэчка — тады і разгаварыцца найлепш будзе, — ніхто не перашкаджае. Прыйдзецца, праўда, чакаць яшчэ два дні — што ж зробіш — пры рабоце час

праляціць нязначна, а там усё будзе ўжо вядома і скончана.

Аднак мыляўся Васіль: тыя два дні, якія, спадзяваўся, шпарка пройдуць, як на злосць, цягнуліся бесканечна, а кожная работа, за якую бы ні браўся, так не спорылася, што проста з рук валілася. Калі ж урэшце надышла нядзеля і збліжаўся час выбірацца на вечарынку, то Васілю раптам захацелася, каб зноў вярнуліся і субота, і пятніца. Яго цвёрдая пастанова неадкладна разгаварыцца з Зосяй зноў пачала неяк слабець, таяць.

Ідучы сцежкай — нацянькі ў мястэчка, хлопец такі быў маўчлівы, сумны, што дзяўчыне ажно жаль зрабілася і, хочучы крыху яго раскратаць, пачала паджартовываць:

— Відаць, Васіль, нечага забыўся ў горадзе, што такі маркотны вярнуўся; а мо што там страціў, прымерам — сэрца?

Васіль ажно вочы вытрашчыў: гэта ж і ёсць пачатак, якраз той пачатак, які яму аніяк не даваўся, і, баючыся яго згубіць, паспешна загаварыў:

— Згадала, Зося, згадала: страціў я сэрца, толькі не ў горадзе, а тут — на сялібе вашай страціў, і сэрца страціў, і спакой страціў, закапаў іх тут глыбока-глыбока.

Зося спахмурнела. Яна не рада ўжо была, што ўдалася ў жарты, якія выклікалі якраз тое, чаго дзяўчына так не хацела, так баялася. А Васілю здалося, што найцяжэйшая для яго хвіліна ўжо мінула, цяпер быццам грэбля прарвалася — словы плылі ўжо самі:

— Бачыш, Зося, нідзе я не мог усядзець, з нікім не мог ужыцца. З братамі не паладзіў — разышоўся; у горадзе службу добрую меў, вясёласці і гульняў хапала — дакучыла, кінуў, а ось тут зайшоў, як звычайны падарожны — падначаваць толькі, а глядзі, што сталася: цяпер ужо і сабакамі не выганіш мяне адсюль. За гэтых колькі тыдняў так прывык, так прывык, што нікуды не хочацца: ані горад мяне не цягне, ані радня свая,

з каторымі жыў ад дзяцінства. Зямля, думаеш, ваша спадабалася? Гаспадарка гатовая? На іх, думаеш, ганюся? Ані думаць! Я грошы маю: магу купіць і зямлю, і гаспадарку завесці. І куплю. Гэту пусташ побач з вашай сялібай куплю, абы ты, Зося, захацела; і гаспадарку завяду, абы ты, Зося, захацела; і працаваць — як той вол, працаваць буду, абы ты, Зося, захацела... Бацьку твайго шанаваць буду, а табе, Зося... служыць буду...

Зося маўчала.

— Я не гультай, не зломак, — пачаў дальш Васіль,— не бадзяка і не прыблуда...

— А ведаеш, хто цябе першы назваў прыблудам?— перапыніла Зося, — Прузына Сальнічышка. Яна перад усімі не інакш як прыблудам звала цябе — з яе і пайшло.

— От шэльма, рапуха! — вылаяўся Васіль.

— Праўда, што рапуха: у яе вочы, як у жабы. Ты яшчэ не ведаеш, што гэта за цаца!

Зося рада была, што гутарку можна было звесці на што другое, і пачала расказваць, жаліцца:

— Падросткам яшчэ я была, пабягу, бывала, у мястэчка — ведама — пагуляць хочацца малой, прыстану да местачковых равесніц, а паміж імі ўжо тады Прузына рэй вадзіла, — як толькі мяне ўгледзе, так зара і накінецца: «Не лезь, брыда, да нас, пайшла вон!» Ды нагой, ды нагой, як таго сабаку. Я толькі зацісну кулачкі ды бягу плачучы дамоў. Яна заўсёды мне дакучала: і змалку, і падросшы, і цяпер; усе плёткі на нас — з яе; праз яе мне сорамна было ў мястэчка паказацца — усю моладзь проці мяне падбухторвала...

— От погань, я ёй пакажу! — зноў вылаяўся Васіль.

— Помніш, Васілька, — дальш гаварыла Зося, цешучыся, што так варожа настройвала хлопца проці сваёй ненавісніцы, — помніш, як ты на першай вечарынцы хацеў з ёй ісці гуляць, а яна адвярнулася ў другі бок і кажа да дзяўчат (ты мо і не чуў, а я блізка стаяла —

чула): «Не мела работы — такому прыблудзе толькі гарадскія сметнікі прыбіраць, а не з дарэчнымі дзяўчатамі гуляць...»

— Паб'ю, даліпан, паб'ю! — крыкнуў ужо Васіль, заціскаючы кулакі.

— Што ж з гэтага, што паб'еш? — разважала Зося.— Ты пачнеш — на табе і скончыцца: табе яшчэ больш можа ўляцець: за яе браты і хлопцы заступяцца — яна ж з імі гарэлку п'е, як роўная. Такая ўжо п'яніца — па бацьку пайшла; кожную вечарынку падвыпіўшы. Памставаць пасля будзе, хіба табе, Васіль, прыйдзецца ўцякаць адгэтуль.

— Недачаканне! — сярдзіта адазваўся Васіль. — Не я ёй, а яна мне ўступе з дарогі.

Цяпер ішлі ўжо моўчкі. Васіля апанавала злосць. Так уся гутарка з Зосяй складна пачалася, а тым часам нічым не скончылася. Загаварылі аб гэтай, каб на яе ліха, Прузыне, і ён нічагусенькі не даведаўся, не дабіўся ніякага адказу нашчот сваёй справы ад Зосі. Трэба было б дапытацца ўрэшце, але цяпер ужо аніяк не мог прыдумаць, з чаго пачаць. Зося была рада. Рада была, што, не даўшы ніякага адказу хлопцу, так лёгка выкруцілася, дый цешылася, што так лоўка пад'юдзіла яго проці Прузыны. Што Васіль мог нарвацца — гэта яе саўсім не абыходзіла, абы-толькі Прузыне дасталося.

На вечарынцы народу было, як і заўсёды, шмат. Васіль, далучаючыся то да адной, то да другой кампаніі, моцна падвыпіў і, ходзячы за Прузынай, дапякаў яе рознымі слоўцамі. Дзяўчына пажалілася двом братом сваім. Тыя, таксама добра выпіўшы, заступілі дарогу Васілю,— слова за слова — пачалася лаянка, а пасля ўжо і скакаць адзін да другога сталі. Немаведама, чым бы гэта ўсё скончылася, каб не падбеглі хлопцы і не расцягнулі завадыякаў.

— Хлопцы! — адазваўся з кута бацька Прузыны, каторы, шукаючы прычыны да выпіўкі, не прапушчаў ні-

воднай вечарынкі, — знаеце мяне: гарнец стаўлю, толькі зараз выкіньце гэтага валацугу!

Закруцілася нешта ў вачах Васіля, у вушах зашумела, і не агледзеўся, як апынуўся ён на дварэ перад зачыненымі дзвярамі. Пачаў лаяцца і барабаніць кулакамі ў дзверы, у сцены, але выбегла Зося, хапіла яго за руку і пацягнула за сабой дамоў. Васіль, лаючы і кленучы ўсіх, ішоў за дзяўчынай, як паслухмянае дзіця. Зося старалася яго супакоіць:

— Дарэмна ты на ўсіх наракаеш, Васіль; тут ні хлопцы, ні браты, ні нат стары бацька не віноўны: гэта ўсё Прузына настроіла, яна адна.

— Не дарую, пакуль жыў, не дарую! — бурчэў пад нос п'яны хлопец.

На другі дзень Васіль, сярдзіты, хмурны, узяўся да работы. Цэлы тыдзень працаваў ён, мала з кім гаворачы; калі ж надышла зноў нядзеля, пашаптаўся аб нечым з старым Міколам, зараз пасля абеду запрог свайго коніка, і, сеўшы ўдвух, мужчыны выехалі за вароты.

Зося была неспакойна гэтай няведамай дзеля якой прычыны паездкай; розныя думкі прыходзілі ёй у галаву: праз увесь дзень, здавалася, месца не магла сабе знайсці.

Сонца ўжо садзілася, калі вароты зноў скрыганулі і на двары паказаўся знаёмы конік. Зосі крыху адлягло, але дапытваць не хацела. Тым часам мужчыны, вясёла гутарачы, упарадкавалі каня і ўвайшлі ў хату.

— Ну, Зося, — першым адазваўся Мікола, — барыша добрага захапілі па дарозе, давай толькі хутчэй закусіць чаго, бо цэлы дзень галодныя былі, як сабакі.

— Не трэ было цягацца цэлы дзень, — сказала Зося, думаючы гэтым выклікаць прызнанне, куды і чаго ездзілі.

— Мусіць-то, трэба было, калі цягаліся, — коратка адказаў бацька.

Васіль, усміхаючыся, адпячатаў пляшку, наліў чарку і падаў дзяўчыне:

— Заўтра, Зося, бярэмся за новую работу, дык выпі, каб ручыла.

— Не ведаю я нічога, якая там у вас работа, дык і піць не буду, — адазвалася, нібы загневаная, Зося.

Але мужчыны, сеўшы за стол, п'ючы і закусваючы, сталі расказваць, перабіваючы адзін другому, куды і чаго ездзілі.

Ездзілі ў двор да камісара нашчот гэтай жа пусташы прапытаць. Камісар вельмі ахвотна прыстаў на продаж, бо толькі клопат яму з гэтай зямлёй: ніхто не хоча там жыць і брацца за яе, а да двара яна не прылегла. Пытаўся, смеючыся, чы не баяцца яны, што пусташ няшчасце ім прынясе, але Васіль адказаў, што ў ніякія забабоны не верыць і здання не баіцца; хацеў бы нат яшчэ гэтай восені азіміны там пасеяць. Камісар і на гэта даў рады: абы-толькі сысціся з цаной і даць задатак, то сеяць можна, а ўвосені — як збяруцца з поля — свабаднейшым часам, паедуць у горад і ў натарыуса ўсё акуратна апішуць, тады і рэшту грошы палажыць трэба будзе. Грошы саўсім невялікія: за паўвалокі (з сенажаткай, што прытыкае да рэчкі) чатырыста ўгаварыліся, а Васіль дамагаўся яшчэ ад камісара надкінуць дрэва на будову з дворнага лесу — у гэтых жа грошах. Камісар абяцаўся пагаварыць з панам і думае, што можна будзе якую капу пнёў дастаць. Словам, усё пайшло гладка і добра. Паўсотні далі задатку, і распіска ў кішэні Васіля.

Зося, слухаючы ўсё гэта, маўчала. Нейкая таемная трывога агортвала яе.

Назаўтра, чуць свет, Васіль з Міколам былі ўжо на новым полі; абыходзілі яго нязлічаныя разы ўздоўж і ўпоперак, раіліся, праектавалі, дзе, што і як рабіць, урэшце выбралі кавалак пад жыта, якое яшчэ гэтай восені Васіль маніўся пасеяць; а што з пары ўжо зыходзіла на першую ворку, выбралі мякчэйшы грунт, дзе маніліся пробаваць шчасця сеяць у адну раллю не падмешваючы.

Вярнуўшыся на абед, седзячы за сталом і сёрбаючы зацірку, Васіль важна адазваўся да дзяўчыны:

— Трэба, Зося, каб ты полудзень прыносіла мне туды — на поле: дзень ужо невялікі, цаліну дзерці — работа няспорная — шкода часу адпрагацца, то зноў запрагацца і траціць час на пераходку, а каню пад нос гатовай травы дам.

— Гэта ж усёй хады праз маргі два-тры, — засмяяўшыся, адказала Зося, але, угледзеўшы, што Васіль спахмурнеў, дакінула:— Па мне — можна і паднесці — часу хапае.

Васіль сам добра ведаў, што на такую мэту яды няварта было насіць, але яму хацелася гэтага заходу; яго цешыла, што ось які заняў ён ужо абшар, ажно на поле яду прыходзіцца насіць.

Хлопец як бы з новай сілай, з новай ахвотай узяўся за работу. Працаваў шчыра, да поту, але меў і награду: гэта той полудзень, які яму прыносіла на поле сама Зося. Яны тут, сеўшы дзе ў цяньку пад дрэвам, самнасам — удваёчку маглі свабадней аб усім паміж сабой гаварыць. Калі ж, здаралася, Зосі не было часу, а яду прыносіў стары Мікола, Васіль тады найлепш адчуваў, як ён прывык да гэтай дзяўчыны, як яму цяжка, не пабачыўшы яе, не перакінуўшыся слоўцам з ёй, дацягнуць да вечара.

Але колькі раз ні наводзіў Васіль гутаркі так, каб дабіцца яснага адвету ад Зосі, тая заўсёды спрытна ад гэтага выкручвалася і пачынала гаварыць аб Прузыне. За кожным разам старалася Зося распальваць як найбольш злосці, нянавісці, помсты ў Васіля да гэтай дзяўчыны. Паводлуг слоў Зосі, няма чаго гаварыць і думаць цяпер аб вяселлі; гэта ж Васілю нельга і паказацца ў мястэчка, сорамна ў вочы людзям глянуць пасля той знявагі, якая спаткала яго на апошняй вечарынцы; людзі пальцамі будуць вытыкаць, што выкінулі хлопца за дзверы, як шчэпку якую. Трэба перачакаць — няхай гэта

ўляжацца, забудзецца крыху. Прузына мае злосць на Зосю, што хлопцаў ёй адбівала і адбівае, але хоць гэта няпраўда, будзе памставаць, цюкаць на іх, як на сабак,— якое ж гэта жыццё будзе, калі з хаты носа не будзе як выткнуць. Трэба чакаць.

Чаго Зося спадзявалася і чаму адцягвала з адветам Васілю — былі на гэта ў яе такія-сякія прычыны.

На канцы крывенькага местачковага завулачка, у старой хатцы, недалёка могільніку, жыла з дзецьмі ўдава Янкеліха; зарабляла яна на сваё жыццё, выпякаючы хлеб і смашныя, румяныя, траскучыя ў руках абаранкі на ўсё мястэчка і на кірмашы. Янкеліху зналі добра і мяшчане і прыяздныя. Тут можна было не толькі купіць абаранкаў на гасцінец, але — каму верыла Янкеліха — з'есці іх з фаршыраванай рыбай у заванянай баковачцы пры пляшцы жоўтай саматужкі, якую прыносіла пад фартухом старшая дачка — Двэрка. Ось тут — у гэтай баковачцы — ад нейкага часу і спатыкаліся Зося з Алёксам Гуронкам, які меў вялікую пашану і веру ў Янкеліхі за свой ціхі, спакойны характар і маўчлівую натуру.

Пасля таго як стары Гуронак прабраў сына на ігрышчы за Зосю, яны пры людзях і не падыходзілі адно да другога — быццам і не зналіся, але на вечарынках заўсёды можна было знайсці зручнасць перашапнуцца, калі сысціся ў Янкеліхі.

Што ў той бок хадзіў Алёкса або ішла Зося — ніхто і ўвагі не звяртаў: туды шмат хто хадзіў то па хлеб, то па абаранкі. Калі ж сядзелі ў баковачцы, то гэта была ўжо справа Двэркі, каторая спагадала маладым (бо і сама была маладая...), каб іх там ніхто не ўбачыў, і сама іх адтуль выпушчала, калі ў хаце не было нікога чужога.

Але на гэтых спатканнях нічога дагэтуль не маглі прыдумаць ані Алёкса, ані Зося. Зося разумела, што калі б нат удалося ёй узбунтаваць хлопца проці бацькі, то і так да вяселля не дойдзе: стары Гуронак такі быў цвёрды чалавек, што гатоў даць данос і пагубіць бацьку,

яе і сына свайго не пашкадуе; а хоць Мікола цяпер сядзеў спакойна, якія там даўнейшыя грашкі былі, Зося сама не ведала, а Гуронак, пэўна ж, добра іх ведаў; а да таго Алёкса баяўся бацькі свайго, як агню, і ніколі не адважыўся б пайсці проці яго волі.

Заставалася чакаць, але чакаць чаго? Хіба мо Прузына на якое ліха нарвецца, і вяселле расклеіцца, чы мо старыя, хоць ужо старгаваліся, як дойдзе перад шлюбам да пасагу — да гатоўкі — за чубы возьмуцца, бо абодва вялікія хціўцы, і ўсё рассыплецца, а тады? А тады мо яшчэ з год адцягнецца (ужо і гэта добра!), і за гэты час мо знойдуць якую раду, а пакуль што: чакаць.

Але калі Зося і Алёкса, не могучы нічога лепшага прыдумаць, гадзіліся чакаць, Васіль так лёгка прыстаць на гэта не мог. Як-то: ён тут загубіў свае планы і надзеі на выезд у Амерыку; ён тут улажыў столькі сваёй працы, грошаў; ён тут звязаўся ўжо з зямлёй — з гэтай пусташай, а найбольш — так прывык ужо да гэтай дзяўчыны, да той мыслі, што Зося будзе яго, што ўжо спакойным вокам глядзець на яе не мог — і цяпер чакаць? Дакуль чакаць? Што ім Прузына — нейкая там дзеўка — зрабіць можа? А ён — Васіль — ці ж не мужчына, каб не патрапіў заступіцца тады ўжо за жонку сваю? Ды ён і цяпер гатоў гэтай гадзюцы Прузыне галаву калом рашчапіць, абы яна не замінала! Зося колькі разоў бегала ў мястэчка і казала, што няма як вочаў туды паказаць — кпяць і з яе і з мяне. Не штука строіць кпінкі перад дзяўчынай, хай папрабуюць кпінкаваць перад ім — Васілём! Праўда, тры тыдні не паказваўся ў мястэчка — такога сораму набраўся праз гэну ведзьму, рапуху, але вось няхай прыйдзе нядзеля — пойдзе сам — сам адзін на злосць ім усім пойдзе — няхай папрабуюць яго зачапіць!

І ў нядзелю — пайшоў. Пайшоў да Лейбы, заказаў гарэлкі, піва, закускі і сам адзін засеў за стол. Сабраўшыяся там хлопцы, некаторыя скоса глянуўшы на Васі-

ля, усміхаючыся, шапталіся, адышоўшы на старану, паміж сабой; іншыя — зразу падышлі, быццам нічога і не было, віталіся, загаварвалі, распытваліся, чаму яго так доўга не было; такіх Васіль саджаў за стол, гутарыў з імі і частаваў — частаваў, як ніколі: на месца пустой пляшкі як віш з'яўлялася поўная, піва прынеслі цэлы кошык, булку вялікую палажылі, селядцоў наставілі. Ішлі жарты, смехі, падыходзілі новыя хлопцы — прысаджваліся і так гулялі дацямна, а калі разыходзілася добра падвыпіўшая кампанія, апрача самога Васіля, каторы больш частаваў, чым піў, — на развітанні — Васіль заклікаў усіх на другую нядзелю — тут жа — у Лейбы.

Дадому вярнуўся здаволены, павесялеўшы: цяпер ён ведаў, што калі будзе мець ворагаў, то будзе мець і прыхільнікаў, каторыя — у разе патрэбы — заступяцца за яго. Так не раз бывала ў горадзе — на фабрыцы, дзяліліся на дзве варожыя сабе партыі, кожная мела свайго правадыра, каторага з усіх сіл бараніла.

І Васіль не памыліўся: моладзь раздзялілася. Багацейшыя — трымалі старану Гуронкаў, паміж каторымі верхаводзілі два Прузыніны браты, і дзеля гэтага іх усіх называлі «сальнікамі»; бяднейшыя — прысталі да Васіля Дубінскага, і Прузына іх празвала проста «дубінамі». Дзяўчаты цягнулі да той ці іншай стараны, куды цягнула іхняе сэрца. Але паміж гэтымі партыямі пакуль што не толькі не даходзіла да бойкі, а нат не было паважнейшай звадкі. Было больш смеху і жартаў, чым злосці або нянавісці.

Васіль цэлымі днямі працаваў цяпер на сваім новым полі, як ён называў пусташ, а ў нядзелі і святы гуляў у мястэчку са сваёй кампаніяй. Да Зосі ён штораз больш, часцей і смялей прыставаў, каб рабіць урэшце які канец.

Не будзем ужо ваўкамі жыць, угаварваў дзяўчыну, ёсць людзі, што і нас будуць любіць і шанаваць, а што сальнікі бушуюць — ліха іх бяры — усё роўна ўсім людзям ніколі не дагодзіш.

— Ты бы паслухаў, як Прузына сабак вешае на нас усіх — не тое б загаварыў, — адказвала, не маючы чым бараніцца, Зося.

— Няхай толькі яшчэ раз нарвецца гэта ведзьма на мяне — заткну я ёй горла, заткну! — пагражаўся Васіль.

Зося не ведала ўжо сама, на што спадзявацца, што рабіць? Даць адправу Васілю — не важылася, бо калі Алёкса ажэніцца з Прузынай, — не сядзець жа ёй век у дзеўках, ды што ж яна будзе рабіць, калі яшчэ бацька памрэ? — усё роўна замуж ісці прыйдзецца, а за каго?— местачковыя хлопцы ганарыстыя — ці возьмуць, а з вясковымі яна ніколі ніякага знаёмства не мела, — дык больш падхадзячага і лепшага не было, як Васіль. Пры ім цяпер у хаце лад, спакой, дастатак.

Алёкса, спатыкаючыся з Зосяй у каморачцы Янкеліхі пад дазорам Двэркі, толькі рукамі разводзіў і ніякага паратунку знайсці не ўмеў; аб адным толькі прасіў яе: пакуль ён жыў, каб замуж не ішла.

— Хворы я, — жаліўся, прытуляючы да сябе дзяўчыну, — мо і смертачка мая не за гарамі, мо і вяселля свайго не дачакаю, хай жа прынамсі вочы мае не ўбачаць цябе з другім.

І праўда. Алёкса — ці сапраўды быў хворы, ці з той нуды, што не далёк быў той час, калі ў хаце іх засядзе ўжо гаспадыняй Прузына, каторую ён моцна не любіў, — спахмурнеў, асунуўся так, што нат паважнейшыя суседзі асцерагалі старога Гуронка:

— Дрэнна, Міхале, робіш, што сына гвалтам жэніш. Ліха яго бяры і з багаццем тым, калі хлопец ужо, як зямля, счарнеў, з вачэй кепска паказвае; яшчэ гатоў бяды нарабіць — рукі, не тут кажучы, на сябе налажыць.

— З вачэй яго адна глупасць паказвае, — спакойна адказваў стары, — усё тая цыганка мазгі яму закручвае, нічагусенькі — выветрае, яшчэ дзякаваць будзе, калі зажыве ў выгодзе.

IV

Надыходзіла восень. Паміж моладзі — ці то на полі, ці ў хаце — толькі тая і гутарка — хто з кім жэніцца, каторая за каго замуж ідзе, калі вяселле, хто як прыбярэцца і г. д.

Да першага вяселля заставалася ўсяго тыдзень часу. Гэта аддаваў сваю апошнюю дачку з хаты багаты гаспадар і добры майстар — рымар Сцяпан Кудрэвіч — удавец; прымакі браць не хацеў, бо яшчэ сам думаў жаніцца. Усім добра было ў памяці, якія адбываліся вяселлі ў яго, калі аддаваў першыя свае дзве дачкі, бо ў Кудрэвіча і яды, і напіткаў хапала без ліку і меры і нікога не абмінуў без пачастунку, а ўжо дачуліся, што трох найлепшых музыкаў з суседняга мястэчка прыгавараў, дык асабліва моладзь, заўчасу з радасці прытопваючы нагамі, рыхтавалася ўся.

Не дзіва што, калі надышла тая даўно жаданая нядзеля, народ валіў да Кудрэвіча, як у царкву, а што — хоць балота было на дварэ — дзень удаўся цёплы, дзеля прастору на скокі ачысцілі і прыбралі ток, панастаўлялі лавы і зэдлі і туды выправілі музыкаў, за каторымі шуганула, як прарваўшаяся паводка, уся моладзь. У хаце за пачастункамі і гутаркай засталіся толькі паважнейшыя кабеты і мужчыны. Праз адчыненыя вокны чутна было, як у таку запяяла спярша скрыпка, пасля зазвінелі цымбалы, ударыў барабан і раптам падняўся такі топат, як бы людзі ўцякалі ці даганялі каго.

Сцяпан не забываўся і аб моладзі: раз за разам насілі ў ток высокія пляшкі з гарэлкай, поўныя лубкі скаромніны і сыраў і закацілі туды велізарную бочку з півам, а дзяўчат частаваў сам гаспадар нейкім салодкім, але моцным напіткам, які прыгатаўляў вядомым толькі яму спосабам.

Дык не дзіва, што і поўнач яшчэ не мінула, а ўжо шмат у чыёй галаве добра шумела і круцілася. Некато-

рыя старэйшыя — хоць ноч была цёмная — сталі распаўзацца да хат, а з-паміж моладзі шмат каторыя беглі за ток — уніз да студні і там аблівалі халоднай вадой свае распаленыя галовы, а іншыя і саўсім уцякалі дамоў, ведаючы, што яшчэ будзе часу спагнаць ахвоту, бо першыя два вяселлі цягнуліся амаль не па тыдню, дык няўжо Кудрэвіч на апошняе паскупее? Апрача таго, сталі хадзіць чуткі-пашаптушкі, што сальнікі шукаюць зачэпкі з дубінамі, каб выкурыць з вяселля галапятнікаў, як яны называлі сваіх праціўнікаў, і гэта задзёрства можа скончыцца агульнай бойкай. Разважнейшая моладзь бегала ад адных да другіх і супакойвала задзіракаў, як магла.

— Дурні вы, дурні, — гаварылі бунтаўшчыкам, — пры канцы вяселля хоць вы галовы сабе паскручвайце, але сягоння — з першага дня — гэта ж усё вяселле можа рассыпацца: пагуляць добрым людзям не дасцё.

Гэтыя словы крыху апамятавалі гарачыя галовы, і толькі Прузына з чырвоным як рак тварам, з выкаціўшыміся наверх вачыма, добра падвыпіўшая, то шапталася са сваімі, то голасна — на ўвесь ток — рагатала.

Васіль, пільна следзючы вачыма за Прузынай, ажно скрыгатаў са злосці зубамі, але, баючыся зноў сораму набрацца, не хацеў першы пачынаць.

Баязлівейшыя дзяўчаты і спакайнейшыя хлопцы адракаліся вяселля і выходзілі, каб не папасціся ў кашу. Адным з першых высунуўся Алёкса, каторы, як ні круцілася Прузына, праз увесь час сядзеў хмурны, маўчлівы. Але ўсё ж такі народу яшчэ столькі засталося, што ў таку ажно горача зрабілася, а музыкам проста дыхнуць не давалі. Хлопцы, карыстаючыся, што тут не пільнавалі іх вочы старых матак і бацькоў, увіхаліся каля прыгожай і вельмі складнай да ўсялякіх гульняў Зосі, як мухі каля мёду. А Зося любіла: калі гуляць — то гуляць! І цяпер на нікога ўжо не звяртала асаблівай увагі, а час

для яе ляцеў шпарка, дык вельмі здзівілася, калі падышоў да яе Васіль і сказаў, што пара дадому ісці.

— Як-то? Ужо? — з жалем адазвалася Зося, — гэта ж саўсім яшчэ цёмна.

Але, глянуўшы на Васіля, яна хутка загаварыла:

— Ідзём, Васіль, хутчэй ідзём: ты саўсім п'яны. Што табе? Нядобра?

Хлопец сапраўды выглядаў страшна: бледны, як папера; трасло яго — ажно зубамі ляскаў, а ў кутках вуснаў відаць была белая пена.

Зося, баючыся, каб чаго з ім не сталася, бо яго сорам вытыкалі бы і ёй, нязначна падтрымовываючы хлопца, выйшла разам з тока. На дварэ чуць віднела, і сцежка яшчэ мала была значна, але Васіль ішоў роўнай, цвёрдай ступою і праз увесь час раз толькі адазваўся да дзяўчыны:

— Ну, Зося, хутка і наша вяселле згуляем.

Зося маўчала.

Увайшоўшы ў хату, Васіль раз і другі напіўся халоднай вады і, мест класціся спаць, пайшоў на пусташ. Зося, як сноп, павалілася на палок і моцна, спакойна заснула.

Сонца ўжо высока стаяла на небе, калі дзяўчына ўсхапілася і заварушылася каля печы.

— Што гэта вы там Васілю зрабілі — хлопец ад цямна, як шалёны, лётае па полі? — адазваўся стары бацька да дачкі.

— Як то — па полі? Чы ж ён яшчэ не клаўся спаць? — спытала, здзівіўшыся, Зося.

— Ані думаў! — адказаў Стрончык, — давай абедаць, ды кліч яго.

Васіль на абед прыйшоў, але да яды ані дакрануўся.

— Не магу: галава трашчыць, у вачах кругі нейкія ходзяць, — жаліўся хлопец. — От, бацька, пойдзем лепш у мястэчка, там ямчэй паснедаем, — закончыў Васіль.

За апошнія часы Васіль у буднія дні не адрываўся ад работы, а ў святы трымаўся больш сваёй новай кампа-

ніі — маладзёжы, дык старому, не маючы сваёй уласнай капейкі, прыходзілася сядзець у хаце. Цяпер рад быў скарыстаць Мікола з намовы Васіля і дзеля гэтага ахвотна згадзіўся ісці разам у мястэчка.

У Лейбы засталі яны паўнюсенька народу. Як толькі паказаўся Васіль, з усіх бакоў сталі крычаць:

— Во хто схаваў дзеўку! Дзяржыце яго, хлопцы, яго! Дзяржыце!

Васіль ад гэтага крыку ажно збялеў, але, пачуўшы рогат, і сам стаў смяяцца:

— Што вы, як жарабцы, іржэце? Я піць хачу ды есці хачу, а яны рачогуць!

— Спазніўся ж ты пахмяляцца, — загаварылі хлопцы, — мы ўжо без цябе справіліся ды ідзём на аблаву.

— На якую яшчэ там аблаву? — спытаўся Васіль.

— Ці ж ты не чуў? — дзеўка з вяселля прапала — Прузына, — паясніў адзін з хлопцаў. — Ідзём трэсці ўсе гумны — пэўна, п'яная недзе завалілася ды храпе, а бацькі рукі ломяць, галосяць...

— Мо жабы, не спазнаўшы, як сваю, у балота зацягнулі? — адазваўся другі.

Моладзь зноў зарагатала. Сталі разыходзіцца: адны шукаць Прузыну, іншыя дахаты выспацца перад вяселлем, а некаторыя падселі да Васілёвага стала, на каторым ужо стаяла пляшка з гарэлкай, і сталі перакідвацца жартамі.

— А ці ёсць Алёкса, глядзелі? Мо хлопец на вяселле сваё чакаць не захацеў: украў дзяўчыну — ды ходу.

— Алёкса ёсць: раніцай знайшоўся; але такі сумны, ажно з твару змяніўся, як апошняе страціў.

— Бо і страціў: Прузыну.

— Ну, па Прузыне не надта ён бедаваў бы! Учора як стала каля яго круціцца, дык ён і вяселля адрокся — уцёк.

— А дзе ж ён быў, калі раніцай толькі знайшоўся? Бо і Прузына, кажуць, яшчэ перада днём счэзла.

— Спаў, кажа, у адрыне сваёй на сене.

— Трэ было б тое сена добра ператрэсці, то, пэўна, і Прузына нойдзецца...

Кампанія рагатала. Васіль піў сягоння больш за ўсіх і то смяяўся разам з усімі, ажно за бакі браўся, то зноў сядзеў насупіўшыся, як сава.

У шынок раз за разам забягалі то адзін, то другі з учарашніх вясельнікаў і, разводзячы рукамі, як бы іх хто пытаўся, заяўлялі:

— Няма Прузыны — як бы скрозь зямлі праваліласся, смяхота, ды і толькі.

— Каму смех, а бацькам неспакой, — адазваўся стары Мікола.

— Мы не бацькі, а нат і не сваякі Прузыны, — адказаў Васіль, — і нам няма чаго тут рабіць і клапаціцца: выпілі — і дахаты; спаць хочацца, — і, расплаціўшыся з Лейбам, выйшаў наперад, а за ім пацягнуўся Строчык. Як толькі прыйшлі ў хату, Мікола звярнуўся да дачкі:

— Ну, Зося, адгадай загадку: не іголка — а прапала?

— Татка, ведаеш, што я да гэтага не здатна, кажыце лепш проста — у чым справа.

— Прузына прапала, — адказаў Васіль.

— Як то прапала? — спаглядаючы то аднаму, то другому ў вочы, спытала Зося, — жарты нейкія ўсё вам у галаве.

— Якія там жарты, калі шукалі ўвесь дзень і не знайшлі, — адказаў бацька.

— Э-э-э, такое дабро і ў агні не згарыць, і ў вадзе не затоне, — махнуўшы рукой, сказала Зося і ўзялася за сваю работу.

— Усяк бывае, — адазваўся Васіль і, узяўшы кажух і пасцілку, дабавіў: — Калі сам не прачнуся, разбудзі, Зося, мяне — пойдзем разам на вяселле.

Цямнела ўжо, калі Зося з Васілём, спушчаючыся сцежкай да мястэчка, здалёку ўгледзелі на гумнішчы Сцяпана Кудрэвіча цэлы натоўп народу, ад каторага

ішоў шум галасоў; але гэта не быў шум людзей, якія сабраліся на вяселле — пагуляць, а нейкі глухі, прыцішаны, як шум далёкай пушчы. Падышоўшы бліжэй, ужо можна было ўлавіць некаторыя словы:

— ...Усё тая распуста... гарэліца праклятая... вялікая рэч: перагнулася, галава закруцілася і паляцела... тут не да вяселля... доктар прыедзе...

— Васіль, — трывожна ціхім голасам адазвалася Зося, — што там такое? Я баюся... там нешта нядобрае...

— Падойдзем — убачыш, — адказаў хлопец.

Пасярод натоўпу людзей заставалася як бы пустое месца, куды з цікаўнасцю ўсе заглядалі. Зося з Васілём праціснуліся туды: на мокрай вытаптанай траве ляжала нежывая Прузына; каля яе на зямлі сядзела матка і, углядаючыся ў адкрытыя, як бы наверх паложаныя шкляныя вочы, ціха ўсхліпвала і качалася, быццам калышачы да сну дзіцянё.

Васіль не столькі ўглядаўся да нябожчыцы, колькі да людзей, якія ўвокал яго стаялі і пільна прыслухоўваліся да кожнага слова.

Зося доўгі час стаяла моўчкі, не могучы адарваць сваіх вачэй ад твару Прузыны, урэшце, моцна схапіўшы за руку Васіля, ціха стала шаптаць:

— Васіль... уцякайма... мне страшна... уцякайма...

Калі яны зноў выбраліся на свабодную сцежку, якая ішла праз гумнішча на поле, Зося першая адазвалася:

— Васіль, што гэта сталася з Прузынай? З чаго?

— Як з чаго? Не чула, што людзі кажуць? Пайшла п'яная ваду даставаць і ўвалілася, — паясніў Васіль.

— Яна не была такая п'яная — гэта няпраўда — я ж бачыла... тут не тое... — казала Зося.

— Калі не тое, дык скажы якое — калі лепш ведаеш, — ужо злосна адазваўся Васіль.

— От, няшчасце, — як бы сама да сябе сказала, уздыхнуўшы, Зося.

— Няшчасце? Ці не для цябе няшчасце? — зноў злос-

на пачаў Васіль. — Праз увесь час толькі той і гутаркі было ды наракання: Прузына ды Прузына — усюды яна замінала. Цяпер ужо Прузыны няма — няма замінішча, і адказу ніякага не можа быць...

— У чым адказу? — перапыніла Зося.

— А хаця бы ў вяселлі нашым, — адказаў Васіль.

— Тут хаўтуры, а яму вяселле ў галаве, — сказала, задумаўшыся, Зося.

Раптоўная смерць Прузыны неспадзеўкі захапіла Зосю. Дзяўчына пакуль што сама яшчэ не ведала, што з гэтага магло выйсці, і толькі цяпер як бы агледзелася: «Гэта ж Алёкса вольны...» — і, лягчэй ужо ўздыхнуўшы, зноў як бы сама да сябе адазвалася:

— Што праўда — то праўда: замінала яна шмат...

Калі прыйшлі ў хату і Зося расказала аб усім бацьку, той саўсім спакойна адазваўся:

— Гэта што? Не такія яшчэ штукі бываюць: пастухом яшчэ я хадзіў, як у гэтым самым мястэчку адзін шавец, не памятаю ўжо, як зваўся, але вялікі п'яніца быў, дык у бочцы — у сваёй хаце ўтапіўся. Казалі, што ён усё чорцікаў лавіў па хаце; здалося, відаць, яму, што чорт у ваду скочыў, і ён туды за ім — боўць! Так жонка і знайшла яго, прыйшоўшы дамоў: галава ў бочцы, а ногі толькі ўверх тырчэлі...

Стары разгутарыўся і стаў успамінаць даўно мінулыя часы, але ніхто яго не слухаў. Васіль сядзеў хмурны і ані словам не адзываўся. Зося, кратаючыся каля сваёй гаспадаркі, успела гаршчок з стравай выкуліць, міску разбіць, — усё неяк сягоння з рук ёй валілася. Дзень выдаўся даўгі, нудны.

Назаўтра Зося ўгаварыла мужчын схадзіць у мястэчка даведацца, што там чутна. Застаўшыся адна ў хаце, яна старалася абдумаць цяперашняе сваё палажэнне, але гэтыя думкі так хутка ляцелі, так раптоўна змяняліся і так дзіўна блуталіся, што аніяк не даваліся дзяўчыне разабрацца ў іх. Апрача таго, цікаўнасць і няпэў-

насць, што робіцца там — у мястэчку — не давалі ёй супакою: раз за разам выбягала яна з хаты паглядзець, ці не варочаюцца мужчыны. І чым дальш прыходзілася чакаць, тым больш агортваў яе нейкі неспакой, страх...

Спаўдня ўжо мінула, калі Зося ўгледзела ўрэшце здалёку на сцежцы ад мястэчка бацьку: ішоў сам адзін і — па хадзе знаць — моцна п'яны. Не чакаючы, калі падойдзе бліжэй, хутка пабегла дзяўчына на сустрэчу.

— Што чутно? Чаму сам? Дзе Васіль? — стала засыпаць бацьку пытаннямі Зося.

Строчык стараўся як мага справіцца з нагамі сваімі і са сваім языком:

— Ліха на іх... паліцыя круціцца... не люблю паліцыі... пракляты народ... уцёк я... арыштоўваюць... хлапца арыштавалі... чэрці...

— Васіля арыштавалі? — трывожна спыталася Зося.

— Арыштавалі... — з трудом адказваў Мікола, — але... арыштавалі Алёксу...

У дзяўчыны пацямнела ў вачах; ногі падкашваліся, яна схапіла бацьку за руку і стрымала яго:

— Чакайце, татка, чакайце! Вы што кажаце? Апамятайцеся... арыштавалі, кажаце? Каго арыштавалі? Каго? Васіля?

— Якога табе Васіля, за што Васіля? Васіль п'янствуе... не хоча дадому, а я ўцёк... паліцыя паганая... арыштавалі Алёксу, за Прузыну ўзялі, — балбатаў стары.

— Гэтага быць не можа... не можа... не можна так... не можна Алёксу забіраць, — ужо сама не памятаючы што, шаптала Зося. — Вы ў хату, татка, ідзеце, я сама туды пабягу... гэтага быць не можа...

У мястэчку Зося адразу звярнулася да Лейбы, там застала некалькі хлапцоў і дзяўчат, а за сталом сядзеў Васіль.

— От і Зося прыйшла, — спакойна адазваўся Васіль, як бы гэтага і спадзяваўся. — А бацька вярнуўся?

— Вярнуўся, — адказала Зося і кінулася да дзяўчат распытваць, як і што тут сталася.

Кожная з іх, як і заўсёды бывае ў такіх разах, расказвала па-свойму, і кожная дакідала сваю ўласную дагадку, і гэткім чынам прыпадак з Прузынай разрастаўся ў штораз большае і большае апавяданне, у каторым трудна было ўжо разабрацца, дзе праўда, а дзе выдумка. Але Зосі ясна было адно: Алёксу арыштавалі і пагналі ў стан на дапрос.

Арыштавалі, дзякуючы тым чуткам, якія распаўсюджваліся па мястэчку: Алёкса Прузыны не любіў, жанілі яго амаль не гвалтам; Алёкса калісь-то некаму прызнаўся: лепш смерць, чым такое вяселле; Алёкса першы счэз з вяселля і дадому не пайшоў, а вярнуўся толькі раніцай, калі Прузыну ўжо шукалі; Алёкса паказаў паліцыі, што ён спаў у адрыне — на сене, але калі ён прыйшоў на тое сена? Мо тады, як Прузыны ўжо на свеце не было: прыпільнаваў дзяўчыну, як выйшла з хаты, паклікаў яе, прыдушыў або прыбіў, бо на галаве нябожчыцы знайшлі круглаватую, як маладзічок, рану, ды ўкінуў у студню, а тады ўжо пайшоў і на сена. А што найважней: каму ж, як не Алёксу, замінала Прузына? Каму ж, як не Алёксу, смерць Прузыны давала свабоду?

Дальш Зося не магла ўжо слухаць усіх гэтых вывадаў: у галаве муцілася, ногі слабелі, і яна ўжо толькі думала, каб як хутчэй дабрацца дахаты і легчы. Толькі яна выйшла ад Лейбы, як Васіль, даганяючы яе, клікнуў:

— Чакай, Зося, і я іду.

Зося, нічога не адказваючы, аглянулася, затрымалася, пакуль не надышоў Васіль, і пайшлі моўчкі побач. Калі мінулі ўжо мястэчка, Зося адазвалася:

— Васіль, што яны там плятуць? Няўжо Прузыну забіў Алёкса? Гэтага ж быць не можа!

— Пэўна, што не: не Алёкса, а ты, Зося, утапіла Прузыну, — цвёрда адказаў Васіль.

— Напіўся, дык табе жарты ды смешкі ў галаве, а там чалавека дарма забралі, — сказала Зося.

— Якія тут жарты, — зноў цвёрда загаварыў Васіль. — Прузыну ты, Зося, утапіла: злосцю, нянавісцю сваёй утапіла ты яе. Не ты ж праз увесь час падгаварвала, пад'юджвала да помсты над гэтай дзяўчынай? Не ты ж столькі-то раз казала, што Прузына і толькі Прузына ва ўсім вінавата — яна табе спакою не давала, яна табе замінала! Ты ўтапіла Прузыну... маімі рукамі ты ўтапіла яе...

— Васіль... Васіль! Ты што... ты?? — задыхаючыся, дапытвала дзяўчына.

— А хто ж, як не я, — ужо дрыжачым голасам пачаў дальш гаварыць Васіль, — скажу табе ўсё, як было... Табе прызнаюся, як на споведзі прызнаюся... Каму ж ведаць, як не табе... табе трэба ведаць — гэта ж наша справа, наша: твая і мая...

— Што ты, Васіль? Ты хіба сп'яна? — перапыніла, спужаўшыся, Зося.

— Не п'яны я, Зося, не: мяне ўжо і гарэлка не бярэ... не... слухай, як было, — і Васіль, як бы баючыся, каб хто не падслухаў, стаў шаптаць прарываючым голасам:— Не спадзяваўся я гэтага... мыслі нат той не было, а ось сталася... як? І сам добра не памятаю. Цёмна яшчэ было... выйшаў я на двор — галава надта круцілася... чую — нехта каля студні шамочыцца... падышоў і я туды, ажно Прузына... боўтае вядром у студні — ніяк вады не можа зачарпнуць... пазнала мяне... а, кажа, пан Дубіна — гарадскі кавалер, мо мне паможаце, ніяк вады не дастану... я, моўчкі, зачапіў поўнае вядро ды кажу: гатова, толькі цягнеце... каб так вечару прыждаць; і ў думцы ў той момант нічога дрэннага не было... нагнулася яна, ажно галава ў зрубе схавалася... а я... як на споведзі кажу: не помню добра — мо толькі жарт які мігнуў у галаве... а я... ці яе штурхануў, ці нагой, здаецца, падбіў яе ногі... толькі раптам нешта белае міганула мне ў

вачах, і як бы хто велізарны камень у студню кінуў — чабохнула і... сціхла... нат не крыкнула... успамінаю, успамінаю: то мне здаецца гэтак было, то зноў інакш... як я сам не кінуўся туды... хіба бог стрымаў, каб пакутаваў на гэтым свеце... а можа, гэта ты, Зося, стрымала мяне..

— Як то я? — стрывожыўшыся, спытала Зося.

— У той момант цябе я ўбачыў, — ціха сказаў Васіль.

— Не была я там... што ты, Васіль... апамятайся, не была я... — дрыжачым голасам, як бы адпрашваючыся, гаварыла Зося.

— Ведаю, што не была, а... убачыў, а мо толькі здалося? Не ведаю, — шаптаў хлопец.

— Ну, а дальш? Што было дальш? — дапытвалася Зося.

— Што дальш? — як бы ўспамінаючы, гаварыў Васіль,— дальш... ужо нічога... адышоўся я, крадучыся, пад ток і абапёрся — ногі калаціліся, устаяць не мог... а да студні падышла цэлая грамада хлопцаў, дзяўчат... чуў, як вядро цягнулі ўгару — стукалася яно аб зруб, а мне здалося... дамавіну забіваюць... а тыя рагаталі, вадой абліваліся, дурэлі... а тады? Тады зайшоў я ў ток па цябе...

— Ах, які ты страшны быў, — перапыніла Зося, — я цябе такім ніколі не бачыла, спужалася: думала, што надта ўжо п'яны. Але што ж цяпер будзе? — як бы апамятаўшыся, спытала дзяўчына.

— Што цяпер будзе? — паўтарыў Васіль, — ці я ведаю, — як бы сам сабе адказаў Васіль...

— Трэба ж Алёксу ратаваць! Як жа так? Ён жа можа не выпутацца, прапасці! — з жарам загаварыла Зося.

— А табе Алёкса што? — звярнуўся да дзяўчыны Васіль, — мо і праўда, што я чуў: казалі...

— Адчапіся з тым, што табе казалі, — перапыніла ўжо злосна Зося, — Алёкса не вінават — за што ж ён

мае гінуць? Трэба яго ратаваць, трэба.... я сама не ведаю, — як бы змучыўшыся, казала Зося, — не ведаю... галава моцна баліць — дахаты хачу... хутчэй дахаты.

Васіль, стрывожаны, маўчаў.

Увайшоўшы ў хату, Зося зразу кінулася на палок. Мікола, не маючы звычаю выпіўшы класціся, таптаўся па хаце; цяпер падышоў ён да дачкі і, пільна прыглядаючыся, адазваўся:

— Зося, ты што гэта? І ты напілася? Чырвоная як рак! Вось ліха...

— Піць, татка, дайце — піць хачу... галава баліць, гарыць, — адазвалася дзяўчына.

— Найлепш квас памагае, квасу табе прынясу, — гаварыў, тупаючы па хаце, Строчык.

— Што вы прычапіліся да яе,— адазваўся Васіль,— не п'яная яна: каплі гарэлкі ў вуснах не мела.

— Усё роўна квас памагае, — настайваў стары.

Дзяўчына, напіўшыся квасу, папрасіла паставіць каля яе міску з халоднай вадой, і яна раз за разам, мачаючы хустачку, прыкладвала яе да свае распаленай галавы.

Назаўтра Зося не ўстала: кідалася, есці нічога не ўзяла, блюзніла, успамінаючы і блытаючы і Васіля, і Алёксу, і Прузыну. Бацька хадзіў хмуры і, цяжка ўздыхаючы, бурчэў пад нос. Васіль моцна занепакоіўся: перш-наперш шчыра жалеў дзяўчыны, а па-другое — баяўся, каб з гарачкі не нагаварыла яна чаго лішняга.

Калі ж Строчык успомніў фельчара, Васіль зараз жа кінуўся запрагаць каня; Мікола стаў нагаварваць, каб разам прывесці і кабету, каторая даглядала б хворую, але на гэта Васіль толькі тады згадзіўся, калі даведаўся, што кабета, якую раіў узяць Строчык, глуханямая Стэфка.

Фельчар, прыехаўшы, агледзеў хворую, пакруціў галавой, пацмякаў, як бы што смешнае з'еў, даў нейкага зелля і, паставіўшы на патыліцы мушку *, ад'ехаў.

Пры Зосі сядзела цяпер неадступна глуханямая

Стэфка. Яна сваімі маленькімі, быстрымі, як у звярка, вочкамі пільна ўглядалася на хворую і ў лёт угадвала кожнае яе жаданне. Лепшай апекі і не трэба было, але Васіль кожную свабодную хвіліну ад работы сваёй прыседжваў пры Зосі, а стары бацька, стругаючы лыжкі, пільнаваў ноччу.

Хвароба зацягнулася. Ледзь на трэцім тыдні Зося крыху ачуняла і магла ўжо сядзець на ложку. Цэлымі гадзінамі, падпершы рукамі галаву, не адзываючыся словам да нікога, старалася яна ўспомніць акуратна па парадку ўсе тыя выпадкі, якія сталіся ў апошнія дні перад хваробай. Розныя думкі, розныя планы радзіліся і круціліся ў хворай яшчэ галаве дзяўчыны. Адно, што заўсёды стаяла перад вачыма Зосі, што неадступна трывожыла яе — гэта лёс Алёксы — што з ім стала? Але дапытваць бацькі чы Васіля не хацела, баючыся пачуць што-колечы страшнае, горшае, чым тое, што рысавалі яе ўласныя дагадкі, думкі.

Не раз прыходзіла Зосі ў галаву, што вось, як толькі паздаравее, акрэпне, стане хадзіць, пойдзе яна да старога Гуронка, кінецца яму ў ногі і прызнаецца, як на споведзі, што і як: выдасць Васіля, але асвабодзе Алёксу. А ён — стары Гуронак — падыме яе з каленяў, абніме, пацалуе і, прытуляючы да грудзей сваіх, скажа: «Добрая з цябе, Зося, дзяўчына: вярнула ты мне майго Алёксу, ты і бяры яго сабе... хай вас бог так благаслаўляе, як благаслаўляю я...» Зося адкідалася на падушкі, зачыняла вочы і марыла, марыла...

Мінула яшчэ некалькі дзён. Зося, хоць аслабеўшая, хістаючыся, стала прабаваць ужо хадзіць. Вярнуўшыся на вячэру, мужчыны — Васіль — з работы, Мікола — з мястэчка, куды насіў прадаваць свае лыжкі, вельмі ўсцешыліся, угледзеўшы ўрэшце дзяўчыну за сталом. Даўно не сядзелі разам. Строчык прынёс з мястэчка навіны і стаў іх расказваць.

Ужо некалькі дзён як вярнуўся Алёкса: следавацель,

кажуць, адпусціў, атрымаўшы ад доктара пратакол. Доктар той рэзаў Прузыну і ніякіх азнакаў гвалтоўнай смерці не знайшоў, а што на галаве нябожчыцы была рана — дык гэта аб вядро, як ляцела, ударылася; прымералі — якраз даходзе формай, і на гэтым скончылася і ўсё следства. Местачковыя — адны вераць усяму гэтаму, другія ж: Гуронку, кажуць, шмат каштавала, але як засыпаў, дык і пусцілі хлопца. Гуронак на гэтыя гутаркі злуе, як звер, і агрызаецца на ўсе бакі, а Алёкса сядзіць у хаце — сароміцца і вочы людзям паказаць.

Зося, зачырванеўшая, як мак, хціва слухала і пільна ўглядалася бліскучымі, яшчэ хворымі вачыма ў пабялеўшы твар Васіля, каторы праз увесь час сядзеў моўчкі, апусціўшы нізка галаву.

Цяпер у Зосі было адно жаданне: як найхутчэй набрацца сілы, каб вырвацца ў мястэчка і самой усё разведаць. З вялікай труднотай старалася яна паказацца жвавай і спраўнай, каб толькі дамашнія не рабілі перашкоды, і гэткім спосабам на трэці дзень, у пятніцу, выбралася ў мястэчка — да Янкеліхі нібыта купіць сабе свежых булак. Там, адазваўшы Двэрку ў баковачку, пачала распытваць. Двэрка перадала горшыя навіны, чым магла спадзявацца Зося.

Стары Гуронак грызе сына, што той ублытаўся ў гэткую дрэнную справу. «Ліха,— кажа,— цябе ведае, як і што там у вас было, а толькі пэўна, што цяпер ні адна дарэчная фамілія дачкі сваёй за цябе не аддасць. Пакуль усё гэта ператрэцца, забудзецца, едзь у Амерыку зарабляць грошы, няма чаго тут рабіць: і без цябе ёсць каму ў хаце за місай сядзець». Алёкса і рад. «Лепш,— кажа,— з'ехаць мне на край свету, чымся маюць тут мяне пальцамі вытыкаць ды ў вочы лезці». Дык, пэўна, за тыдні тры і выедзе з кампаніяй, бо ў гэтым часе заўсёды выязджала з мястэчка некалькі чалавек у Амерыку. Зося ўпрасіла Двэрку як-колечы наказаць Алёксу,

каб прыйшоў сюды — да Янкеліхі ў аўторак, калі менш круціцца народу ў мястэчку.

Вярнуўшыся дахаты, дзяўчына праз увесь час старалася абдумаць, чаго трымацца ў гэтым новым, саўсім неспадзяваным для яе палажэнні. Тыя думкі, мары тыя, якія буялі перш у яе хворай галаве — такія чароўныя мары — цяпер, калі яна спакойна, цвяроза разабрала іх — развеяліся як туман. Ісці да Гуронка старога, рабіць данос на Васіля — гэта ж адна глупасць! Васіль або адрачэцца, або яе ўблытае. Чым яна тады дакажа? Хто ёй дасць веры? От, скажуць, захацелася Строчыкам чужой працай пажывіцца, дык уздумалі хлапца ўпратаць. І скажуць. Не, цяпер не тое — цяпер прыйшоў канец і яе надзеям і яе марам. Абы пабачыцца яшчэ з Алёксам, разгаварыцца з ім, нагледзецца на яго, а тады? — тады — хоць у вір галавой. Каб толькі хутчэй прыждаць аўторка!

А чакаць Зосі было тым больш цяжэй, што Васіль стаў гвалтоўна прыставаць рабіць які-колечы канец дый назначыць дзень шлюбу.

— Ніякай перашкоды цяпер хіба ўжо няма,— дык чаго ж яшчэ цягнуць? — угаварваў Васіль дзяўчыну,— дый разлучаць тое, што ўжо злучана, няма каму.

— Ніхто нас не толькі не злучаў, але нат і не сватаў,— выкручвалася Зося.

— Сасватала нас Прузына, яе смерць злучыла нас,— сур'ёзна адказаў хлопец.

Зося змаўчала. Яна сцягвала цяпер з адказам толькі дзеля таго, што хацела яшчэ раз параіцца з Алёксам.

Спаткаўшыся ўрэшце з ім у назначаны дзень у Янкеліхі, Зося стала плакаць і наракаць на сваю долю. Алёкса з набалеўшым сэрцам слухаў гэтых жаляў і стараўся, як мог і чым мог, уцешыць дзяўчыну.

— Плакаць і бедаваць тут нічога ўжо не паможа,— разважаў ён,— такі ўжо, відаць, лёс, што трэба расстацца, дык каб расстанне гэта прынамсі было добрае,

бо што ж больш застаецца? Калі б нат удалося яму і выкруціцца ад гэтай выправы ў Амерыку — жаніцца ім цяпер ніякім чынам нельга, хоць бы нат са стараны бацькоў перашкоды не было, бо тады — няма што і гаварыць — усе ў адзін голас закрычаць: «Ось бачыце, каму патрэбна была смерць Прузыны!» І бацькі нябожчыцы могуць прычапіцца, зварухнуць паліцыю і гатовы запратаць маладых у турму. Алёкса гэтага не хоча і на такую рызыку не пойдзе: калі не можа даць шчасця Зосі, дык не хоча, каб яна праз яго пакутавала, і хоць надта яму будзе цяжка, балюча, але свету завязваць дзяўчыне не будзе: хай ідзе замуж за Васіля — хлопец не кепскі, а ён — Алёкса — з'едзе з гэтай старонкі, каб і вочы яго гэтага не бачылі, каб і сэрца свайго дарэмна не крывавіць. Цяпер толькі трэба пастарацца, каб хоць гэты кароткі час, які застаўся да выезду Алёксы,— выкарыстаць: нагледзецца, нацешыцца сабой, каб было што ўспомніць і на чужыне.

Зося, слухаючы Алёксу, хоць яшчэ горш разжалілася, але чула, разумела, што хлопец кажа праўду: іншага выхаду няма. Хай жа будзе і так — ёй цяпер усё роўна. Да выезду Алёксы заставалася не больш трох тыдняў; хай жа Васіль рыхтуецца праз гэты час да вяселля; хай усім сам займецца і з'едзе да братоў сваіх, мо ў горад, чы яшчэ куды, каб не замінаў тут ёй — Зосі. Гэтыя тры тыдні — яе тыдні. Знайсці прычыну ісці ў мястэчка цяпер будзе лёгка: мала чаго трэба дзяўчыне перад вяселлем,— дык будуць спатыкацца тут — у Янкеліхі, а мо яшчэ дзе — абы часцей, як найчасцей... а пасля? Пасля няхай едзе сабе Алёкса туды — у Амерыку, а тут — пад той час будзе вяселле. Будзе вяселле для ўсіх, а для яе — Зосі — гэта будуць хаўтуры — хаўтуры яе мараў, яе маладога жыцця, хаўтуры першага і апошняга кахання.

Зося, варочаючыся дадому, ужо не думала аб тым, што будзе пасля, па вяселлі,— цяпер у галаве яе раіліся

толькі гэтыя тры тыдні, якія заставаліся да расстання з Алёксам, і гэта адно як бы ажывіла дзяўчыну.

Васіль, глянуўшы на яе, зразу прыкмеціў гэту перамену і ажно здзівіўся.

— Відаць, Зосі нешта пашэнціла ў мястэчку, гэтак узрадаваная вярнулася,— сказаў ён дзяўчыне.

— Згадаў, Васіль,— адказала, услыхаючыся, яна,— пашэнціла — на булкі,— і стала выкладаць румяныя «халкі» на стол.

— Прыеліся ўжо гэтыя жыдоўскія прысмакі,— каб так скаштаваць караваю — бадай, лепш было б,— адазваўся Васіль, збоку ўзіраючыся на дзяўчыну.

— Я і ад караваю не адмовілася б, каб так хто гатовенькі на стол паставіў,— сказала Зося.

— Цьфу! — неўспадзеўкі адазваўся стары Мікола, стругаючы начоўкі,— дальбог, збрыдала ўжо слухаць! Што гэта цяпер за мода пайшла: нейкія загадкі, нейкія дагадкі — ліха ведае чаго і аб чым валаводзяць-валаводзяць, а толку ніякага: чы туды, чы сюды!

— Бацька, ведаеш,— загаварыў Васіль,— чуць не ад першага дня, як я сюды папаў, чаго і чаму тут застаўся, а і Зосі я ўжо не раз казаў.

— Казаў, дык і годзе! — перапыніў Строчык Васіля, а пасля звярнуўся да дачкі:— А ты, Зося, што звадзіла хлопца? Кажы: так чы не? Толькі не валаводзь!

— Не ведаю,— пачала дзяўчына,— як татка.

— Як татка? Як татка? — перадражніваў Мікола Зосю,— а вось, як татка: Васіль,— крыкнуў ужо стары да хлопца,— гоцні на каня і мігам да Лейбы! З пустымі рукамі мне не варочайся! Разумееш?!

Хлопец ажно падскочыў з радасці, і толькі пяты яго замігацелі.

— Ну, Зося,— адазваўся Строчык,— я са сваімі прыладамі магу і ў сенцы выбрацца, а ты завініся тут: прыбяры ў хаце, абрус засцялі ды вазьміся за скавараду, каб, пакуль вернецца Васіль — усё было гатова.

— Мне незабава,— адказала, увіхаючыся па хаце, дзяўчына.

І праўда. Калі Васіль вярнуўся, то застаў ужо пасвяточнаму прыбраную хату, а на стале цэлую заставу: і сыр, і масла, і нарэзаная скаромніна, і паўнюсенькая скаварада яшчэ пырскаючай яешні. Хлопец таксама выступіў не абы-як: паставіў чатыры бутэлькі піва салодкага, кварту простай гарэлкі і пляшку нейкай чырвонай салодкай баўтухі.

Баляванне зацягнулася да ночы, дык паспелі ўсё абдумаць, абгаварыць, як, калі і што трэба зрабіць, а на астатак так падвыпілі, што ўсе перацалаваліся, а стары Мікола сплакаўся, як бабёр.

Вяселле назначылі праз месяц. Васіль даў Зосі пяцьдзесят рублёў, каб дзяўчына справіла ўсё патрабнейшае як для сябе, так і для хаты. Стары Строчык падраджаўся направіць печ, бо ўжо моцна павыбівалася і брыдка выглядала, і выбеліць хату. Сам жа Васіль перш-наперш меўся з'ездзіць да сваіх і папрасіць іх на вяселле — як бы не было — а браты родныя, ды і госці з іх будуць важныя: хай пабачаць тутэйшыя ганарыстыя мяшчане, якую ён мае радню; а пасля маніўся паехаць у двор да камісара, адтуль з ім у горад і зрабіць прызнанне на пусташ.

Гэткім чынам зразу скончаны ўсе свае справы, каб пасля вяселля не трэба было нікуды рыпацца, а пільнаваць хаты і сваёй уласнай ужо гаспадаркі.

Назаўтра ад самага рання Васіль стаў збірацца ў дарогу і ледзь цяпер успомніў, што трэба ж і да бацюшкі — каб там якой задзержкі не выйшла, але гэта ён надумаў уладзіць па дарозе — бо ехаць да сваіх прыходзілася праз мястэчка.

Калі свежая булачка хлеба была ўжо спечана, кавалак скаромніны і дзесятак яец згатаваны, Васіль, спакаваўшы ўсё, спаўдня выбраўся ў дарогу. Стары Міко-

ла, крэкчучы, стаў пэцкацца каля печы, а Зося яшчэ гэтага ж дня злётала ў мястэчка.

Вярнуўся Васіль ледзь на шосты дзень: чатыры дні ўправіў на дарогу, а ў братоў пагасціў усяго дні два. Але вярнуўся павесялеўшы: хмурнасць, якая лягла за апошні час на твар хлопца, як бы счэзла. Браты прынялі вельмі добра: хвалілі, што не распусціў грошы, што адрокся горада і Амерыкі, а найбольш хвалілі, што набыў сабе вечнасць, і абяцалі на вяселле прыехаць. Прывёз Васіль і пасылку і ліст да брата ў Амерыку і прасіў Зосі, каб аддала іх,— каго лепш знае з тых, што выбіраюцца за мора: а ну ж удасца знайсці, бо брат Васіля жыў у Нью-Йорку, дзе мелася затрымацца і местачковая кампанія. Сам жа Васіль, не трацячы часу, даў толькі суткі аддыхнуць каню і выбраўся да камісара канчаць з пустошай.

Больш трох тыдняў ад часу балявання страціў Васіль на свае паяздушкі і вярнуўся дахаты ўсяго за некалькі дзён да вяселля. Печ была ўжо наладжана, хата выбелена, спарадкавана было і каля хаты, толькі Зосю сваю знайшоў бледную, спахмурнеўшую, маўчлівую.

Зося праз увесь час, пакуль не было Васіля, амаль не штодня бывала ў мястэчку. Калі стары бацька выгаварваў ёй гэтыя палятушкі, дзяўчына заўсёды знаходзіла чым выкруціцца: шыла яна сукенку ў мястэчку, дык трэ было то нечага дакупіць, то прымераць і г. д. Усе гэтыя прымеркі адбываліся, разумеецца, у Янкелевай Двэркі, дзе праседжваў гэтыя часы і Алёкса. Калі надышоў урэшце апошні дзень перад выездам у Амерыку, Двэрка набралася нямала страху, бо Зосю прыйшлося адліваць вадой, а калі крыху ачуняла і ўбачыла нагнуўшагася над сабой Алёксу, катораму даўно пара было ўжо ісці, абхапіла яшчэ раз яго за шыю і прашаптала:

— Помні, Алёкса: калі не вернешся, а першы будзе

ў мяне сын,— падгадую і прышлю яго па цябе хоць на край свету.

У той дзень позна вечарам Зосю падвяла пад самую хату Двэрка, а Строчык, глянуўшы на белы з пасінеўшымі вуснамі твар дачкі, спужаўся, улажыў яе, накрыў кажухамі і праседзеў каля яе ўсю ноч. Зося — спала чы не — але пралежыла ціха, спакойна да раніцы, а пасля, устаўшы, узялася каля сваёй работы, наракаючы толькі на боль у галаве. Дні праз тры прыехаў і Васіль, калі Зося ўжо крыху пакрапчэла.

Васіль справіў вяселле, якога б не пасаромеўся і багацейшы стары местачковы гаспадар. Гасцей было паўнюсенька, а ўсім хапала і напіткаў і яды. Шмат у гэтым памаглі два старшыя браты Дубінскія, каторыя, прыехаўшы на дзвюх маляваных брычках, навезлі поўныя лубкі сыраў, каўбас, пірагоў і іншых прысмакаў. Праз тры начы чатырох найлепшых з ваколіцаў музыкаў рэзала не сціхаючы. Гулялі і весяліліся ахвоча ўсе — усе, апрача Зосі і... Васіля.

V

Жыццё маладых Дубінскіх спачатку паплыло роўна, спакойна, ціха — мо нат праз меру ціха.

Стары Мікола на сялібе сваёй ужо прывык і да адзіноты і да ціхаты, але яму патрэбна было хоць час ад часу гвалтоўнай перамены гэткага спакойства: з нейкім жалем успамінаў ён цяпер сваю даўнейшую кампанію, з каторай і дома не раз добра баляваў і ездзіў у свет «бандарыць», а ўрэшце — хаця б тыя адведзіны местачковага клуба — Лейбы, куды да вяселля часта вадзіў яго Васіль на пачастунак, але такога жыцця, якое настала цяпер, Мікола аніяк не мог зразумець і бурчэў:

— Чы тут у нас, людцы добрыя, было вяселле чы хаўтуры? Маладыя — ні за парог, да іх — ніхто клямкай не бразне, паміж сабой — гэтаксама маўчаць, гэта ж чалавек мовы людской забудзешся!

Але на гэтыя нараканні не адзываліся ні Зося, ні Васіль.

Зося, што толькі прыналежала гаспадыні, спраўляла жвава, спраўна; нічога ёй не трэба было прыпамінаць,— ніякага закіду нельга было зрабіць. Прыглядаючыся, аднак, да працы маладой кабеты, можна было лёгка прыкмеціць, што не ахвота, не любоў да гэтай работы кіруюць Зосяй, а абавязак. Кожную работу старалася яна пазбыцца як найхутчэй, каб выгадаць сабе хоць невялічкую вольную хвіліну часу. Забівалася тады дзе ў куток і моўчкі, не варухаючыся, ціханька сядзела, як бы ўсім чужая ў хаце.

Васіль працаваў, як шалёны: ад цёмнага да цёмнага кідаўся ён ад адной работы да другой, як бы баяўся застацца без занятку. У хату днём ускакваў толькі з'есці і, ні словам не адзываючыся, зноў выбягаў да работы.

Але насунуліся доўгія, цёмныя асеннія вечары, і ў хаце — пры той мяртвоце, якой веяла жыццё на сялібе Строчыка,— рабілася жутка. Мікола не вытрываў: узапасіўшы абручоў і сабраўшы патрэбнае бандарскае начынне, выбраўся ў мястэчка; там лучыў якраз на добрую пару: кожны гаспадар патрабаваў перад зімой наладзіць то тую, то іншую пасудзіну, дык бандарскіх заработкаў было і даволі і добрых. Апрача заплаты, не адна гаспадыня і яешняй і чаркай гарэлкі пачаставала старога бондара, абы-толькі дагадзіў майстар у рабоце; вечарамі і святам праседжваў Строчык у Лейбы, куды — каб скараціць доўгія вечары — сцягваліся і местачковыя жыхары, і тут не раз угаварваўся на новую работу, а пры гэтым не абыходзілася, разумеецца, без пачастункаў; ды Мікола сам меў цяпер за што і пры чым пасядзець за шынкаровым сталом, бо ткі завяліся свае ўласныя пабразгачы, дык час схадзіў гладка, шпарка і вясёла.

Вярнуўшыся дахаты, здзівіўся Мікола, калі даведаў-

ся, што больш месяца яго тут не бачылі; здзівіўся Мікола яшчэ больш, што ў хаце за гэты час нічога не змянілася — от як бы ўчора толькі выйшаў: Васіль — хоць ужо снег быў на дварэ — праз увесь дзень не спатыкаўся ў хаце, хіба толькі пры ядзе; Зося сядзела таксама моўчкі пры кудзелі. Строчыку пасля местачковага шуму свой дом выдаўся яшчэ больш глухім, пустым, маркотным. Пры вячэры стары бацька стаў расказваць местачковыя навіны, з-паміж каторых найцікавейшае было тое, што некаторыя мяшчане атрымалі ўжо лісты з Амерыкі ад сваіх, якія выехалі яшчэ гэтай восені разам з Алёксам. Строчык раіў і Васілю даведацца на пошту: можа, ад брата якая вестка ёсць.

— У нядзелю схаджу: шкада часу траціць у будні дзень,— сказаў Васіль і, устаўшы з-за стала, зняў са сцяны каромысла, зачапіў імі вёдры і выйшаў з хаты.

Мікола, заўважыўшы, што Васіль няхутка варочаецца, адазваўся да дачкі:

— Што за ліха, куды ён запрапасціўся?

— Чы ж, татка, не бачыў,— загаварыла Зося,— што наша студня забіта дошкамі? От, уроіў сабе, што са студні цягаць ваду боязна, бо можна ўваліцца; перастаў сам браць адтуль ваду і мне забараніў; але я, разумеецца, не зважала на гэтыя выдумкі і ўкрадкам ад яго цягала ваду са студні, ён гэта даследзіў, насцягваў дошак і забіў цвікамі. Цяпер сам носе ваду ажно з рэчкі — гэткую-то даль!

— Звар'яцеў чалавек, звар'яцееш і ты з ім! — ажно крыкнуў са злосці Строчык.

— Хворы ён; не чапайце, татка, яго — не кажэце яму нічога,— прасіла бацьку Зося.

— Ды мне што? — ужо спакайней адазваўся Мікола.— Хай цягае сабе ваду гэтую хоць з мора, абы цябе не ганяў.

Надышоў урэшце і Васіль, выліў ваду ў высокі цэбар і зноў, стукаючы вёдрамі, моўчкі выйшаў з хаты.

Мікола плюнуў раз і другі, вылаяўся пад носам і лёг спаць.

У першую нядзелю пасля прыходу Строчыка Васіль схадзіў на пошту, дзе знайшоў ліст ад брата з Амерыкі. Вельмі гэта яго ўсцешыла, ажывіла. Пацягаўся з радасці па мястэчку, каб спаткаць знаёмых, пахваліцца перад імі добрым братам. Зайшоў урэшце да Янкеліхі і накупіў дахаты булак і баранкаў. Двэрка напала, жартуючы, на яго, што трымае маладую жонку хіба пад замком, бо нідзе яе не відаць; што гэтак жывучы кабета можа здзічэць, дык як вырвецца — гатова бяды нарабіць. Ось, хай канешна прышле сваю Зосю да яе — да Двэркі — тут засталіся нейкія рэшткі ад строяў, якія шыла сабе яшчэ перад шлюбам.

— Прыйдзе пара, што маладой кабеціне патрэбны будзе і маленькі шматочак,— закончыла, усміхаючыся да Васіля, Двэрка.

Вярнуўшыся дахаты, Васіль перш-наперш сказаў Зосі, аб чым гаварыла яму Янкеліха, а пасля стаў расказваць, аб чым пісаў брат яго ў сваім лісце, каторы Васіль успеў ужо некалькі разоў прачытаць.

Адамчык — як называў свайго брата Васіль — вельмі ўзрадаваўся і з весткі з краю, і з пасылкі. Знайшоў яго ў Нью-Йорку Алёкса досыць лёгка, паводлуг адраса, і аддаў усё ў цэласці. Алёкса яму вельмі спадабаўся: ціхі, спакойны, статэчны *,— дык падгаварыў яго, каб застаўся працаваць у тым самым складзе, дзе і ён — Адамчык. Праца лёгкая, і плата добрая. На складзе ў іх адны гузікі: і вялікія і малыя, надта дарагія і саўсім танныя, рознага сорту, рознага колеру — але адны толькі гузікі. Ось іх трэба паводлуг запатрабавання-заказу адлічваць, пакаваць, адпраўляць. Цяпер разам ужо працуюць, разам ядуць, разам нат жывуць — у адной кватэры. Апрача платы, бываюць і гасцінцы на святы, а што пяць гадоў плата павялічваецца амаль не ўдвая. Там ёсць такія, што дваццаць пяць гадоў ужо праслужылі, дык

бяруць такія грошы, што не ведаюць, што і рабіць з імі. Але найбольш усцешыў Адамку той пачок, што прыслалі з дому. Склікаў ён сваіх знаёмых землякоў і частаваў сырамі, маслам, скаромнінай, а найлепш спадабаліся каўбасы, хоць іх больш нюхалі, чымся елі; а адзін стары — служыць ён у тым жа складзе гузікаў — з Ашмяншчыны родам — адрэзаў кавалачак каўбасы, здзёр скурку,— мяса з'еў, а скурку закруціў у паперку і схаваў у кішэнь: штодня, кажа, пакуль не выветрае, перад сном нюхаць буду — родны край прысніцца — нашыя пясочкі з пад'ялоўцам; гавора, смяецца, а вочы — паўнюсенькі слёзаў. І смех і нейкі жаль, боль глядзець было на гэтага ашмяншчука. Год ад году адкладае ўсё свой выезд у сваю старонку — усё тых грошаў праклятых хочацца больш сабраць, каб там зямелькі купіць і гаспадарку завесці. І Адамчык не маніцца хутка варочацца: ажно пакуль не збярэ столькі, каб пасля на сваём у выгодзе можна было б жыць. Калі прыедзе перш — то толькі даведацца сваіх, пагасціць ды зноў назад.

Апавяданне Васіля слухалі ўважна і Мікола, і Зося, хоць маладую кабеціну больш рупіў наказ Двэркі. Зося добра памятала і ведала, што ніякіх сваіх шматочкаў там яна не пакінула — забрала ўсё, але калі Янкелішка наказвала, то, відаць, нейкая там іншая справа, а ёсць, і яна, не адкладаючы на другі дзень, выбралася ў мястэчка. Там спаткала яе вялікая ўцеха: на імя Двэркі прыйшоў ліст з Амерыкі ад Алёксы для Зосі. Нічога, праўда, Зося не даведалася з гэтага ліста новага, апрача таго, што ўжо чула ад Алёксы; але калі Двэрка адчытвала гэты ліст, то Зося ажно расплакалася з радасці, бо гэта яе пераконвала, што ткі Алёкса там — недзе за нязмерна вялікім морам, памятуе, думае аб ёй — аб Зосі, і яна, узрадаваная, вясёлая, вярнулася дахаты, а што і Васіль пасля весткі ад брата зрабіўся крыху гутарлівейшым, дык у хаце Строчыка трохі павесялела.

Аднаго разу Зося ў гутарцы ўспомніла неяк Прузыну; Васіль зразу спахмурнеў і нейкім балючым голасам адазваўся:

— Слухай, Зося: калі жывым хочаш мяне бачыць — ты мне і слова такога нат не выгаварвай! Чуеш, Зося?

Зося змоўкла, а Васіль, стукнуўшы дзвярмі, выйшаў і праз увесь дзень не паказваўся ў хаце.

Праз усю зіму Мікола займаўся бандарствам, у чым шмат яму памагаў і Васіль, дык мелі і жывую капейку, якой абганялі драбнейшыя патрэбы свайго штодзённага жыцця. З прыходам вясны зноў настала гарачая пара для Васіля, тым больш што прыходзілася ўжо абсеяць не толькі сялібу Строчыка, але і куплёную пусташ, а што работа каля запушчаных здаўна дзірваноў была цяжкая — прыйшлося прынаняць крыху работніка. З касьбой таксама было цяжкавата, бо стары Мікола мала ўжо што памагаў; але найгорш прыйшлося з жнівом, бо якраз пад гэты час Зося прыждала, калі ў хату завітаў новы госць — шустры, ёмкі хлопчык; але сама матка занядужала, і хвароба гэтая працягнулася праз усё жніво. Васіль і не агледзеўся, як на хваробу жонкі, хрэсьбіны малога Яначкі і на рабочыя рукі растала некалькі чырвоных паперкаў. Спадзяваўся на добры ўраджай,— але і той падвёў, а тут яшчэ конь захварэў, кормнае свінчо немаведама з чаго згінула, і калі насунулася другая зіма, заработкаў з бандарства ўжо не хапала; прыйшлося не раз зачапіць гатовую — даўнейшага запасу — капейку. Круціў галавой Васіль, але маўчаў. Настала жыццё — якім найчасцей бывае жыццё: з яго неспадзеўкамі, драбніцамі, недастачамі. Да гэтага ўсяго далучалася штораз новая бяда: амаль не штогод Зося дарыла Васілю дзіцянё, і ўсё дочкі, але гэтая ўцеха кожны раз была нядоўгая: прыйдзе на свет божы, паквілікае пару тыдняў, чуць успеюць ахрысціць — і гатова — новы курганок прыбывае на мясцовым могільні-

ку. Завёз туды ўжо Васіль цэлую сямейку: Марыльку, Ганульку, Агатку, Стэфку, Кацярыну.

Людзі аб гэтым усяляк баялі: адны — упэўнялі, што гэта з уроку; іншыя — зноў бачылі прычыну няшчасця ў той пусташы, якую набыў Дубінскі. Васіль і Зося бачылі ў гэтым кару божую, але нат адазвацца адно другому аб такой думцы не важыліся і ўдавалі перад сабой і перад людзьмі, што вераць іх гутаркам. А калі стары Мікола стаў нагаварваць завесці Зосю да знахара, Васіль ухапіўся за гэты праект з вялікай ахвотай.

З таго часу пачаліся ўсялякія парады з рознымі знахарамі і знахаркамі. На ўсё гэта, разумеецца, патрэбны былі зноў грошы і грошы. Даўнейшы запас Васіля скончыўся. Гаспадарка не ручыла: выціснуць што-колечы з яе было трудна; прыйшлося ўлезці ў доўг. Васіль штораз больш рабіўся маўчлівым, маркотным дый часта стаў прападаць з дому, варочаючыся позна і моцна выпіўшы. Хатнія спачатку маўчалі, але пасля пачаліся лямянты Зосі і нараканні Міколы.

А тым часам у хаце надышлі зноў радзіны і зноў — дачка. Толькі на гэты раз дзіцянё прыйшло на свет божы рухавае, здаровае, і бабулька, каторая была пры хваробе Зосі, цяпер не магла нахваліцца:

— Каб мне столькі дзянькоў шчаслівых, колькі дзетак прайшло праз мае рукі, а гэткай здаровенькай, чыстай дзяўчынкі не здарылася мне бачыць! Будзе пацеха бацькам — унукаў прычакаеце,— падхлёбывалася бабулька, ведаючы з практыкі добра, што гэткія пахвалы дарма не прападаюць: пападзе і лішняя скварка, і лішняя чарка.

Але на гэты раз словы бабулькі як бы спраўджаліся: мінуў тыдзень, другі і трэці, а ў дзіцяці не паказвалася ніякіх тых хвараблівых азнакаў, якія з'яўляліся пры мінулых радзінах. Матка таксама ўстала парой і без ніякай хворасці. Стары Мікола заціраў рукі з радасці: гэта ён настроіў знахараў, гэта ён нараіў,— і вось бачы-

це, што выйшла? — зразу як рукой усё зняло! Васіль таксама крыху павесялеў, мо кара божая мінула? Мо і ўсё жыццё цяпер пераменіцца на лепшае?

У хаце быццам павіднела.

Назначылі хрэсьбіны. Васіль выбраўся ў мястэчка, запрасіў і прыслаў дахаты кумоў, а сам застаўся парабіць такія-сякія пакупкі дый выпіць крыху з радасці, што ўжо ўсё перамянілася, усё пайшло на лепшае.

Тым часам на сялібе Строчыка Зося мыла і шаравала сталы і лавы, чысціла і прыбірала ў хаце, як перад вялікім святам, а стары Мікола, запрогшы каня, выпраўляў у царкву кумоў.

— Якое ж імя малой? — дапытваліся кумы, закручваючы ў хустку дзіцянё.

— Якое бог даў, якое воля яго прызначыла,— першым адазваўся сам Строчык.— Нашто гэтыя людскія выдумкі? Даўней гэтага не было, а дзеці гадаваліся, як дубы.

Зося не пярэчыла.

Кумы, прыехаўшы ў мястэчка, не знайшлі бацюшкі дома — паехаў да хворага. Прыйшлося чакаць амаль не да вечара, дык вярнуліся пазнавата. А што больш яшчэ непакоіла і Зосю і Міколу, што Васіль не варочаўся.

Ужо добра сцямнела, калі паказаўся Васіль — праз лад гутарлівы, праз лад вясёлы — і стаў, выцягваючы з торбы, стаўляць на стол пляшкі гарэлкі, піва, мёду, але, глянуўшы на жонку, стрымаўся,— ногі шырэй расставіў, вочы вытрашчыў:

— Зося, табе што? Хворая ты? Гэта ж на тваём твары крывінкі не відаць! Зося, што табе сталася? — дапытваўся ён.

— Адчапіся ты,— адазваўся за дачку разгневаны Мікола,— кабета за цэлы дзень спрацавалася, а тут людзі галодныя чакаюць столькі-то часу, а ён прападае ліха ведае дзе!

— Зара, зара ўсё будзе! — заварушыўся Васіль, адпячатваючы адну за другой пляшкі.

Пачалося баляванне. Пілі за здароўе бацькоў, дзеда, кумоў; пілі, каб дзіцянё добра гадавалася, каб вялікае вырасла і г. д.

— А пакажэце ж вы, кумка-галубка, мне гэтае дабро,— адазваўся Васіль.

Кума не надта цвёрдымі нагамі выскачыла з-за стала, падхапіла дзіцянё і, густаючы яго перад самым носам бацькі, стала прыказваць:

— Глянь, глянь, татка, на нас,— якія мы ўдалыя: цельца беленькае, чысценькае, шчочкі чырвоненькія, вочкі сіненькія, як тыя ягадкі на вярху сядзяць...

— Як то на вярху? — спытаў, углядаючыся на дзіця, Васіль.

— А ты, татка, добра прыгледзься на нас: мы гэтымі вочкамі хлапцоў будзем зводзіць, унукаў прычакаеце, пацеху на старасць будзеце мець! Вось мы якія! — распіналася кума.

— Якое ж вы імя маёй дачцэ далі? — спытаў Васіль.

— Імя? Пекнае імя! — адным словам — імя,— расхвальвала дальш, стараючыся прыпадабацца, кума.— Ужо так бог судзіў, што на яе долю выпала такое імя: Прузына, Прузына!

— Што-о-о?? — падымаючыся з-за стала, саўсім ціхім голасам выгаварваў Васіль.— Што-о-о?? Прузына?? Хто? Прузына? Хто? Мая дачка — Прузына??

І раптам дзікім, страшным голасам крыкнуў:

— Пру-зы-на!!! — І хістаючымся крокам мінуў хату і выйшаў.

— Пру-зы-на!!! Пру-зы-на!!.— спярша ў сенцах, а пасля ўжо на дварэ чуваць быў гэты дзікі, страшны, нейкі жаласліва-шалёны крык.— Пру-зы-на-а-а!!! — і... сціх.

За сталом — струхлелі. Спярша — і кумы і Мікола не надта звярнулі ўвагу на Васіля, от, думалася ім, на-

піўся, дык і выпраўляе авантуры, але пачуўшы той крык — крык не то бязмернага болю, не то бязмернай роспачы чы жудасці,— яны пачулі, зразумелі, што гэты крык не п'янага чалавека, а хіба... шалёнага.

Зося збялела, як хустка: рукі яе дрыжэлі, вочы гарэлі, зубы ляскалі. З вялікай труднотай яна выгаварвала словы:

— Тата... татачка... бяжэце хутчэй... хутчэй... бяда будзе... няшчасце будзе... я ведаю... бяжэце, татка... Васіля даганеце...

Але Мікола Строчык знерухомеў. Ён ніяк не мог зразумець, што тут сталася, у вушах яго адбіваўся яшчэ нейкі нялюдскі — быццам выццё дзікага звера — крык Васіля, а перад сабой бачыў Зосю — Зосю, дачку — раптоўна захварэўшую, з пасінеўшымі дрыжачымі вуснамі, з мяртвецка-белым тварам, з дзіка-вар'яцкімі вачыма.

— Ты гэта, Зося, пакінь, супакойся: Васіль нікуды дзенецца, нічога яму не станецца; выпіў залішне — на дварэ хутчэй пройдзе,— супакойваў Мікола дачку, хоць сам супакою ў душы не меў і сам сваім словам мала верыў.

Кума заварухалася каля Зосі: паіла яе халоднай вадой і, закідаючы рознымі слоўцамі, старалася як мага ўсцешыць маладую кабеціну.

Мікола выйшаў урэшце на двор. Гукануў раз, другі і трэці, але ніхто не адзываўся. Патаптаўся крыху і, нічога не дабіўшыся, вярнуўся ў хату.

— Цемра страшэнная — дзе ж там што ўбачыш; клікаў — не аказваецца. Прыйдзе, нікуды дзенецца,— прынадзейваў стары.— Мо папёр у мястэчка? Вядома, загуляў чалавек — вернецца.

Але Васіль не варочаўся. У хаце рабілася жутка.

Зося ўпрасіла кумоў, каторых меў адвезці ў мястэчка Васіль, заначаваць. Тыя ахвотна згадзіліся, тым больш што іх таксама агарнуў нейкі таемны страх.

Ноч выдалася бесканечна доўгай. Чуць толькі сві-

таць стала, Зося ўпрасіла бацьку схадзіць у мястэчка даведацца пра Васіля.

Строчык сабраўся і выйшаў, але неўзадаўжкі вярнуўся ў хату назад і, моўчкі, грузна апусціўшыся на лаву, стаў моцна сапці.

Усе сталі дапытваць старога, што сталася, што так хутка вярнуўся, але Мікола спачатку нешта такое марматаў, што і разабраць было трудна, і толькі пасля некаторага часу, крыху супакоіўшыся, стаў гаварыць — і то як бы сам да сябе.

— ... Яно ж усё роўна: прыйдзецца, відаць, ісці ў мястэчка... надта бо дзіўна: учора звечара сам сваімі вачыма добра бачыў, як усё было на месцы — цалюсенька... а сягоння — гляджу: тырчаць адарваныя ў гару... жарт — гэткая-то сіла! Скуль яна ўзялася ў яго? Абухом забіваў, а тут як бач — рукой паўзрываў!.. На адным цвіку нат кавалак сукна целяпаецца — жыўцом вырвана... акурат з бравэркі Васіля... скуль яно там узялося?.. Дзіўна, надта дзіўна...

— Аб чым гэта, татка, гаворыце, хто і што забіваў абухом? Якое там сукно целяпаецца? Васіля, кажаце? Дзе яно? Ніяк не магу зразумець,— дапытвалася Зося.

— Бо табе і разумець не трэба — лепш дзяцей сваіх глядзі, і ўсё,— ужо злосна буркнуў Мікола.

— Ды вы, татка, нешта ведаеце, толькі, відаць, сказаць не хочаце. Што з Васілём сталася? — настайвала Зося.

— Што сталася? Што сталася? — пачаў нездаволеным голасам Строчык, — а паралюш яго ведае, што з ім сталася? Яшчэ сам добра не ведаю: толькі так — адны дагадкі і то дурныя. Бо хто ж, калі не ён, паўздзіраў гэтыя дошкі? На якое ліха?

— Якія дошкі? Якія дагадкі? — перапыніла яго Зося.

— Якія дошкі? Вядома, якія,— дальш бурчэў стары,— дошкі пааддзіраны са зрубу студні, што гэты вар'ят некалісь-то сам пазабіваў... на якое ліха? Учора

былі на месцы, а сягоння ўгару тырчаць. Чыя ж гэта работа, калі не яго?

Зося, глыбока і цяжка ўздыхнуўшы, прашаптала:

— Я гэта ведала...

Мікола, дачуўшы, прычапіўся:

— Што ведала? Што ты ведала? Чаго ж ты маўчала, калі ведала? Кажы, кажы цяпер! Вас даўно нейкі чорт круціў! Я ткі казаў, што і ён вар'ят, і ты з ім звар'яцееш!

Зося, апусціўшы нізка галаву сваю, маўчала, слязіны пачалі капаць адна за другой.

— Ігнат,— адазваўся Мікола да кума, устаючы з лавы,— хадзем, братка, разам: трэ пераканацца, а мне аднаму неяк моташна. Мо ў нас па хрэсьбінах дурасць толькі ў галаву лезе, а Васіль сядзіць сабе ў Лейбы, п'янствуе ды пасмяхаецца з нас.

Мужчыны выйшлі. Знайшоўшы доўгі шост, падышлі да студні, адагнулі яшчэ больш дошкі на старану, і Мікола першы, перагнуўшыся праз зруб і глыбока запусціўшы шост у студню, стаў ім то ў адно, то ў другое месца тыркаць у ваду, але ўскорасці з нейкім не то страхам, не то гідасцю выпусціў з рук шост і сам выпрастаўся.

— А каб ты лепш гэткі на свет божы не радзіўся! Валацугам быў і як валацуга скончыў,— прамовіў Мікола і звярнуўся да Ігната:— Папрабуй ты, куме, мо толькі мне выдае так.

Ігнат, злавіўшы шост у рукі, таксама стаў ім баўтаць у студні і таксама хутка адвярнуўся.

— Не інакш — ён,— цвёрда сказаў кум.

Вярнуліся ў хату. Зося толькі глянула на іх і ні словам не адазвалася. Мікола кляў цяпер, як чалавек, катораму зрабілі — быццам на злосць — вялікую крыўду. Самае горшае, самае цяжкае было цяпер для яго ўжо не смерць зяця, а што трэба было ісці ў мястэчка — да паліцыі; а іншага выхаду не было, бо пасля можна было

яшчэ горшай бяды набрацца. Крэкчучы і не перастаючы лаяцца, Мікола з Ігнатам выбраліся ў мястэчка, а кума засталася пры Зосі і старалася як мага ўсцешыць кабету, але Зося, здавалася, нічога, што ёй гаварылі, не чула і нікога не бачыла.

Строчык, ідучы ў мястэчка, стараўся сам сябе падшукаць: што вось ён прыйдзе туды і найдзе Васіля здаровага, хоць моцна п'янага, вылае яго за неспакой, які ім нарабіў, нат піць з ім з гневу не будзе, але пасля ўсё скончыцца добра і зноў будуць жыць па-даўнейшаму... Але ў мястэчку ад учарашняга ніхто нідзе Васіля не бачыў, і ўсе мары Строчыка разляцеліся, як туман...

Праз пару гадзін Мікола варочаўся на сваю сялібу побач з панятымі, а наперадзе ішоў ураднік.

Пачалася самая звычайная ў такіх выпадках завіруха і цяганіна: дасталі з студні цела Васіля, прыкрылі яго, паставілі варту; пасля пайшлі дапросы, пратаколы; потым прыехалі доктар з фельчарам, парэзалі мертвяца, і зноў пайшлі пратаколы, і ўрэшце, прызнаўшы, што самагубства ўчынена сп'яну,— пазволілі пахаваць нябожчыка.

Праз увесь гэты час Мікола думаў толькі аб адным: каб як хутчэй адкараскацца ад гэтай зграі чынавенства. Зося — нат не магла аб чым-колечы думаць; хадзіла як бы моцна ўчадзеўшы. Але калі ўрэшце скончылася ўся гэта цяганіна і Зося засталася толькі з бацькам у хаце, прыйшлося хоцькі-няхоцькі добра разважыць, як жыць далей. Бо калі даўней ім удваіх было жыць цяжкавата, то цяпер з двойма дзяцей прыходзілася прынатужыцца яшчэ больш. Праўда, Яначку ішоў ужо дзесяты гадок, хлопчык на свой век быў і рослы, і шустры, але здароўем — хударлявы, і з яго ніякай помачы ў хаце нельга было спадзявацца нат у бліжэйшы час, хіба — каб пазбыцца лішняй лыжкі пры місцы — аддаць куды за падпасыча, але на гэта ні за што не згаджалася матка: праз меру любіла яго, каб гэтак рана запрагаць яго ў

хамут. Прузынка — яшчэ больш была на перашкодзе матцы, бо звязвала ёй рукі, не даючы свабодна адхінуцца з хаты і заняцца работай на полі.

Калі, бядуючы, дачка з бацькам цэлымі днямі ўкладалі розныя планы, зайшло новае здарэнне, каторае яшчэ змяніла іх палажэнне.

Тыдні праз тры-чатыры пасля смерці Васіля саўсім неўспадзеўкі прыехаў да іх брат нябожчыка — Адам Дубінскі — з Амерыкі. Ён ужо паспеў пагасціцца ў старшых сваіх братоў, а цяпер выбраўся на некалькі дзён да малодшага, каторага найбольш любіў.

Смерць брата, ды яшчэ такая страшная смерць, на Адама зрабіла страшэнна цяжкае, разумеецца, уражанне, тым больш цяжкае, што ён у душы сваёй не верыў, каб прычынай няшчасця была гарэлка, ён гэта душой сваёй прачуваў, што тут крыецца нешта горшае, чым п'янства,— страшнейшае, але падымаць гэту справу, заводзіць нанова следства не хацеў, бо не спадзяваўся дабіцца праўды. Схадзіў на магілу брата, зайшоў пасля ў мястэчка, заказаў дарагі памятнік, заплаціў з гары[1] ўсе грошы, а распытаўшыся аб знаёмых нябожчыка, папрасіў іх дапільнаваць паставіць гэты памятнік і напісаць яму аб гэтым павэдлуг адраса ў Амерыку, бо ані Зосі, ані Міколу не надта верыў: яны выдаліся яму зусім няпэўнымі.

Вярнуўшыся на сялібу, Адам зразу звярнуўся да Зосі:

— Што ж думаеце, братава, дальш рабіць? Хто цяпер гаспадарку ў вас павядзе? Бо, як бачу, бацька ўжо крыху цяжкават на гэта.

— Мы самі яшчэ добра не ведаем, як будзем жыць,— адказаў Мікола за Зосю,— трэба добрых людзей паслухаць, параіцца...

— Што добрыя людзі найдуцца — то пэўна, асаблі-

---

[1] З гары — у сэнсе наперад.

ва калі гэтай рады пачне шукаць сама братава,— углядаючыся на дародную кабету, прамовіў Адам,— для гаспадаркі мо гэта будзе і лепш, але не для дзяцей. А я вам вось што параю,— пачаў дальш Адам,— Яначка слабенькі — не скора прыдасца ён вам у гаспадарцы, дык аддайце вы мне яго, у Амерыцы пры мне ў людзі выйдзе; з часам вернецца, дык яшчэ і матцы на старасць дапаможа. Скрыўджаны-то пэўна што не будзе — я ж ткі родны яго дзядзька.

Мікола ажно вочы вытрашчыў на такую неспадзяваную прапазыцыю.

На твар Зосі быццам полымя шуганула.

— А Алёкса Гуронак з вамі працуе... разам? — ціха, не гледзячы на Адама, спыталася Зося.

— Разам, а што? Чаму гэта пытаецеся, братава? — уважна глянуўшы на кабету, спытаўся Адам.

— От, так сабе... толькі так... усё ж ткі лепш будзе дзіцяці, весялей гадавацца паміж сваіх, чымся паміж гэных заморскіх,— тлумачыла Зося.

— Хоць заморскія, а людзі яшчэ лепшыя мо за нас; па гэтым не бядуйце — ды там апрача Алёксы яшчэ ёсць шмат народу з нашай старонкі — паміж сваіх будзе. Дык, доўга не думаючы, скажыце: так ці не, бо і я не маю часу доўга тут сядзець, трэ на службу варочацца.

— Няхай будзе так,— ціха-ціха адказала Зося.

Стары Мікола ажно падскочыў на лаве.

— Ось, не спадзяваўся, каб ты так лёгка расставалася з сваім Яначкам,— крыкнуў ён.— Дзіва, адно дзіва — ды і толькі! Ну і маткі цяперашнія! — дакінуў на астатак.

— Ані матцы, ані дзеду няма чаго дзівіцца і шкадаваць гэтай пастановы — будзьце пэўны і спакойны. А вырасце дачка — і аб ёй не забуду: як адно, так і другое — братава кроў. Дык завініцеся ды прырыхтуйце, што толькі патрэбнейшае хлапчуку, а аб рэшце — сам дам рады,— закончыў Адам.

Не дальш як на другі дзень малы Яначка сядзеў ужо на возе побач з Адамам Дубінскім, і нат слёзкі яго высахлі, слухаючы аб тых дзівах, якія прыйдзецца яму ўскорасці ўбачыць за морам.

VI

Першыя дні пасля ад'езду Адама з Яначкам Зося хоць крыху паплаквала, але разам з тым і цешылася, што тое, аб чым некалісь-то ўспамінала Алёксу,— споўніла: сына адаслала да бацькі. Адаслала дзіця, бо чакаць і спадзявацца, што хутка Алёкса вернецца сам сюды — пакуль што не было ніякай надзеі: ён пісаў да Зосі праз Двэрку некалькі разоў, што варочацца дахаты, пакуль жыве яго бацька, не думае, бо старому зноў мо захочацца муштраваць яго па-даўнейшаму, дык будзе ў хаце толькі калатня, ад якой у Амерыцы ўжо адвык; але як не стане бацькі, то зараз жа кіне ўсё, абытолькі як найхутчэй спаткацца з тымі, без каторых так маркотна яму было на чужыне. Тым жа часам бацька Алёксы — Мікола Гуронак хоць стары, але такім яшчэ кознерам трымаецца, што, як кажуць, і калом яго не даб'еш. А што Яначку ў Амерыцы будзе як сыру ў масле — у гэтым Зося не сумнявалася, дык жаласць да сына хутка мінула; кабета ўзялася да штодзённай сваёй працы, звальваючы ўсе клопаты гаспадарскія на плечы старога бацькі.

А гаспадарскія клопаты былі не малыя: гатоўкі ў запасе — ані звання, прадаць што-колечы з гаспадаркі, апрача жывёлы,— не было, але, прадаючы жывёлу,— значыла вызбыцца з гаспадарскай сілы, зруйнаваць гаспадарку. Прыходзілася шукаць іншых спосабаў, і ось па гэтыя спосабы і выбраўся Строчык у мястэчка. Мікола падумаў, што найлепш будзе, калі ён усю сваю зямлю разам з пусташай аддасць у запашку — напалавіну. Тады і каня і адну карову можна будзе прадаць,

дык і грош нойдзецца і работнік нічога не будзе каштаваць, а для іх дваіх хваце зерня і з палавіны. Што на запашку такую хоць хто пагоніцца — Мікола быў пэўны: пры самым мястэчку зямля, і то не абы-які кавалак, ды яшчэ гэткі-то луг пры пусташы? Але як жа здзівіўся Мікола, калі ніхто з местачковых гаспадароў аб гэтым і слухаць не хацеў.

— Брацца за пусташ? Гэта ж зглуміць не толькі гаспадарку, але і сябе згубіць,— казалі мяшчане.— Праз што дзеці ў Дубінскіх уміраюць? Праз што Васіль у студні апынуўся? — усё тая пусташ. Лепш ужо адразу пятлю на шыю надзець, чымся туды лезці,— заключалі яны.

Гэткай адправы Мікола саўсім не спадзяваўся. Прыходзілася што-колечы новае выдумляць, дык на параду зайшоў да Ігната — хроснага Прузынкі.

Ігнат Курач — чалавек яшчэ малады, жанаты, але бяздзетны, меў пашану сярод людзей за сваю дабрату да ўсіх, спакойны характар, дастатак і лад, які панаваў у яго хаце.

— Да цябе, куме, па ратунак прыйшоў,— пачаў ад парога Строчык,— бяда звалілася на мае старыя годы, а ты ўсё-ткі хросны: апекавацца павінен сіратой — Прузынкай, бо мне ўжо не доўга засталося гасцяваць на гэтым свеце, дык памажы, парай,— і Строчык выклажыў перад кумам усе свае справы і скаргі.

Ігнат быў здаволены, што людзі прыходзяць да яго на параду і робяць нават апекуном дзіцяці, а да дзяцей ён меў тым большую ласку, што сваіх не меў. Папрасіў Міколу пасядзець, пагасціць, пачаставаў яго, як прыналежала, і, разабраўшы ўсю справу, ураілі ўзяць чалавека да гаспадаркі і кабету да дзіцяці, каб Зося магла заняцца работай. Мікола, падзякаваўшы і за парады, і за пачастунак, доўга не думаючы, зайшоў па глуханямую Стэфку і ўжо з ёй вярнуўся дахаты, а на другі дзень, закінуўшы катомку за плечы, пусціўся ў дарогу.

Ледзь праз тыдзень вярнуўся дадому Мікола, а з ім прыйшоў нізкі, шыракаплечы, руды, крыху зызаваты Халімон Шарун, даўнейшы знаёмы, як казаў Строчык. Зося, глянуўшы на Халімона, успомніла, што колісь-то гэтага чалавека ўжо бачыла і, як ёй здавалася,— у той кампаніі, якая даўней заязджала на іх сялібу баляваць, але распытваць не важылася.

З першых зараз дзён Халімон рупна ўзяўся за гаспадарку; зручнасць і сілу меў непамерную, дык калі браўся за якую работу,— яна ў яго руках перуном ляцела; але бяда ў тым, што не заўсёды, як відаць, брала яго ахвота да гэтай работы, хоць неяк жа да зімы і дацягнуў, а тады стаў Халімон прападаць з дому па цэлых тыднях, як жа толькі варочаўся — цягнуў Міколу ў мястэчка, і там разам п'янствавалі.

Але Зосі мала гэта абыходзіла: яна жыла цяпер сваім асобным жыццём. Перш-наперш атрымала яна кароценькі ліст ад Адама Дубінскага, што ў Амерыку даехалі шчасліва і сын здароў. Пасля прыслаў ліст — як заўсёды на імя Двэркі — Алёкса; паведамляў ён Зосі, што Яначка надта яму спадабаўся, што хлопчык толькі спачатку маркоціўся, а цяпер вясёлы, сыты, адзеты і ходзе ўжо ў школу і хоць здалёку-здалёку, але моцна-моцна цалуе маму. Зося з радасці то плакала, то смяялася. Прузынка, хоць была вялікая капрызніца, але гадавалася добра, а што ў хаце пакуль што ў ядзе нястачы не было, дык Зосі нічога больш і не трэба было.

Мінула зіма. З вясны Халімон зразу заядла ўзяўся за гаспадарку, але заядласць гэта шыбка мінула ў яго, і калі людзі даўным-даўно скончылі сяўбу, паказалася, што новы гаспадар і палавіны таго не абсеяў, што бывала абсеяна за нябожчыкам Васілём, дык гэты другі гаспадарскі год выдаўся для сялібнікаў цяжкім. Халімон прынадзейваў рознымі абяцанкамі к налеццю. Але калі надышло тое налецце, Халімон не толькі ў свабодны,

але нават у рабочы час кідаў усё і счазаў з дому на цэлыя тыдні. І такім спосабам год ад году даўнейшая гаспадарка Васіля няўзнак штораз больш і больш ішла да ўпадку.

З Амерыкі Зося атрымоўвала лісты, хоць кароткія, але акуратна, толькі ад Дубінскага. Алёкса пісаў штораз радзей і радзей і ўрэшце саўсім змоўк; да бацькі таксама перастаў пісаць. Зося занепакоілася. Яна ўпрасіла Двэрку напісаць да Алёксы ад яе — Зосі — імені, але і на гэта адказу не было. Тады Двэрка на просьбу Зосі напісала да сваяка, каторы разам з Алёксам ў той час выехаў у Амерыку, просячы яго акуратна даведацца аб Гуронку і аб усім ёй напісаць.

Чакаючы адказу, Зося аб адным толькі думала, аднаго жадала.

— Хаця б ён жыў! Хаця б ён жыў! — быццам малілася яна.

Ажно з твару змянілася кабеціна, пакуль прыждала таго адказу. Прыждала, але саўсім не спадзявалася Зося, што вестка, якая там была аб Алёксу, магла быць для яе горшай, страшнейшай, чым сама яго смерць! Вестка гэта паласнула Зосю, як распаленым жалезам: Алёкса жыў, ажаніўся; ажаніўся няўдала: з нейкай танцоркай з тэатра, каторая ўвесь заработак Алёксы прагулівае з кім папала, а сам Алёкса жыве ў цяжкай працы, вялікай бядзе і нязмерных згрызотах.

— Папомне ён мяне! — быццам засычэла Зося, але што і як папомне — яна яшчэ сама не ведала.

Тым часам жыццё на сялібе станавілася штораз цяжэйшым. Большая частка поля ляжала дзірванамі. Каб абагнаць дамашнія выдаткі, прыйшлося прадаваць адну карову; залаталі дзве-тры дзіркі, але на іх месца вылазіла пяць-шэсць дзірак. Звязаць канцы з канцамі ўжо не ўдавалася.

Ігнат, каторы час ад часу даведваўся сваёй хроснай — Прузынкі, даўно раіў адправіць гультая Халімона, а

пашукаць рупнейшага чалавека; настайвала на гэта і Зося, але ўпіраўся Мікола.

— Справіцца яшчэ,— прынадзейваў ён,— пасля нябожчыка, ды яшчэ гэткага, гаспадарка заўсёды не ручыць; трэба змяніць жывёлу, снасць і насенне,— расталкоўваў Строчык.

Але як толькі прабавалі змяніць, то яшчэ горш выходзіла: старое прадавалі, грошы разыходзіліся, і новага не было ўжо за што купляць.

Халімон, каторы мала калі адзываўся, пачуўшы нараканні на цяжкія часы, сам першы загаварыў:

— Вам чаго не хапае? Яды? — дрэнь! Дастаўлю! — і, хоць надыходзіла ноч, счэз з хаты...

ПАЭМА

ДЗЕД ЗАВАЛА

Жоўтага пясочку —
Ды і таго мала —
Меў наш дзед па бацьку;
Зваўся ён Завала.
Ліхая хацінка
Саломаю крыта,
Ліхая адрынка
Ды адно карыта;
З крадзенага лесу
Лава, стол у хаце,
Міска і дзве лыжкі —
Вось і ўсё багацце!
Праўда, у аборы,
Як каза, кароўка

З голаду рыкала.
Звалася Чарноўка.
Сваёй гаспадаркі
Не любіў Завала,
Так і з ёй карысці
Меў саўсім ён мала.
З стрэльбачкай на плечах
Ды у зубах з люлькай
Кожны дзень спаткацца
Маглі б вы з дзядулькай.
Саўсім яшчэ цёмна,—
Так не раз, бывала,
Дзед ужо ў лесе —
Яшчэ пушча спала...
Гэтакага лесу
Нам ужо не бачыць,
Бо каморнік штодня
З жыдам яго значаць;
На шнуры лес рэжуць,
Нумары стаўляюць...
Колькі пнёў у лесе
Яны пасчытаюць?!
І от з таго часу,
Як лічыць пачалі,
Звер і птушкі нават —
Тыя замаўчалі...
І не дзіва, брацця:
Цяпер наш Рыгорка
Кожны пень абліча
З любога прыгорка.
...Казаў: спала — пушча.
Толькі дзед Завала,
Як у сад знаёмы,
Цягне там, бывала.
Пакуль пройдзе выган
Ды шнурамі поле,

Моліцца і боскай
Аддаецца волі;
А як толькі ступіць
На край лесу цёмны,—
Гоц праз пні, калоды,
Як той непрытомны!
Бо ў пушчы сцежак,
Ні дарог не будзе;
Хто не знае лесу,
Той, як бач, заблудзе!
Ні Завале сцежак,
Ні дарог не трэба.
Стрэльбачку на плечы,
Люльку, кусок хлеба...
Тут сасна-таўстуха,
Дуб зараз пузаты,
Там — часаў з павалы
Упорку да хаты;
Скора будуць ёлкі
Тры зараз зламаны,
Далей — корч рагаты,
Добра дзеду знаны:
Дзесяць год мінула —
Пахаваў старуху,
Калядамі потым
Тут забіў маруху *.
За карчом жа скора
Будзе там палянка,—
Некалі стаяла
Тут чыясь зямлянка;
Драбняк за палянкай
Цягне яшчэ з гоні,
Тут, загнаўшы летась,
З'елі ваўкі коні.
Потым бор высокі —
Сасна у сасонку!..

Слухае дзед вухам
У адну старонку:
Нібы нехта шэпча,
Нібы хтось смяецца,
Нібы сціха плача —
Так усё здаецца...
Дзед на гэты шэпты,
Крадучыся ціха,
Стаў бліжэй падходзіць —
Не баіцца ліха!
Выйшаў на паляну
Стары дзед Завала,
Туды-сюды глянуў —
Чуць тады світала;
Праз палянку рэчка
Бяжыць, шуміць, плача;
Дзед па пнёх праз рэчку
На другі бок скача;
А там пень дубовы
Ростам з чалавека —
Выпалена сэрца,
Стаіць, як калека.
У дзюпле рассеўшысь,
Як у сваёй хаце,
Стаў вымаць дзядуля
Тут сваё багацце:
Порах, шрот, пістоны
І кавалак хлеба,
Стрэльбачку паставіў,
Глянуў ён на неба:
Там — высока недзе —
Хмаркі, як каточкі,
То як вол лабаты
Або нібы бочкі...
Змяняюцца хмаркі:
То з іх лось рагаты,

То з іх птах вялікі,
То шнурамі хаты...
А ужо і пушча
Стала прабуджацца,—
Некамусь ды трэба
Першым адазвацца.
Аж тут калі плёхне
У віры пры рэчцы:
Шчупаку паснедаць
Нехта пападзецца!
Потым на балоце
На сасне-старушцы
Глушэц заіграўся,
Як смалой на пужцы.
Хіба што глухі ён,
Бо, каб прыслухаўся,
Сваёй песні пэўне
Сам бы застыдаўся!
Гэтакую песню
Першы дрозд-спявака
Прыняў за знявагу
Свайго брата-птаха:
На шчыт елкі сеўшы,
Стаў свістаць, смяяцца,
Што той песняй можа
З салаўём раўняцца.
Цецярук хоць сватам
Глушцовым лічыўся,
Але з стыду, злосці
І ён расхадзіўся:
Шыкнуў ды стаў лаяць
Як мага ён свата,—
Не меў ён ляпшога
Да лаянкі хвата.
Гаспадар у лесе —
Дзяцел наш насаты —

Не любіў, каб сварка
Выхадзіла з хаты.
Як абухам, грукнуў
У сухую елку.
Каб уцішыць сварку,
Каб не было згелку *,
Памачніцы-жоўны
Тут жа затрашчэлі,—
Дзятлаву каманду,
Відаць, зразумелі.
І, як макам сеяў,
Так прыціхла пушча,
Толькі рэхам недзе
Адазвалась гушча...
Доўга дзяцел слухаў,
Наставіўшы вуха,—
Зляцеў пасля ў кузню
І стаў каваць глуха.
Як бы на каманду
Пушча заіграла:
Песні, шум і гоман,—
Слухаў дзед Завала...
Павіднела лепей
Ужо на паляне,—
Змерыўся дзед вокам,
Стрэльба дзе дастане;
Рука затраслася,
Як у цэль ён змерыў,
Але б яшчэ трапіў
У добрага звера.
Сядзіць і чакае,
Ў свет глядзіць далёкі;
Бач, ляціць і заяц,
Белы, касавокі;
Толькі што займацца
Гэтакай скацінай,

Чалавек раз знаўся
З лепшаю звярынай!
Зморшчыўся і плюнуў
Знехаця Завала:
Непрывычны біць ён
Што бы ні папала!
І стаў зноў чакаць ён...
Сонца паднялося...
Выстраліць сягоння
Дзеду не прыйшлося!
Але і спяшацца
Не было да кога:
Ў хаце не пакінуў
Нічога мілога...
І з дзюпла дзед вылез,
Лёг на сонцы грэцца,
Уздыхнуў, успомніў,
Як яму жывецца...
Слезіна па твары
Скацілася з вока,—
Ой, бо тыя думкі
Ляцелі далёка...
Вельмі, ох, любіў ён
Думачкі думаці,
Праўду ад няпраўды
Дзяліць, разбіраці...
Любіў з дзікай пушчай
Гэтым падзяліцца,—
Са сваймі, з людзямі,
Не мог неяк зжыцца.

. . . . . .

Зашумеў бор цёмны...
Хто шум той пазнае?
Чы ветрык павеяў,
Чы хтось паклікае?..

Ёсць у гэтым шуме
Доля і нядоля,
Енкі ёсць, што кажуць,
Злая дзе няволя...
Ёсць у гэтым шуме
Плач як бы сіроткі
І крык нейкі ціхі,
Страшны і кароткі...

. . . . . .

Даўно было гэта.
Хадзіць чуткі сталі,
Аб вялікай волі
Ўсе заталкавалі.
Многа гаварылі,
Што загляне сонца
(Толькі памажэце!)
У ваша ваконца.
Народ йшоў у пушчу
Па долю другую,—
Пайшоў і Завала
Шукаць яснасць тую.
І пайшла ўзрастаці
Магіла к магіле...
Ваўкі з груганамі
Костачкі дзялілі.
Свайго свой пужаўся
У сваёй старонцы...
І, хоць паднялося,
Не прыгрэла сонца!

. . . . . .

Калі там вярнуўся
Дзядуля дадому?
І як там дабраўся?

Не знама нікому.
Адно з таго часу,
Калі хто пытаўся,
Дзе гэта дзядуля
Так доўга бадзяўся?
— А, сачыў магілкі,—
Так ім дзед гавора,—
Дзе касцей звярыных,
Як пяску ў моры.
Пятая дзе пушча,
Сем балот як пройдзеш,—
Калі справядлівы,—
Там іх тады знойдзеш.
Кожны звер чы птушка,
Калі смерць пачуе,
Цягнецца і там жа
Днюе і начуе.
Там ёсць і бальніцы,
Калі хвор каторы,
Гнёзды пухам сланы
І выгодны норы.
Бацяны за бабак,
Фельчарам — ласіца,
Дохтарам — сам вожык,
Служкаю,— сініца;
Пестуны [1] за нянек,
Лось — дзеля парадку,
Бабры пры будове,
А дзік каля статку;
Мядзведзь за сядзелку,
Крукі за спявакаў;
Свірна воўк пільнуе,
Каб не было браку;
Свежага ліс мяса

[1] Вядома, што мядзведзіца пакідае пры сабе сына за няньку для малых дзетак з другога прыплоду, і такіх нянек завуць *пестунамі*.

Туды дастаўляе;
Рысамаха млекам
Кублы налівае.
Зерне носяць птушкі,
Чаплі цягнуць рыбу,
Галубкі — вадзіцу —
У сваю сялібу;
Удод у засекі
Насыпае бобу,
А сарока зелля
На кожну хваробу;
З барсукамі выдры
У стог сена носяць,
Казлы на хаўтурах
З жонкамі галосяць.
Старшынёю — ястраб;
Пасланцы — вавёркі
Лётаюць, пільнуюць,
Ад зоркі да зоркі.
Кожны звер ці птушка —
Там яны пры чыне —
Мусіць працаваці,
Аж пакуль не згіне.
Адной не прымаюць
Толькі там зязюлькі,
Што сірот кідае,
Зараклася люлькі.
Ёсць яшчэ будынак
Там зусім асобны,
Добра збудаваны,
Цёплы і аздобны;
Стыдна і прызнацца,
Каго там хаваюць
У такой выгодзе
І бяды не знаюць:
Без зубоў сабаку

І каня-калеку!
За век службы людзям
Тут знайшлі апеку...
Гэтак любіў баяць
Стары дзед Завала,—
Можа, многа праўды,
Можа, зусім мала?..

. . . . . .

. . . . . .

Ішоў год за годам,
Ішоў чарадою,—
Дзед штодзень у лесе
Летняю парою.
Завале без пушчы,
Пушчы без Завалы —
Як бы не ўсе дома,
Як бы чагось мала!
Адны песні пелі,
Адны думкі мелі,
Друг дружка без слова
Добра разумелі;
Аж так і дапелісь
Да канца пустога:
Ой, не строіць жартаў
Пушча, знаць, з нікога!
Адной штось нядзелькі
(Была, помню, бура:
Па высокім небе
Хмура йшлі за хмурай),
Як пабрыў дзядуля
У свой лес знаёмы,
Так больш не папаўся
На вочы нікому.

Што з ім, бедным, стала?
Трудна адгадаці:
Ў беларускай пушчы
Гэта, брат, не ў хаце!
Мо пярун агністы
Яго абязвечыў,
Можа, звер пашчупаў
Косткі чалавечай?!
А можа, дастаўся
Ў той будынак з байкі,
Дзе коні-калекі,
Без зубоў сабакі?..

НАРЫСЫ. УСПАМІНЫ. АРТЫКУЛЫ

ЛІСТЫ З ДАРОГІ

I

Вільня. Немеж — ваколіца. Немеж — двор. Немеж — сяло

Здаўна жадаў я,— а думкі мае ляцелі і ляцелі за гэтым жаданнем,— каб як-колечы вырвацца з-паміж цесных і душных вулачак горада на прастор, на волю; пацягацца па родным краю, знаёмых адведаць, незнаёмых спазнаць; заглянуць пад саламяныя стрэхі ў тыя куткі-куточкі, аб каторых столькі-то пішуць, седзячы ў горадзе. Вось усё гэта, што я сам бачыў і чуў, тымі думкамі, якія навеяла на мяне мая дарагая старонка, і хачу з вамі дзяліцца.

27 мая пад вечар выбраўся я з Вільні па Ашмянскаму тракту. Хоць горад і мінуў ужо даўно, але неяк праз доўгі час не пахла вёскай: абапал тракту, як даўней — бярозы, так цяпер абселі дарогу тракціры, піўныя... Справа — Ліпскі, злева — Шопен; справа — Шопен, зле-

ва — Ліпскі, дый так усцяж... І стаяць гэтыя рассаднікі «культуры» гарадской, як на варце, як разінуўшаяся страшная звярына ляпа, каб не прапусціць, каб глынуць тую рэштку медзякоў падпіўшага селяніна, каторую не здалеў у яго выціснуць горад; тую рэштку, на каторую дома — у сяле — чакае мо галодная сям'я...

Дарога пясчаная; ісці цяжка... Прыглядаюся да пасеваў. Як на падгародную зямлю — ураджаі зусім не цікавыя: жыта рэдкаватае, саломка тоненькая, каласкі дробныя; ярына, відаць, прыпазніліся з сяўбой, дык не паспела скарыстаць з запасу зімовай вільгаці, а цяпер яшчэ ўдарыла суш, вось і засела, жоўкнуць стала. Дый, відаць, тутэйшыя хлебаробы думаюць, што калі навязуць яны гарадскога тлустага гною пад збожжа, дык і пазадкі радзіць будуць: зямля выраблена дрэнна, насенне нячыстае, ды гной добра не прагніўшы; вось і ўсселя трава — як луг расце, а збажыны — па каліву. Гародаў, садкоў — з чаго найбольшы можна было б мець даход каля горада,— не відаць; аж дзіва, як людзі не ўмеюць яшчэ карыстаць з таго, што ім само ў рукі сунецца. Чы ж бы ім гэта не патрэбна было? Чы ім мо яшчэ *задобра* жывецца? Бо кажуць, што толькі бяда ўсяго вучыць...

Па дарозе наганяю нейкага старца. Разгутарыліся. Відаць, нейкі адстаўны ваяка, бо зара пакіраваў гутарку на палітыку, на вайну. Павэдлуг яго, хаця цяпер вайны і не чутна, бо толькі турак бунтуе ды адганяе ўсіх чужынцаў што найдалей ад сваёй граніцы, але ўсе царствы рыхтуюцца да страшэннай бойні. «Немец,— кажа ваяка,— на хвасце едзе...» — «Як-то,— пытаю,— на хвасце?» — «З гораду ідзеш, а нічога не ведаеш?» І, як бы са злосцей, пачаў далей тлумачыць мне ваяка ўсю палітыку. Англічанка, вядома, шыбчэй за рыбу ідзе і па вадзе і пад вадой; яна, бач, першая выдумала і пад неба лётаць з войскам: уссадзіць батальён салдатаў і чатыры гарматы на такую машыну і коціць куды вочы гля-

дзяць. Ад англічанкі налаўчыўся і японец. Той хоць малады, але хітрэй за ўсіх. Яшчэ не так даўно быў ён пад кітайцам. Меў Кітай 12 царстваў пад сабой, з каторых дзёр, як той скуралуп, падаткі; паміж такіх падданых быў і японец. Цяжка была японцу няволя, і вось ціханька, моўчкі стаў ён вучыцца, народ свой прасвячаць; край стаў багацець, ажно пакуль у сілу не ўбраўся. Вось прысылае Кітай аднаго году свайго казначэя да японца дань збіраць, а японец і кажа яму: «Едзь ты, крывапіўца, да свайго цара і скажы, што годзе яму нашу кроў смактаць: нічога не дамо, а хоча — хай сілай папрабуе, войска прышле; сваёй тады крыві нап'ецца!» Так і выйшла. Прыслаў Кітай войска, дык японец такую ім лазню справіў, што тыя ў сваёй крыві тапіліся. З таго часу японец стаў вольным народам. І цяпер японскі народ разумней за ўсіх; там і чужынцу добра жыць, бо, перацярпеўшы сам няволю, спагадае другім і не няволіць нікога; а дзе што карыснае чы разумнае на свеце прыдумаюць, зара і ў японца ёсць. Так і з машынамі да лятання. Пасля лётаць навучыўся француз, аўстрыяк, а цяпер ужо і немец, падла, ззаду на хвасце едзе; таксама, значыцца, саджае батальён салдатаў і гарматы бярэ і лётае, як той нячысцік. Ускорасці, бадай, і мы навучымся. Не ведаю, як доўга плёў бы мне гэтыя свае басні стары, каб не прыйшлося яму звярнуць на іншую сцяжынку — дадому, а я паплёўся далей і думаў: якія ж яшчэ пачую я глупствы ў глухіх, далёкіх кутках роднага краю, калі тут гарадскі, можна сказаць, жыцель гэткі-то цёмны? І чаму такая цемната?

Іду; піўныя штораз радзей; здалёку відаць ужо ваколіца Немеж; зямля штораз лепшая, і ўраджаі весялей глядзяць. А вось і двор — Немеж. Агромністыя мураваныя пакоі, абсаджаныя лесам (паркам), і вялізная, таксама мураваная, стайня, дый усе будынкі вялікія, быццам цяжкія, як вялікая і цяжкая была праца тых дармовых рук, каторыя некалісь стаўлялі гэтыя будынкі...

Але дармовых рук — не стала: зараслі грацаваныя сцежкі *; дзічынай узняўся даўней падчышчаны лясок; павыбіваныя шыбы глядзяць, як страшныя, запаўшыя вочы смерці... Даўно адцвілі тут кветкі... Сумны двор!.. Мінаю яго; зварачваю з тракту ўбок, бяруся пад сяло Немеж — 9 вёрст ад Вільні. Вось і яно; захавалася ў лагчыну паміж гор і ўзгоркаў. Зямля тут хоць і цяжкая, але добрая; ураджаі — аж люба глядзець, асабліва жыта. Сяляне хоць крэкчуць і наракаюць на цяжкое жыццё, але будынкі ў іх выглядаюць добра; жывёла сытая; дзенідзе блішчаць садочкі. Заходжу да аднаго гаспадара, прашуся нанач; з ахвотай прымае ён мяне, зара на стале паказалася малачко, хлеб; пачалася вячэра і гутарка. Даўней тут было ўсяго 18 хат, цяпер пайшоў прыплод — ёсць іх ужо 54; зямлі штораз скупей, дык усё поле—нават папарнае — прыходзіцца засяваць, а пашы зусім няма, і пастуха не прымаюць; кожны сваю скаціну ў руках водзіць па сваіх сцежачках ды ўзмежках і гэтак мучыцца. Уся вёска — каталікі, але мова чуваць скрозь беларуская, і толькі некаторыя зусім непатрэбна калечаць яе не то польскай, не то немаведама якой. У вёсцы ёсць 2-класнае міністэрскае вучылішча, але варункі жыцця не даюць як мае быць карыстаць з яго; бо, як толькі дзіця крыху падрасце і мае ўжо 12—14 год, бацькі бяруць яго з сабой на заработкі ў лес: то кару яловую дзерці, то пілой цягаць. Яшчэ тутэйшыя сяляне зарабляюць капеек 40—50 за воз каменняў, каторы цягаюць у Вільню, а адтуль прывозяць на свае землі гарадскі гной — найбольш з суметнікаў. Не агледзіўся я, як за гутаркай мінула і поўнач, схапіўся з лавы, падзякаваў за вячэру ды пайшоў спаць у гумно на пахучае сена.

II

Немеж — сяло. М. Рудоміна — двор Паўлова

Сонца яшчэ ледзь узнімалася, калі я, сабраўшы свае невялікія манаткі, пусціўся 28 мая нацянькі з Немежа ў Рудоміна. Перарэзваючы Ашмянскі тракт, якраз выпала мне ісці каля памятніка палкоўніку расейскаму Дзееву. На памятніку напісана: «На семъ месте покоится прахъ полковника Деева, начальника Казанского пех. полка, убіеннаго 31-го июля 1794 года при усмирении возмущения въ Вильне».

У памяці тутэйшага народа захавалася аб гэтым палкоўніку такая легенда. «У 1794 годзе Дзееў браў штурмам Вільню, жыцелі бараніліся як мага, але ніякія кулі не бралі палкоўніка. Ён збіраў іх каля сябе, вымаў з кішэні чы апраткі, калі туды траплялі, і сыпаў імі, смеючыся і жартуючы, пад ногі сваіх салдатаў. Салдаты дзіваваліся і цешыліся ды лезлі за сваім правадыром у агонь. Але вось на Астрабрамскай вуліцы выйшаў нейкі малады чалавек і, узяўшы ў два пальцы маленькі беленькі прасты гузічак, пстрыкнуў ім у палкоўніка, а той і зваліўся. Падхапілі салдаты палкоўніка і на прасцірадлах неслі яго аж на гэту гару (тут стаяла частка войска); тут Дзееў сканаў, тут яго і пахавалі галавой на Маскву. У 1866 годзе памятнік аднавілі, але ўжо пасунулі яго крыху вышэй самой магілы. У сто гадоў пасля яго смерці тут быў вялікі ваенны парад і малебствы, і ў гэты дзень яго магіла завалілася. Яе прыказалі закідаць каменямі і засыпаць. Так і зрабілі. Знак, дзе магіла завалілася, і цяпер відаць».

Ёсць яшчэ каля Немежа вялікая гара — Казловай завецца. Тут некалісь-то быццам аблюбаваў гэта месца змей, каторы глуміў шмат народу. Змея, аднак, удалося змагчы, і закапалі яго на гэтай самай гары.

Дарога ў Рудоміна круціцца вузенькай сцяжынкай

паміж красуючага жыта. Пахне гэта краса не то хлебам, не то мёдам — смачна пахне. Мястэчка відаць здалёку. Прыходжу туды. Мястэчка маленькае, мізэрнае. Ёсць, праўда, царква, новы драўняны касцёл, ёсць прыхадская школа, маленькія бедныя крамкі, чыстая манаполька і некалькі шыночкаў — піўных. Заходжу па хатах купіць малака — няма; хлеба — няма. Народ бедны, голы — як бізун. З чаго ж жывуць гэтыя шыночкі? — пытаю я сам сябе, і думкі — адна другой сумней — ціснуцца да маёй душы... Купіўшы жыдоўскую булку, цягнуся далей. Мінаю крывыя старажытныя хаткі, могільнік і выбіраюся на трабскі гасцінец. Дарога вельмі аднастайная. Поле ўсё гарыстае; ураджаі скрозь добрыя; вёсак не відаць, а толькі шляхоцкія ваколіцы і засценкі; жывуць, відаць, не бедна: будовы добрыя; садкі і агароды ў парадку; гумны вялікія; у некаторых платы і граніцы павыкладаны каменнямі, бо такі гэтага дабра штораз болей і болей. Але масты, масты! Рэчак, праўда, тут няма ніякіх, але ёсць канавы нейкія дзе-нідзе, ну і масткі праз іх паложаны. Расказаў бы я вам аб гэтых масточках як след, але дарма не хачу. Бо калі людзі плацяць грошы, каб паглядзець нейкія там ламаныя штукі, дык каб мне плацілі, майго і апісання хваціла б, якія я, пераходзячы праз гэты чысцец, выкідаў штукі. Я і ў прысяды ішоў, я і жабку скакаў, і чаго ні рабіў,— вось неяк бог усцярог, ногі цэлыя пранёс. Як тут іншыя ездзяць і ходзяць па гэткіх мастках — мо іх абмінаюць — не ведаю: не давялося бачыць, толькі ведаю, што пасля кожнага такога мосціка ішоў я шукаць даўнейшых тутэйшых пушч лясных, каб у іх цяні адсапнуцца крыху. А сонца страшэнна пячэ. Увойдзеш у лес, схаваеш у цень нос, у патыліцу пячэ, схаваеш патыліцу — у нос смаліць. Вось табе і пушчы! Гэй, гэй, пушчы мае, у песнях-казках апяваныя! Хто ж там наздзекаваўся над вамі, што нават бярвенца на аршыновы масток вы даць ужо не можаце??! Гэй, гэй!..

. . . . . .

Як было, так было, але ўжо і Паўлова відаць, гэта чатыры мілі ад Вільні, а я яшчэ і ў локаткі цягаўся. Пара і есці і спачыць, а тут і сонца чым ніжэй, тым шыбчэй, здаецца, ляціць уніз за лес, за горы, уніз ляціць, вось і схавалася яно...

III

Паўлова—Тургелі—Гемза—Савайцішкі—Кармэляны—Цішканы—Нарвелішкі—Сурвелішкі—Трабы

Паміж, як вокам сцягнуць, лугоў красуючых, паміж, як вокам сцягнуць, палеткаў збажыны, паміж векавых дрэў стаіць двор *Паўлова*. Сумны двор. Таўстыя, аграмадныя мураваныя сцены яго быццам заскляпілі ў сабе ўсё былое, мінуўшае і... маўчаць. Маўчаць яны, сумна пазіраючы на штораз новых і новых гаспадароў сваіх, на новыя парадкі, і... маўчаць. Але не маўчыць гісторыя аб іх...

У 1767 годзе гэты двор — тады званы Мэрэчам — купіў ад Корсака Павал-Ксавэры граф Бжастоўскі і ад першага свайго імені назваў яго Паўлова. Новы пан звольніў тады ўсіх сваіх падданых дворных мужыкоў ад прыгону; даў ім вольную волю; напісаў правы, кіруючыся каторымі сяляне даходзілі прасветы і свядомасці грамадскага жыцця. Мелі тады сяляне свае школы, суды, банк, доктара, розныя агульнаграмадзянскія інстытуцыі; мелі свой як бы сейм пад прадсядацельствам свайго пана і войска (міліцыя зямянская). Дык жылі тут і кіраваліся сваімі законамі, мелі сваю «аўтаномію», прызнаную і зацверджаную глаўным канстытуцыйным сеймам 4 красавіка 1791 года. Але, як мінае вецер і бура, так мінулі светлыя, ясныя дні для Паўлова... Калі перамяніліся гаспадары тутэйшага краю, дык і ў Паўло-

ве сялянам вярнулі паншчыну, каторая панавала моцна па ўсяму краю. У 1795 годзе Паўлова прадалі Мошынскаму, а даўнейшаму ўладзельцу прыйшлося выехаць за граніцу, адкуль ён вярнуўся ў свой родны край у 1798 годзе. У канцы 1827 года Бжастоўскі памёр, і пахавалі яго ў Рукойнях. Памятнік, што стаяў над магілай гэтага светлага чалавека, якіх мала было ў нашай старонцы, згінуў. Кажуць, быццам яго прадалі за 18 рублёў...

Цяпер Паўлова ўжо зусім у іншых руках. З нейкім жалем і болем у сэрцы мінуў я Паўлова... Здалёку — на ўзгорку блішчыць тургельскі новы касцёл. Сонца пячэ, духата — чуць ногі перастаўляеш, але так-сяк дацягваюся да *Тургель*. Мястэчка маленькае, бруднае; піўных — пропасць, чутно праз адчыненыя вокны крык, лаянкі... Хоць ногі падкашваюцца,— мінаю Тургелі. Зара за мястэчкам цягнецца жыта — ды якое! Сцяна сцяной! Такога ад самой Вільні нідзе не бачыў. Кладуся з ахвотай на ўзмежак каля яго аддыхнуць крыху. Пытаю падарожнага: «Чыё жыта?» — «Ксяндзова,— кажа,— ён у нас першы гаспадар! Год у год у яго ўраджай».

У Тургелях ёсць міністэрская школа, ёсць і фельчар. Даўнейшы пан суседняга двара Паўлова — граф Бжастоўскі палажыў жалезны (ненарушаны) капітал, з каторага працэнты ідуць на тургельскага вучыцеля (75 руб.) і на фельчара (200 руб.). Векавечная і рэдкая гэта памятка!

Сапачыўшы крыху, пацягнуўся я да бліжэйшай вёскі — *Гемзы*. Па дарозе трапілася першая яшчэ рэчка ад Вільні — Марачанка, дык першы раз давялося выкупацца — і то лежачы ў ёй, бо вады і да кален не хватае. У Гемзе трапіў я, як і ўсюды трапляў, на добрых гасцінных гаспадароў і тут астаўся начаваць. Назаўтра падышоў сюды з суседняй вёскі — *Шастакоў*, адзін чалавек, і вось, сабраўшыся грамадкай, пайшла ў нас гутарка то аб тым, то аб сім. Вельмі разумныя словы гэтага шастакоўскага селяніна добра ўрэзаліся мне ў памяць. «Гор-

ка,— казаў ён,— нам жыць: і зямлі нехват, і пашы жывёле нехват, але мы самі дабаўляем да гэтага жыцця яшчэ палыну. Няма ў нас, беларусаў, народнай свядомасці, няма ў нас грамадзянскага жыцця, няма ў нас прасветы, дык ні за што марнеем. Гляньце,— кажа гэты шастакоўскі селянін,— на вашы вопраткі! Гэта ж фабрычны тандэт з анучын вашых, што падбіраюць анучнікі па вашых сметніках і адсылаюць на фабрыкі, а там іх расчосваюць, прадуць, фарбуюць і ткуць ды вам жа гніллё ваша потым па крамах прадаюць! А вы, дурныя, франтуеце ў іх, чураючыся сваёй моцнай, чыстай, самадзялковай пражы! Чураецеся яе, як чураецеся сваёй роднай, бацькоўскай, пекнай і багатай мовы беларускай, калечачы яе то на польскі, то на расейскі лад...» Люба было слухаць гэтага чалавека, і я з ахвотай бы з ім даўжэй засядзеўся, але трэба было цягнуцца далей. Пайшоў я нацянькі, выкупаўся яшчэ раз у Марачанскай рэчцы і кінуўся на старану, — да *Савайцішак* — да аднаго каваля: ён нядаўна купіў сабе шматочак зямліцы, дык хацелася мне паглядзець яго новай гаспадаркі.

Прыходжу. Хатка новая, канчае ён гумно ставіць, ужо садочак залажыў, абсеяўся. Спатыкаю гаспадара каля кузні. «Скуль?» — пытае. «З Вільні»,— кажу. «Чы не з «Нашай Нівы?» — зразу да мяне. Гляджу, высалупіўшы вочы, з чаго ён пазнаў. «А хто ж нас, гаротных, праведае, калі не нашаніўцы? — пачаў гутарку каваль. — Дзякуй вам! Садзіцеся, пагутарым, хоць часу і нехват: да гумна нанятыя людзі — трэ пільнаваць і памагаць». Зразу гутарка наша паплыла, як вада, быццам паміж добрых, старых знаёмых. І не дзіва: чалавек свядомы, чытае газеты, ведае, што на свеце робіцца, і кінуўся на сваю мазольную працу, прыгатаваны на ўсялякія неспадзеўкі. Купленая зямля цягнецца доўгім, вузенькім шнурам, выпаласкана дачыста, але гэты каваль патрапіць даць сабе раду: накуе ён і сабе і суседзям дабра і прасветы! Бог табе, братка, хай памагае!

Кругу дзеля гэтага каваля даў-то даў,— але нанач дацягнуўся да в. *Кармэляны.* Чуць-чуць упрасіўся нанач, бо тутэйшыя сяляне, глянуўшы на мае падарожныя куцыя мэшты *, прызналі мяне за мар'явіта *, і прыйшлося перад імі добры экзамен дзяржаць... Але ў гумно — на салому, дзе я начаваў, прыбег — і прыкуцнуў побач мяне сын гаспадара ды давай перапрашаць за цемнату сваіх бацькоў... Вёска вялікая, дый жылі б нішто, каб не суседні сялянскі адвакат, каторы смокча даходы сабе з прашэнняў і гэтым дыхае, апрача таго, завяліся тут распуста і зладзейства, ды шнуравая гаспадарка даканчвае, а перайсці на хутары — згоды няма. За Кармэлянамі горы і ўзгоркі штораз малеюць, каменняў менш, дарогі штораз лепшыя: роўныя, гладкія. Чубочкі лясоў то з той, то з другой стараны, але толькі чубочкі. Ледзь падходзячы да вёскі *Цішканы*, пачынаецца як мае быць лес — лес казённы. Заходжу да лесніка, прашу кіслага малака, бо на такой спякоце толькі і ахвота да яго. Маладзенькая гаспадынька стаўляе яго поўную міску і стог бліноў кладзе, а маленькі гадавы хлопчык круціцца каля яе спадніцы дый просіць: «Мама, мама! Дай кароўяга малака!» — «Хадзі,— кажу,— разам будзем есці». — «Не,— адказвае хлопчык,— у цябе кіслае малако — *бычачае,* а я кароўяга хачу — салодкага!» Падзякаваўшы гаспадарам за «бычачае» малако, крапчэйшымі ўжо нагамі пайшоў я далей. Поле змяняецца: гор штораз менш, раўніна, каменняў няма, а во лес — першы лес, у каторым можна было знайсці добры цень і смашна ў ім храпануць... За лесам зара рэшткі агромністых муроў старадаўняга манастыра — *Нарвелішкі.* Цяпер яшчэ стаіць вялізная званіца, але на месцы самога манастыра стаіць ужо толькі крыж. Ніжэй жа збудаваны новы вялікі на два этажы дом з агародам і садам навокал. Тут вучаць цяпер маладых дзяўчатак розных гаспадарскіх работ. Як пчолкі, увіхаюцца яны то з паліваччкамі, то з лапатачкамі каля градак і дрэў... Дай божа

ім трапіць на добрую сваю гаспадарку, а навука іхняя дарма не прападзе... Вось скора і *Сурвелішкі;* пачынаюцца вялікія дворныя абшары. Ураджаі лепш за сярэднія. Тут ёсць бровар і фабрыка дахоўкі. Гэта яшчэ першыя фабрычныя заводы, якія папаліся мне па дарозе з Вільні. Ад Сурвелішак недалёка ўжо і Трабы — верст 5. Зямля штораз горшая: пясочкі глыбейшыя і глыбейшыя, сасоннічак нізенькі каранжаваты *, скрозь кусты пад'ялоўцу, жыта слабейшае, нізкае, з дробнымі каласкамі, ярыну пазапякала. А вось і самыя *Трабы* — у нізіне маленькае, брудненькае мястэчка, толькі ўсёй красы — пекны новы касцёл. Ёсць тут і пошта, дык трэба карыстаць з яе і канчаць пісаць.

IV

Трабы—Такарышкі—Даўнары—Бакшты

У Трабы папаў я на торжышча. Дзень быў жыдам[1] святочны, але народу сабралася. Торг найбольш ішоў на скаціну: кароў і коней. Цэны на іх трымаліся добрыя: чуць што лепшая кароўка — 40—60 р.; конь добры — рублёў 80, а то і больш. Жыта, ячмень, авёс, можна сказаць, у адной цане — кап. 65 за пуд. На торг ласа спаглядалі нашы жыдкі, але, апрача як сваімі піўнымі шыночкамі, нічым болей у дзеле прычаснымі не былі. Глядзеў я і дзівіўся з тутэйшых мужчын: спякота была страшэнная, а яны — хто ў карацейшых, а хто і зусім у даўгаполых суконных цяжкіх світках цягаліся, быццам

[1] У тэксце некаторых твораў пісьменніка, прысвечаных паказу дарэвалюцыйнага жыцця, сустракаецца слова «жыд». Паколькі гэтае слова ўжывалася тады як бытавое і за ім не стаяла знявага чалавека яўрэйскай нацыянальнасці, рэдкалегія палічыла магчымым пакінуць яго ў творах даўно памёршага аўтара без змен.

пакутуючыя душачкі, абліваючыся потам, па калдобінах местачковых вуліц. Ці ж бы ў іх не было дома белага лёгкага балахона, якія скрозь носяць нашы беларусы? За Трабамі ізноў, як перад мястэчкам, пацягнуліся пяскі і пяскі, каранжавыя сасонкі і кусточкі пад'ялоўцу. Гадоў восем таму назад тутэйшыя і акалічныя сяляне каля каляд пачыналі ўжо купляць хлябок, але потым за намовай і прыкладам новага гаспадара суседняга двара — Бокшышак кінуліся сеяць яны лубін, і цяпер не толькі хапае хлеба, але і ў запасе які пудзік калі-некалі астаецца. Вёрст 5—6 ад Траб зямля быццам крыху цямнее; поле выглядае весялей; раўніна — скрозь. Здалёку відаць Такарышкі: двор і вёска. У двары агромністы паравы млын. За колькі міль цягнуцца сюды падводы з розным дабром, шмат трацячы часу і на дарогу і не раз чакаючы сваёй чародкі. Так здарылася якраз пры мне: не хапіла нейкай падмазкі да машыны, і млын стаў, а вазы прыбывалі і прыбывалі. Чаму нідзе няма тут моды ставіць, калі вады нехват, ветракоў? Я ведаю — бачыў некаторыя нашы старонкі, дзе толькі ветракамі і абходзяцца. Вёскі там велізарныя, і кожная з іх мае такіх млынаў 5—6. Чы ж бы ў гэтай старане быў іншы вецер? Трэба толькі добрага майстра, а не партача паставіць да работы. І хай хоць адна вёска, каторая што найдальш ад гэтага паравога млына, хоць бы хаўрусам — супольна папрабавала збудаваць добры вятрак, што пэўна скора верне кошт, а пасля будзе даваць і даход і вялікую выгаду. За Такарышкамі, мінаючы адну вёску — Даўнары, уцешыўся я, угледзеўшы, як дагадаліся тутэйшыя сяляне разумна выкарыстаць з таго балота-шляму, каторы панакідалі яны каля сваёй вёскі, чысцячы равы каля дарогі і ямы, дзе мочаць пяньку. Вось кожны з іх, разраўнаваўшы сабе кавалачак шляму, абгарадзіў,— і там пазасаджвалі варыва, высадкі. Маладчынкі — даўнарскія гаспадынькі!

Падбіраюся ўжо бліжэй Бакшт: штораз трапляюцца

іншыя зусім вопраткі, чуваць і вялікую розніцу ў самой мове. Дагэтуль ад Вільні па тых вёсках і засценках, каторыя мне давялося прахадзіць — амаль не ўсе каталікі, дык і мова іх, асабліва па засценках, зафарбавана крыху польскімі словамі, але толькі крыху і то найбольш тымі фанабэрыкамі, каторыя, сустрэціўшы новага чалавека, хочуць паказаць, што яны не такія, як усе; але калі гэтага самага франта падслухаеш з-за плота, як ён з жонкай лаецца, то ўжо, будзь пэўны, не пачуеш там ніводнага польскага слова. Мова беларуская ўжываецца скрозь зусім такая, якой піша і ўжывае цяпер «Наша Ніва». Наогул шмат лепей знаюць сваю родную мову кабеты, чым мужчыны. Таксама надта добра гукаюць па-беларуску і тутэйшыя даўнейшыя жыды. Здарылася мне сустрэціць у адным месцы старую жыдоўку, каторай, за часоў яе моладасці, за нейкія-то мусі грашкі, муж так адбіў глузды, што тая, бедная, з таго часу аглухла. Дык вось, не чуючы здаўна навамоднага калецтва ў тутэйшай мове, у памяці яе засталася толькі даўнейшая — чыстая беларуская. Ну і праўда: аж міла было слухаць: гутарка яе як вада плыве, словы зычныя, і мяккія, і плывучыя, і спеўныя. З вялікай ахвотай доўгі час я з гэтай жыдоўкай прасядзеў і слухаў... Чуць не забыўся я сказаць аб адным слове, якое я тут скрозь чуў. Тут не скажуць нідзе, пачынаючы, бадай, ад самой Вільні: адна вярста, дзве вярсты, а — *адзін вёрст, два, тры вёрст і г. д.* Вось усёй розніцы і было дагэтуль, але каля Бакшт пачуў я зусім неспадзяваную навіну. Тут захавалася яшчэ старадаўняя беларуская форма ў вымове некаторых слоў, не скажуць — валы, гады, сталы, але — *валэ, гадэ, сталэ;* захаваліся тут і беларускія вопраткі: кабеты іншыя носяць яшчэ каптуры з навушнікамі, а наверх завязваюць хустку,— спераду гладка прыстае яна да валос, а ззаду — каля патыліцы — тарчаць два ў розныя бакі моцна накрахмаленыя рагі. Спадніцы самадзялковыя, у кашулі верх перада і наплечнікі (нараменнікі)

вышываныя ніткамі або цэльнымі кавалкамі паркалю; на гэта надзяваюць найбольш чорныя чы гранатовыя гарсэты, а наверх белыя доўгія балахоны. Бадай, такія самыя белыя балахоны носяць і мужчыны. Але вось відаць ужо і Бакшты. Як у абручы, укруг апаясана цёмным лесам, стаіць вёска, раскінуўшыся на 2—3 вярсты на гладкай, як стол, раўніне. Гэткай аграмаднай вёскі на сваёй дарозе я яшчэ не сустрэціў. Адно толькі добра, што хаты яе не скрозь цесна пабудаваны, а параскіданы месцамі далёка адна ад адной. Гэта, бадай, адна з найважнейшых прычын, што калі і быў які тут пажар, то даволіўся ён не такімі вялікімі абшарамі, як па іншых месцах. Сяляне тутэйшыя ўсе праваслаўныя, і мова іх страшэнна пакалечана расейскімі словамі, а яшчэ дзіўней, што побач гэтых расейскіх слоў трапляюцца і зусім польскія, якіх мне не здарылася чуць нават паміж беларусаў-каталікоў. Так, напрыклад, замест пятніца кажуць — *пёнтэк,* мест вялікі — *велькі,* іншыя кажуць мест лаві — *лапай,* хоць гэта «лапай» чуў я толькі паміж плытнікаў,— быць можа, прывязлі яны яго з Гродны чы Коўны. Мужчына, сустрэціўшы, іначай не адазвецца, як *здраства;* затое кабеты і дзеці «пахвалёнага» ўжываюць. Таксама паміж дзяцей і кабет і сама мова зусім іншая: ані крыху не чуваць у ёй расейшчыны, дык скуль узялася і бярэцца яна паміж мужчын? Чы і тут не тая самая прычына, якая паміж беларусаў-каталікоў: хочуць людзі праз сваю цемнату паказацца не тым, чым яны ёсць, і зусім калечаць сваю родную мову. Дык што ж ты з імі зробіш? Без дурняў, кажуць, свет не можа абысціся... Але жаль, вялікі жаль я маю да тых, што як тыя курчаты, вылупіўшыся пад саламянай страхой, за апошнія бацькоўскія крывавыя грошы прыждалі надзець модныя куртатыя з бліскучымі гузікамі курткі дый цяпер чураюцца сваёй роднай мовы! Але калі ўжо дагэтуль мова беларуская захавалася і жыве, то і жыць будзе; а мова — гэта душа нацыянальная народа, калі ёсць такая

душа, то ёсць і гаспадар яе — гэта сам народ, а як не гіне народ з нацыянальнай душой, так не загіне беларускі народ!

Дык не чурацца, не заракацца трэба гэтага народа, а ісці на сустрэчу яго жаданням, яго думкам. Хай кожны, каму дораг свой родны край, загляне хоць у бліжэйшыя вёскі, загляне пад надгніўшыя стрэхі хатак, хай дзеліцца сваімі думкамі, радамі, вестачкамі, а пэўне сустрэне там прыхільнасць... Хай кожны святлейшы чалавек ідзе паміж гэтага народа і запальвае паміж яго светач навукі, свядомасці, справядлівасці і гэткім парадкам сплачвае хоць частку таго доўгу, які ён зацягнуў перад роднай сваёй старонкай, каторая ўскалыхала і ўзгадавала яго!

V

Бакшты—Заберазь

Як з самых Бакшт, так і з усёй бакштанскай воласці нямала моладзі рассыпаецца па ўсіх кутках роднай Беларусі. Бацькі сваіх дзяцей, каторыя скончаць тутэйшыя школкі, як мага з астатку высылаюць іх вучыцца далей: найбольш на народных вучыцялёў, а за апошнія часы сталі пасылаць і ў фельчарскія школы. Дык каму ж, калі не той моладзі трэба шанаваць сваю бацькоўскую мову і шырыць свядомасць і пашанасць паміж сваіх братоў-беларусаў да свайго краю, да ўсяго блізкага, роднага? Але ў нас побач з прасветай часта, узяўшыся за рукі, ідзе і цемната. Так, памятаю я карэспандэнцыю ў «Наша Ніву» з гэтых самых Бакшт. Пісалі, што сход валасны пастанавіў закрыць усе піўныя ў Бакштах, ну і закрылі. Вось, думаў я, светлы народ! Разглядаюся цяпер па вёсцы,— праўда, нідзе ніводнай піўной вывескі.

Але чы ведаеце, што з гэтага выйшла? Даўней, каб трапіць у піўную, трэба было знаць грамату, каб расчытаць вывеску, а цяпер і няграматнаму добра, бо куды ні зайдзеш — усюды трапіш на шыночак. І хто ж іх падтрымлівае? Тыя самыя, што крычалі на сходзе проці піўных! Як таргуе тутэйшая манапалька — не то што сказаць, але і падумаць страшна: не дзесяткі і соткі рублёў гіне, але тысячы і дзесяткі тысяч згарае там кожны месяц цяжка запрацаваных грошаў! Скуль жа яны бяруцца? Зямля тут хоць і добрая, але свае надзелы тутэйшыя сяляне даўно ўжо, дзелючыся, парэзалі на маленькія шматочкі, дык нават пры добрым ураджаі і так яшчэ прыходзіцца прыкупіць хлеба. Але ёсць туг сплаўная рака Бярэзіна; за нейкую вярсту прылучаецца і другая сплаўная рэчка — Іслач, дык дрэва ідзе сюдыма страшэнная моц і заработкаў шмат, абы ахвота; падросткі і тыя зарабляюць, а сталыя ды болей спраўныя да работы за лета, апрача ўсіх расходаў, па сотцы адкладаюць; але шмат ёсць такіх, каторыя толькі і працуюць на манапольку... Апрача бакштан, праўда, і суседнія вёскі гэтай воласці акуратна зносяць сюды падатак на гарэлку. А трэба ведаць, што ўсіх душ у бакштанскай воласці тысяч з дзевяць, вось «з міру па нітачцы, а голаму сарочку» і шыюць... А вядома, што дзе большае п'янства, там і родны брат яму Суд — векавечны. Як я чуў, у бакштанскай воласці цяпер неразабраных яшчэ судоў каля паўтары тысячы! Паўтары тысячы! Запас нішто? Колькі-то яшчэ днёў, рабочых днёў страцяць, змарнуюць тутэйшыя сяляне на гэтыя суды? Але на гэта тутэйшы народ не глядзіць, яму не шкода рабочага дня, бо тут не толькі святы, але прысвяткі, градавыя, ледавыя і ўсялякія *зголадовыя* святкуюць дні. Калі падлічыць, што тутэйшая воласць у год прасвяткуе толькі 10 лішніх дзён, а на 9 тысяч жыцялёў толькі будзе трэцяя частка здатных да работы,— значыцца, тры тысячы, то ў год прападае рабочых дзён на адну гэту во-

ласць 30 тысяч дзён; лічучы па два злоты дзень, страты ў год воласць будзе мець 9 тысяч рублёў.

Ёсць тут хаўрусная крама; з вывескі відаць, што краму гэту адкрыла «Общество «Крестьянин» при содействии члена Государственной Думы Замысловского». Што супольнага мае гэта хаўрусная крама з бакштанамі — так я і не даведаўся, бо каго толькі ні пытаў, чы прыналежыць ён да гэтага хаўрусу, кожны кажа: «Не наша гэта справа, не ведаем!»

Каля самых Бакшт круціцца Бярэзіна; на ёй, недалёка валаснога праўлення, ляжыць на самай вадзе плывучы мост; казна бярэ арэнду за права лавіць рыбу ў гэтай рэчцы, ну дык і мост сама ўсё маніцца будаваць ужо пяты год. І я, стоячы над гэтым мастом, доўга думаў: разувацца чы не? Але, узяўшы на адвагу, пусціўся ў сваіх хадаках; праўда, вады паўнюсенька ў іх набраў. Выбраўся на бераг; тут жа пачынаецца і *Заберазь*. Вёска таксама не малая — больш вярсты цягнецца; вуліца шырокая, хаты нішто, а што найважнейшае, перад кожнай хатай пасаджаны дрэвы: ліпы, клёны, бярозы і іншыя; і глядзець прыемна, і ад пажару вялікая абарона. Жаль толькі, што мала зусім фруктовых дрэў відаць. Аж дзіва, як людзі так мала дбаюць аб сваёй выгадзе і карысці. Тут я зайшоў да адных вельмі гасцінных гаспадароў і заваліўся ў іх на колькі дзён адсапнуцца. А так і пара: нацянькі ад Вільні да Заберазі больш сотні вёрст.

VI

Заберазь—Шыльві

Як суседняя вёска — Бакшты, таксама і Заберазь мае агромністыя абшары пад выганамі. Сотні коней, рагатай скаціны і свінней бадзяюцца па гэтых выганах. Я ка-

жу: бадзяюцца, а не пасуцца, бо і што ж іншага маюць рабіць яны на гэтых голых бубнах? Выганы гэтыя займаюць найбольш нізкія, з вясны заліваныя вадой тарфяныя месцы; ёсць, праўда, і вышэйшыя, пясчаныя кавалкі, але ўсё гэта выбіта, перабіта, вытаптана, выпалена гусіным гноем, і пажыва з гэтай пашы зусім малая, хіба толькі для коней гультаёў, для нядойных кароў; гэта толькі *выгада* для гаспадароў несвядомых або таксама гультаёў, а *згуба* для самога гаспадарства. Бо ткі разважыўшы: каня, каб моцным быў дый мог працаваць, ці карову, каб давала малако, тутака прыкормліваюць дома — з рук; гэта прыкормка і ёсць уся іх падмога і пажыва; дык, выганяючы добра накормленую дома жывёлу на пусты выган,— гэта значыцца пазбывацца таго, што ў нас найпатрэбнейшага ёсць у гаспадарстве — гною. А трэба ведаць, што гэтыя выганы — гэта не пачынаныя яшчэ куты багацця: месцамі ляжаць глыбокія залежы торфу, месцамі цягнуцца глыбокія ямы і равы, паўнюсенькія тлустага шляму. Маючы пад рукой такія гнаі, можна лёгка ўзбагаціць зямлю на доўгія гады і падтрымаць імі сваё гаспадарства.

Не ў «лістах» аб гэтым месца гаварыць, што і як трэба ўзяцца каля гэтага; але пакуль не будзе паміж сялян згоды, еднасці, хаўрусоў, пакуль не пазбудуцца яны няволі сваёй — шнуравой гаспадаркі,— датуль трудна штоколечы і зрабіць. Хай пакуль што карыстаюць з гэтых выганаў хоць гаспадынькі: падкурстайце *, як гэта вы, калі хочаце, умееце, сваіх мужыкоў, каб нацягалі вам увосень шляму на агароды дый загаралі яго; а калі ўдасца дастаць торфу, то пакіньце ў кучках яго праз зіму, а на вясну растрасці і загараць,— дык прыжджацё добрага варыва, асабліва капусты і буракоў. І яшчэ адна рада таксама для гаспадынь. Чаму гэта вы так мала гусей гадуеце, а качак і зусім блізка не відаць? Гэткія выганы ды яшчэ са сталай вадой і балацінамі — якраз падходзіць месца для гадоўлі такой звярыны; і даход лад-

ны можна мець, і не адну пярыну сабраць дачцэ на пасаг. Праўда, гусей трэба падкармліваць калі-нікалі аўсом; ну, але бывае час, калі мужык малоціць авёс, дык гэта ўжо ваша, гаспадынькі, справа, каб яму менш было з тока насіць у свіран... не кажыце толькі, што гэта я вас навучыў, бо другі раз не будзе як і паказацца мне туды... Карыстайце, пакуль вашы мужыкі спяць!.. А як скора яны прачнуцца? Гэта ўжо ляжыць найбольш на сумленні мясцовых народных вучыцялёў: людзі добра граматныя, ім прыступны ўсялякія кніжкі; яны аддалі свой час, сілы сваіх маладых гадоў на прасвету народа,— хай жа і гэтай справай займуцца, хай і для сталых будуць яны светачам культуры роднага краю. Гэта ўжо іх справа заахвоціць, выстарацца, каб сход адпусціў якую дзесяціну зямлі з выгану. Адна дзесяціна гэтага абшару — ці ёсць яна, ці няма — і знаку ніякага не будзе, а тым часам з яе можна зрабіць адкрытую, добра зразумелую нават для няграматных сельскую гаспадарскую кніжку: парэзаўшы гэту дзесяціну канавамі, рассыпаць выкапаную зямлю на гэтым самым палетку і зрабіць тут пробнае поле. Калі каторы вучыцель стаў бы адказвацца, што ён не гаспадар і на гэтым не знаецца, то я веры не дам, не святыя гаршкі лепяць — абы ахвота! Можна напісаць, паслаць нават жменьку зямлі на пробу ў якую-колечы гаспадарскую газету, апісваючы ўсе мясцовыя варункі, а пэўна аніводная рэдакцыя не адкажацца даць сваю раду; можна выпісаць усе патрэбныя кніжкі, можна ўрэшце паехаць у бліжэйшы двор, дзе вядзецца культурная гаспадарка, і там пэўна не адкажуцца ад рады і помачы,— і вось гэткім парадкам можна залажыць праўдзівы рассаднік культуры. Справа вельмі важная, і вялікую заслугу будзе мець той, хто першы ёй займецца. Пакуль не будзем мець пры воласцях і вучылішчах такіх пробных палеткаў, датуль слабая надзея, каб сяляне нашы адракліся старасвецкага спосабу гаспадаркі, а пайшлі культурнай пуцявінай.

Але годзе гэтых рад, бо вось на стале не ўгаманілася яшчэ і сквірчыць верашчака, як вір; каля яе ладны ўжо стажок бліноў, а яшчэ ўсё расце і расце ён угару... Трэба ткі добра каля іх міласці завіхнуцца перад дарогай.

«Як не еў — дык не мог, як пад'еў — дык ні рук, ні ног»,— таксама і са мной; але цягнуся неяк к шчасцю лесам — халадок; будзе мне тут яго шэсць вёрст усцяж. Люблю лес. Толькі вочы мае прывыклі да даўнейшых, «некультурных» лясоў, а тут то з левага, то з правага боку — наіскось лысеюць дзялянкі. Не ўсмак гэткае гаспадарства, відаць, звярыне і птушкам: пуста, ціха ў лесе. Хоць кажуць, што дзікі тут цягаюцца і бульбе бліжэйшых лесу сялян ад іх не раз добра дастаецца; задарма прыходзяць капаць, а за сваю фатыгу, што выкапаюць, то з'ядуць,— на гаспадарскіх, значыцца, харчах... Але вось і лес канчаецца; я так не сустрэціў нічога жывога. На скрай лесу — у ягадах угледзеў я дзяўчат; пытаю дарогі. «Дарога,— кажуць яны,— тут найбліжэйшая адна: першая паваротка налева, а там — прасцюсенька, але тудой трудна прабрацца — мост нягодны, лепш ісці ўкруг, хоць накладу і зробіце вярсты 3—4, але смялей».— «Воз мой не цяжкі,— кажу, смеючыся,— усяго што на плячах».— «Дарма, што не цяжкі,— адказваюць яны,— там і з пустымі рукамі дрэнна перабрацца». От, думаю сабе, вядома, бабы — пужлівае населле; што за такі мост, каб пехатой не прабрацца! Бяруся, прайшоўшы з вярсту, крута ўлева, качу простай дарогай, ажно і мост. Тпр-ру. Стой! Рэчка Шыльвянка не шырокая, але глыбокая — не пройдзеш; «папаў як у нерад: ні ўзад ні ўперад»; назад — сорамна дый далёка варочацца; уперад — неяк адвага адпала. Ажно прэць нейкі жыд — тоўсты, вялікі, з чырвонымі вачыма; лыпнуў ён імі на мяне дый, нічога не кажучы, стаў на першую перакладзіну; выцягнуўшы наперад палку, пастукаў ёй па другой перакладзіне дый гоц на яе, адтуль памацаў кіем трэцюю і на тую скок; пасля прысеў, ухапіўся за яе рукамі дый,

спусціўшы ўніз ногі, давай імі баўтаць, ажно пакуль не трапіў на палю, што чутачку з вады тарчала; стаў тады на яе, адсапнуўся дый на другую паліну перабраўся, пасля і далей. Эгэ, думаю сабе, і з мяне ж на гэта добры фізік, толькі не ведаў, скуль пачынаць спярша, дый услед за гэтым жыдам давай гэткія самыя штукі выкідаць. Сапе жыд, кракчу я, але ўжо і пад другі бераг падабраліся; там ізноў, як па драбіне, чапляючыся то за гнілыя калодкі, то за бераг, выбраліся на зямлю. Глянулі мы адзін на аднаго дый не здзержыліся — зарагаталі! Пачалася гутарка. Даведаўся я, што гэты жыд гадоў ужо з восем як поўзае па гэтым мосце. Мост прыналежыць да двара Шыльвёў графа Мілеўскага, але граф даказваець, што мост гэты павінна ладзіць казна, а казна звальваець на графа — і гэтак валтузяцца ўжо колькі гадоў, а тым часам бедны народ колькі то лішніх вёрст накладу штодня робіць. Хто ж верне яму гэтыя «прагоны»? Закарбаваў * і я на іхнія душачкі чатыры вярсты.

VII

Козевічы—Чапунь—Карукі—Любча

Падбіраюся да вёскі Козевічы. Здалёку блішчыць яна, новенькая, як з іголачкі, як аднаго дня будаваная, але, увайшоўшы ў яе, ажно мароз прабег па маім целе: апрача двух канцавых двароў, скрозь валяюцца кавалкі абгарэўшых бярвенняў. Яшчэ і году не мінула, як праляцеў над гэтай вёскай чырвоны пятух. У гадзіны дзве, апрача двух, як ужо успамінаў, двароў, зніштожыў усё: хаты, гумны, свірны, хлявы — усё змёў дачыста. Здавалася, што бяда павінна была навучыць людзей розуму,— дык не! Зноў страху на страху панасаджвалі, а што было б скарыстаць з бяды: будаваць, дык акуратна

будавацца, балазе што той самы граф, каторы ўпіраецца даць пянькі са два на мост, тут усім сялянам дрэва за паўцаны адпусціў. Зямля тут гладкая, роўная, — хай жа бы рассяліліся на хутары — усё роўна будавацца; але не, — зноў збіліся ў кучу. Ой, людзі, людзі! Брахня, відаць, старая прыказка, што гора ды бяда — усяго навуча. Да козеўчан гэта не прыстае, — на тое яны і *козеўчы!*

На падвячорак дацягнуўся да вёскі Чапуні. Вёска вялікая, чыстая; заходжу да першай лепшай хаты прасіць малака, за мной яшчэ са трох падарожных сялян усунулася ад дажджу схавацца, бо ткі добра пачынаў ужо сцёбаць. У хаце разгутарыліся. Падарожныя варочаліся з лугоў, што закупілі ў дварэ. Лугоў тут прадаецца гібель. Графскіх, як казалі яны, на тысяч дзевяць дый налібоцкіх — на 15 тысяч рублёў. Арэнда нішто, хоць нядаўна яшчэ паднялася на іх цана. Хто ж падняў, як бы вы думалі? Нагналі яе самі ж сяляне. Даўней, аблюбаваўшы каторы кавалак, прыйдзе наш брат купляць, то ўжо другі на карк яму не лезе, цаны не перабівае, не псуе; а цяпер усё пайшло іначай: паназначылі таргі — ліцытацыі; хмара мужыкоў набіваецца на гэтыя зборышчы, дый давай адзін аднаму боты шыць: пачнецца, здаецца, з малога, той надкіне залатоўку, той саракоўку, іншы і ўвесь рубель, а там яшчэ двузлотку, яшчэ грыўню, і так гонюць і гонюць адзін перад адным, ажно пакуль з якіх рублёў трох не даедуць да 20-ці; з пяці — нагоняць трыццаць, і хоць прыпацеюць мужычкі, але такі тысяч наскладаюць. Не хацелася мне неяк сядзець даўжэй у гэтай хаце і, хоць дожджык пырскаў, — пацягнуў далей. Абапал дарогі лугі і пасекі, пасекі і лугі, і так амаль не да самай вёскі *Бярэзіны*, што над гэтай рэчкай стаіць. Але тут пераняў мяне такі дождж, што хоцькіняхоцькі прыйшлося хавацца ў будку з яловай кары, зробленай для вартаўніка пры сплаўным лесе. Сядзім скорчыўшыся ды гутарым. Работы (як мне казаў стораж)

ёсць шмат з дрэвам, — і, завіхаючыся, можна ў дзень рубля выгнаць; іншым разам і за рыбу што-колечы перападае. Ловяць яе тут найбольш восцямі ўночы з агнём, але год ад года рыбы штораз менш і менш, дый і тая драбнавата. Трапляецца часам госць з Нёмна — сом, але таго не прадасі: трэфны * ён, дык жыды не купляюць, самім прыходзіцца есці. Вось якраз майму новаму знаёмаму на прошлым тыдні папаўся самок пудкі са два, дык праз колькі часу варылі яго. Хоць тлусты сом, аднак смак не вялікі.

Дождж стаў сціхаць; падышло яшчэ трох падарожных, і мы сталі выклікаць з другога берага паромшчыка. Той, угледзеўшы, што ўсяго нас чатырох, паляніўся цягнуць паром, а, выплехаўшы з большага чаўна ваду, пад'ехаў на ім па нас. Перабраўшыся на другі бок і заплаціўшы па капейцы ад носа, разышліся мы хто куды. Я ўзяўся ўправа праз лес на Любчу. Апошняя гэта ўжо тут мая пераходка праз Ашмянскі павет. Спачатку ідзе нізіна; на ёй лісцясты лес: вольхі, асіны, бярозы, паміж імі зрэдзь дубы і клёны, але чым далей, тым зямля вышэйшая, і пачынаецца ўжо баравы лес, толькі то з таго, то з другога боку трапляюцца лагчыны — імшарыны; але ўскорасці ўсё гэта канчаецца, і перад маімі вачамі незмяраныя абшары раўніны, а там — удалі — на ўзгорку блішчаць, як зачараваныя, агромністыя белыя муры любчанскіх палацаў; ад іх, быццам доўгія пальцы, цягнуцца ўніз шнуры местачковых шэрых хат. Любча, гэта ўжо ў Навагрудскім павеце — на тым беразе Нёмна (ён тут аддзяляе Віленскую ад Мінскай губерні). Не зважаючы на тое, што я сягоння адмахаў ужо чатыры мілі, усё падбаўляю дый падбаўляю ходу: хацелася яго скарэй угледзець. Вось, Ён-Ён — Нёман наш! Стаю, гляджу і вачам сваім не веру. І не такі шырокі ён, і не такі глыбокі, а такі ціхі, спакойны, здаецца, быццам і не кратаецца ён, а толькі, калі, распрануўшыся, кінуўся я ў яго чыстыя воды, калі ступіў на яго мяккае дно, тады толькі

спазнаў я, колькі ў гэтай злуднай * пакоры крыецца страшэннай патайнай моцы! Не толькі плысці, ісці нават проці вады не было змогі. Доўга сядзеў я, задумаўшыся, над берагам Нёмана. Доўга ўслухіваўся я да дзіўных, чароўных шэптаў яго берагом сваім... Аб чым ён шаптаў?? Ціха. Скажу вам. Я падслухаў гэтыя шэпты. Я зразумеў іх. Гэта Ён, Нёман наш, падшэптываў, вучыў... як павінны працаваць яго беларусы...

VIII

Любча (Навагрудскі пав. Мінск. губ.)

У Любчу трапіў я якраз на другі дзень пасля пажару, каторы бушаваў тут у чэрвені месяцы. Згарэла хат 50 і ўсе халодныя будыніны пры іх. Усяго шчасця, што агонь пачаўся, калі не спаў яшчэ народ, а то магло б пайсці з дымам усё мястэчка, бо хоць пажарная дружына і ёсць тут, але слабавата, і да яе мала нешта прылучаецца мяшчан, асабліва нашых, — усё найбольш жыды. Страхоўкі возьмуць пагарэлыя ўсяго тысяч 17. Наогул, значыцца, на кожнага гаспадара прыйдзецца па паўчварта соткі, за гэтыя грошы цяперашнім часам не ўскрэснеш! Цяжка, праўда, плаціць вялікую страхоўку, а вялікая яна дзеля таго, што страховыя хаўрусы глядзяць на гэту справу не як на помач народу, а як на гандаль, на каторым стараюцца зарабіць што найбольшыя працэнты; але пакуль па нашых вёсках ды мястэчках будуць, як дагэтуль, будаваць страху пры страсе з пальнага матэрыялу, а абарона ад пажараў слабая або зусім яе няма, — дык прыходзіцца з апошняга плаціць, але страхавацца трэба на вышэйшыя грошы.

Трапіўшы ў Любчу, захацелася мне — ведама — глянуць зблізку на белыя агромністыя муры дворных пала-

цаў і на тамтэйшыя парадкі. Заўсёды чалавек спадзяецца ў такіх вялікіх дварох угледзець што-колечы цікавае і карыснае для сябе: мо дрэўка фруктовае іначай вядзецца, мо кусцік які новы з ягадамі, мо будыніна на новы лад пастаўлена, чы прылады якія гаспадарскія нязнаныя заведзены. Падходжу да брамы, ажно ўжо і навіна ёсць: вісіць дошчка, а на ёй напісана: «Вход воспрещается». Здарылася мне, помню, некалісь то быць каля Маладэчны; бачыў я там на адной дворнай браме доўгую, шырокую дошку з такім надпісам: «Міласці просім!» Зразу знаць было, што там жыве і чалавек і наш брат-славянін, сэрца каторага для госця, як адчыненая брама... А тут бог іх ведае, што за людзі!

Прызнаюся, зразу адпала ў мяне ахвота да гэтых «браніраваных» палацаў, і я завярнуўся пацягацца па мястэчку, балазе якраз выпаў тарговы дзень і народу шмат сабралася. Памеж усіх сялян зразу кідаюцца ў вочы шчарсунцы ў нацыянальных сваіх апратках: у мужчын белыя доўгія балахоны, падпяразаныя шырокім тканым або ласіным паясом, і саламяныя шырокія капелюшы сваёй работы. Кабеты ў самадзялковых спадніцах, белыя з вышыўкамі кашулі, гарсеты паверх; на галаве крамная хустачка, да рагоў каторай папрычапляны сваёй работы кутасікі; хустачка гэта ўкруг твару прыстае гладка, але на вярхочку самай галавы падкладаюць паперу, дык выглядае начыпурыўшыся; на шыі паначапляны пацеркі.

На рынку шмат рагатай скаціны і коней. Скаціна вельмі пекная; найбольш галяндэрскага і швыцкага, хоць і не зусім чыстага, заводу. Штуку на рублёў 60—80 знайсці не трудна. Коні складныя і не малыя, але на даражэйшыя цэны не было відаць. Казалі мне, што з вясны наводзяць сюды лепшых коней, але перакупшчыкі ўжо выпаласкалі іх за граніцу. У нас заўсёды так: чы лепшая жывёла, чы лепшае зерне — усё забяруць, пазвозяць, ды яшчэ за паўцаны, бо ніхто з нашых сялян праў-

дзівай цаны і не чуў, і не даведаўся, — а нам пакідаюць адны выбіркі, быццам мы чы не ўмеем працаваць добрай скацінай, чы з'есці сытнейшае мяса або спажыць лепшай мукі не патрапімо. Толькі мы з заграніцы нічога людскага не пажывімся, а калі што і прывязуць адтуль, дык дзяруць, ажно скура трашчыць.

Добра, што Любча мае хоць тую славу, што гадуе добрую скаціну і коней; праўда, славіцца яшчэ Любча і добрымі гулякамі ў карты — прэферанса... Мае Любча і крамаў шмат, асабліва аптэчных; чаму іх столькі туг набралася (бо ёсць і аптэка), каго яны лечаць чы калечаць? — гэта ўжо іх сакрэт. На іншых вуліцах мястэчка панатыканы высокія сухаватыя тычкі; хто можа не сплючы сніць, таму можа здавацца, што з іх будуць прысады... Дык усяго тут хапае, не хапае толькі вучылішч. Мястэчка вялікае, а школа тут усяго адна, дык вучанікоў набіваецца паўнюсенька. Скончыўшы гэтую школку, хлопцам няма куды дзецца, каб далей вучыцца, бо гарадскога вучылішча няма; нямашака, ведама, ніякіх і прафесіянальных школ. У горад ехаць няма за што, дома аставацца няма пры чым, дык усе, хоцькі-няхоцькі, пхнуцца ў Маладэчненскую вучыцельскую семінарыю, каб пасля душыцца разам з дзяцьмі ў нізкіх, цесных вясковых хатках, бо з будынкамі пад новыя школы не так-то скора ў нас рупяцца.

IX

Сенна — Шчорсы (Навагрудскі пав. Мінск. губ.)

З Любчы выбраўся я на другі дзень пад вечар. Дзень выпаў пекны, дык грамадка новых знаёмых выйшла разам са мной прайсціся крыху. Пры вясёлай гутарцы і не агледзеліся, як адмахалі вёрст сем — да Сенна.

Гэтую вялізную дворную маетнасць раскупілі цяпер малымі часткамі сяляне. Справядлівае гэтаму двару прыдумаў нехта прозвішча — Сенна: куды ні глянь — сенажаці і сенажаці, і то не абы-якія, а ў пояс! Іду ў двор. Вось прысады; некаторыя ў колькі абхватаў, векавыя дрэвы ляжаць ужо на баку, парэзаныя на дровы. Ад параднай брамы асталіся толькі слупы; да іх прычэплены цяпер простыя вароты. Заходжу на дзядзінец. Густа абсаджаны ён рознымі тутэйшымі і заграніччнымі кусцікамі. Яны ўжо адцвілі. Адцвілі апошні раз: сякера і рыдлёўка выцерабяць і выкарчуюць іх. На гэтым месцы рассядуцца таўстапузыя буракі і капусцяныя галовы. У глыбі відаць заграніччныя дрэвы. Далікатная пілачка садоўніка выцацкала іх у розныя формы. Цяпер стаяць яны падцярэбленыя, пакалечаныя, толькі чубкі ўгары тырчаць. Іх сукі пайшлі на паркан, каб падзяліць даўнейшы абшар саду на кавалкі новым гаспадарам. У садзе, паміж выпешчаных фруктовых дрэвак, паўнюсенька парэчак, агрэсту, вішань, слівак; а вось і ліповая алея; густая яна. Пні ліпы праз доўгі, відаць, час абрэзаны былі мала чаго вышэй росту чалавека, дык сукі, густа сплёўшыся, спушчаюцца ажно ўніз; зверху таксама спляліся, як страха. Ні дождж, ні сонца туды не дабяруцца; ідзеш быццам праз тунель — цёмна. Недалёка гэтых ліп глыбокія ямы; месцамі засыпаны яны цагляным грузам. Гэта быўшыя мураваныя скляпы, у каторых мо пераховывалі бочкі з заграніччнымі дарагімі вінамі. Над скляпамі гэтымі стаялі дзераўляныя палацы, каторыя быўшы пан, разабраўшы да апошняга бярвенца, забраў адгэтуль з сабой. Важная памятка. Далей стаяць муры і муры: доўгія, шырокія, аграмадныя,—іншыя ў два этажы; клопат новым гаспадарам зямлі: шмат месца займаюць; дык прадаюць іх цяпер на разборку, абы за што, каб толькі як пазбыцца гэтага замінішча. Супроціў быўшых палацаў — зноў прысады; цягнуцца яны недалёка, — толькі да магілы даўнейшых тутэйшых паноў.

На месцы магілы вымураваны склеп; над склепам пастаўлены вялізны памятнік; на ім крыж з фігурай Хрыста, дзіўна пекнай работы.

Сумныя думкі так і наляталі, так і ціснуліся ў душу маю, калі я пакідаў гэты двор. Сумна. Не дзеля таго сумна, што веліч гэтага двара гіне, — дый не аб гэтым толькі ў Сенне думаю я; а сумна, што гінуць гэтыя дубы не пад навалай культуры, а ад сваёй уласнай парахні... А культура? Культура дасць колькі крокаў узад. А чаму? Бо не прыйшла сюды свядомая грамада людзей, а найшлі яны ўрассыпную і жыць будуць урассыпную: не для грамады, не для агульнага дабра, а кожны сабе, кожны паасобку. І там, дзе даўней пры добрай машыне — культурнай гаспадарцы ў адзін дзень пры малай працы кралісся соткі поўных зерня снапоў, цяпер дзеля гэтых самых снапоў пойдуць соткі людзей набіваць мазалі, надрываць свае высахшыя грудзі, класці хлебу на афяру сваё здароўе, дый ад зямлі не здалеюць узяць таго, што можна. Так было, так ёсць, так будзе. Так будзе датуль, пакуль кожны з нас не зразумее, не дойдзе да той свядомасці, што нават у шчасці жыць самому і толькі дзеля сябе — нельга. Шчасце аднаго ў грамадзе такое самае ніклае, як у згоднай грамадзе няшчасце каго-колечы. Трэба, каб жаданне грамады было і маім жаданнем, яе доля — маёй доляй, яе шчасце — маім шчасцем, яе думкі — маімі думкамі, яе святло — маім святлом. Пачын культурнай працы для агульналюдскога дабра толькі гэты і ёсць. Кожная іншая дарога — фальшывая дарога...

За думкамі сваімі мяне і ноч агарнула, а ісці так цяжка: удзень прайшоў крыху дождж, дык зямля тутэйшая зрабілася, як смала, — трудна нагу адарваць. Вёрст сем ад Шчорсаў прыйшлося заначаваць у вёсцы.

Зямля тут хоць і ўраджайная, але вельмі цяжкая да працы на ёй, і, напрыклад, варыва даўней не маглі тут дагадавацца, ажно пакуль не наехаў у гэтыя стораны быўшы глаўны ўпраўляючы шчорсаўскі Ф-р. Той і шчор-

саўскую гаспадарку наладзіў, і акалічныя вёскі шмат чаго навучыліся і пераняли ад яго. Вось цяпер і жыць было б нішто, дык другая бяда надышла: народу прыбыла, а зямлі, як і ўсюды па вёсках, — нехват. Невялікія былі надзелы, дый тыя на шматочкі паразрывалі; ляжаць толькі некранутыя абшары пад выганамі; месца пад імі нізкае, тарфяное, дык і з пашы карысць невялікая, а каб перарабіць на поле — трэба сілы, а сілу родзіць толькі еднасць і згода — дзве найважнейшыя рэчы, каторых, як і скрозь паміж нашых сялян, тут нехват.

Назаўтра, чуць сонца ўзнялося, я ўжо быў у Шчорсах. Апісываць дворную гаспадарку не буду: не дзіва, што ў караля жонка хараша. Дый і тут не далі б рады ніякія ўпраўляючыя, каб не мелі да помачы аднаго старога слугу. Але што нам з гэтага? Адмовіць яго — мы не патрапім, а сам ён не скора яшчэ, бадай, пяройдзе на нашу старану. Магу толькі сказаць вам пад сакрэтам, як ён завецца: *Капітал.*

X

Шчорсы—Кроман

Шчорсаўская зямля надта добрая, але каля яе трэба ўмела хадзіць, і да выработку яна вельмі цяжкая. Ужо на што дворная — як даведзена, а і то ў пружыновую барану запрагаюць чатырох валоў; ды якіх валоў! Штука ў штуку з бараны не менш соткі рублёў варта, і ім, відаць, нялёгка прыходзіцца. Ураджаі, праўда, наўздзіў пекныя. Вырваў я без выбару каласоў дзесяць жыта дворнага (яно яшчэ тады на пні стаяла), падлічыў зярняткі: найменшы колас меў іх 28, найбольшы — 62. Даўней шчорсаўская дворная гаспадарка лічылася першай на ўсю Расею; цяпер, кажуць, тут крыху слабей ідзе;

тым часам па іншых месцах некаторыя двары хапіліся за розум і таксама павялі гаспадарку сваю на заграніччны спосаб,— вось цяпер і зраўнаваліся з Шчорсамі. А вядомая рэч, чым лепшая культура ў дварэ, тым і суседнія вёскі, прыглядаючыся, больш чаго добрага навучацца і самі лепш гаспадараць. Так і тут. Сама вёска Шчорсы аграмадная: цягнецца яна вёрст сем; суцэльныя надзелы яе былі маленькія — па дзесяцін восем; цяпер жа, падзяліўшыся, найбольш ёсць трохмарговых гаспадароў. Праўда, морг тутэйшай зямлі цэніцца не менш 200 руб., бо ткі ўраджайная, напрыклад, жыта з марга нярэдка бывае сто пудоў. Але што ж, калі гэтай зямлі зусім скупа, дык і жыць цяжка. Заработкаў, не зважаючы на веліч двара, мала, бо там усё машынамі робяць,— вось яны і глытаюць ручную працу. Да прасветы моладзь, праўда, шчыра горнецца, але вядомая наша прасвета: чытаць, пісаць навучаць, а далей хоць у вір галавой: няма за што дый няма куды дзецца; усяго шчасця, калі на народнага вучыцеля выб'ецца. Пазнаёміўся я тут з некаторымі з-паміж іх, і сперша, прызнаюся, неяк скоса яны на мяне паглядалі; але слоўца за слоўцам, дый хутка добра разгутарыліся. Спазнаў я тады, што добра толькі паскрабі палітуру, якой пацягівае сваіх вучанікоў дырэктар Маладэчненскай вучыцельскай семінарыі, то пад ёй пэўна дабярэшся да праўдзівага добрага беларуса...

З Шчорсаў крута павярнуў я ўлева, перарэзаў Нёман, захапіўшы, значыцца, толькі маленькі шматочак Навагрудскага павета, і апынуўся ізноў у Ашмяншчыне. Зараз за Нёманам пачынаецца, бадай, найбольшы, які астаўся яшчэ ў Віленскай губерні, лес. Спачатку — Шчорсаўскі, пасля — Налібоцкі, далей злучаюцца яны з казённымі і цягнуцца ажно пад самыя Бакшты. Здаўна столькі-то наслухаўся я пра гэтыя лясы — пушчы, што з вялікай пашанай уходзіў сюды. Іду. Разглядаюся. Дарога шырокая, бітая, гладкая, абкопана канавамі, лясок

чысценькі, добра перацярэблены, старадрэвіны і не ўгледзіш. Каб ісці ў цяні, пераходжу з адной стараны дарогі на другую. Прыслухіваюся: нідзе нічога. Толькі дзяцел чы жаўна час ад часу адазвецца, пераляціць. Бяруся штораз далей, углыб. То мінаюць, то на сустрэчу едуць фурманкі; па лесе чуваць — вясёла галёкаюць пастухі. Бачу здалёку — праз дарогу нешта сівое смарганула, за ім другое, трэцяе. Падбаўляю ходу, каб прыгледзіць — аж свінні! Не дзікія свінні, не, а самыя звычайныя: сівенькія, рабенькія, як і па нашых хмызняках пры вёсцы цягаюцца, рыюць, рохкаюць. Але бо і хаты ўжо блізка — *Кроман*. Каля іх стаяць слупы: граніцы Шчорсунскіх і Налібоцкіх лясоў. Кроман — гэта невялікі кавалак ворнай зямлі паміж лясоў. Тут жывуць леснікі і аб'ездчык. Недалёка хат — у катлавіне — возера Кроман. Не надта вялікае яно — вярсты дзве ў абход, але, як кажуць, вельмі глыбокае. Нядаўна яшчэ арандаваў яго жыд; плаціў сто рублёў у год за права лавіць рыбу, але цяпер нешта адрокся. Лавілі рыбу тут толькі зімой, прарубаючы лёд, невадам, але невад аршын 200 даўжыні. Рыбаловы прыязджалі нанятыя з-пад Гродны. Шанцавала ўсяляк: бывала, што і пусты невад выцягнуць, але траплялася і па асмін сорак за раз.

XI

Налібокі—Івянец

Пераначаваўшы ў Кромане, раніцай пусціўся я ў дальшую дарогу. Мінаючы слуп гранічны, глянуў я на табліцу — напісана на ёй: «Налібоцкая пушча, Фальц-Фэйна». Узрадаваўся я, што давядзецца-такі зблізку глянуць мне на пушчу, але, прайшоўшы колькі вёрст, і смех, і жаль нейкі агарнулі мяне. Дык гэткая мае быць

пушча? — пытаў я сам сябе. Беларуская пушча? Не, пане Фальц-Фэйн; на табліцы можаце пісаць, што хаця, але зразу відаць, што не тутэйшы вы, не беларус, і беларускіх пушч вам не даводзілася бачыць ды і не давядзецца,— бо іх ужо няма! Беларуская пушча — ведалі людзі, дзе пачынаецца, чулі — дзе канчаецца, але колькі яна цягнецца — ніхто не знаў, што ў яе сярэдзіне — у яе сэрцы — ніхто не бачыў! Гэты ж лес скрозь падлічаны: кожны шматочак яго абмераны, зграбна парэзаны шырокімі дарогамі — лесасекамі ў квадрацікі; абкопчаны маляванымі слупочкамі, з надпісамі амаль некалькі пядзей у ім; мала таго, скрозь ён ужо абмотаны дротам — тэлефонам: яшчэ не паспееш чхнуць, толькі зморшчышся ў Кромане, а ўжо ў Налібоках — «будзь здароў» — кажуць. Звяр'ё і тое чуць не пад нумарамі; скора, бадай, камароў на гарцы вымераць. І гэта кажуць — пушча! Чы не за тым завецца яна пушчай, што некалькі гадоў таму ўзад была аблава тут на мядзведзяў і двух забілі? Дык вось паслухайце, якая гэта была аблава. На табліцы гэты лес ахрысцілі пушчай,— добра; а якая ж гэта, думаюць сабе хросныя бацькі, будзе пушча, калі ў ёй і мядзведжага хваста няма? Трэ зрабіць пушчу: як зарычыць мядзведзь,— вось і будзе пушча. Дасталі недзе парачку маладых мядзвяджаткаў, паілі, кармілі, няньчыліся з імі і, падгадаваўшы, пусцілі ў лес дый чакаюць, што будзе. Брыкаюць, гуляюць мядзвяджаткі ў лесе, але... але, як вымерхаюцца — ходзяць, духі падцягнуўшы,— не могуць ніяк яды знайсці. Прызвычаіўшыся, як паняты, да гатовага стала, не могуць даць сабе рады, каб самім расстарацца, запрацаваць. І зрабіліся нашы мядзвяджаты на манер экспрапрыятараў: то пастуха зловяць — абмацаюць, чы няма чаго з'есці; то падарожных пераймуць, каб чым пажывіцца. Народ стаў жаліцца. Тады прысудзілі сказніць гуляк-валацугаў, што не ўмеюць запрацаваць на хлеб. Зманілі іх ядой у нейкі хлевушок і, як гэта вядзецца, зачыніўшы ў адседцы, далі

знаць. З'ехаліся паўбіраныя за стральцоў паны, пасталі *на метах;* хлевушок адчынілі, арыштанты выскачылі,— пук, стук, — і ўсё скончылася. Але чаго ж болей і трэба? Былі мядзведзі; была аблава; былі стрэлы; цякла кроў; зраненыя кідаліся, мучыліся, каналі на вачах сведкаў... Чым дрэнная гульня? Каб мне гэтак пашанцавала, няйначай пачынаў бы сваю гутарку паміж гасцей, як так: «Як я забіў у Налібоцкай пушчы на аблаве мядзведзя і т. д. ...» Ну, але мядзведзі скончыліся. Ёсць цяпер яшчэ, як мне казалі, шмат у гэтым лесе дзікіх коз, дзікіх свінней, ёсць і ласі-недабіткі. Кажу — недабіткі, бо на іхнюю долю выпала яшчэ горшае няшчасце, чым на тых мядзведзяў. У 1905 г. некаторыя акалічныя сяляне, збіраючыся ў грамадныя банды, мест ісці дзяліць долю сваіх братоў, што за іх клалі сваё жыццё, запушчаліся ў гэтыя лясы адбіраць ні ў чым непавінным зверам свабоду і жыццё. Бедныя ласі таялі дзесяткамі; яшчэ больш уміралa іх зраненых па гушчарах. Людзі гэтыя паказалі, што яны не дараслі яшчэ да свядомасці аб свабодзе і самі яе не варты. Без прычыны і толку нават зверху адбіраць свабоду і жыццё нельга. Але годзе аб Налібоцкім лесе, бо вось і самыя Налібокі. Як дагэтуль Шчорсы, Любча, Бакшты і ўсе вёскі паміж іх былі падобны да сябе з мовы, апратак, погляду нават і амаль не ўсе праваслаўныя, так Налібоцкая вёска больш падходзіць да ашмянчан з-пад Траб, тут ужо каталікі; мова беларуская, добрая, чыстая, а старэйшыя трымаюцца яшчэ і нацыянальных апратак. Зямля, мест навагрудскіх раўнін, змянілася на прыгожыя ўзгоркі, але на ўраджай — паказвае добра. Крэкчуць толькі налібочане, што гэтай зямліцы скупа; наракаюць і тутэйшыя жыдкі, старадаўнія чыншавікі: так іх аблуталі новымі парадкамі, што патрапілі ўсучыць кантракты і цяпер дзяруць з іх арэнду, якую ўздумаецца. Урваліся і даўнейшыя заработкі — закрылі старадаўнюю налібоцкую фабрыку жалезную. Не зышоўся новы пан з купцом на дровы — фабрыка і стала.

Ляснула ўся падмога не толькі для налібочанскіх, а і для іншых з суседніх вёсак сялян. Сталі кідацца людзі на іншыя заработкі — дрэнныя заработкі: пайшлі зладзействы, суды. А ў гэтых старонах людзі да судоў, відаць, ласы, бо калі выбраўся я з Налібок і пусціўся праз Пруды і Камень на Івянец, то куды, было, ні зайдзеш — усёй гутаркі, што аб судах, а я, прызнацца, і не люблю, і баюся іх, як агня, дык пёр як мага, каб як скарэй мінуць гэтыя неспакойныя старонкі, і тады толькі супакоіўся, калі ўгледзеў Івянец. А і спачыць было па чым і было дзе: з Налібок у Івянец — ладны кавалак, а трапіў да такіх людзей, што не ў кожнага сваяка так будзе...

XII
Івянец—Люцынка

Івянец — старасвецкае мястэчка. Сведчаць аб гэтым два велізарныя з баштамі * муры даўнейшых каталіцкіх манастыроў. Кажуць, быццам злучаны яны падземным ходам. Кажуць,— а чы праўда, чы не — хто ведае. Мы нічога не ведаем. Не ведаем, што ёсць на зямлі, а не то што пад зямлёй. Не ведаем нават, хто жыве на гэтай зямлі,— чыя яна бацькаўшчына. Спытайцеся нашага селяніна-беларуса, хто ён, дзе жыве, а пэўна пачуеце такі самы адказ, які і я скрозь чуў. «Тутэйшы,— скажа вам,— я!» Мы нічога не ведаем дый не цікавімся ведаць. Смех сказаць, але мы — хоць з апісання — па кніжцы лепш і болей можам ведаць аб якім кавалку зямлі ў Афрыцы ці Аўстраліі, чым, напрыклад, аб Віленскай губерні. Адна толькі пацеха ёсць для нас, ды і тая дрэнная: не мы адны — беларусы — гэтак спім у шапку, спяць у Расеі ўсе; вось і не дзіва, што, напрыклад, у Сібіры адступаюць чы аддаюць заграніччным багачам абшары зямлі

ў арэнду, як ката ў мяху — за нішто, бо не ведаюць, якое багацце выпушчаюць з рук сваіх; а тыя чужынцы, заграбаючы нашы мільёны, з нас жа кпяць. Заграніччныя вучоныя людзі не толькі кожны куточак, кожны шматочак роднай зямлі зведалі і дэтальна апісалі, але едуць у далёкія нязнаныя краі, трацяць час, грошы, а іншым разам і здароўе, каб узбагаціць свой край, свой народ навучнымі ведамасцямі. Там яны не толькі прыглядаюцца да цяперашняга жыцця і звычаяў, але, рыючыся глыбока ў зямлі, адкапваюць даўнейшыя, спрадвечныя памяткі і з іх-то спазнаюць гісторыю даўнейшага жыцця народаў. Як багацце краю залежыць ад спазнання яго самога, так мінуўшая гісторыя народаў — гэта адкрытая кніга, з каторай можна даведацца аб усіх прычынах развіцця і ўпадку гэтых народаў; па гэтай кнізе — па гэтай вяковай практыцы, мы павінны вучыцца, як нам трэба кіравацца ў цяперашнім жыцці, каб будаваць лепшую сабе будучыну. Ёсць і ў нашым краю шмат і на зямлі, і пад зямлёй старадаўніх забыткаў, каторыя адкрылі б нам вочы не на адну цёмную пляму нашага мінуўшага жыцця, але мы не рупімся аб гэтым. Так і з Івянецкімі манастырамі. З часам гэтыя манастыры перакулілі на цэрквы. Адна з іх згарэла. Тырчаць толькі высокія башты яе — цяперашні прытулак буслаў, дый месцамі ацалеўшыя сцены; у сярэдзіне — пры сценах гэтых відаць яшчэ абломкі амбоны і даўнейшыя фігуры нейкіх святых. Тамтэйшыя каталікі, не маючы касцёла, гадоў пяць таму, стараліся, каб ім вярнулі гэту рудэру *, і меліся яе давясці да парадку. Каталікі нядаўна пабудавалі да часу невялічкі касцёл пры сваім могільніку. Успомніўшы аб ім, успомніў я праваслаўны і жыдоўскі могільнікі. Месцы пад іх адведзены недалёка мястэчка пад узгоркам амаль не супраціў адзін другога. Праваслаўны могільнік без ніякага плота; жыдоўскі — гладка і моцна абгароджаны. Відаць, што і на гэтым свеце адны любяць прастор, другія прывыклі да... «чарты аседласці»...

Вельмі спадабаліся мне хаткі івянецкіх мяшчан... просценькія яны, іншыя і старэнькія, але чысценькія; дзенідзе садочкі; у якое аконца ні глянь — паўнюсенька вазонаў, кветак; добрая варажба: не благі той чалавек, хто любе хараство, і я вельмі жалею, што не меў часу больш і лепей пазнаць івянчан.

Івянец мае сваю славу — заслужоную славу: выраб-ляюць тут кафлі да печы і розную гліняную пасудзіну; усе гэтыя вырабы вельмі аздобныя; рысунак пекны і арыгінальны. Але мы, калі і маем што добрае, то не ўмеем з гэтага выкарыстаць: івянецкім фабрыкантам трэба было б канешне мець па мястэчках і гарадах свае хаўрусныя склады ўсялякіх сваіх вырабаў; толькі такім парадкам можна было б павялічыць продаж, расшырыць свае фабрыкі і даць заработкі мясцовым здольным мулярскім работнікам, каторыя цяпер мусяць цягацца па свеце, шукаючы працы на кавалак хлеба. Апрача таго, усялякія вырабы павінны мець на кожнай пасудзіне сваю фабрычную марку на чыстым тавары і асобны знак на браках; так робіць кожная лепшая і справядлівая фабрыка. Варта даваць час ад часу і абвесткі ў газетах, які тавар ёсць на складзе і па якой цане прадаецца. Усялякі гандаль вымагае рупнасці, спрыту і заходу каля яго, а ў нас гэтага часта нехват. У Івянцы спаткаўся я з некаторымі людзьмі, што шчыра спагадаюць беларускай справе; пільна слядзяць за ўзростам яе і працуюць над беларускай граматыкай. Памажы ім божа! Вельмі добра было б, каб гэткія працы прысылалі ў рэдакцыю, дзе, як мне вядома, ужо ёсць шмат сабранага матэрыялу, а чым яго будзе болей, тым лепей, лягчэй і акуратней можна будзе ўзяцца за гэту вялікую і важную працу.

Выгодна спачыўшы і смачна папалуднаваўшы, з Івянца пусціўся я пуцявінкамі адшукаць тую хатку, пад страхой каторай некалісь-то ламаў свае пальцы, каб як нагрэмзаць першую літару. Шмат з таго часу вады ўплыло, ох, шмат! Шасцёра нас там было: тры дзяўчынкі (адна

з іх ужо ў магіле) і тры хлопчыкі; я быў найменшым — гадкоў сем меў; вучылі нас розных навук, нават музыкі. Наша вучыцелька (вечны ёй ужо пакой!) і яе бацькі так умелі падахвочываць нас да навукі, што кожны з нас наперабой браўся да яе. Гэта было ў 187... гаду ў фальварку першага беларускага песняра — Вінцука Марцінкевіча — Люцынцы... Памятаю я і Люцынку, і яе гаспадара: старэнькі ўжо тады быў, але надта добры, вясёлы, жартаўлівы. Памятаю і вялікі куфар, куды хаваў ён сваё пісанне, паўнюсенькі быў, але мала выйшла гэтага пісання адтуль у свет: па смерці Марцінкевіча стары дом згарэў, пайшла з дымам і большая палова працы гэтага заслужанага для нашай бацькаўшчыны чалавека. Дзіўлюся я цяпер, як мог ён столькі працаваць, калі цалюсенькі дзень у гэтым самым доме дзеці—адны барабанілі на фартап'яне, другія — галасілі над кніжкай, іншыя — дурэлі: музыка, смех, гоман, крык, а ніколі, бывала, слова благога не скажуць ні ён сам, ні яго жонка-старушка, ні дачка — наша вучыцельніца. Любілі яны нас,— чулі гэта нашыя дзіцячыя душачкі, ды і мы іх з усяго сэрца кахалі, шанавалі, як родных бацькоў. На кожны важнейшы, бывала, дзень — нябожчык пісаў для нас усіх — дзяцей якую-колечы камедыю, мы яе вучыліся, з'язджаліся госці, і ішло прадстаўленне. Памятаю доўгія восенныя вечары... памятаю цікавыя апавяданні аб роднай бацькаўшчыне і аб далёкіх халодных краях, куды злая доля заганяе шмат людзей... Збіўшыся ў кучку, слухаем мы гэтыя дзівы, а нябожчыца, жонка песняра, ціхачом уцірае слязіну; шчымелі нашы сэрцы, у грудзях нешта бунтавалася. Але скончылася тут наша навука: нас паразвозілі да бацькоў. Цяпер, ідучы, калі здалёку ўгледзеў я Люцынку, таксама як некалісь-некалісь, зашчымела маё сэрца, у грудзях нешта бунтавалася, але ўжо не кулакі заціснуліся, а толькі скацілася па твары слязіна...

...Бывае, находзяць думкі — іншы раз — вясёлыя, то

ізноў — сумныя, але такія дарагія, такія патайныя, што чалавек ажно аглядаешся, быццам баішся, каб хто не падслухаў, не падгледзіў, не дагадаўся іх, бо іх ведаць ніхто не павінен — ніхто!..

XIII

Люцынка—Першаі

На месцы старога згарэўшага дома ў Люцынцы стаіць цяпер новенькі зграбненькі дамочак — зусім на манер местачковага. Зграбненькі ён зверху, чысценькі — усярэдзіне; мэблі пекныя, мяккія,— сядзіш, як на пярыне; фартап'ян аж блішчыць, але... усё ж ткі не мяняў бы я на яго тую даўнейшую старэнькую згорбленую пад амшалай стрэхай хатку... Ніяк не магу я прывыкнуць да цяперашняга ладу на свеце: то фарніркай наложаць, то палітурай пацягнуць, глядзіш — здаецца, усё быццам і добра, а што там пад гэтым лоскам, што ўсярэдзіне,— і не разбярэш... У Люцынцы жывуць цяпер унучкі нашага песняра, вось і стаў я іх дапытваць, чы не засталося якіх памятак па ім, але апрача партрэтаў ды рваных кавалачкаў пісулек,— нічога няма: усё агонь забраў. А было гэтага, помню, паўнюсенькі велізарны куфар. Прасіў я цяперашніх паняў Люцынкі, каб былі ласкавы сабраць і спісаць, якія самі памятаюць, чы мо радня, або суседзі, усе ведамасці аб нябожчыку сваім дзеду. Нямала, бадай, іх сабралася б і пэўна вельмі б былі цікаўныя; асабліва за часоў, калі Марцінкевіч вёў дружбу з вялікім песняром-лірыкам, каторага, хоць і пісаў па-польску, таксама ўзгадавала Беларусь — Уладзіславам Сыракомляй (праўдзівае прозвішча яго — Людвіг Кандратовіч). Абяцаць абяцалі і пэўна абяцанку захочуць споўніць. Жыве яшчэ недалёка Люцынкі пан Ж..., каторы таксама дру-

жыў з нябожчыкам песняром нашым, лётаў я і туды, але дома не застаў — у Мінску быў. Хадзіў і па акалічных засценках, рады засцянковічы ўспамінаць свайго песняра, але твораў яго добра не памятаюць, а спісаных знайсці не мог і толькі ў нейкі месяц атрымаў пісульку, што адшукалі там на маю просьбу «Дудара» і «Дажынкі».

З нейкім жалем і болем сэрца пакідаў я Люцынку (апошні хіба ўжо раз), мінаючы тут памятную мне ліпу, у цяні каторай столькі-то раз грамадка наша палуднавала (і па сягонняшні дзень памятаю люцынскія халаднічкі, а запяканы хлеб як успомню, здаецца, і цяпер пах з яго ідзе); пад ліпай гэтай не раз даводзілася і мне стаяць з галіной у колькі раз большай за сябе на варце, каб барані божа ў талерку з ядой чы ў міску не ўвалілася муха, бо тады квіт ядзе, так іх нябожчык брыдаўся. Мінуў я добра знаёмую горку — зараслі ўжо сцяжынкі на ёй,— там над ручайком у пясочку часта капаліся мы, ляпілі і пяклі пірагі, муравалі печы; там жа не раз знаходзілі старыя манеты і нейкія бляшкі... Знайшліся б пэўна і цяпер яшчэ і манеты, і бляшкі, хваціла б і пяску на печы і пірагі, але не знойдуцца мінуўшыя годы!!.

З Люцынкі пацягнуўся я пуцявінкамі на Першаі. Як малюнкі, то на ўзгорку, то пры лясочку панасаджаны дзе-нідзе хаткі; быццам хаваюцца яны ад людзей, каб не стрывожылі той цішы, якая вее ўкруг іх... Вось і Першаі: вялікая вёска, касцёл, двор; тут жа і палацы першайскага графа Тышкевіча.

Тутака мова беларуская трымаецца яшчэ добра; хаткі вясёленькія, зямля добрая, але, ведама, як і ўсюды, скупа яе.

XIV
Валожын—Чэрнева

З Першаёў пайшоў я на Валожын. Дарога цягнецца гарыстая; зямля ўраджайная, але, відаць, тутэйшыя людзі гэтым яшчэ не здаволены, бо скрозь ужываюць лубін і гэтак яшчэ больш узбагачваюць сваю зямліцу. Праўду тут кажуць: дай зямлі, то яна табе ўдвая аддасць.

Валожын блішчыць здалёку. Бадай, ніводнага жыда няма на свеце, каторы не знаў бы ці хаця бы не чуў а Валожыне. Найважнейшая тут жыдоўская духоўная школа, і найважнейшымі лічацца валожынскія рабіны. Не толькі з усёй Расеі чы Еўропы, але з усяго свету — з Амерыкі, Японіі нават прыязджаюць сюды вучыцца на рабінаў. Але, праўду кажучы, і жыды тутэйшыя неяк зусім інакшыя за тых, якіх мы спатыкаем па гарадах чы мястэчках нашых. Не трайкочуць яны, як тыя сарокі, чужой мовай; не надзімаюцца, як індыкі ў павіх пёрах, абы-толькі як паказацца не тым, кім яны папраўдзе ёсць; не, яны моцна трымаюцца сваёй веры, звычаяў, мовы і нават старасвецкіх апратак. А толькі такіх людзей можна і шанаваць, каторыя, не чураючыся свайго, не ўшываюцца ў чужую, прадажную скуру...

Зайшоўшы нанач да аднаго тутэйшага жыда, стаў я распытвацца яго аб тутэйшым жыцці. «Не ведаю,— кажа ён,— добра аб гэтых справах, бо дагэтуль жыў у Дзісенскім павеце і нядаўна адтуль вярнуўся, але спытайцеся хіба майго бацькі». Гляджу я на яго, вытрашчыўшы вочы: кпіць чы дарогі пытае? «Колькі ж вам год, пытаю?» — «Я самы малодшы сын,— усміхаючыся, адказвае ён,— і то, дзякаваць богу, ужо пераваліў за сем дзесяткаў!» Ну, думаю, сабе, калі такі малодшы сын, які ж будзе бацька? Ажно прыходзе і той. Праўда: старэнькі, сівенькі, але чорствы яшчэ, а які рухавы, гутарлівы, дый жарцікі нават трымаюцца яго! Скора мы з ім

разгутарыліся. «Пачакайце,— кажа да мяне стары,— пакажу вам і сваю маладзіцу — агонь кабета! Праўда, яна крыху маладзейшая за мяне, бо я даязджаю да сотні, а як мы жаніліся, мне ішоў пятнаццаты, а ёй чатырнаццаці не было...» Бачыў я і гэту маладзіцу: прыбраўшыся ў святочныя старасвецкія атласовыя апраткі, выходзілі яны разам у школу (якраз пятніца была) богу маліцца. «Ну, ну,— клёпаючы па плячах жонку, жартаваў стары,— жвавей, паненка, спраўляйся, лягчэй ступай, а то падумаюць, што старая баба нейкая сунецца».— «Вось бачыце,— кажа да мяне старушка,— ён заўсёды такі: хіба *пастарэе* і блазнаваць не пакіне!»

Справядліва — па-старадаўняму, відаць, зжылі гэтыя людзі свой век, калі ў гэтых гадах ад іх мовы вее такая пагода, спакой...

Пазнаёміўся я з тутэйшай грамадкай нашых беларусаў; невялічкая, праўда, яна, але, відаць, шустрая, і, калі будзе рупіцца, многа можа яна зрабіць... Жалею, вельмі жалею, што не давялося мне бліжэй усіх іх пазнаць, хоць адзін вечарок з імі прасядзець, пагутарыць, але знаю добра аднаго з-паміж іх з лістоў і твораў яго, прысыланых у рэдакцыю, і адно толькі скажу: дай божа, каб «Наша Ніва» каласілася такімі...

На другі дзень, выйшаўшы каля поўдня з Валожына, дацягнуўся захадам у двор *Чэрнева*. Заходжу прасіцца нанач, ажно калі сталі вылятаць з усіх куткоў двара сабакі — вялікія, малыя, кудлатыя, гладкія, усялякай масці, усялякага стану, ды калі сунуцца да мяне,— дрэнна, думаю, можа скончыцца: лыткі як лыткі — за дарогу падсохлі, дык не ўгрызуць, але маё куртатае падарожнае адзенне можа-ткі яшчэ пакарацець! Давай я з імі ў млынка гуляць, ажно пакуль не выйшла нейкая паненка ды не пачала кожнага з гэтых брахуноў па прозвішчу выклікаць, ратуючы мяне з бяды. Якіх толькі там не было гэтых прозвішч, дык і не ўспомню! Нейкія Жолькі, Молькі, Жучкі, Сучкі, Знайды, Гайды, Фінкі, Мінкі — усіх і не пералічыш!

XV

Гарадок—Аляхновічы

З Чэрнева пацягнуўся я гарамі ды ўзгоркамі да Гарадка. Зямля тут хоць цяжкая, але добрая. Народ жыве не бедна, але да прасветы ахвоты не мае; затое да сварак і лаянкі — першы. Як жыву, дзе не быў, не здарылася мне чуць гэтакай лаянкі, гэтакай брыдасці, як у ваколічных вёсках Чэрнеўскага двара! І то не паміж хлапцоў, а паміж маладых дзяўчат! Скуль яны гэтага набраліся? Кажуць, што такую адукацыю наносяць салдаты; але ж салдаты ёсць па ўсіх вёсках; ці ж бы дзяўчаты тутэйшых вёсак толькі і здатны былі да гэтай адукацыі?

Па дарозе ў Гарадок паміж дварамі Чэрневам і Пранцэйкавым ёсць невялічкі засценак, у каторым, як кажуць, жыве *слізкі* чалавек. «Як-то, пытаюся, слізкі?»— «А так, кажуць, як яго не зловіш, як не прыціснеш, здаецца, павінен быў бы аддыхнуць... пасядзець, а тут глядзіш — ізноў выслізнуўся, ізноў дома...»

Я сам знаю слізкіх людзей і шмат на шляху сваёй дарогі чуў наракання ад спакойных людзей на гэтых уюноў і, праўду кажучы, добра не разбяруся, дзе тут віна: чы што гэтакі чалавек сам слізкі, чы тыя рукі, каторыя яго дзяржаць, слізкія? Бадай, што адзін варт грыўні, а другі — залатоўку без дзесяткі...

Гарадок — мястэчка маленькае, бруднае, беднае. У ваколіцы яго ёсць, праўда, двары вялікія, багатыя, але, як гэта і па іншых мястэчках бывае, найдзецца некалькі шышак, што ад гэтых двароў разбохаюцца унь як, а другія сохнуць, гібеюць. Так і ў Гарадку. Торжышчы тут зусім слабыя, і толькі гандлёўшчыкі коньмі кратаюцца нішто. Асабліва шанцуе глаўнаму іх правадыру. Гэтак ужо вядзецца на гэтым белым свеце: калі шанцуе, то шанцуе.. Мае ён вялікія ласкі ў багатага пана, што жыве побач з Гарадком, мае вялікія ласкі і ў бога, бо,

кажуць, іншым разам гэтаму гандляру коні валяцца з неба...

Каля Гарадка пазнаёміўся я з адным маладым хлопцам-беларусам. Хлапец, як і найбольш нашы маладыя хлопцы, відаць, добры, да кніжкі рупны, а і да пяра складны, але што ж, калі яго пісанне было не ў роднай мове, дык кашлява * яно і выглядала. Толькі нядаўна спаткаўся я з яго подпісам у «Нашай Ніве»; прызнаюся, вельмі ўцешыўся: прыбыў нам яшчэ адзін таварыш, а на яго працу для нас я маю надзею.

З Гарадка стаў падбірацца я да Аляхновіч. Гэта яшчэ першая жалезнадарожная станцыя, якую натрапіў я на сваёй дарозе, бо хоць адмахаў ужо больш 400 вёрст, але трымаўся праз увесь час болей глухіх куткоў, і толькі раз здарылася прайсці праз рэльсы і то воддаль ад станцыі.

Чым бліжэй падыходзіў я да станцыі, тым больш спатыкаў па дарозе народу. Тут ужо інакшы абарот маюць людзі: усё больш б'юць на заработкі каля чыгункі: то каменне, то дрэва возяць. Мо так мне здалося, але быццам і народ сам нейкі інакшы: не такі шчыры, болей на хітрыкі здатны, а што мова беларуская, то штораз горшая. Чутны ўжо былі гудкі, калі і не агледзеўся я, як насунулася хмара, ды такі ўрэзаў дождж, што пакуль дапёр я да самых Аляхновіч, сухой ніткі на мне не асталося; а тут і вечар на дварэ. Сунуўся я ў адну карчму, у другую — ані прыступу, скрозь купцы нейкія сядзяць. Праўда, усяго іх там двух чы трох, але такія, відаць, шырокія, што за імі не прыступішся нават абсушыцца, абагрэцца. Іду ў вёску прасіцца нанач да гаспадара. У адной хаце кажуць — месца няма; у другой — гаспадара няма дома, дык жонка баіцца пушчаць незнаёмага; прашуся ў трэцюю, каб хоць куль саломы даў ды пазволіў у адрыне пераначаваць. «У нас цяпер куль саломы трыццаць капеек варт, ды я не ведаю, хто вы такія»,— адказвае той.

Не двузлоткі мне было шкада, але нейкі такі жаль сціснуў за сэрца, што толькі глянуў яму ў вочы і, слова не сказаўшы, завярнуў на станцыю. Не ведаю, што гэтаму чалавеку паказалася, дагнаў ён мяне і стаў прасіць нанач у хату, але я ўжо не вярнуўся.

Хоць сабе і ў цёплую летнюю ноч, але калі чалавек змокне, як тая анучына, што хоць круці, дык так дрыжыкі прабіраюць, ажно зубамі ляскаеш. Так і са мной цяпер было. Прыйшоўшы на станцыю Аляхновічы, мокры, ззяблы, не мог я месца сабе дзе знайсці, каб хоць абсушыцца, абагрэцца. Поезду ніякага на той час не было, дык на вакзале пуста, глуха. Заганяючы эканомію, быццам канаючы, чуць міргае ліхтарня, за буфетам нейкая паненка з панічом у пашаптушкі забаўляюцца; стораж з мятлой з кута ў кут скрабе цяжкімі ботамі; нейкі падарожны, выцягнуўшыся на лаве, ёрзае па ёй дый чухаецца,— вось і ўся кампанія. Папрабаваў было і я, падлажыўшы кулак пад галаву, прылегчы — спачыць, але лава зроблена быццам з кантовых лат, дык праз мокрае адзенне ажно ўпіваюцца ў цела гэтыя канты,— не ўляжыш. Саджуся, прабую пісаць,— прыцемна, ды пальцы, як граблі, тырчаць — ані сагнуць. А на дварэ цемрасць, дождж. Сонна, ляніва, скрыгаючы, прысунуўся на станцыю таварны поезд. Увайшоў кандуктар і, сеўшы за стол, лыпнуў увокал раз-другі чырвонымі заспанымі вачамі і заснуў. Поезд, крыху пастаяўшы, павалокся далей, а кандуктар усё яшчэ спаў, падсвіствaючы ды кудактаючы час ад часу, як асіпшая курыца. Прачнуўся ён, праўда, скора, але поезда ўжо не дагнаў, так і астаўся. І цяпер яшчэ дзіўлюся сам з сябе, чаму я не разбудзіў яго ў пару? Але тады нейкая злосць на яго захапіла мяне. Бо як жа ж! Спіць, як пшаніцу прадаўшы, а поезд ідзе ў Вільню. У Вільню! І зразу агарнула мяне такая жуда, такая страшэнная падпала ахвота адрачыся ўсяго, сесці на гэты поезд і апынуцца паміж сваіх у Вільні, што птушкай, здаецца, пераляцеў бы туды! Ненадоўга — не:

от так толькі — на момант, глянуў бы на іх, сціснуў бы моцна, шчыра ды ізноў назад!.. Ужо не холад, а цяпло нейкае ўдарыла на мяне... Выйшаў на двор, дождж стаў сціхаць, неба — выпагаджвацца. Тым часам паязды часцей сталі падкачваць да станцыі, але народу — прыязджаючых і ад'язджаючых — зусім мала. І не дзіва. Найбліжэйшае — вёрст восем — мястэчка ад гэтай станцыі — Радашковічы; адтуль столькі ж вёрст, колькі і ў Аляхновічы, да другой станцыі гэтай самай жалезнай дарогі — Радашковіч, дый туды праведзена шаша, дык каму ж ахвота вытрасаць духі, ездзячы ў Аляхновічы. З другой стараны Аляхновіч — пад Вільню, станцыя Ута пры самым мястэчку Красным, і туды нямала народу набіраецца, дык нашто і для каго ў гэтых Аляхновічах нядаўна вымуравалі агромністы вакзал і ўлялюкалі на гэта тысячы рублёў, чараўнікоў бы спытаць...

XVI

Путнікі—Дакшняны—Удранка—Бахметаўка—Прудзішча. Дом

Яшчэ і віднець не пачынала, калі я, сабраўшы свае манаткі, пусціўся са станцыі Аляхновічы далей у дарогу. Зямля тут хоць гарыстая, але цяжкая, дый размачыла яе, дык ногі так і коўзаюцца ў балоце. Гэтак прашлёпаў я вёрст пяць — да Путнікаў. Стала віднець. Вёска вялікая; ураджаі добрыя; нідзе не бачыў я столькі панасяваных канапель, як у гэтых Путніках. Смела можна сказаць, што пры добрым ладзе паміж путнічан маглі б яны свае каноплі і пяньку не пудзікамі перакупшчыкам прадаваць, а зразу вагонамі высылаць на якую-колечы фабрыку. Спазналі б яны тады і розніцу ў цане і сваю сілу для грамадзянскай справы. Варта каля гэтага паклапа-

ціцца; бо тут, як я даведаўся, кожны год таксама шмат сеюць канапель і амаль не кожны год добра яны родзяць. Трэба было б спісаць усіх гаспадароў, колькі каторы *наймени* можа мець на продаж канапель і пянькі і, падлічыўшы ўсё, даць абвестку ў якую гаспадарска-гандлёвую газету, колькі чаго пудоў і дзе прадаецца, а купцы пэўна адклікнуліся б.

З Путнікаў выпала мне ісці каля Дакшнян. Двор вялікі; будынкаў шмат; жыве тут толькі ўпраўляюшчы ад пана, але гаспадарка, відаць, ідзе на лад, бо ўраджаі наўздзіў пекныя. Стаяць тут і драўляныя старыя палацы, але здавен-даўна ніхто ў іх не жыве. Вось бы дзе, прыйшло мне ў галаву, залажыць гаспадарскую школу! Будынак гатовы, відаць, нікому не патрэбны, а і зямлі, як чуў я пра дакшнянскага пана, некалькі дзесяцін пэўна не пажалеў бы адпусціць, мястэчка блізка — вярсты дзве, чаго ж на пачатак болей трэба? Пэўна, і падмога нейкая з ваколіц знайшлася б. Калі не хто другі, то радашкоўскай Думе варта было б добра каля гэтага пахадзіць.

З Дакшнян, не зварачваючы ў мястэчка, перарэзаў я віленскі тракт і зайшоў у Мігаўку, адкуль, добра і як дома — выгодна перадыхнуўшы, пусціўся нацянькі пад дом. Знаёмыя мне пайшлі ўжо тут сцяжынкі! Вось цягнуцца абшары радашкоўскіх пяскоў; з году ў год штораз болей і далей заносяць яны мяшчанскія шнуры ўраджайнай зямлі, і нікому ў галаву не прыходзе бараніцца ад гэтай навальніцы; ніхто не парупіцца пасадзіць пясчанай вярбы (шэлюгі), каторая расце на гэткай сухой зямлі, а ўзросшы, затрымлівае лётныя пяскі, бо зямля пад ёй займаецца дзірваном. За пяскамі гэтымі над рэчкай Удранкай, дзе да нядаўна яшчэ стаялі толькі са дзве старэнькія хаткі, цяпер наляпілі тут адзін пры адным дамкі — дачы. Месца як на дачы выбрана нішто: пры жывой вадзе, за рэчкай цягнецца пекны сасновы бор, да мястэчка тры вярсты, а да таго і тутэйшыя дачнікі, ві-

даць, такія, каторым дагадзіць не трудна. Але дамочкі пабудаваны так, быццам адзін другога дражніць. Як той, хто першым будаваўся, не дагадаўся адсунуцца ад дарогі, каб пяском вочы панам дачнікам не засыпала, так і ўсе зрабілі; першы некаторы прыляпіў да хаты не то ганак, не то катух, і ўсе папрылеплівалі такія самыя катухі і г. д. А каб пабудавацца на старане чы дрэвак, кусцікаў пасадзіць,— ніхто не дагадаўся. Няма што сказаць, на свае выдумкі ў нас розуму не багата, вось толькі калі дагледзілі што-колечы ў другога, дык і ўсе, як тыя бараны, за тое самае хапаюцца.

Хоць з поўдня ўжо было, калі мінуў Бахметаўку, але сонца яшчэ добра прыпякала, і, толькі дабраўшыся да казённага лесу, лягчэй стала ісці. А мо дзеля таго лягчэй, што дом блізка? — вёрст сем асталося. Падбіраючыся да яго, пачуў я фабрычны гудок. Адкуль гэта, думаю сабе? Ніякіх фабрык перш тут не было. Падбаўляю ходу; вось і лес канчаецца,— Прудзішча. Гляджу і вачам сваім веры не даю: недалёка дворнага млынка тырчыць угару агромністы фабрычны комін. Ого, думаю сабе, узрадаваўшыся, культура і ў наш кут наехала! Але прапала мая ўцеха, калі, бліжэй падышоўшы, пазнаў я, што гэта паравы тартак. Няхай яе кот брыкне, гэткую культуру! Бо ткі падумайце самі. Як пераезджая свацця, цягаецца гэткі франт са сваёй машынай з месца на месца, дзе лясы ды работнік таннейшы. Куды прыткнецца,— цана нібы то падскочыць крыху і на работніка, і на лес; але лес увакол сябе ўскорасці выпалашча дазвання, бо скуплівае нават такія бярвенцы, што на кроквы толькі згодны — не суцэльныя тры вяршкі ў водрубе; вось хто мае якое палена, дык і той, квапячыся на гатовы грош, прадае. Пройдзе колькі часу,— *культура* гэта павалочыцца ізноў далей пустошыць ваколіцы, а на яе месцы астануцца тырчэць толькі пянькі маладых, без пары пазразаных дрэў. І лесу няма, і пабразгачы, што за яго ўтаргавалі, разышліся, а каторы з сялян пры гэтай фаб-

рыцы і зарабіў лішняга рубля, дык пасля ўдвая прыйдзецца аддаць, бо не то што на будыніну, але і на дровы да цаны на лес і прыступіцца трудна будзе.

Ну, але годзе ўжо гэтай гутаркі: годзе гутаркі на сягоння, а цяганіны на сёлета. Вось бо ўзгорак, а там — у долі векавыя дубы, ліпы стаяць — мае дубы, мае ліпы! Сад відаць — мой сад! А ўжо пры самым лесе паміж розных дрэў выглядае дамок — мой дамок! Мой! Апісаць вам яго? Як жа я апішу, калі ён мой?! Бягу, ляту да яго!.. Бывайце здаровы!!

ДУМКІ З ПАДАРОЖЫ

Я скончыў свае «лісты з дарогі». Скончыў лісты, але не скончыў выказваць усіх тых думак, якія наляцелі на мяне ў вялікай маёй дарозе: не ў лістах ім было месца.

Вось цяпер паспрабую я выказаць сваё агульнае ўражанне.

Такіх цёмных куткоў, аб якіх не раз пішуць у газету нашы карэспандэнты, я не напаткаў. Народ паспеў: не такімі вачамі глядзіць ужо ён на свет, якімі глядзеў гадоў 10—15 таму назад. Праўда, з яго быццам закпілі, мігнуўшы перад вачамі блескам вясёлкі,— але як туман расплылася яна, а і без таго асцярожны беларус зрабіўся яшчэ больш непрыступным да сваёй душы, да сваіх думак... Адно зразумеў ён, што так жыць, як жыў дагэтуль — нельга; ён шукае новых дарог і гатоў пайсці па іх, але трэба не толькі паказаць, кудою выхад, але і разам — побач пратаптваць гэту новую дарогу, бо вера на словы страціла свой крэдыт...

Моладзь ірвецца да прасветы, але тыя рамкі, у якія ўціснута цяпер навука нашых школ, даюць столькі карысці, колькі можа мець яе галодны чалавек, калі яму вымазаць вусны салам. Ды і вучаць там, як ведама, не ў роднай беларускай мове, а ў расейскай, дык і тут такая самая пажыва, якую маюць дзеці, што вучацца ў гімназіях нямецкай ці французскай мовы, а не ўжываюць яе дома. Калі ж каторы трапіцца надта ўжо здатны хлопец, а падмогі з дому хватае, куды ж яму кінуцца далей? Прафесіянальных школ нехват, дый у нас за мяса і жылы больш плацяць, як за грамату, вось і ўсяго шчасця, калі, выбіўшыся на народнага вучыцеля, будзе гібець дзе ў цеснай хацінцы. Бывае яшчэ горш: прыходзіцца кідаць родную старонку і шукаць хлеба на чужыне. А гэта найбольшая страта, якая толькі можа быць для вёскі; бо гэткім парадкам вызбываюцца суседзі разумнейшых

з-паміж сябе людзей, каторыя мо патрапілі б кіраваць не толькі справамі грамадзянства, але і ўнеслі б не адзін прамень святлейшы ў сваю вёску.

Таксама не напаткаў я вёсак, у каторых гаспадары надта ўжо дрэнна вялі б сваю гаспадарку. Беларускі мужык дасканальна знае сваю зямлю і вырабляе яе так, як толькі можна вырабіць на шнуры, дзе і з бараной трудна завярнуцца. Калі ж і не можа мерацца сваімі ўраджаямі з фальваркамі ці дварамі, то гэта яшчэ не значыцца, што там культура зямлі вышэйшая (я не кажу, разумеецца, аб тых дварах, дзе гаспадараць на новы заграніччны лад), але дзеля таго, што па дварах засейваюць толькі лепшыя кавалкі зямлі, а пусцейшыя — аддаюць на адработак, у арэнду або запушчаюць пад лес. Мужыку ж выбіраць няма з чаго: скрабе ён ад мяжы да мяжы; хіба ўжо якую нетру толькі пакідае. І ўсё ж такі з сваёй цяжкай працы пры найлепшым ураджаі выжыць сямейнаму селяніну з сваёй гаспадаркі — без заработкаў са стараны — нельга, бо сам варштат яго працы цесны. Некаторыя дабрадзеі і апекуны нашы кажуць, што зямлі мужыку хіба хватае, калі і з гэтай, якую мае, не можа як належыць выкарыстаць. Але каб падняць даходнасць зямлі, трэба перакуліць варункі не толькі гаспадаркі, але варункі і самога жыцця нашага мужыка. А на гэта трэба працы і часу. Працы — пакуль мужык не стане добра свядомым; часу — пакуль мужык не стане свабодным.

412

Gau-de-a-a-a-mus i-gi-tur
Juvenes dum su-u-u-mus,
Gau-de-a-a-a-mus i-gi-tur
Juvenes dum su-u-u-mus,
Post jucund-a-am juventu-u-tem.*

. . . . . .

Грымеў гэты традыцыйны студэнцкі гімн, гімн — чаруючы сваёй пекнатой: чулася ў ім павага і весялосць; чулася — радасць і сумнасць. Ад гэтага вялікага акорду пекнаты, здавалася, дрыжыць усё — усё, апрача сцен: яны былі праз лад моцныя, праз лад тоўстыя — гэта былі сцены маскоўскай перасыльнай Бутырскай турмы. . .

. . . . . .

. . . . . .

188... год у Маскве нічога добрага для студэнтаў не прарочыў: адчуваўся неспакойны настрой. Шпікамі была запоўнена ўся Масква. Трэба было вялікай асцярогі, каб не нарвацца. Паміж сяброў Менскага зямлячаства (у тыя часы, разумеецца, забароненага) найлепшы нюх да шпікоў меў Івася. Як бы такі шпік ні маскаваўся, як бы ні падмазваўся — Івася заўсёды яго знюхае.

Толькі, бывала, прысядзеш на лаўцы на якім-колечы бульварыку, як тут жа побач з вамі прысаджваецца тып нігіліста: валасы — доўгія, акуляры — велізарныя, круглыя, цёмна-сінія, боты — стаптаныя, паліто — рыжае, ну, але Івасю не падшукаеш! Пацягне толькі носам, захрапе ім, як той вайсковы жарабец, пачуўшы бітву, і пачынае гудзець сваім басам:

— І вялікі ж чалавек быў гэты Пушкін! Ён сказаў: цвёрдыя знакі (ъ) саўсім падобны да шпіёнаў: як без тых, так і без другіх можна было б саўсім лёгка абысціся, а яны тым часам прывыклі ўсюды соўгацца...

Калі гэта прамова не памагала і шпік моцна сядзеў далей, Івася ўскакваў з лавы, адкідваў свой мікалаеўскі плашч на плечы, грамовым сваім басам гукаў на ўсю вуліцу:

— Звозчык! Звозчык!!

Цэлай кучай, цэлай хмарай надляталі звозчыкі, а Івася спакойным тонам дапытваў кожнага:

— Свабодны?

— Так точна, свабодны!

— І ты свабодны? — пытае другога.

— Так точна, свабодны!

— Дык вы ўсе свабодныя?

— Свабодны, ваша сіяцельства.

— Ну і малайцы ж вы,— грыміць дальш бас Івасі,— шчасліўцы — зайздрую я вашай свабодзе, я — дык ніколі яе не маю: заўсёды цягаюцца за мной гэтыя апекуны...— і тут жа, махануўшы рукой у бок шпіка, крута паварачваўся і сваімі велізарнымі крокамі часаў у старану.

А звозчыкі — рагаталі. Трэба ведаць, што маскоўскія звозчыкі — вельмі вострыя на язык самі — любяць, калі ім урэжуць штуку таксама вострую і смяхотную, і за гэта не гневаюцца.

Насовывалася і ў Маскве вясна, хоць яшчэ сакавік трымаўся моцна: удзень — плюшчэў, ноччу — трашчэў...

Памятаю, добра памятаю той момант, калі невялікая кучка бліжэйшых сабе сябрукоў сабралася ў цеснай каморачцы свайго «раённага» на нараду. Сядзім, гутарым, самавар гудзіць, калачамі закусваем; раптам убягае да нас пятровец,— так называлі тады студэнтаў Пятроўска-Разумоўскай Акадэміі.

— Я вам павінен сказаць вельмі непрыемную навіну,— пачаў пятровец...

— Да нас едзе рэвізор,— перапыніў адзін з нашых, паджартовываючы.

— Так — рэвізор,— казаў дальш пятровец,— і то не адзін рэвізор — іх соткі: нашу акадэмію ўсю акружылі жандары і арыштавалі ўсіх — усіх, апрача некалькіх, якія прыпадкам былі ў Маскве (Пятроўска-Разумоўская Акадэмія знаходзілася пару вёрст за горадам, і ўсе студэнты жылі там у агульных памяшканнях). Вам хіба трэба ведаць, каб прыняць адпаведныя крокі,— кончыў пятровец і як раптоўна ўскочыў, так і раптоўна выскачыў ад нас.

Як пярун на нашыя галовы звалілася гэтая вестка.

Што падгатоўка паміж студэнцтва да выступу з пэўнымі вымаганнямі ўступак ад тагачаснага ўрада ішла — гэта было вядома амаль не ўсім студэнтам, але яшчэ варажылі, каб цяпер — на вясну — перад самымі экзаменамі мо лепш не выступаць, а адлажыць к налеццю. А ў пятроўцаў з сваім начальствам выйшла спрэчка, студэнты пагарачыліся крыху, і... сталася.

Цяпер не пара ўжо было разважаць, а брацца за работу, за арганізацыю, за агітацыю паміж універсантамі. Але перад намі была яшчэ ўся ноч. Не спалі мы гэтую ноч...

Назаўтра паміж 12—2 на нашым факультэце ішла лекцыя фізікі. Старэнькі, худзенькі прафесар Сталетаў чытаў так ціха і так лаканічна, што на яго гадзінах прыходзілася вуха трымаць войстра, каб не прапусціць ні аднаго слова, і такая бывала ціхота, што чутно было, як неспадзеўкі заляцеўшая муха звініць. Але не тое сталася сягоння: пад час лекцыі ўвайшоў нейкі не малады ўжо, з доўгімі валасамі студэнт і, падышоўшы да першых лаваў, уткнуў некалькі запісак. Запіскі гэтыя паляцелі з рук у рукі. У іх пісалася: «Таварышы! сягонняшняй ночы ўсіх пятроўцаў арыштавалі! Вы дасканальна памятаеце, як пятроўцы хутка адклікаліся на ўсе патрэбы і выступленні нас — універсантаў. Цяпер чарод за намі. Усе, як

адзін, павінны мы выступіць на абарону нашых правоў і на абарону нашых таварышаў — пятроўцаў: або няхай асвабодзяць іх, або няхай і нас забіраюць! Дык на сходку! На сходку — у сад універсітэцкі!»

Прафесар не мог не прыкмеціць неспакойнага руху паміж студэнтаў, але лекцыі сваёй не спыняў, пакуль з верхніх лаваў, да каторых ужо дайшлі запіскі,— не адазваліся:

— Таварышы! Годзе яго слухаць — пара на сходку!

Аўдыторыя заварушылася — пачала гудзець. Сталетаў, паглядаючы на ўсіх, замоўк.

З верхніх радоў пачалі збягаць, зрабілася завіруха: адзін за другім сталі выбягаць за дзверы аўдыторыі. На калідорах таксама была вялікая суматоха. Адусюль чуўся адзін і той самы клік:

— На сходку! На сходку!

Праз двор беглі ўжо студэнты: адны — у сад на сход, другія... давалі драпака за вароты — на вуліцу.

У садзе універсітэцкім сабралася ладная кучка студэнтаў; знайшліся, разумеецца, аратары, каторыя зараз жа пачалі ўзбірацца на нейкія выпадкова там стаяўшыя скрынкі, на дрэвы нават, і адтуль ліліся прамовы. Паміж студэнцкіх бліскучых мундзіраў сталі ўвіхацца нейкія падазроныя тыпы штацкія, якія пільна слядзілі за прамоўцамі. А прамоўцы ставілі варункі ясныя: або выпушчайце пятроўцаў, або бярыце нас і садзіце разам з імі ў турму.

Паказаўся рэктар, але на яго ніхто і ўвагі не звяртаў: не толькі не слухалі яго прамовы, але нат свістаць пачалі. Гэта прымусіла пана рэктара як найхутчэй схавацца.

Прыйшоў тады інспектар Д..., каторага студэнты вельмі любілі і паважалі, і таксама пачаў прамову, але знаць было, што гэтыя словы гаварыў ён толькі «по долгу службы». Ясна адчувалася, што будзь гэты чалавек цяпер студэнтам, дык сядзеў бы таксама, як вунь той кас-

маты студэнт, на дрэве, трымаўся за галіну і крычаў бы, трасучы кулакамі.

Інспектара выслухалі — уважна, але моўчкі. Скончыўшы сваю прамову, ён неяк нязграбна махануў рукавом каля свайго вока...

Ці не было ў гэтым воку чаго непатрэбнага ды, крый божа, забароненага?.. Крута павярнуўся інспектар і пайшоў ва універсітэцкі гмах.

Прамовы не памаглі: студэнты цвёрда стаялі на сваім; відаць было, што зговару не спадзявацца.

Тады... тады скрыганулі жалезныя вароты, якія зачынялі універсітэцкія двор і сад ад Маховай вуліцы, і раптоўна ўляцела конная жандармерыя.

— Разайдзіцеся, гаспада,— крыкнуў начальнік атрада.

— Ні за што! — гуканулі студэнты.

— Так мы вас забяром,— прабаваў настрашыць начальнік.

— Бяры: даўно пара, каб цябе самога чорт забраў!— адказалі студэнты.

Пачалася кароткая каманда:

— На-а-а-хвост! Кру-у-гом — арш!..

Адзін момант — і ўсе студэнты былі акружаны; конь прытуляўся да каня так шчыльна, што, здавалася, паміж іх і муха не праціснецца. Гэты манеўр, не зважаючы на дрэвы ў гэтым месцы, зроблены быў так спрытна і складна, што некаторыя студэнты заляскалі ў далоні на «брава», чым выклікалі агульны смех паміж арыштаваных і вялікае здзіўленне жандараў.

Праўда, у гэты самы час здарыўся і саўсім іншага характару інцыдэнт: адзін з-паміж жандараў наляцеў праз лад ужо блізка на аднаго студэнта, а той — калі не зацюкае на жандара, як на ваўка: «ага — ціў-у яго! ага — ціў-у!» дый у дадатку яшчэ і плюнуў проста на яго. Жандар агледзеўся ўвокал, дастаў хустачку і, абцёршыся, саўсім спакойна адазваўся:

— Какой вы шутник.

Чаму не нагайка, а гэткі мядовы адказ спаткаў адважнага студэнта — прычыны трэба шукаць, разумеецца, не ў далікатнасці жандара, а ў тым настрою Масквы да студэнтаў наогул, які выказаўся тады ў апошні час.

Каб гэты настрой лепш зразумець, прыходзіцца крышку збочыць з гэтага апавядання.

Даўней, бадай, нідзе не было такога варожага настрою да студэнтаў, як у Маскве: дробнае купецтва, мяшчанства і асабліва маскоўскія мяснікі — інакш і не глядзелі на студэнтаў як на с і ц і л і с т а ў, якія ідуць і проці бога, і проці цара-бацюшкі,— а гэта лічылася найвялікшым праступкам. Амаль не за кожным разам, як толькі пачынаўся бунт студэнтаў,— на іх выпушчалі цэлыя банды хуліганаў-мяснікоў, і тыя з вялікай ахвотай і нат са смакам кідаліся — як азвярэлыя — з нажамі на моладзь, і пачыналася дзікая расправа...

Але ось — пад той час — студэнты ўрэзалі такіх пару штук, што і купецтва, і мяшчанства, і разнікі — толькі губу разявілі ды рукамі развялі і галовамі, як бараны, трэслі,— а ўцяміць нічога не маглі.

А справа была гэткая: студэнты даведаліся, што ў Сібіры [1] памёр сасланец — ідэал тагачаснай моладзі — аўтар «Что делать?» — Мікалай Чарнышэўскі. Трэба было выкарыстаць гэту смерць для дэманстрацыі. Студэнцкая дэлегацыя спярша звярнулася да свайго начальства, каб пазволілі адслужыць паніхіду ў сваёй універсітэцкай царкве. Як і трэба было спадзявацца,— начальства універсітэцкае на гэта не згадзілася. Тады тая самая дэлегацыя, а за ёю ўжо і цэлая хмара студэнтаў — пайшлі вуліцамі да дома генерал-губернатара з тым жа дамаганнем.

Генерал-губернатарам у Маскве тады быў князь Даў-

---

[1] Відавочная недакладнасць. М. Чарнышэўскі памёр ў Саратаве, ужо вярнуўшыся з ссылкі *(заўв. укладальніка)*.

гарукі — той самы, аб каторым пасля яго выезду з Масквы казалі: «Даўгі — засталіся, а рукі — паехалі...» Чалавек ён быў някепскі, але таксама не мог адважыцца даць пазваленне памаліцца за душу палітычнага ссыльнага.

Усё гэта было толькі вада на млын моладзі. Набожная Масква загудзела: бязбожнікі студэнты хочуць ісці ў царкву спраўляць паніхіду (па кім — добра не разбіраліся), а начальства не пушчае. Што за ліха?!

Але моладзь надумала выкарыстаць гэты выпадак да канца.

Таго ж вечару колькі студэнтаў, пераадзеўшыся ў цывільныя вопраткі, пайшлі ў маленькую царкву, якая, бадай, і цяпер яшчэ стаіць на рагу Пушкінскага бульвара, і закупілі на заўтрашні дзень паніхіду па «рабе божым — Мікалаю».

Старэнькі попік саўсім не разбіраўся ў палітыцы дый, пэўна ж, ніколі аб ніякім Міколе Чарнышэўскім і не чуў: урэшце, студэнты і не называлі прозвішча, а толькі імя нябожчыка,— дык на ўсё ахвотна згадзіўся.

Назаўтра зрання каля царквы круцілася толькі некалькі чалавек моладзі. Пачалася паніхіда. Ажно — адкуль тое бралася—калі стаў валіць сюды народ—цэлымі групамі, шарэнгамі і наўздзіў: універсанты, курсісткі, пятроўцы, акадэмікі і г. д.— адна моладзь. У царкве студэнцкі хор, нікога не пытаючы, падмяніў царкоўны хор. Бацюшка струхлеў, але паніхіду, бедны, правіў далей. Моладзь у царкве не тоўпілася і запрудзіла вуліцы і часць Пушкінскага бульвара. Стала збірацца і розная публіка.

Наляцелі жандары, паліцыя, але што ж было рабіць? Уся моладзь, скінуўшы шапкі, спакойна і паважна стаяла, быццам малілася. Разганяць ці арыштоўваць — вельмі рызыкоўная была штука: як гнаць з паніхіды? з царквы? а тут яшчэ нехта крыкнуў на паліцыю:

— Шапкі далоў! Далоў шапкі!

Прыйшлося і шапкі скінуць і — хоць мо зубамі скрыгаталі, але трэба было прастаяць ціха да канца паніхіды і таксама нібыта маліцца.

Надзея, што нешта ды будзе пасля паніхіды — таксама не збылася: моладзь спакойна, у парадку разышлася, і прычапіцца да чаго-колечы нельга было.

Шмат гутаркі было аб гэтай паніхідзе, пакуль забыліся, супакоіліся. Ажно тут новы выпадак, яшчэ паважнейшага складу, саўсім ужо збіў з тоўку ворагаў студэнтаў.

18-га лютага 188... г. некалькі цывільных, добра адзетых чалавек, зайшлі ў найвялікшую ў Маскве царкву — Хрыста Спасіцеля і закупілі, багата заплаціўшы, паніхіду на заўтрашні дзень за супакой душы «раба божага— Аляксандра»...

Калі ж на другі дзень пачалі з усіх бакоў вялікай Масквы паказвацца гурткі моладзі і кіравацца ў адным напрамку — да царквы Хрыста Спасіцеля,— паліцыя і жандары знюхалі, што тут ёсць нейкі падвох, і кінуліся да царквы. Там ішла паніхіда, і ўжо крыху сабралася народу. Царкву зачынілі і паставілі варту, каб нікога туды не пушчаць.

Прыпазніўшаяся моладзь таўклася групамі на царкоўным пляцы і гутарыла з публікай.

— Што тут такое? — дапытваліся маскоўцы.

— А што ж,— адказвалі студэнты,— сягоння 19 лютага — дзень асвабаджэння сялянаў, ось мы і хацелі адправіць паніхіду па цару асвабадзіцелю, а бачыце — нам не пазваляюць.

Жыхары былі абураны страшэнна: як так? Бязбожнікі-студэнты хочуць маліцца за цара, а ім не пазваляюць!

І ось з таго часу адносіны да студэнтаў саўсім змяніліся як маскоўскага купецтва, так і мяшчанства, а нат разнікоў: замест нянавісці з'явілася нейкая спагаднасць. А зважаючы на агульны настрой маскоўскіх жыхароў,

прыходзілася і паліцыі, і жандарам стрымоўвацца з сваімі звярынымі імпэтамі.

Цяпер, выказаўшы некаторыя прычыны «новага курсу» да бунтаў студэнтаў, перайдзем далей да нашага загаловачнага апавядання.

Акружоныя жандарамі студэнты яшчэ самі добра не ведалі, якая доля чакае іх.

Але ось вароты, якія ўслед за ўехаўшымі жандарамі былі зноў зачынены, яшчэ раз скрыганулі, абруч конніцы быццам рашчапіўся з аднаго боку, і... працэсія наша роўным, спакойным крокам скранулася.

Выйшаўшы на Маховую, відаць было, што тут усё ўжо ў парадку: сама вуліца была саўсім вольная ад публікі і толькі на хадніках *, адціснутыя і адгароджаныя паліцыяй, стаялі цэлыя натоўпы народу, паміж каторага дзенідзе блішчэлі студэнцкія мундзіры.

Прысутнасць студэнтаў паміж публікі, якая ў большасці сваёй углядалася на ўсё, як на нейкае прадстаўленне, страшэнна ўзбурыла арыштаваных; пачуліся паміж іх воклікі:

— Бывайце здаровы, таварышы!

— Чаго стаіцё, разявіўшы ляпы? Спяшайцеся: абед у цёткі астыне!

— Спаць, на пярынку спаць, падлізы!

Публіка, чуючы гэткія кпіны, стала варожа спаглядаць на сваіх суседзяў-студэнтаў і таксама паджартоўвала з іх.

Адшчапенцам-студэнтам, відаць, не ўсмак было іх становішча: некаторыя сталі праціскацца паміж публікі, каб сысці з вочаў, але знайшліся і такія, што рынуліся наперад, распіхалі паліцыю, жандараў і з воклікам: «З вамі хоць у Сібір!» — далучыліся да арыштаваных. Такіх спатыкалі воплескамі, ціснулі ім рукі...

Разам сперша змяшаная грамада арыштаваных, ідучы ўжо вуліцамі, стала разбівацца на невялічкія гурткі: зыходзіліся бліжэй знаёмыя, землякі.

Сумна было нам — невялічкаму гуртку Менскага зямлячаства, што не бачылі мы паміж сябе Івасі. Ці ж бы і ён запісаўся ў адшчапенцы? Ці ж бы і ён быў здраднікам? Не: гэтага быць не магло — хіба мо бяда якая з ім сталася...

А тым часам можна было ўжо спазнаць па тых шарэнгах паліцыі, куды былі яны скіраваны, стоячы абапал вуліцы, што для нас пакуль што прызначаны на памяшканне «манеж».

Манеж — гэта старадаўні вялізарны гмах, якім ганарылася Масква. Па сваёй велічы — удоўжкі і ўшыркі, па спосабу сваёй будовы (не было ўсярэдзіне ні адной падпоры, ніводнага слупа) — гэтая аграмадзіна-будыніна не мела роўнай сабе не толькі ў Маскве, але, бадай, ва ўсёй Расеі. Тут вучыліся ездзіць на веласіпедах, аб'язджалі коней, тут адбываліся розныя гульні, выстаўкі і інш.

Дзеля прыкладу ўспомню адну такую выстаўку — лясную. На выстаўцы гэтай былі размешчаны ў манежы цэлыя групы кветак, кустоў, дрэў; былі — альтанкі-бяседкі, прысады, шырокія дарогі, вузенькія сцежкі, скрозь абсаджаныя прыгожымі дрэўцамі, былі асобныя аддзелы розных сартоў дрэў, пачынаючы ад сасновых каранжакоў Архангельскай губ. і канчаючы сартамі паўднёвых губерняў. На той выстаўцы проста можна было заблудзіцца.

Манеж быў саўсім блізка ад універсітэта, і мы ўжо падыходзілі да яго, калі пачулі голаснае:

— Стой!

Агледзеліся мы, агледзеліся нашы правадыры і нат сапраўды крыху стрымаліся.

— ...калі кажу — прапусціце, дык прапусціце, бо, як сам пачну прабірацца — горш будзе,— грымеў на ўсю вуліцу бас нашага Івасі,— і, распіхаючы кулакамі варту, кіраваўся да нас.

Я забыўся пахваліцца, што, апрача паліцыі і жанда-

раў, ззаду нас была конная сотка казакоў, а па баках вуліцы шарэнгамі стаялі пяхотныя жаўнеры. Ім быў прыказ нікога не прапушчаць, але Івася — у сваёй мікалаеўскай з бабровым каўняром накідцы — такі меў грозны від, з такой пэўнасцяй пёрся наперад, што варта і не агледзелася, як той працінуўся паміж іх і ўскочыў у гушчу студэнтаў.

— Што ж вы, аспіды гэткія, мяне не пачакалі,— гукануў зноў басам Івася і такім сур'ёзным тонам, быццам і сапраўды гэта ад нас залежала.

Громкія воплескі і шчыра-вясёлы рогат спаткалі новага сябрука нашай долі.

— Ой, браткі мае, чуць не спазніўся, ажно пена з мяне пайшла,— жаліўся, выціраючы рот, Івася,— зайшоў я да знаёмых, там даведаліся, што мяне чакае, і пачалася, разумеецца, цэлая драма: уздыхалі, слязіну пушчалі, ну але прытым так смачна кармілі, што грэх было пакідаць — на тры дні авансам нагрузіўся — цяпер хоць на Камчатку! — закончыў Івася.

Пакуль што не Камчатка, праўда, а манеж маскоўскі ўжо нас чакаў: дзверы былі расчынены насцеж, каля іх стаяла варта, як толькі мы туды ўвайшлі, то яшчэ і там нас няведама дзеля чаго акружылі гарадавыя з сваім начальнікам.

Увесь манеж быў амаль што не пусты, бо толькі ў адным канцы яго былі нейкія падмосткі — ці то для тэатра, ці для канцэрта якога, а перад падмосткамі гэтымі паскладаны адна на адну даўгія лавы. Не было чаго чакаць: трэба было разгасціцца ў новай хаце: у адзін момант лавы парасстаўлялі, частку іх усцягнулі на падмосткі і, дзе хто папаў і як папаў — прыладзіліся.

Некалькі сотак чалавек, калі было ў невялікім садзе універсітэцкім ці нават на вузкаватай вуліцы — выглядала на добрую грамаду людзей, але тут — у гэтай велізарнай і пустой гамерні — мы самі сабе выдаліся саўсім маленькай жменькай.

Але разважаць над гэтым цяпер не было калі: гутарка, нарады ішлі само сабою, дый падыходзіла ўжо пад вечар, і прыходзілася падумаць, чым-колечы падмацавацца.

Большасць арыштаваных, выходзячы з дому, ведала ўжо, што сягоння ім не вярнуцца, дык выбіраліся з запасамі, а ў каго не было — зрабілі складчыну і звярнуліся да гарадавых уладзіць гэту справу. Тыя — мо дзеля таго, што самі былі галодныя, дык спачувалі і другім, мо пагаліліся на «чаявыя» (гасцінец), але падрадзіліся даставіць. Гэта была першая зачэпка да знаёмства з нашымі апекунамі. Пасля расталкавалі і ўгаварылі іх, што пільнаваць нас тут — у манежы — няма ніякай патрэбы: куды ж мы з зачыненай будыніны маглі б дзецца? Гэта, відаць, іх пераканала, а больш, бадай, дзеля таго, што, стоячы, ногі памлелі,— пашаптаўшыся паміж сабой, паліцэйскія адышлі набок — пад сцяну — і таксама рыхтаваліся пасілкавацца, ласа спаглядаючы на бачоначак, які на падвячорак для іх прыкацілі з кіслымі агуркамі.

Але сталася нешта саўсім неспадзяванае.

Студэнты, як толькі паліцэйскія адышлі на старану, параспаўзаліся, як тыя ракі, па ўсёй будыніне. Трэба ж было, як на тое ліха, набрылі яны недзе ў кутку ажно другога канца манежа на паскладаныя велісапеды. Доўга не думаючы, паўскаківалі на гэтыя машынкі — ды наўзавадкі!

Угледзелі паліцэйскія: вочы вылупілі, рукі растапырылі... Што рабіць? Як па закону??

Злажылі быццам спешную нараду: шэпчуцца, рукамі махаюць, галовамі трасуць, нагамі прытоптваюць,— не так лёгка, відаць, было што-колечы прыдумаць у неспадзяваным выпадку, аб якім у інструкцыях саўсім не ўспаміналася.

Але ось, знаць, нарада скончылася: выпрасталіся, паясы тужэй падцягнулі, адкашляліся і — з оклікам: «не

палагаецца!» — сперша трушком, а пасля наўзавадкі сыпанулі даганяць велісапедыстаў.

Трудна было б нат выдумаць больш што камічнае, як гэта сцэнка, якой мы былі сведкамі: абшар быў велізарны, дык разгону хапала, студэнты — хлопцы спрытныя — як маланкай праляталі яны паміж напаснікаў *, а тыя — гналіся ўдагонкі, кідаліся ва ўсе бакі, круціліся ў лукаткі, пёрлі наўскось, не раз носам каторы грымнуўся, але, усхапіўшыся, зноў дальш часаў.

А тут яшчэ арыштаваныя, якія прыглядаліся да гэтай камедыі,— давай пад'юджваць: «лаві! дзяржы! улева! управа! узад! не туды! уперад! лаві, лаві, лаві!», і вясёлы рогат рэхам адбіваўся ад пустых сцен манежа...

З паўгадзіны, бадай, цягнулася гэтая аблава, пакуль урэшце паліцэйскія, хоць пара з іх пайшла, не перамаглі: адабраўшы велісапеды, вярнуліся яны з гонарам на сваё старое месца.

Але ткі праўду кажуць: бяда ніколі не ходзіць адна. Толькі адсапануліся паліцэйскія і, нарэзаўшы тоўстыя лусты хлеба, збіраліся перагнаць смагу — закусіць агурочкамі,-- як тут новая бяда, новае «непредвиденное обстоятельство»: у бочцы каб хоць адзін агурок!

Што за ліха? Зноў растапырылі рукі, зноў вылупілі вочы і — ажно разінуліся, угледзеўшы ў руках спакойна падвячоркаваўшых студэнтаў ужо толькі хвосцікі зялёных агурочкаў.

Зноў што рабіць? Зноў: як па закону? Зноў: нарада...

Але на гэты раз нарада скончылася хутка і неспадзеўкі — гладка. Паліцэйскія — усе як адзін — дайшлі сваім уласным розумам, што агурок не велісапед: яго не дагоніш, яго — калі з'едзены — не адбярэш, дык хоць і быў жаль, мо не так у сэрцы, як у жываце, махнулі на ўсё рукой і разам са студэнтамі — шчыра — ці не — рагаталі з новай прыгоды.

Вечарэла.

Шэрая гадзіна заўсёды наганяе нейкую сумоту на душу чалавека.

Гэты настрой адбіўся і на ўсёй грамадзе арыштаваных: змоўклі жарты, прыціх смех. Жменька студэнтаў забралася на падмосткі і разляглася нейкай фантастычна-красачнай групай; іншыя парасцягваліся на лавах, то пазбіваліся ў маленькія гурткі, сціха паміж сабою гутарачы. Саўсім на старане — здалёк, таксама прыціхшая, кампанія нашых апекуноў-паліцэйскіх. . . . . .

. . . . . .

Наша ж-и-и-изнь коротка-а-а
Все уно-о-о-сит с собо-о-ю;
Наша ю-ю-но-о-сть, друзья-я-я,
Пронесе-е-ется стрело-о-ю.

Срабрыстым тэнарам нехта адазваўся з доўгіх лаваў.

Проведем-те ж, друзья-я-я,
Эту но-о-о-чь веселе-е-ей:
Пусть студентов семья-я-я
Собере-е-тся тесне-е-ей!

Дружна падхапіў велізарны хор.

Не люби-и-ить — погуби-и-ть
Значит жи-и-знь молоду-у-ю.

. . . . . .

Зноў звінеў той самы тэнар, а пасля зноў адказ — грымеў хор.

Настрой быў мінорны. Што ж будзе з намі далей?

Час ад часу ўскаквалі, паказваліся нейкія чыны жандармерыі, але на ўсякія нашыя пытанні заўсёды быў адзін адказ: «Не могу знать». Ці мог, ці не мог ён знаць — ліха яго бяры, але гэта няпэўнасць наганяла на нас нейкую нуду. Адно, што цікавіла нас — гэта прысыланыя гасцінцы. Адкуль і хто іх прысылаў — нам не ка-

залі, але неспадзеўкі з'яўляўся нейкі чын і са словамі «приказано передать» клаў на лаву пачкі каўбасаў, сыраў, булак і скрыначкі папяросаў.

«Ага,— думалася нам,— значыцца мы не адны: нехта памятае аб нас, спагадае; заварушылася Масква». А гэта толькі і трэба было нам.

Цяпер мы ўжо добра разумелі, што ані пузатае купецтва, ані хуліганы-разнікі больш не пойдуць на нас.

Добра ўжо сцямнела, калі бліснула электрычства, а разам з тым і сумны настрой пырснуў: зрабілася неяк весялей у манежы; гутарка і песні не змаўкалі. Так цягнуўся час да гадзіны дзесятай вечара. Ажно ўрэшце паказаўся нейкі старшы чын і салодка-мяккім голасам адазваўся:

— Вас будуць адгэтуль выводзіць партыямі па чалавек 30—40; куды? Хіба самі добра разумееце, што мне аб гэтым гаварыць не прыходзіцца. Але ў вашым інтарэсе, каб аддзелы гэтыя складаліся з бліжэй сабе знаёмых людзей, і я даю вам права гуртавацца самім. Для гэтага маеце яшчэ часу: першая партыя выйдзе за гадзіну.

Выслухаўшы гэткую прамову, мы зараз жа злажылі нараду, на каторай прыйшлі да праканання, што хоць і дрэнна, што нас разбіваюць на такія маленькія гурткі, але працівіцца бескарысна.

Грамада загудзела. «Твярскія — сюды! Смаленскія — да нас! Каўказ — гой!» — громка адзываліся галасы.

Самымі моцнымі, багатымі і найлепш арганізаванымі былі ў тыя часы — твярскія, смаленскія і каўказскія зямлячства.

Нас — менчукоў — была жменька невялікая, дык прыйшлося лучыцца з правінцыямі, прымерам — са случакамі і інш.

Гэткім чынам уся грамада арыштаваных раздзялілася на дзесяць партый, і нат устанавілі чарод, хто за кім мае ісці.

Роўна праз гадзіну, як казаў той чын, паказаўся ат-

рад паліцэйскіх і па камандзе акружыў першую партыю; маніліся ўжо скрануцца, але паміж студэнтаў адазваліся галасы:

— Стойце, пачакайце — дайце развітацца — мо больш не прыйдзецца спаткацца.

Прашкоды ў гэтым паліцэйскія не рабілі, нат крыху адступіліся на старану.

Сумнае гэта было развітанне: моцна ціснулі адны другім рукі, іншыя зноў — шчыра цалаваліся, а калі ўрэшце скранулася акружаная стражай першая партыя, інстынктыўна неяк усе як адзін гуканулі сваё дарагое: «Gaudeamus».

Партыю павялі не праз бліжэйшыя дзверы, а праз увесь манеж — у дзверы другога канца.

Калі ўжо гэтая малая грамадка шчазала ў шырокіх дзвярах, з усіх старон чутно было: «Бывайце здаровы! Бывайце здаровы, таварышы!» — а шапкі ляцелі высока ўгару.

Гэткім парадкам і з тымі ж самымі цырымоніямі за кожным разам правадзілі партыю за партыяй. Бралі іх не ўслед адну за другой, а пачаканкамі — праз кожную паўгадзіну.

Нашая грамадка стаяла на прадапошнім месцы, але калі надышоў наш чарод,— раптам выйшла новае распараджэнне: апошнюю, якая стаяла за намі, партыю павярнулі назад і павялі праз бліжэйшыя дзверы, а мы гэткім спосабам апынуліся ўжо толькі самі адны.

Што каму-колечы ды трэба быць апошнім — саўсім зразумела, але як-ніяк гэта рабіла на нас цяжкае ўражанне, і тая паўгадзіна, якую нам прыходзілася чакаць,— выдалася нам бесканечна доўгай. Ну, але прыждалі: вывелі і нас.

Не было, праўда, з кім нам ужо развітвацца, не было каму нам песні спеці, не было каму слоўца дарагога кінуць на дарогу... Але ж мы самі сабе прапяялі, самі сабе гуканулі «ўра!» і рыхтаваліся ўжо ісці праз бліжэйшыя

дзверы, але нас завярнулі, павялі праз увесь манеж і вывелі праз другія — дальшыя дзверы.

Мы толькі пасля даведаліся, якія былі прычыны, што адных выводзілі праз адны, другіх — праз другія дзверы.

Пры бліжэйшых дзвярах сабралася, не зважаючы на позні час, шмат публікі, якая вельмі прыхільна спатыкала і праводзіла кожную партыю студэнтаў.

Гэта не былі тыя студэнты, якія ўжо сядзелі ў манежы, але саўсім новыя групы, каторыя нейкім таемным спосабам гуртаваліся і праходзілі пад манеж, дамагаючыся, каб і іх забралі, каб і іх упусцілі ў гэту будыніну дзяліць разам долю таварышаў. Але іх не толькі не забіралі, а разганялі, каб не было вялікага ліку арыштаваных.

Як толькі публіка даведалася, што з манежа студэнтаў выводзяць праз другія дзверы, яна шуганула туды, а паліцыя кінулася на хітрыкі і вывела адну партыю праз бліжэйшыя дзверы. Публіка зноў сыпанула назад; тады нас — апошнюю групу — і вывелі праз далейшы ход.

Як толькі высунуліся мы за дзверы, зараз жа — апрача паліцыі — акружылі нас яшчэ і конныя жандары.

Ісці было вельмі дрэнна, бо вялі нас сярэдзінай дый такімі глухімі вулічкамі-закавулачкамі, дзе веснавое балота даходзіла да костачак. Пасля яркага электрычнага святла цемра, у якой мы апынуліся, выдалася нам яшчэ гусцейшай, і прыходзілася ўжо, не зважаючы ні на што, хлёпаць па змешаным з балотам снегу.

Куды нас вялі?

Масква — настолькі горад велізарны, настолькі раскінуты і блытаны, што спанатрыць што-колечы па тым кірунку, у якім нас вялі, было немагчыма.

Вядуць? Ну і добра: няхай вядуць! Куды! Не ўсё роўна — куды...

На гэта ж мы ішлі, гэтага жадалі, дабіваліся. Правоў

сваіх даходзілі, крыўды сваёй шукалі, таварышаў сваіх — пятроўцаў — з няволі выручаць хацелі.

Што залежала ад нас — зрабілі ўсё, што маглі, дык чаго бедаваць? чаго журыцца? Хлёпай па балоце — некуды захлёпаеш...

Крыху з нуды, а больш з агітацыйнымі замерамі пачалі мы знаёмства заводзіць са сваімі апекунамі-паліцэйскімі. Зачапіў і я свайго суседа — гарадавога. І вось — на табе: новы зямляк знайшоўся: з Менскай губерніі і павета Менскага — трапіў ажно сюды! Разгаварыліся; і, разумеецца, разгаварыліся крыху шчырэй, чымся гэта выпадала арыштаванаму са сваім дачэсным начальствам.

Гутарылі мы паміж сабой ціханька, чуць не шэптам, аглядаючыся на бакі, каб нас не падслухалі іншыя гарадавыя, а тым больш — жандары.

Ад новага свайго знаёмага даведаўся я, што нас вядуць у Бутыркі. Куды дзелі іншыя партыі — ён не ведаў, і — па той шчырасці, з якою мне ён прызнаваўся, можна было даць веры, што і сапраўды ён больш нічога не ведае. Усё было роблена шыта-крыта.

Але ж што найбольш мяне здзівіла, калі гэты самы гарадавы адазваўся:

— Эх, барын, барын! Каб я ведаў, што мне прыйдзецца весці свайго земляка ў Бутыркі — галавой бы лепш налажыў! Не смачнае там жыццё; а мы чулі, што ідзяце вы за праўду; шкада нам вас!

Нам жа ўсім так ужо дакучыла мясіць гэтае балота, што хацелася як найхутчэй дабрацца хоць якога-колечы прыпынішча. А тут здарылася яшчэ новая прыгода.

Міналі мы нейкі цёмны, крывы завулачак, як нехта з цемры п'янаватым голасам крыкнуў:

— Стой! Хто ідзе? Стой!

— Студэнтаў арыштаваных вядуць,— адазваліся галасы з нашай грамадкі.

— Студэнтаў арыштаваных? — здзіўленым голасам

зноў крыкнуў нязнаны.— Стойце ж, і я з вамі пайду — і я студэнт.

Чутна была шлепаніна па балоце няпэўных крокаў, і ўрэшце, хістаючыся на бакі, далучыўся да нас рослы студэнт.

Ані паліцэйскія, ані жандары ніякай прашкоды яму не рабілі. Не ўсё роўна: адным болей — адным меней. Але гэты, моцна падпілы, сам зараз жа стаў прыставаць да жандараў.

— Чэрці вы лазатыя!— крычаў новы наш сябрук,— арыштоўваць-то вы дасужыя, а вясці не ўмееце: гэта ж тут пекла, а не вуліца! Стойце: дайце закурыць! Кажу — стойце: курыць хачу.

Жандарскі афіцэр, які ехаў наперадзе крокам, стрымаў каня, і, разумеецца, стрымаліся ўсе. Пачаліся жарты, смех, сталі частавацца папяросамі, а наш новы сябра ўсё прыставаў да паліцэйскіх і жандараў, каб і тыя курылі. І калі праз некалькі мінутаў наша грамадка скранулася ў дальшую дарогу, то неяк ішла весялей, шпарчэй і ахвотней; ахвотней мо дзеля таго, што, як казалі нам нашыя праважатыя — хутка прыйдзем ужо на месца.

І праўда, не зважаючы на цемру — перад намі вырысоўваліся ўжо велізарныя, грозна-сумныя муры Бутыркаў. Там, відаць, чакалі нас, бо — як толькі падышлі мы бліжэй — замігацелі, забегалі ліхтаркі, вароты сціха расчыніліся, і нас увялі спярша на двор, а пасля павялі нейкімі таемнымі ходамі, пакуль урэшце не трапілі мы ў велізарны, слаба асвечаны пакой. За доўгім сталом сядзела нейкае начальства.

— Пазвольце запісаць вашыя прозвішчы і адрасы,— адазвалася да нас начальства, і, убачыўшы, што ніхто з нас не мае да гэтага ахвоты, начальнік зноў загаварыў:

— Вашыя таварышы ўсе запісаліся, дык і вам нічога іншага не застаецца, як споўніць гэтую фармальнасць,— і пры гэтым ён падсунуў нам паперу, на якой і

сапраўды быў спісак нашых арыштаваных таварышаў.

Спірацца, само сабой, не было чаго. Як толькі кончылася гэтая цырымонія, начальнік зноў звярнуўся да нас:

— Цяпер будзьце ласкавы аддаць усе, якія хто мае пры сабе, вострыя рэчы: нажы, ножыкі, пінцэты і інш. падобныя. Вобыску рабіць не буду — веру на ваш гонар. Аддавайце смела, нічога не прападзе, і вам пасля вернуць вашыя рэчы. Вашыя таварышы таксама дабравольна споўнілі гэта.

Такая далікатнасць жандара нас вельмі здзівіла, а разам з тым зрабіла добрае ўражанне. Мы споўнілі яго жаданне.

Цяпер далі нам новых правадыроў, і зноў прыйшлося ісці цёмнымі калідорамі, крутымі ўсходамі. Чым вышэй падымаліся ўгару, тым чутней далятаў да нас аднекуль вялікі гоман галасоў. А як толькі ўвайшлі мы на трэці паверх, перад намі расчыніліся дзверы. Не ўспелі мы яшчэ іх пераступіць, як дружнае, громкае «ўра! ура! ура!» — спаткала нас.

Тут былі ўсе нашыя таварышы з манежа. Не маглі мы нацешыцца, што нашая сямёрка зноў злучылася разам, дык гуканулі сваё дарагое:

Gau-de-a-a-a-mus i-gi-tur
Juwenes dum su-u-u-mus.

Пяялі, як хто мог і як хто ўмеў, але пяялі ўсе, а ўсіх было 412.

БУТЫРКІ

Бутыркі!!

Колькі ж светлых, чыстых, ідэйных душ згінула ў тваіх — Бутыркі — праклятых, грозных мурах!! Колькі?? Ці ёсць змога падлічыць?? Не. Ды навошта лічыць?!

Петрапаўлаўка — у Пецярбурзе, Бутыркі — у Маскве — ось тыя два сіты, праз каторыя прасейвалася ўся

інтэлігенцыя быўшых падданых быўшага Расейскага гасударства.

Бутыркі!!

Бутыркі,— а сапраўдная назова: «Цэнтральная перасыльная Бутырская турма» — гэта была быццам дачасная дамавіна. Калі і выпушчалі адтуль на волю, дык вока паліцэйскага, жандара ці шпіка мела вас у сваёй апецы.

Але саўсім, бадай, неспадзеўкі здарылася тагачасная авантура.

Ось — узбунтаваліся пятроўцы. Іх захапілі амаль не ўсіх. На другі ж дзень загарэлася ва універсітэце. Моладзь — не то што дабравольна, але проста гвалтам — дабівалася арышту, дабівалася турмы.

Першая партыя арыштаваных універсантаў — гэта быў толькі пачатак. І калі гэту партыю загналі ў манеж,— то, як мы пасля даведаліся,— прыходзілі цэлымі групамі студэнты, дабіваючыся, каб і іх арыштавалі. Але такога «прыказу» не было, і іх толькі разганялі.

Але якое ж жыццё было ў нас — тых 412-ці, якіх загналі ў Бутыркі.

Памяшканне — калі гэта можна назваць памяшканнем — далі нам на трэцім паверху турмы. Гэта былі два велізарныя калідоры, пад простым кантам, пры якіх было дваццаць восем камераў. Камеры — гэта адны меншыя, другія большыя — пакойчыкі, і там нас, трэба пахваліцца, не запіралі, але далі поўную волю: куды каторы хочаш.

Мы — менчукі,— з кампаніяй, якая далучылася да нас, заарандавалі апошнюю — 28 камеру.

Што ў такіх камерах было? Голыя драўляныя нары — і толькі. Праўда — яшчэ было нешта: тысячы, а мо мільёны, выбачайце, плюскваў *.

Ну, але трэба было неяк жа даваць сабе рады. Першую ноч ніхто і не думаў укладацца спаць, ішла гутарка, ішлі нарады. Варты ніякай пры нас не было, дык

гаварыць можна было смела і свабодна аб чым хочаш, і дзеля гэтага мы не агледзеліся, як шпарка мінула тая першая ночка.

Адно толькі што нас трывожыла — гэта лязганне па каменных усходах. Куды і па што ганялі гэтых няшчасных кандальшчыкаў — мы толькі даведаліся пасля: неспадзявана вялікі лік нас — новаарыштаваных — прымусіў турэмнае начальства гусцей сціснуць даўнейшых сваіх нявольнікаў, і ось, калі ярчэй звінелі гэтыя кандалы, на нас веяла не толькі сумнота, але нейкі жаль, трывога, гро̀за, і нашыя маладыя галасы прыціхалі...

Прыждалі ўрэшце раніцы. Цяпер можна было ўжо лепш разгледзіцца, куды нас засадзілі.

Бутырская турма — чатырохкантовы гмах; моцна закратаваныя вокны з усіх камораў выходзяць усе на невялічкі панадворак, пасярод якога стаіць маленькая царква. Праз некаторыя вокны з калідора можна ўбачыць круглыя высокія вежы, у каторых трымаюць так званых «адзіночных». Ось і ўсё; вуліцы, а значыцца, і вольных людзей не ўбачыш.

На нашым калідоры, амаль не проці 28-й камеры — была зроблена загародка, за ёй — умураваны велізарны кацёл, у каторым чуць не праз увесь дзень была гатаваная вада, з якой можна было рабіць сабе гарбату.

Нам — як «прывілегераваным» — палагалася ў суткі па дзесяць капеек на душу, але ж, пэўна, гэтых грошай хапіць не магло, тым больш што ішлі яны праз некалькі рук; з гэтых крохаў жывілася і турэмная кантора, жывілася і кухня, дык яда была надта дрэнная. Але арыштаваныя — усе як адзін — высыпалі свае запасы кішанёвыя ў адну кучу, а што знайшліся, разумеецца, і хлопцы багацейшыя, дык сума злажылася ладная. Цэлымі скруткамі закупілі гарбаты, цукру, каўбасаў, сыроў, хлеба, булак і іншай дробязі. Кубачкі да гарбаты, міскі і лыжкі драўляныя выдалі нам казённыя, нож даваў-

ся толькі адзін на ўсіх, і то выбарнаму з-паміж нас старшыні. Аб відэльцах, само сабой, і ўспаміну не было.

Але на яду самую мала хто і звяртаў увагі. І як ні дзіўна пакажацца, а мы, седзячы ў турэмных камерах, карысталі, нат цешыліся з волі і свабоды. Бо ці ж у тыя часы пазволілі б сабрацца некалькі соткам студэнтаў? Праўда — нас зачынілі, але ж пры нас ніхто не стаяў, ніхто не падслухоўваў.

У камерах была духота; прыйшлося паадчыняць вокны. Разам са свяжэйшым ветрыкам даляцела да нас добра знаная песня:

Быстры, как во-о-олны,
Дни нашей жи-и-изни...

Скуль тут гэтая песня? Кінуліся да закратаваных вокнаў. Дзе перш не ўдалося адчыніць акна, там цяпер зазвінелі шыбы... А песня — дарагая наша песня — плыла...

Мы праз краты працінулі універсітэцкі мундзір і завесілі яго на акне. Праз момант з другой стараны — толькі паверхам вышэй, заблішчэў таксама вывешаны праз акно мундзір студэнтаў Пятроўска-Разумоўскай Акадэміі.

— Ура! Ура!! — гуканулі мы ўсе.

— Ура! Ура!! — у адказ пачулі мы ад пятроўцаў, і громкія воплескі пасыпаліся з абедзвюх старон.

Гэта былі шчырыя прывітанні тых, якія ішлі ў турму за адну і тую самую справу.

Але гэтымі воклікамі, гэтымі песнямі зацікавіліся, відаць, і ўсе, якіх доля загнала ў гэтыя муры.

Не мінула і пару гадзін, як паказаліся ў нашых вокнах нітачкі з запіскамі. Пісалі да нас чужыя людзі — і па сваіх поглядах і па сваіх мэтах — гэта былі звычайныя праступнікі. Палітычныя сядзелі ў вежах, і з імі завязаць зносіны было не так лёгка.

Але затое з нашымі таварышамі — пятроўцамі — перапіска ў нас да паўдня наладзілася саўсім акуратна.

Як лоўка і хутка пераляталі запіскі з аднаго на другі канец Бутыркаў — трэба было толькі дзівіцца. З таварышамі — пятроўцамі — мы, разумеецца, перапісваліся ў сваіх справах: хто арыштаваны, якія планы на будучыню, чаго цвёрда трымацца, а ад чаго можна і ўступіць і інш.

Ад праступнікаў атрымоўвалі мы найбольш аднолькавыя лісты: спярша ішла падзяка, пасля — павіншаванне, што не ўзбаяліся мы турмы, урэшце нараканні на несправядлівы, прадажны суд, а на астатак просьба прыслаць крыху грошай.

Спярша мы, праўда, пасылалі — колькі маглі, але ўскорасці так густа сталі сыпацца такія ж самыя пісулькі, што здаволіць іх не было ніякай змогі.

Былі і другога зместу лісты: нам прапанавалі ўзбунтавацца дый сваю помач, каб разбіць турму. На гэта згадзіцца, само сабой, мы не маглі, бо добра разумелі, што толькі пальецца лішняя кроў, будуць лішнія афяры.

Была агульная пастанова цярпліва чакаць далейшых выпадкаў.

А выпадкі гэтыя пачаліся з першага дня.

Наш сябрук, які далучыўся па дарозе ўночы п'яненькім, цяпер ачухаўся і стаў бунтаваць.

— Не хачу,— крычыць ён,— сядзець у турме, у пекле гэтым! Я на сходзе не быў — мяне забралі з вуліцы! Не мелі права!

Мелі ці не мелі права — аб гэтым смешна было і спірацца: ці ж у тыя часы для жандараў было права? Ды гэты хлопец сам жа гвалтам ускочыў да нас. Дык аб чым было гаварыць?

Але справа не ў тым. Нам самім такі сябра быў не на руку. Калі ён інакшых поглядаў, дык пашто яму быць паміж нас? Тым больш што яго асабіста ніхто добра не знаў, ніхто не мог паручыцца за яго, які гэта чалавек.

Трэба было, значыцца, пазбыцца яго. Але як жа гэта зрабіць? Пастанавілі дабівацца ад начальства турэмнага, каб яго — або выпусцілі, або хоць забралі ад нас і пасадзілі асобна.

Пачалі мы ляпаць у тыя дзверы, якія зачынялі нашыя калідоры. Паказаўся нейкі стораж; праз яго выклікалі начальніка турмы, і справа пайшла зусім лёгка: начальнік адразу згадзіўся выпусціць на волю непажаданага для нас таварыша.

Прыкрае, цяжкае, вельмі цяжкае ўражанне зрабіў на нас гэты выпадак, ну — але нічога не зробіш: у найлепшай сямейцы могуць быць калекі...

Чакалі нас выпадкі яшчэ горшыя, яшчэ больш балючыя.

Паказаўся нейкі чын і стаў выклікаць прозвішча ўсіх жыдкоў, якія былі паміж нас.

— Пашто гэтая штука? — спыталіся мы.

— Ім трэба з'явіцца ў турэмную кантору,— адказаў чын.

— Пашто? — зноў пытаемся.

— Там выясніцца,— адказалі нам.

— Без агульнай нарады і пастановы яны адгэтуль не выйдуць! Прыйдзіце праз паўгадзіны,— рашуча сказалі мы.

Нарада. Сабраліся ў найбольшай камеры, але і там, разумеецца, цесна было.

Спярша былі галасы, каб не выпушчаць таварышаў, але самыя жыдкі запратэставалі проціў гэтага, каб часам не вызваць гэтым ніякага непажаданага прымусу з боку турэмнага начальства.

Праз паўгадзіны яны выйшлі і... ужо не вярнуліся.

Як пасля мы даведаліся — іх усіх адразу выслалі на «родину». Гэта значыцца, што іх паразвозілі пад апекай жандараў да бацькоў, і там здалі іх пад распіскі...

Балюча было і нам — менчукам: са жменькі нашага зямлячаства вырвалі вельмі сімпатычнага, любёнага

ўсімі жыдка Х...— сына тагачаснага менскага казённага рабіна.

Звалі мы яго Аркашкай і, апрача таго, за тое, што гаварыць ён мог толькі або пісклівым, дзіцячым голасам, або басам,— звалі яшчэ «першы тэнар у Расіі, ён жа і бас...».

Трэба яшчэ адзначыць і такі выпадак.

У турэмнай канторы па спісках агледзеліся, што паміж арыштаваных ёсць прозвішчы сыноў вельмі знаных не толькі ў Маскве, але і ў расейскім грамадзянстве асобаў.

Ці толькі само турэмнае начальства аб гэтым парупілася, ці мо хто яшчэ са стараны — у Маскве націснуў спружынку, але ж прыйшоў да нас начальнік турмы і, выклікаўшы некалькі гэтых чалавек, заявіў ім, што яны свабодныя і могуць хоць зараз выйсці з турмы.

Але тыя наадрэз адмовіліся карыстаць з гэткай асобнай ласкі.

— Выйдзем толькі разам з усімі і долю сваіх таварышаў будзем дзяліць да канца,— заявілі яны.

Гэткія словы, гэткія іх пастановы ўсе спаткалі громкімі воплескамі і дружным «ура!».

Калі надышла пара палуднаваць, двух арыштантаў, звонячы кандаламі, прынеслі велізарны цэбар з капустай. Было ў ёй нат крыху мяса, але сам гэты цэбар такі быў брудны, абхляпаны нейкай тлустасцяй, што не кожны адважыўся на гэткі трактамант *. Найбольш карысталіся з гарачай вады: была гарбата, былі свае такія-сякія харчы, і гэтым падмацоўваліся.

А што найважней: былі маладыя годы, чыстае сумленне і вера ў будучыню.

Першы дзень прайшоў для нас шпарка, а дзеля таго, што мінулую ноч не спалі, дык паўкладаліся рана. Але які там мог быць сон: нары, як я ўжо казаў, голыя, дык прыйшлося, распрануўшыся, частку адзежыны палажыць пад галаву, частку — пад бок, а часткай — на-

крыцца. А да таго так лезлі да нас з усіх шчылінкаў чырвоныя звяркі і так яны нам дакучалі, што трудна было вытрываць.

Раніцай нас спаткала неспадзеўка.

— Гляньце, таварышы, гляньце,— адазваліся тыя, што раней усхапіліся з нараў,— яшчэ адзін мундзір — наш мундзір — універсантаў —вісіць проціў нас.

Кінуліся да аконных кратаў — праўда: якраз на другой старане — там, дзе сядзелі пятроўцы, толькі паверхам ніжэй — блішчэў у акне студэнцкі мундзір.

Дзякуючы наладжанай ужо ў нас таемнай пошце, неўзадаўжкі ўдалося нам спісацца з новымі арыштаванымі таварышамі.

Як даведаліся мы, гэтую партыю забралі таксама з універсітэцкага саду, дзе яна сабралася і не згадзілася разысціся, дамагаючыся свайго арышту, каб дзяліць долю сваіх таварышаў.

Іх таксама, як і нас, загналі спярша ў манеж, а ўжо толькі ноччу перавялі ў Бутыркі.

Як толькі развіднела, яны ўбачылі на нашай старане вісячы мундзір, дык — каб паведаміць аб сваёй тут прысутнасці,— вывесілі і свой мундзір.

Амаль не праз цэлы дзень ішла паміж нас перапіска: хацелася ведаць, колькі іх, ці ёсць знаёмыя, што чутно наогул у Маскве і г. д.

Свежа арыштаваных было чалавек са трыста, але збіраюцца новыя партыі, якія маюць дамагацца таго ж самага арышту.

Апрача перапіскі, мелі мы ў гэты дзень яшчэ адну, але вельмі прыкрую занятку: выпісаўшы праз турэмнае начальства цэлы яшчык сернікаў, пайшлі мы вайной з агнём на нашых ворагаў — чырвоных звяркоў. Мы так шчыра і заядла вялі гэту барацьбу, што і ляжаць і спаць на нарах стала спакайней.

Мінула яшчэ адна ночка; і зноў неспадзеўка: прывялі яшчэ адну партыю студэнтаў-універсантаў.

Цяпер ужо лік арыштаванай моладзі даходзіў да паўтары тысячы.

Гэта, відаць, устрывожыла маскоўскае начальства, і больш яно, як мы пасля даведаліся, арыштовываць — хоць і былі зборышчы моладзі — не важылася. Іх проста разганялі, і толькі.

Як доўга прыйдзецца нам сядзець — хто ж гэта мог згадаць? З ядой неяк жа ў нас наладзілася: не елі сытна і смачна, але і не галадавалі. Для нас сталі прысылаць грошы. Хто іх прысылаў — мы не ведалі.

— Приказано передать,— чулі мы ад начальства, і толькі.

Але сумы бывалі ладныя: бывалі соткі, былі і тысячы. Апрача таго, мы адмовіліся ад турэмных харчоў, дык нам сталі належныя грыўні выплачваць гатоўкай. Адна была бяда — што ўсё гэта працэджвалася праз шмат чужых рук, да якіх значная частка з нашых капіталаў прыліпала, інакш харчоў было б пад дастаткам.

Але горшая справа была ў тым, што мы былі як бы адрэзаны ад усяго свету: ні кніжак, ні газетаў, ні лістоў ніякіх мы атрымоўваць не маглі. Вялі мы перапіску з турмой, са сваімі таварышамі, але ж і яны больш за нас нічога не маглі ведаць.

Апрача хлеба — моладзь патрабавала справы духоўнай. Трэба было прыдумаць, вышукаць якую занятку.

Знайшоўся запас паперы, знайшліся, разумеецца, і алоўкі. Ось і залажылі дзве рэдакцыі — дзве газеты сталі выдаваць: адну «дэмакратычную», другую — «кансерватыўную»...

Паміж такой грамады студэнтаў, само сабой, знайшліся і добрыя літаратары, і моцныя публіцысты,— дык матэрыялаў у газету — хоць адбаўляй. Выходзілі газеты толькі, разумеецца, кожная ў адным экземпляры, дык слухаць іх чытанне збіраліся ў найвялікшую камеру.

Нумары былі вельмі ўдалыя: былі — сур'ёзныя стац-

ці, была і цікавая белетрыстыка; газеты двух напрамкаў вялі паміж сабой заядлую палеміку, але былі аддзелы, каторыя вызывалі агульны рогат: надта камічна састаўлены былі весткі і тэлеграмы з усяго свету.

Кожны ж з нас дасканальна ведаў, што не толькі са свету, але нат з бліжэйшага завулачка — ніякая вестка да нас дайсці не магла, а тут раптам чуеш — то ў сур'ёзным, то ў камічным тоне — састаўленыя тэлеграмы з Берліна, Парыжа, Лондана, Пекіна, з Амерыкі, Японіі і г. д. Яшчэ смяшнейшымі былі «прыдворныя» весткі расейскага і заграніччных царскіх двароў.

Чаго і аб чым толькі там не пісалася! Бакі надрываліся ад смеху!

Але ж усё-такі газеты прыналежалі да паважнейшых нашых занятак.

Маладыя, здаровыя сілы дамагаліся руху, размаху. І ось узяліся за чахарду. На доўгіх калідорах турмы ўстанаўліваўся цэлы чарод да бялізны раздзетых хлопцаў, і адзін праз другога пачыналі скакаць і скакаць, ажно да добрага поту.

Мала гэтага: прыдумалі яшчэ нешта больш камічнае, хоць мо крыху ўжо і дзяцінае: гульню ў жандараў.

Ось бачыце, як нейкі рослы барадаты студэнт чацвёртага, калі не пятага курса, медык,— ускочыў на плечы свайго таварыша, абхапіў яго нагамі і рукамі і гойсае, быццам на кані.

— Вперед! Вперед! — крычыць ён.— Асадзі назад! Назад асадзі!

За ім гоняцца студэнты, б'юць быццам — як жандара — кулакамі, стараюцца яго сцягнуць, зваліць на зямлю, а той ажно пеніцца — так адбіваецца.

А тым часам гэткіх жандараў прыбывае і прыбывае: калі ты сам не ўскочыў каму на карк, дык, абы заўважылі твае здаровыя плечы, ускочаць на цябе.

Нікому і ў думку не прыходзіла гневацца за гэта; наадварот: трэба было яшчэ ржаць і добра выкід-

ваць нагамі — падбрыкваць, як і прыстала добраму каню.

І калі я ўспамінаю мінулае і прыглядаюся да цяперашняй моладзі, то ў мяне з'яўляецца адно пытанне: калі яны маглі так хутка пастарэць? Хто так хутка вырваў у іх маладую душу? Хто пазбавіў іх гэтага найдаражэйшага скарбу?

Даўней — навука была навукай, і, разумеецца, больш ёй займаліся, чым цяпер; сур'ёзныя заняткі, сходы, нарады, праца ў бібліятэках і інш. ішлі не спыняючыся, аднак заставалася часу, калі маладая, не затручаная яшчэ нічым душа рвалася да шчырай, мо нат часам крыху наіўнай, але чыстай, праўдзівай весялосці.

Але пашто аб гэтым успамінаць? Пашто гаварыць?

Не течет река обратно,
Что прошло — того не будет...

Знайшлі мы і яшчэ адну занятку, ды нат вельмі прыемную: канцэрты.

Смешна цяпер можа каму выдацца, як можна было даваць канцэрты ў Бутырскай турме, а тым часам праходзілі яны вельмі цікаўна, гладка, удала.

Апрача агульнага, нарыхтаванага паміж сабой хору, выступалі асобныя канцэртанты: салісты, дуэты, трыо, квартэты і г. д. Паміж імі былі такія галасы, якія можна было пачуць толькі з добрай тэатральнай сцэны. Былі дэкламацыі, маналогі, экспромты. З вялікай люботай можна было ўсё гэта слухаць.

Іншым зноў разам — выклікалі мы начальніка турмы — палкоўніка, прозвішча каторага ўжо не памятаю — быццам па вельмі важнай справе. Ён заўсёды з'яўляўся ў хуткім часе. Але трэба было бачыць яго, як, акружаны грамадой студэнтаў,— ён — то чырванеў, то бялеў. Ужываць якіх-колечы рэпрэсій проці студэнтаў, відаць, яму было забаронена, дык быў, дрыжучы перад сваім старшым начальствам, паслухняны.

А, праўду кажучы, ніякай справы да яго мы не мелі: ось так толькі, абы чымся з нуды заняцца.

Палкоўнік стаяў, а ўвакол яго гудзелі маладыя галасы:

— А што чутно ў Іёкагаме? А што дзеецца ў Конга? Што з турэцкім султанам? Ці праўда, што яго жонкі збеглі? — і гэтак дальш, у тым самым напрамку.

Ён разумеў, што тут строяць жарты, але трымаўся, як мог, каб не страціць сваёй павагі: выкручваўся, як уюн, каб у чым-колечы не здрадзіцца, і калі ўжо даваў драпака ад нас, то мы дасканальна бачылі, што нат найлепшая маскоўская лазня не магла так дагадзіць пану палкоўніку, як дагадзілі яму мы.

Гэтак перакульвалі мы дзень за дзяньком... Але чым дальш яны цягнуліся, настрой рабіўся тым больш сумны. Прыходзілася шукаць новых спосабаў, каб падтрымаць, ажывіць пульс маладога, непрывыкшага да такіх абставінаў жыцця.

Паміж сябрукоў нашага Менскага зямлячаства найцяжэй прыходзілася ад такога жыцця, як найбольш уражліваму душой — Івасю.

Кідаўся ён на нары, выцягваўся ўдоўжкі і пачынаў выць — настаяшча выць воўкам.

Хто не падходзіў з таварышаў дапытвацца: што яму такое? — ён коратка і нат сярдзіта адказваў:

— Выць хачу — ну і выю! Не перашкаджай голасу маёй душы!

— Ну дык і вый,— раілі яму таварышы,— гэта памагае.

Але ўскорасці Івася знайшоў другую сабе занятку: закахаўся! Знайшоў спосаб у Цэнтральнай Бутырскай турме — закахацца! Праўда, мы — землякі — добра яго ведалі:

Co oltarz — to ofiara...

Але гэтую афяру здацен быў вышукаць хіба толькі Івася.

Побач з нашай — 28-й камерай — пад простым кантам — пачынаўся на тым самым паверху аддзел арыштаваных кабет. Прытуляючыся да кратаў апошняга свайго акна, Івасю ўдалося не толькі з імі разгаварыцца, але завесці перапіску. З запісак, якімі пахваліўся перад намі Івася, відаць было, што пісала іх нейкая маладая дзяўчынка. Праўда — ці не — хто згадае? Але пісала, што бацьку яе несправядліва засудзілі ў ссылку — на Сібір, а яна — як дачка — ідзе дабравольна за ім, а што не мае спосабу прабрацца сваім коштам, дык аддалася ў лапы турмы (такі звычай быў тады сапраўды). Гэта можна было пераканацца па іхняй адзежыне: праступніцы насілі ясна-жоўтыя халаты; паступіўшыя дабравольна адзяваліся ў сваё — як хацелі.

Так ці іначай, а наш Івася закахаўся, і асабліва ноччу — пры месячыку — заўсёды бачылі мы яго прыціснутага да кратаў апошняга акна нашай камеры.

Шчаслівы! Сапраўды шчаслівы! Мы тады і гэтай радасці і ўсцехі знайсці не маглі...

Ад той безрабоціцы, якая нас агортвала ў Бутырках, пачалі мы шукаць новых і новых выхадаў. Надумалі мы ўрэшце зрабіць інтэрнацыянальны канцэрт і тэатр.

Да гэтага канцэрта падгатоўваліся сур'ёзна цэлымі нацыянальнымі групамі. І — калі ён распачаўся — сапраўды было што паслухаць і было на што паглядзець.

Першымі выступалі ўкраінцы са сваімі, душу захопліваючымі, меладыйнымі песнямі.

Расейцы выступілі велізарным хорам, у якім чулася скарга, велізарная скарга здаўна набалеўшай душы:

Укажи мне такую обитель —
Где бы русский мужик не стонал...

Пасля выйшлі палякі. Іх грознае, мала яшчэ тады другім знанае:

Z dymem pożarów...

А пасля жаласлівая мелодыя:

Boże, coś Polskę
Przez tak długie wieki...—

зрабілі на ўсіх вялікае ўражанне.

Выйшлі каўказцы. У песнях іх чуліся нейкія дзве спрэчныя мелодыі: ад адных — чулася нешта дзікае, пабеднае, ад другіх — веяла на нас нейкай дзіўнай, нязнанай, саўсім не зразумелай для нас сумнотай.

Выступалі літоўцы, латышы.

Апрача песняў былі і нацыянальныя скокі: польская мазурка, каўказская лезгінка, расейскі камарынскі і г. д.

Усіх спатыкалі і праводзілі громкімі, дружнымі воплескамі.

Канцэрт зацянуўся. Ужо добра сцямнела, калі разышліся.

Вярнуўшыся ў сваю камеру, мы — менчукі — паўкладаліся да сну. Але гэты сон аніяк да нас не прылятаў. Чаму? і самі яшчэ добра не разумелі. От — гутарым, шэпчамся, быццам баяліся, каб хто іншы нас не падслухаў.

Калі глянем, ажно і нашыя суседзі — случчакі, магілёўскія, вітэбчане — неяк не могуць спакойна прымасціцца на сваіх нарах: усхопліваюцца і таксама шэпчуцца, як мы.

Што за прычына? Гэткі-то ўдалы быў канцэрт, гэтакто весела там было, а тут — на табе: маркотна, але то так маркотна зрабілася на душы, што, здаецца, гатоў кожны з нас хоць у вір — галавой.

Паспаўзалі мы з нараў і сышліся разам са сваімі суседзямі — таварышамі, каторых мучыла, як мы бачылі, таксама нейкае неспакойства.

Але неяк нічога ў нас не клеілася: кожны гаварыў аб нейкай дробязі, аб нейкім глупству, старанна абмінаючы тое, што набалела і трывожыла яго душу.

— Таварышы, браткі мае родныя! — пачуўся пры-

цішаны, мяккі голас недзе саўсім збоку.— Што ж з намі сталася? Чаму прыціхлі галасы нашыя? Чаму нас агарнула такая сумота? Чаму не хапае нам слоў выліць той жаль, той боль, якія запанавалі ў нашым мазгу, у нашым сэрцы, у нашай душы? Што гэта?? — кідаў пытанні ён.

Але адказу не было: сціхлі ўсе,— сціхлі і ўважліва ўглядаліся ў мала тады яшчэ нам знанага прамоўцу.

З доўгімі валасамі, з яснымі блакітнымі вачыма, стуліўшыся неяк, сядзеў ён на нарах і цяжка дыхаў.

— Прычыну такога настрою,— пачаў ён дальш,— трэба шукаць у тым уражанні, якое зрабіў на нас сягонняшні канцэрт. Чулі мы там такія прыгожыя песні — украінскія, расейскія, польскія, літоўскія,— скажыце ж вы мне, чые песні найбольш вам спадабаліся?

— Усе яны аднолькава прыгожыя, усе яны роўныя,— адазваўся нехта з нараў.

— Спытайцеся ж тых, хто сягоння там пяяў — не такі адказ пачуеце вы: паляк — будзе хваліць сваю песню, украінец — сваю, расеец — сваю, і гэтак дальш,— зноў пачуўся голас першага прамоўцы,— і — не дзівота: кожнаму сваё роднае — наймілейшае, найдаражэйшае; для нас жа яны, вы сказалі праўду,— усе роўныя, адналькавыя, бо... адналькова чужыя!

Мы — паміж гэтых народаў — як тыя пакрыўджаныя сіроты... Так — пакрыўджаныя: адабралі ў нас волю, свабоду... ну, але путы налажыць — на нашыя думкі, на нашыя душы — не ўдасца!..

Нашыя лугі — для нас цвітуць; нашыя каласы — для нас шэпчуць; нашыя рэчкі — для нас гудзяць; нашыя лясы — для нас шумяць, а нашыя сумныя песні — для нас і толькі для нас звіняць і — будуць звінець!..

Чулі вы гэткую песню:

Ой ляцелі гу-у-у-сі
Ды з-пад Белай Ру-у-у-сі...

Зацягнуў прыцішаным нізкім тэнарам сваю песню, але зараз жа гэтая мелодыя абарвалася і пачуўся сухі, цяжкі, надрываючы грудзі кашаль.

Усе заслуханыя ў першыя словы песняра цяпер трывожна аглянуліся на яго: не зважаючы на цемру, якая абхапіла ўжо нашую камеру, убачылі мы, як у руках песняра міганула белая хустачка, якой ён пачаў старанна выціраць свае вусны...

Адзін са студэнтаў — медык — хутка саскочыў з нараў і — кінуўшыся ў калідор, прымчаў адтуль вады і падаў кашляючаму таварышу. Той, напіўшыся і цяжка дыхаючы, яшчэ больш ціхім голасам зноў пачаў:

— Не магу я пяяць, не магу — у грудзёх не ўсё, відаць, у парадку, ну але гэта міне. Я вам хоць так — без мелодыі ўспомню некалькі родных нашых песняў.

І пачалася дэкламацыя беларускіх песняў...

Плылі яны — адна за другой плылі...

Не пяяў жа ён іх, а толькі словы гаварыў, а здавалася, што словы гэтыя плывуць, зліваюцца ў адну мелодыю — мелодыю жалю, скаргі, болю... Здавалася — ось-ось недзе рэха павінна было адклікнуцца... не — не адклікнуцца: рэха заплакаць павінна — наўзрыд заплакаць...

Раптам нехта адазваўся:

— Стойце, браткі, пачакайце: знаная мне гэтая песня — яшчэ нянька навучыла; хочаце — спяю яе?

Усе, разумеецца, згадзіліся. Знайшліся і другія, каторыя ўспомнілі іншыя песні.

І ось, бадай, ці не першы раз — як Бутыркі — Бутыркамі — у грозных іх мурах, у цемры закратаванай камеры — пачулася, палілася сумная беларуская песня!..

З якой увагай, любоўю, пашанай услухоўваліся мы да малазнаных тады яшчэ мелодыяў!..

Пяялі саўсім прыцішаным голасам, як бы баючыся, каб хто не падслухаў іх, каб з чужымі людзьмі не прый-

шлося дзяліцца неспадзеўкі зпойдзеным дарагім скарбам...

Пашто, каб хто чуў: пяялі мы сваё роднае і пяялі — толькі для сябе.

Як жа хутка мінула нам гэтая ночка! Колькі новых планаў навеяла яна! Колькі новых зярнятак закінула ў нашыя маладыя душы! Колькі новых неспадзяваных думак нагнала яна ў нашыя гарачыя галовы!!.

Ужо добра развіднела, калі разышліся мы, каб сапачыць крыху на нашых цвёрдых нарах; але на сапачынак надзея была слабая; кожны з нас рупіўся раней падняцца, каб як найхутчэй зноў сысціся са сваімі начнымі таварышамі. Цяпер бо гэта жменька маладых людзей такая сталася паміж сабой блізкая, дарагая, родная; так сцэментаваліся нашыя жаданні, нашыя мэты, што нам спешна было згаварыцца паміж сабой ва ўсіх дэталях — дробязях будучай нашай супольнай працы.

Дык, апрача агульных сходаў з усімі таварышамі, гэта новая нашая жменька мела саўсім асобныя свае нарады, на каторых абгаварваліся ўжо толькі свае справы.

Першымі найважнейшымі пастановамі на гэтых нарадах былі ось якія:

1) Заснаваць тут жа — у Бутырках — Першы Беларускі Гурток Моладзі ў Маскве;

2) Якім бы то ні было спосабам — легальным ці нелегальным — тварыць Беларускае друкаванае слова;

3) Пад час летніх вакацыяў ісці ў Беларускі народ — будзіць і пашыраць паміж яго нацыянальную свядомасць;

4) Знайсці ў Маскве канспіратыўную кватэру, дзе можна было б перыядычна збірацца на нарады аб далейшай сваёй працы.

На чале гэтага гуртка стаў студэнт-юрыст В...іч, родам з-пад Слуцака (здаецца, сын валаснога пісара).

Гэта і быў якраз той самы бландын, які першы рас-

пачаў тут з намі сваю дзіўную гутарку, прамовіў для нас дзіўнымі словамі і які першы запяяў нам родную беларускую песню.

Другім сябрам новага гуртка быў таксама студэнт-юрыст — Т...ко, з Магілёўшчыны, які з часам стаўся знамянітым адвакатам і чуць не трапіў у прэдседацелі расейскай гасударственнай Думы.

Рэшта сяброў былі то з Меншчыны, то з Вітэбшчыны і інш. старон.

Ну, але не ў гэтым апавяданні месца ўспамінаць аб той працы, якую вёў пасля гэты гурток, і аб той долі, якая спаткала яго пасля ў жыцці...

Вернемся цяпер ізноў да нашага агульнага штодзённага жыцця ў Бутырках.

Жыццё гэтае і сапраўды сталася і штодзённым, і буднічным: другі тыдзень ужо распачалі мы свайго турэмнага жыцця, а пераменаў ніякіх не было; не было ніякіх колечы вестак, каторыя маглі б пранікнуць з таго — цяпер далёкага, недаступнага да нас свету — праз гэтыя тоўстыя сцены і моцныя жалезныя краты.

Сядзелі і... чакалі.

Слабаватая сухая яда, нехват чыстага, здаровага паветра, дрэнны, нявыгадны сон — усё гэта як-ніяк адбівалася на здароўі арыштаваных, а разам з тым, разумеецца, і на цэлым настроі: газеты — не мелі ўжо таго размаху, канцэртанты трацілі свежасць сваіх галасоў, пад час чахарды — не з такой лёгкасцю скакалі, і нат коні «жандараў» не так ужо падбрыківалі...

Сядзелі і... чакалі.

Цяпер збіраліся больш у тых камерах, дзе ўсім вядома было, што ёсць «весельчакі». Гэтыя тыпы бываюць скрозь, а што ж і гаварыць, што паміж студэнтаў у тыя часы хапала іх, колькі хочаш. Такі чалавек не толькі сам ніколі не сумуе, а патрапе яшчэ заняць, насмяшыць, развесяліць цэлую грамаду людзей.

Колькі там праўды ў яго словах, апавяданнях-пры-

годах, анекдотах — яму толькі ведаць, але так вам ён усё гладка раскажа, што быццам і сапраўды сам ён там быў, чуў і бачыў...

Каля нікога столькі не збіралася ахвотнікаў-слухачоў, як каля аднаго добра ўжо старога студэнта-матэматыка, каторы нешта аніяк не мог скончыць свайго факультэта.

Тады гэткія, як іх называлі, «вечныя студэнты» дажывалі ўжо свой час, бо ўскорасці забаранілі «сядзець уволю» ў універсітэце, а трэба было або скончыць яго ў прызначаны тэрмін, або пакідаць навуку.

Не думайце толькі, што тагачасныя апавяданні былі зафарбаваны ў такі колер, запраўлены такімі прыправамі, у якіх толькі і смакуюць не то што цяперашняя моладзь, а нат — падросткі — чуць не дзеці. Калі ж і здаралася, як тады казалі — «жучка падпусціць», — то рабілася гэта ў такой форме, што слухаць можна было без брыдасці, без гіду.

Для прыкладу ўспомню тут хоць пару апавяданняў.

Ось сядзіць на нарах гэты самы «заслужоны» матэматык; увокал яго цэлая грамада, а ён, закінуўшы ажно на плечы свае доўгія,— як смоль — чорныя валасы — і, быццам расчэсваючы тонкімі, белымі пальцамі бараду, пачынае:

— Эх, браточкі мае, дзеткі мае, да чаго мы дажыліся? Здрабнелі мы, здрабнелі: нат выдумаць нічога не можам, каб нуду сваю разагнаць! А ось паслухайце, якія даўней былі паміж нас востранькія хлопчыкі.

Быў тады я на першым яшчэ курсе. Калі распачаліся экзамены для канчаючых наш факультэт, пайшоў і я паглядзець і паслухаць, як там будуць «рэзаць».

Найбольш цікавіліся ўсе, як пройдзе экзамен Мікіце. Гэта быў велізарны — як мядзведзь — студэнт, катораго зналі і звалі ўсе проста — Мікітам. Знаў ён астралогію лепш самога лектара, і за гэта прафесар яго надта не любіў. Усе былі пераконаны, што на экзамене Мікіце

прыйдзецца туга, бо прафесар «рэзаць» умеў: спытае неспадзеўкі якое глупства, і... хлопец спёкся.

Дык не дзіва, што, як толькі выклікалі Мікіту — усе ажно заварушыліся. За сталом, апрача экзаменатараў, сядзелі там яшчэ нейкія «свяцілы навукі» — словам, цэлая цырымонія.

Але ўсе гэтыя ягомасці — як не бралі ў ляшчоткі Мікіту — той ані запнуўся: на ўсе пытанні адказваў, быццам кпінкуючы, але з такой глыбокай знаёмасцяй, што ўсіх здзівіў сваімі адказамі.

Здавалася, што ўжо канец, ажно прафесар — лектар Мікіты, крута павярнуўшыся да яго, раптам пытае:

— А вы бачылі месяц? (луну)

Усе ажно жахануліся: каб задаваць такое пытанне канчаючаму факультэт студэнту — гэта было больш, чым свінства.

Глянулі мы на Мікіту: збялеў, маўчыць, толькі сваімі бліскучымі вачыма пільна ўглядаецца ў прафесара.

А той зноў:

— Месяц вы бачылі?

Мікіта, памаўчаўшы яшчэ хвіліну, спакойна адказвае:

— Пане прафесару, месяца я не бачыў.

У прафесара ажно вочкі загарэліся: злавіў, думае; ды ізноў да Мікіты:

— Як, як? Месяца вы ніколі не бачылі?

— Прызнаюся: не бачыў. Шмат аб ім чуў, яшчэ больш чытаў, магу вам вылажыць усе навуковыя аб ім даныя і выказаць свой асабісты погляд, але яго самога бачыць — не даводзілася.

Неспадзеўкі ўся справа перакулілася: Мікіта — спакойны, пэўны сабе — быў як пабядзіцель; прафесар — з трыумфатара — папаў у пастку: палажэнне яго было такое глупае, што не ведаў, як з яго выкруціцца; пачырванеў як рак, ёрзаў на крэсле, вусны яго дрыжэлі.

Усе добра зразумелі, што трапіла каса на камень.

На зале пачуўся, сілай глушаны, смех; прафесары

таксама кусалі сабе вусны, каб не страціць павагі і не рассмяяцца.

— Як жа так,— звярнуўся экзаменатар да сядзячых за сталом прафесараў,— ён месяца не бачыў!

Тыя — як бы ў адказ, што на гэта нічога не папішаш — рукамі толькі развялі, але маўчалі.

Нічога не заставалася больш і пану лектару, як толькі замаўчаць, і то замаўчаць саўсім у гэтым універсітэце, бо, каб уцячы ад свайго сораму — прыйшлося падацца ў адстаўку.

З таго часу, як казалі, пан прафесар зненавідзеў месячык і больш ніколі на яго не глядзеў,— закончыў расказчык.

Студэнты-слухачы зарагаталі і сыпанулі воплескамі.

Стары матэматык нат не ўсміхнуўся, зноў толькі паправіў свае доўгія валасы і дальш распачаў:

— У тыя часы, як вам вядома, сярод нашых было шмат нігілістаў: адны — з праканання, а больш — толькі імі прыкідваліся; а якраз тады была мода ў маладых дзяўчат насіць залатыя крыжыкі на шыі. Насілі іх на прыгожых істужках, а яшчэ часцей — на дарагіх ланцужках.

Рабілі гэта не столькі, бадай, з набажнасці,— бо пашто ж крыжыкі выстаўляць напаказ,— колькі для аздобы.

Ось аднаго разу ідзе гэткая панначка з крыжыкам на белай шыйцы па Цвярскім бульвары, скромна апусціўшы вочкі. Як на ліха — насустрач валіць гурба падвіпіўшых студэнтаў.

Убачыўшы дзяўчыну, зірканулі адзін на другога, перамірганулісся і раптам — двох з-паміж іх высунуліся наперад, падышлі да дзяўчынкі і са словамі «выбачайце» — пакланіліся і ўзялі — адзін — з адной, другі — з другой стараны — пад рукі і затрымалі яе.

Тая, разумеецца, спужалася, але хлопцы ўпэўнілі незнаёмую, што нічога страшнага тут не будзе.

Рэшта кампаніі студэнтаў выстраіліся ў чарод і сталі адзін за другім падыходзіць з вялікай павагай да панначкі.

Што каторы падойдзе — скіне шапку, набажна тры разы пераждагнаецца, а пасля, нагнуўшыся, цмок у крыжык ды зноў пераждагнаецца.

Пасля зноў, далікатна пакланіўшыся, і зноў са словамі «выбачайце» — дзяўчынку адпусцілі на свабоду.

Апрача апавяданняў — цешылі мы сябе яшчэ песнямі-экспромтамі. Зазвычай пачыналі мы з якой-колечы стара-студэнцкай песні. Найбольш ходкай была:

Есть в столице Москве
Один шумный квартал,
Что Козихою он
Прозывается.
От зари — до зари,
Лишь зажгут фонари,
Вереницею там
Студенты шатаются...

І сапраўды — нідзе так густа не было ў Маскве студэнтаў, як на гэтай Казісе. Квартал ад універсітэта, забудаваны пераважна старэнькімі драўлянымі дамочкамі, дык кватэры былі танныя — якраз падхадзячыя да студэнцтва.

Пасля гэтай песні — пераскаквалі на другую.

Эх вы, синие мундиры,
Обыщите все квартиры;
Обыскали квартир триста —
Не нашли социалиста...

Дальш пачыналіся ўжо экспромты: хто што прыдумае — запявае, а агульны хор падхватвае прыпеўкай:

Гей, гей, хо-хо-хо!
Черная галка,
Чистая полянка,
Ты же, Марусенька,
Черноброва —
Чему не ночуешь дома?

Успомню тут хоць некалькі экспромтаў:

Вышнеградский ум высок —
И из спичек выжал сок.

Вышнеградскі — тагачасны міністр фінансаў; ён завёў акцызу на сернікі.

Негодяй из негодяев —
Это с... сын — Бердяев...

Бярдзяеў быў тады начальнікам сыскной паліцыі.

Есть еще один таковский —
Генерал-майор Юрковский...

Юркоўскі — тагачасны маскоўскі паліцмайстар.

Был еще один такой —
Это граф министр Толстой.

Талстой быў міністрам прасветы.

І гэтак дальш — экспромты сыпаліся без канца: нікому не даравалі; а чым каторы быў вастрэйшы, тым дружнейшымі спатыкалі воплескамі.

Але калі бывалі гадзіны весялосці, то настаў такі час, калі яны счэзлі.

Апрача загарадкі, аб каторай я ўжо ўспамінаў, з катлом для гарачай вады, быў яшчэ прыпынак, куды хадзілі мыцца.

Ось неяк адзін са студэнтаў, пайшоўшы туды, угледзеў праз ражок тамачнага акна, як з круглай вежы паказаўся «адзіночны». Яго, відаць, выпусцілі «на прагулку». Арыштант гэты меў кавалачак абмурованага двара, па якім меў права хадзіць праз паўгадзіны — раз у дзень; а на дварэ гэтым былі высока зложаны дровы; ось ён і ўзабраўся на гэтыя дровы дый стаў даваць знакі студэнту. Той, не разумеючы гэтых знакаў, даў зараз жа знаць таварышам. Усе, разумеецца, хто толькі мог стоўпіцца (умывальня была велізарная), кінуліся да таго акна; шыбы паляцелі ў адзін момант;

знайшліся паміж нас такія, каторыя дасканальна маглі разгаварыцца пальцамі.

Даведаліся мы, што няшчасны чалавек сядзіць у гэтай вежы ўжо дзесяць гадоў! Сам ён са Смаленска — быўшы семінарыст, засуджаны як палітычны праступнік. Выгляд яго быў страшэнны: высокі, худы — як шкілет, твар і рукі — чорныя, як зямля, сам абросшы — як звер які.

Жутка, да таго жутка было глядзець на яго, што шмат у вачах каго блішчэлі слёзы.

Гэты бедны сказанец * меў да нас адну просьбу: спяяць яму студэнцкія песні.

Само сабой, праз увесь час грымела песня за песняй, пакуль яго не загналі ў гэтую праклятую вежу.

Назаўтра дарэмна мы чакалі: яго больш не выпусцілі, спанатрыўшы, відаць, што мы з ім завязалі зносіны.

Гэты чалавек на нас усіх зрабіў такое сільнае ўражанне, што і жарты нашыя замоўклі... і песні спыніліся.

Жутка, балюча было на душы... Да таго жутка, да таго балюча, што, здавалася, сорамна было глянуць адзін другому ў вочы.

— Чаму, Івася, не выеш? — пыталіся мы свайго сябрука.

— Дур-рра-кі — выць магу толькі па сабе, а тут во што трэба! — і ён грозна патрос сваімі велізарнымі кулакамі.

Прыціхлі мы. Сядзелі і... чакалі. Ладзіліся, праўда, да тэатра — ролі з памяці распісалі, але неяк і да гэтага ахвота адпала: сядзелі і чакалі.

Ажно ўрэшце прыждалі. На пачатку трэцяга тыдня — неяк пад вечар — прыйшоў да нас начальнік турмы і сказаў нам збірацца; па чалавек 20—25 маняцца нас вывозіць конкаю ў Маскву.

Ну што ж — добра і гэта: вывозіць дык вывозіць — годзе ўжо гэтай турмы. Збіраніна была не клапатлівая — кожны сабраўся ў момант. Чакалі мы нядоўга.

Нас — партыю за партыяй — што паўгадзіны — сталі вывозіць і раскідаць па ўсёй Маскве, каб не маглі сабрацца ў грамаду.

Вывозілі праз усю ноч, але вывезлі не ўсіх: васемнаццаць чалавек пакінулі.

У гэты лік папаўся і я.

Спадзяваліся і мы спачатку, што нас вывезуць апошнімі, ажно выйшла неспадзеўка: прыйшоў начальнік турмы і заявіў, што мы застанемся тут, дый яшчэ пальцам паківаў, што цяпер нас не чатырыста, а васемнаццаць, дык рады сабе дасць.

Гэткая абяцанка не магла, разумеецца, не зрабіць на нас прыкрага ўражання, але знайшоўся паміж нас адзін чалавек, каторы патрапіў усіх нас развесяліць: гэта быў сын знамянітага ў той час паэта — графа А... Т... Ён так патрапіў усіх разварушыць, што неяк забыліся мы на сваё скрутнае становішча.

Назаўтра нас — гэтых васемнаццаць чалавек — паразвозілі: частку ў адзіночныя камеры, скуль пасля, дзякуючы вялікай моцнай пратэкцыі — выпусцілі; частку — саслалі, а трох згінула ў Петрапаўлаўцы.

У той жа год скасавалі Пятроўска-Разумоўскую Акадэмію.

Доля вывезеных на концы студэнтаў была розная: адным прыйшлося гнаць той самы курс другі год; другіх паразганялі па іншых універсітэцкіх гарадах, а былі і такія, каторым прыйшлося і саўсім з універсітэтам развітацца.

Трэба яшчэ адзначыць, што разруха паміж студэнтаў была не толькі ў Маскве: перакінулася яна, як гэта і заўсёды бывала, ва ўсе універсітэцкія гарады. У той год разруха гэтая дайшла да асабліва вялікага размаху, і хоць не ўсіх, але частку сваіх жаданняў — дабіліся — афяры не прапалі дарма.

У чэсць гэтых афяр закончу свае ўспаміны — тым, з чаго пачаў:

Gaudeamus igitur
Juwenes dum sumus...

В. МАРЦІНКЕВІЧ У ПРАКТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ

Навука такіх «вучыцялёў чалавечаства», каторыя кажуць: «Ты жыві, як я вучу, а не як жыву», не можа быць трывалай і ў жыццёвай практыцы ўмацавацца не можа. Народу трэба пратоптаных сцежак, а не намаляваных на паперы; таптаць жа іх у нас, калі нават і ёсць змога, часта нехват ахвоты, а яшчэ часцей — *адвагі.*

Бадай, не ахвоты, а адвагі не хапіла і ў нашага бацькі беларускай літаратурнай мовы — нябожчыка Дуніна-Марцінкевіча.

У 1877-8 гадах давялося мне жыць пад страхой нашага песняра: дачка яго вучыла невялічкую грамадку дзяцей. Вучылі нас там па-расейску, па-польску, па-французску, вучылі розных навук, але ані гісторыі Беларусі, ані нават беларускай мовы мы не чулі...

Мо гэтага нашы бацькі не вымагалі, мо нават не хацелі, але ўсё ж ткі ў дзіцячай памяці (а былі паміж нас і ладныя падросткі), як на мяккім воску, пясняр беларускі павінен быў сваю пячатку выціснуць. Марцінкевіч гэтага не зрабіў. Мы нават яго твораў не ўмелі. Калі ж, бывала, прыязджалі суседзі-госці, то чулі мы, як толькі зрэдку перакідваліся яны з гаспадаром, быццам жартам, беларускімі слоўцамі, як гэта і цяпер вядзецца паміж дробных памешчыкаў (да каторых прыналежаў і Марцінкевіч), калі хочуць паказаць сваю дружбу, сваё «запанбрацтва».

Умеў нябожчык заахвочваць нас да навукі, умеў строіць жарты, быў для нас вельмі добрым; любілі і шанавалі яго акалічныя сяляне і суседзі, але з пісаннем сваім, з думкамі сваімі ад усіх запіраўся ў каморку! І хоць каваў ён там беларускую жывую мову, хоць ён першы паказаў, што мова гэта не цяжкая, не тапорная, за якую яе ўважалі *, а гладкая, гібкая, пявучая, лірычная, багатая ў словы і звароты, каторых хватае выка-

заць нават такія чароўныя творы, як Міцкевіча; хоць ён першы сеяў зярняты, усходу каторых, бадай, ці спадзяваўся сам,— але ў штодзённым сваім жыцці не меў адвагі заявіць сябе шчырым беларусам, не меў адвагі беларускую ідэю прыпасаваць да жыцця і дзеля таго не змог пацягнуць за сабой большага гуртка блізкіх сабе людзей, не змог нават знайсці наследнікаў сваёй ідэі; і, хоць справу беларускага адраджэння зачапіў, але з месца яе не скрануў.

І вось цяпер, калі мы перажываем 25-ю гадаўшчыну смерці Марцінкевіча, найлепшым успамінкам будзе, калі мы, сабраўшы ўсе свае сілы, не толькі пісаннем, але і жыццёвай практыкай станем пратаптваць тую заросшую зеллем сцежку, якую назначыў нам час, назначыла гісторыя, каторая вучыць, як павінны мы брацца за гэтую працу.

Гляньце толькі на нашых братоў-чэхаў. У XVI сталецці нацыянальная культура чэхаў стаяла вельмі высока, але пад час трыццацілетняй вайны, пасля бітвы пры Белай Гары, усе чэшскія арыстакраты і буржуазія былі або зніштожаны, або ўцяклі з роднага краю; іх месца занялі немцы. Вось з таго часу нацыянальная свядомасць чэхаў стала гінуць, і ў XVIII сталецці яе лічылі саўсім ужо прапаўшай. Але ў пачатку XIX сталецця прыглушаная гістарычнымі прыпадкамі * чэшская мова пачынае ажываць; народ — сам народ змагаецца за яе і не важыцца прыстаць хоць і да вышэйшай, але чужой культуры; ён шчыра бярэцца супольнымі, хоць яшчэ і слабымі сіламі за адраджэнне і ўзрост сваёй прыдушанай культуры. Праца была не малая, але затое цяпер чэхі, бадай, сталі найбольш свядомым свайго нацыянальнага пачуцця і высокай культуры народам у славянскай сям'і. Нам, беларусам, варта вучыцца ў іх вытрываласці і тых спосабаў, якія яны ўжываюць і цяпер для самаабароны ад няпрошаных апекуноў.

Мараўская суполка «Яднота» аддрукавала тысячы

лісткоў і разаслала сваім братам-чэхам, у каторых спісаны вось якія правілы:

1. Кожны чэх няхай стараецца гаварыць добра па-чэшску, высцерагаецца слоў і зваротаў чужой мовы.

2. Чэшскае дзіця павінна трымацца з дзяцьмі чэшскімі і гаварыць заўсёды па-чэшску.

3. Бацькі, ці то старшыя ў хаце, перад тым як аддаваць дзяцей у школу, павінны навучыць іх дома чытаць і пісаць па-чэшску.

4. Чэшскае дзіця павінна хадзіць у чэшскую школу.

5. Маліцца і пяяць у царкве чэх павінен па-чэшску.

6. Чэшская хата павінна быць прыбрана чэшскімі гістарычнымі малюнкамі і партрэтамі.

7. Чэшскае дзіця павінна вучыцца чэшскіх прыказак, вершаў, песень і народных танцаў і гульні.

8. Старшыя ў хаце павінны ўспамінаць, шанаваць і трымацца народных звычаяў і святкаваць гадаўшчыны гістарычных выпадкаў у Чэхіі.

9. Пад час доўгіх зімовых вечароў супольна чытаць чэшскія кнігі.

10. У кожнай чэшскай хаце павінна быць чэшская газета.

11. Хатнім багаццем павінна быць бібліятэка чэшскіх кніжак.

12. Чэх павінен гаварыць па-чэшску не толькі ў сваёй хаце: хай мова яго адважна звініць на вуліцы, у краме, у горадзе — усюды. Калі да каго-колечы звяртаешся з якім пытаннем, насамперш звяртайся па-чэшску.

13. Сямействы чэшскія павінны дружыць паміж сабой.

14. Кожын чэх павінен старацца быць ці то ў чэшскім тэатры, ці то на народным свяце.

15. Чэх павінен сцерагчыся ўсяго таго, што можа зняважыць яго нацыянальнае пачуццё.

16. Чэх павінен купляць чэшскія вырабы і гэтак памагаць сваім рамеснікам.

17. Сям'я чэшская павінна моцна трымацца сваёй зямлі і не пушчаць яе ў чужыя рукі.

18. Грошы ці то складаць, ці пазычаць, толькі ў чэшскіх банках.

19. Чэшская сям'я павінна сумленна спаўняць нацыянальныя павіннасці.

20. Кожын чэх павінен карыстаць з свайго права пры выбарах.

21. Пад час народнай перапіскі ўся сям'я павінна запісвацца чэхамі.

22. Бацька, матка і старшыя хатнія няхай запісваюцца ў чэшскія суполкі.

23. На нацыянальныя патрэбы кожын чэх хай дае сваю складчыну.

24. Несвядомых сваёй нацыянальнасці чэхаў старацца перацягнуць на карысць роднага краю.

Якіх яшчэ спосабаў ужываюць чэхі для ўзросту свайго краю, шмат месца і часу заняло б спісаць, але і з гэтых правілаў каб мы хоць тыя спаўнялі, якія наша змога!

На гэта трэба не толькі ахвоты, але, яшчэ раз скажу, і грамадзянскай адвагі, каторай 25 лет таму назад не хапіла Марцінкевічу. Раздабыцца на яе пара!

ХТО ЧЫМ МОЖА — ХАЙ ДАПАМОЖА!

Як бы доўга ні вісеў звон,— маўчыць ён толькі да часу: ускалыхніце яго сэрцам, ударце, а скрытая ў ім моц адзавецца і пакоціцца ўдаль...

Так бывае і з народам. Сілай можна яго прыглушыць; праз доўгі час будзе ён цярпець, маўчаць, але адабраць, зніштожыць адкрытую ў ім моц,— ніхто і нішто не здалее. Ускалыхніце яго сэрцам, ударце, а патайная, дзіўная моц адзавецца і рэхам пакоціцца ўдаль...

Так і з намі — беларусамі. Цярпелі мы многа, маўчалі доўга, але ўскалыхнулася сэрца, ударыла ў душу народа, а скрытая ў ім моц адазвалася, загрымела і пакацілася рэха з канца ў канец роднага краю...

Такім сэрцам для нас — наша беларуская газета. У ёй нашы думкі; у ёй нашы скаргі, нашы ўцехі; у ёй наша родная мова. Родная мова — гэта кроў народа: пакуль жыве яна — жыве народ. «Наша Ніва» — гэта люстра жыцця беларускага народа. Праз яе мы спазнаём сваіх братоў з усіх старон і куткоў не толькі Вялікай Беларусі, але і братоў сваіх далей загнаных у далёкія чужыя краі. Для ўсіх іх «Наша Ніва» — гэта прыстанішча; бо, як пісалася ўжо не раз у ёй, не прыналежа яна да таго невялікага гуртка людзей, каторыя працуюць у самай рэдакцыі, а прыналежа да ўсяго беларускага народа. Дык народ — сам народ, а не рэдакцыя, дасць адвет перад гісторыяй Беларусі за долю свайго першага дзіцяці — першай роднай газеты — гэтага агнішча беларускай справы. Ад народа, ад яго правадыроў залежа, каб гэта агнішча не загасла, каб агонь яго не толькі ярчэй шыбаў угару, але і каб вечна гарэў. Але кожны добра разумее, што сама па сабе газета вымагае накладу працы, накладу грошай, дык прымака, а не родны сын сваёй бацькаўшчыны будзе той,

каторы, маючы змогу, не ўспамагае яе. Шмат жа ёсць яшчэ паміж нас такіх, каторыя з усёй душы хацелі б далучыцца да агульнай працы над адраджэннем і ўзростам роднага краю, але помач гэта для іх непрыступна. Дык вось нам трэба ўзяцца за такую работу, да каторай маглі б прыналежыць не толькі багаты, але і найбяднейшы; не толькі пісьменнік, але і бязграматны просты рабочы. Мы павінны пачаць будаваць такі гмах, да закладкі каторага мог бы дакінуць кожны сын Беларусі сваю цэгліну.

Такім гмахам можа быць толькі **Народны Беларускі музей.**

У ім павінны мы складаць, збіраць скарбы-памяткі даўно мінуўшага і цяперашняга жыцця і развіцця беларускага народа.

Калі гэты гмах стане і ці стане ён пры нас — бог ведае, бо народ, каб ступіць адзін крок наперад, не раз патраціць цэлыя вякі гадоў, але даць пачатак, рабіць па сваёй сіле закладку,— **можам і мы.**

Якія ж скарбы мы будзем складаць? А вось якія. Мо ў каго знойдуцца старадаўнія кнігі, паперы, малюнкі, разьба якая; мо аружжа, пасудзіна, мэбля даўнейшай работы; мо старасвецкія нацыянальныя вопраткі, тканіны, прыкрасы якія-колечы і мо прылады гаспадарскія і г. д. Кожная такая рэч, калі яна адна ў каго-колечы і пераховываецца, ані карысці, ані вартасці вялікай не мае; зусім іншая справа, калі ўсё гэта збярэцца разам — у адно: разглядаючы гэтыя памяткі, перад намі быццам аджываюць, устаюць нашы прадзеды са сваімі прывычкамі, звычаямі; мы як бы заглядваем у тое далёкае, даўно мінуўшае жыццё, ад каторага нас аддзялілі цэлыя вякі, і тады спазнаем, куды мы самі ідзём...

Іншая зноў справа, што зложым мы ў музей — у гэты скарбец народны з нашага цяперашняга часу. Тут мы павінны помніць, што ўсё, што бы мы цяпер ні сабралі, мае значэнне не толькі для нас саміх, але і для будучы-

ні — для нашага патомства: як для нас на старадаўніх памятніках адбіваецца старадаўняе жыццё з яго культурай, так на тых рэчах, каторыя мы цяпер зложым, адаб'ём пячатку культуры і працы нашага часу, нашага жыцця для будучага патомства.

Для нас жа, апрача таго, мела б гэта яшчэ адно вельмі важнае значэнне.

Шмат у нас ёсць гаспадарскіх прылад сваёй выдумкі, сваёй работы, ужываных у якой-колечы ваколіцы, а зусім не знаных у другой старане.

Шмат ёсць і розных мясцовых вырабаў, аб каторых далей мала хто ведае.

Шмат марнее ў глухіх кутках Беларусі і здатных працаўнікоў ці то да сталяркі, ці слясаркі, ці то да рысунку, ці так да якой-колечы работы.

Дык вось, каб усе яны прысылалі ў музей свае вырабы, свае пробныя работы, то з гэтага злажылася б быццам паказная выстаўка.

Праз гэта не адзін мо знайшоў бы сабе добрыя заработкі і выбіўся на важнага майстра. Іншыя, угледзеўшы якія-колечы вырабы ці карысныя прылады, мо б завялі ў сябе ці выпісвалі іх у вырабшчыка і г. д.

Гэткім парадкам мы не толькі лепш спазналі б свае сілы, але і ўзрастала б наша культура.

Добра было б, каб нашы браты-беларусы, што жывуць на чужыне, прысылалі нам адтуль такія мясцовыя прылады, каторыя варта і карысна і нам у сябе заводзіць.

Разумеецца, што ніякія фабрычныя вырабы не могуць мець якога-колечы значэння, бо іх знойдзеш і ў магазінах, а толькі вырабы дамовай, мясцовай работы, і то прысылаць трэба не такой велічы, якой яно ўжываецца, а толькі зусім невялічкі, але акуратны мадэль яго.

Апрача таго, у музеі павінны быць засушаныя ўсялякія травы, кветкі, матылі, жукі і розныя кузуркі з надпісам, дзе і калі знойдзены і як завуцца. Таксама

важна было б мець высушаныя і напханыя скуркі ўсялякіх птушак і звяроў (хоць іх галовы) нашай Беларусі.

Кожны тады мог бы не з рысунку, а ў натуры бачыць сваіх шкоднікаў і прыяцеляў.

Для гісторыі Беларусі вельмі добра было б мець дэтальныя апісанні (найлепш апісваць у мясцовай мове), партрэты, планы нашых вёсак, засценкаў, аколіц, іх граматнасць, промыслы, звычаі, мова, гаспадарка і г. д.

Словам, трудна нават пералічыць, успомніць усё тое, чым можам і чым павінны мы багаціць свой Народны Беларускі Музей.

Але перад намі яшчэ адно пытанне: куды пасылаць і куды складаць гэтыя нашы скарбы? Клопат гэты — хоцькі-няхоцькі — прыходзіцца зваліць на рэдакцыю. Пакуль што памяшчэння мо хваце ў самой рэдакцыі; мо апытаюць прыватную дзе кватэру, гаспадар каторай згадзіўся б да часу прымаць падсыланыя рэчы, а як збярэцца гэтага болей, тады супольна параімся, што і як рабіць дальш.

Дык шчыра ж возьмемся за працу над культурай і ўзростам роднага краю, але і захаваўшы ж яго родным — Беларускім!

Хто чым можа — хай дапаможа!

У справе гэтай, так важнай для нас, вельмі хацелася б выслухаць рады і думкі сваіх прыяцеляў і чытачоў. Пішыце ў рэдакцыю «Н. Н.», а хто ласкаў да мяне: пачт. ст. Радашковічы Віленск. губ. Ядвігіну Ш. у Карпілаўку.

ПЕРАКЛАД

У. Гаршын

СІГНАЛ

I

Сёмка служыў сторажам на чыгунцы. Ад яго будкі да адной станцыі было дванаццаць, да другой дзесяць вёрст. Вярсты чатыры ад яго будкі пабудавалі летась фабрыку; з-за лесу яе высокі комін чарнеў, а бліжэй, апроч суседніх будак, не было і хат.

Сёмка быў чалавек хворы і слабы.

Дзесяць гадоў перад гэтым быў ён на вайне; служыў ён дзеншчыком у афіцэра і цэлы паход быў з ім. І галодны бываў ён, і мёрз, і на сонцы пёкся, і праходзіў ён вёрст па сорак і пяцьдзесят у дзень у гарачыню і ў марозы; траплялася і пад кулямі быць у бітве, але, дзякаваць богу, ніводная ні зачапіла.

Стаяў раз полк на першай лініі. Цэлы тыдзень з туркамі перапалка была: ляжыць наша лінія, а цераз

далінку — турэцкая, і ад ранку да вечара страляюць. І афіцэр Сёмкі быў на лініі; усякі дзень тры разы насіў яму Сёмка з палкавых кухань, з рова, гарачы самавар і абед. Ідзе, бывала, з самаварам адкрытым месцам; кулі свішчуць, у камені ляскаюць; страшна Сёмцы, плача, а такі ідзе. Паны афіцэры вельмі яго хвалілі: заўсёды ў іх была гарачая гарбата.

Вярнуўся ён з паходу цэлы, толькі ў руках і ў нагах ламаць начало. Нямала бяды прыйшлося яму з той пары перажыць. Прыйшоў ён дадому — бацька стары памёр; сынок быў, чацвёрты гадок меў, і гэты захварэў і памёр; асталіся з жонкаю ўдвая. Не ўдалася ім і гаспадарка, да і цяжка з апухшымі рукамі і нагамі поле араць. Нельга ім было жыць у сваім сяле; пайшлі яны ў свет шчасця шукаць. Быў Сёмка з жонкаю і на лініі, і ў Херсоні, і ў Доншчыне; нідзе шчасця не знайшлі. Пайшла жонка служыць, а Сёмка, як і перш, усё хадзіў.

Давялося яму раз на машыне ехаць; на адной станцыі бачыць — начальнік на яго ўглядаецца. Пазналі адзін аднаго. Гэта быў афіцэр таго палка, у каторым ён служыў.

— Ты, Сёмка? — кажа ён.

— Так точна, ваша благародзіе, я той самы і ёсць.

— Ты як сюды папаў?

Расказаў яму Сёмка: так, кажа, і так.

— Куды ж цяпер ідзеш?

— Не магу знаць, ваша благародзіе!

— Як жа ты, дурань, не можаш знаць?

— Так точна, ваша благародзіе, дзеля таго, што падацца няма куды. Работы якой шукаць трэба, ваша благародзіе.

Паглядзеў на яго начальнік станцыі, падумаў і кажа:

— Вось што, братка, астанься ты пакуль што на станцыі. Ты, здаецца, жанаты? А дзе ж твая жонка?

— Так точна, ваша благародзіе, жанаты; жонка ў горадзе ў купца служыць.

— Ну, дык пішы жонцы, каб прыязджала. Дармовы білет пастараюся. Тут у нас адна дарожная будка будзе свабодная, папрашу ўжо за цябе начальніка.

— Дзякую вельмі, ваша благародзіе,— кажа Сёмка.

Астаўся ён на станцыі. Памагаў у начальніка на кухні, дровы сек, панадворак, платформу падмятаў. Цераз два тыдні прыехала і жонка, і паехаў Сёмка ў цялежцы ў сваю будку. Будка новая, цёплая, дроў колькі хочаш, гародчык невялічкі ад даўнейшага стоража астаўся, і зямлі морг з бакоў насыпаў быў.

Узрадаваўся Сёмка: стаў думаць, як ён сваю гаспадарку развядзе, карову, каня купіць. Далі яму ўвесь патрэбны прыпас: флаг зялёны, флаг чырвоны, ліхтарні, трубку, малаток, ключ шрубы падкручваць, лом, лапату, мяцёлак; далі і дзве кніжачкі з правіламі і распісаннем, у якую гадзіну машына ідзе. Спачатку наш Сёмка і начэй не спаў, усё распісанне чытаў: машына яшчэ цераз дзве гадзіны будзе ісці, а ён абойдзе сваю часць, сядзе на лавачцы каля будкі і ўсё глядзіць і слухае, ці не трасуцца рэльсы, ці не шуміць машына. Навучыўся ўжо ён на памяць і правілы: хоць і дрэнна чытаў, па складах, а ўсё ж вывучыўся.

Было гэта ўлетку; работа не цяжкая, снегу з насыпу адграбаць не трэба, ды і машына на гэтай дарозе не часта ходзіць. Абойдзе Сёмка сваю вярсту два разы ў дзень; дзе-нідзе шрубкі папрабуе падкруціць, пясочак падраўняе, масткі агледзіць і ідзе дадому, гаспадарку сваю ўпыняць. У гаспадарцы ў яго толькі заўсёды замятка была: што ні задумае зрабіць, аб усё дарожнага майстра трэба прасіць, а той начальніку дакладвае; пакуль прашэнне вернецца,— пара і пяройдзе. Пачалі Сёмка з жонкаю нават тужыць.

II

Прайшло месяцаў два; начаў Сёмка з суседзямі-старажамі знаёміцца. Адзін быў стары-старэнькі; усё на яго месца новага назначыць прыбіраліся; ледзьве з будкі вылазіў. Другі будачнік, што бліжэй да станцыі, быў чалавек малады яшчэ, але худы і жылясты. Спаткаліся яны з Сёмкам першы раз на насыпе, пасярэдзіне паміж будак, у абходзе. Сёмка шапку зняў, пакланіўся.

— Добры вечар,— кажа,— суседзе!

Сусед глянуў на яго бокам.

— Добры вечар,— кажа.

Адвярнуўся і пайшоў далей.

Спаткаліся пасля іх бабы. Прывіталіся Сёмкава Таця на з суседкай; тая гэтаксама многа не гаварыла, пайшла. Угледзеў раз яе Сымон.

— Што гэта,— кажа,— у цябе, маладзіца, муж не гаварлівы?

Памаўчала баба, пасля кажа:

— Аб чым яму з табой гаварыць? У кожнага сваё... Ідзі сабе з богам.

Прайшоў яшчэ з месяц; пазнаёміліся суседзі.

Сойдуцца Сёмка з Васілём, суседнім сторажам, на насыпе, сядуць на беразе, люлькі закураць і гутараць аб сваім жыцці. Васіль усё больш маўчаў, а Сёмка аб сваёй вёсцы і аб паходзе расказваў.

— Нямала,— кажа,— гора на сваём вяку прыняў, а веку майго не бог ведае колькі. Не даў бог шчасця. Ужо каму якую долю бог дасць, так яно і бывае. Гэтак яно, братка Васіль.

А Васіль люльку выбіў аб рэльсу, стаў і кажа:

— Не доля нас з табою век заядае, а людзі. Няма на свеце звера, гэткага нягожага і сярдзітага, як чалавек. Воўк воўка не есць, а чалавек чалавека жывога заядае.

— Ну, братка, і воўк воўка есць,— гэтага ты не кажы.

— З гутаркі гэтак прыйшлося, вось і сказаў. А ўсё ж няма стварэння горшага ад чалавека. Каб не чалавеча злосць ды зайздрасць — жыць бы льга было. А то ўсякі ад цябе кусок адабраць стараецца ды злопаць яго.

Задумаўся Сымон.

— Не ведаю,— кажа,— братка. Можа, яно і гэтак, а калі і гэтак, то ўжо ёсць ад бога такое палажэнне.

— А калі гэтак,— кажа Васіль,— то няма чаго нам з табою і гаварыць. Калі ўсякую брыду на бога звальваць, а самому сядзець ды цярпець,— то гэта трэба, братка, не чалавекам быць, а скацінаю. Вот табе і ўвесь мой сказ.

Павярнуўся і пайшоў не развітаўшыся.

Устаў Сёмка

— Суседзе! — крычыць, — за што ж ты лаешся?

Не адвярнуўся сусед, пайшоў. Доўга глядзеў на яго Сёмка, пакуль у далінцы на павароце стала Васіля не відаць.

Вярнуўся ён дамоў і кажа жонцы:

— Ну, Тацяна, і сусед жа ў нас: звер, не чалавек.

Але апасля не пагневаліся яны; спаткаліся ізноў і, як і сперша, пачалі гутарку, і ўсё аб тым самым.

— Эх, братка, каб не людзі... не сядзелі б мы з табой у гэтых будках,— казаў Васіль.

— Што ж у будцы... нішто, і ў будцы жыць можна...

— Жыць можна, жыць можна... Эх ты! Многа жыў, мала нажыў: многа глядзеў, мала бачыў. Беднаму чалавеку, ці там у будцы, ці дзе, якое там жыццё, ядуць цябе жывадзёры гэтыя, увесь сок выціскаюць, а як састарэеш, выкінуць, як шалупіну якую свінням на корм. Ты якую пенсію бярэш?

— Ды невялікую, Васіль; дванаццаць рублёў.

— А я трынаццаць з палавінай. Скажы ты мне, чаму гэта так? Па правілу ад праўлення ўсім адно назначана:

пятнаццаць рублёў у месяц[1], дровы, газа... Хто ж гэта нам з табой дванаццаць або трынаццаць з палавінай назначыў, скажы ты мне? А яшчэ кажаш, жыць можна! Ты раздумай: не аб паўтара там або тры рублі гутарка; хоць бы і ўсе пятнаццаць плацілі. Быў я на станцыі прошлага месяца. Дырэктар дарогі (важная асоба пры чыгунцы, інжынер) пераязджаў; вось яго бачыў я; меў я гэткі гонар убачыць. Едзе сабе ў асобным вагоне; выйшаў на платформу, пахаджае... Ды не астануся я тут надоўга; пайду куды вочы глядзяць.

— Куды ж ты пойдзеш, Васіль? Пры хлебе хлеба не шукаюць. Тут у цябе і хата, і цёпла, і зямлі крыху ёсць. Жонка ў цябе работніца, дасужая...

— Эх, паглядзеў бы ты на зямлю маю. Ні каліўца на ёй няма. Пасадзіў быў вясной капусту, ды і то дарожны майстар прыехаў. «Гэта, кажа, што такое? Чаму без дакладу? Чаму без пазвалення? Выкапаць, каб і духу яе не было». П'яны быў. Другі раз і нічога б не сказаў, а тут убілася: «тры рублі штрафу»...

Памаўчаў Васіль, пацягнуў люльку і кажа ціха:

— Каб яшчэ крыху, прыбіў бы яго да паўсмерці.

— Ну, суседзе, і гарачы ты, я табе скажу.

— Не гарачы я, а па праўдзе кажу і думаю. Пастой, прыжджэцца ён у мяне, чырвоная морда! Да самага начальніка лініі жаліцца пайду. Паглядзім!

І папраўдзе пажаліўся.

III

Прыязджаў раз начальнік дарогу аглядаць.

За тры дні пазней паны важныя з Пецярбурга меліся па дарозе пераехаць: рэвізію, бач, рабілі, аглядалі, ці

---

[1] Плата, здаецца, і вялікая, але пры чыгунцы трэба і ўдзень рабіць, і ўночы не спаць; там няма ні свята, ні буднага дня; машына не глядзіць, хоць на першы дзень Вялікадня йдзе і трэба быць гатоваму; апроч гэтага трэба жыць на сваім хлебе.

ўсё ў парадку, вось перад іхнім прыездам трэба было ўсё ўпарадкаваць. Пяску падсыпалі, падраўнавалі, шпалы перагледзелі, шрубкі падкруцілі, слупы падмалявалі, на пераездах загадалі жоўтага пясочку падсыпаць. Суседка-старажыха і свайго старога выправіла траву чысціць. Працаваў Сёмка цэлы тыдзень; усё ўпарадкаваў і на сабе халат паправіў, вычысціў, а медзяную бляху цэглай гэтак адцёр, што аж зіхацела на сонцы.

Рабіў і Васіль.

Прыехаў начальнік дыстанцыі на дразіне[1]; чатыры работнікі корбу круцяць; кольцы шумяць, шэсцерня гудзіць; ляціць цялежка вёрст па дваццаць у гадзіну, толькі калёсы выюць.

Паляцеў да Сёмкавай будкі; падскочыў Сёмка, адрапартаваў па-салдацку. Усё ў парадку знайшлося.

— Даўно ты тут? — пытае начальнік.

— Ад другога мая, ваша благародзіе...

— Добра. А ў сто шэсцьдзесятым нумары хто?

Дарожны майстар, што разам з ім ехаў, кажа:

— Васіль Гушча.

— Гушча, Гушча... а, гэта той самы, што вы мелі летась на ўвазе?

— Той самы і ёсць.

— Ну, добра, паглядзім і ў Васіля Гушчы. Валяй!

Узяліся работнікі за корбу; пайшла цялежка ў ход. Глядзіць Сёмка на іх і думае: «Ну, будзе ў іх з суседам гульба».

Гадзін цераз дзве пайшоў ён у абход. Бачыць, з далінкі па насыпу ідзе нехта, на галаве як бы нешта белае нясе. Пачаў Сымон прыглядацца; бачыць — Васіль: у руцэ палка, за плячамі хатулёк маты, твар хусткай абвязаны.

— Суседзе, куды гэта ты? — крычыць Сёмка.

---

[1] Цялежка на чатырох колах, каторая коціцца па рэльсах ад таго, што работнікі круцяць корбу.

Падышоў Васіль бліжэй; твару на ім няма.

Белы, як хустка, вочы дзікія, пачаў гаварыць,— голасу няма.

— У горад, кажа, у Маскву... у праўленне чыгункай.

— У праўленне... вось яно што! Жаліцца ідзеш? Пакінь, Васіль, забудзь...

— Не, братка, не забудуся. Позна ўжо забывацца. Бачыш, ён мяне ў твар выцяў, да крыві разбіў. Пакуль жыць буду, не забудуся, не пакіну гэтак.

Узяў яго за руку Сёмка.

— Пакінь, Васіль; праўду табе кажу: лепш не зробіш.

— Якое там лепш! Я і сам ведаю, што лепш не зраблю. Праўду ты казаў, што такая наша доля. Сабе лепш не зраблю, але за праўду трэба, братка, стаяць.

— Ты ж скажы, ад чаго ўсё пачалося?

— Ды ад чаго ж... агледзеў усё, з дразіны сышоў, у будку глянуў. Я ўжо ведаў, што будзе крэпка пытаць, усё як мае быць прыгатаваў. Ужо хацеў ехаць, а я з жалабай. Ён тады ў крык: «Тут, кажа, важная рэвізія, а ты аб гародзе жаліцца!» Я не ўцерпеў, сказаў слова, не то каб ужо вельмі што, але ён не ўпадабаў. Як дасць ён мне!.. А я стаю сабе, як бы яно гэтак і трэба. Паехалі яны, апомніўся я, абмыў сабе твар і пайшоў.

— А як жа будка?

— Жонка асталася. Не прагледзіць; ды чорт з імі, і з дарогай іхняй!

Устаў Васіль, сабраўся.

— Бывай здароў, Сёмка, не ведаю, ці знайду сабе ўправу.

— Няўжо ж ты пехатой пойдзеш?

— На станцыі на таварны поезд папрашуся; заўтра ў Маскве буду.

Развіталіся суседзі: пайшоў Васіль, і доўга яго не было. Жонка за яго рабіла, дзень і ноч не спала, саўсім замарылася, чакаючы мужа.

На трэці дзень прыехала рэвізія: машына, багажны вагон і два вагоны першай клясы, а Васіля ўсё няма. На чацвёрты дзень угледзеў Сёмка ягоную жонку: твар ажно азыз ад слёз, вочы чырвоныя.

— Вярнуўся муж? — пытае.

Махнула баба рукой, нічога не адказала і пайшла ў свой бок.

IV

Навучыўся Сёмка некалі яшчэ хлопцам з каліны дудкі рабіць. Выпаліць дротам у палачцы сярэдзіну, дзіркі дзе трэба прарэжа, на канцы пішчык зробіць і гэтак важна наладзіць, што хоць што хочаш іграй. Рабіў ён, як меў час, дудак многа і праз знаёмага кандуктара ў горад на рынак пасылаў. Давалі яму за штуку па чатыры грошы.

